Вольга Іпатава



...прамоўленае Слова валодае сілай,

яно можа павярнуцца дзеяй...

# Апошнія ахвяры сьвяшчэннага дуба

*У 1374 годзе ў Канстанцінопалі былі кананізаваныя тры пакутнікі за хрысьціянскую веру Іаан (Ян), Антоній (Антон) і Яўстафій (Астап), якія ў язычніцтве насілі імёны Кумец, Круглец і Няжыла, што сьведчыць пра іхняе славянскае паходжаньне, хутчэй за ўсё з крывічоў, якія складалі значную частку насельніцтва Вільні. Да сьмерці вялікага князя Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага Альгерда (сына праваслаўнай Вольгі і Гедзіміна) заставалася яшчэ тры гады. Несумненна, ён ня мог не дазнацца аб кананізацыі: усе тры пакутнікі былі некалі ягонымі прыдворнымі, ён добра ведаў кожнага і, паводле некаторых зьвестак, асабліва любіў Кумца і Няжылу.*

*Аднак жа менавіта ў час ягонага валадараньня яны былі пакараныя страшнаю сьмерцю – павешаныя на сьвяшчэнным дубе, стаўшы яго апошнімі ахвярамі, бо пасьля іхняе сьмерці гэты волат-дуб быў сьсечаны, а на яго месцы пабудавалі храм сьвятой Тройцы. Палітычныя меркаваньні, паводле якіх хрысьціянін-князь вымушаны быў аддаць пакутнікаў у рукі жрацоў, мінуліся ўжо праз*

*нейкае дзесяцігоддзе, і Альгерд жорстка адпомсьціў тым, перад кім раней павінны быў схіляць галаву. Аднак справа была зробленая. Думаецца, што на сваёй апошняй споведзі (паміраў вялікі князь, прыняўшы праваслаўную манаскую схіму, што яшчэ раз сьведчыць пра ягоную палітычную і этнічную арыентацыю) ён спавядаўся найперш у гэтым сваім граху.*

*За сем з паловай стагоддзяў, якія прайшлі ад часу пакутніцкай сьмерці трох маладых прыдворных Альгерда, шмат навальніцаў пранеслася над беларускай зямлёй. Сьвятыя, мошчы якія вярнулі ў Вільню пасьля кананізацыі ў Канстанцінопалі, былі шанаваныя месьцічамі і праваслаўнымі беларусамі ажно да пачатку Першай сусьветнай вайны. Менавіта ў гэты час (1915 г.) мошчы былі зноў вывезеныя – гэтым разам у Маскву, і да 1926 году знаходзіліся ў музейных сховішчах, дзе над імі рабілі розныя эксьперыменты.*

*У вяртаньні мошчаў на радзіму актыўны ўдзел прыняла беларуская інтэлігенцыя, у прыватнасьці, бацькоўскі камітэт пры Віленскай беларускай гімназіі.*

*Але ранейшая вядомасьць да пакутнікаў усё яшчэ не вяртаецца: другая сусьветная вайна і яе жахі, страта Вільні, нарэшце, савецкая атэістычная прапаганда зрабілі сваю справу. Страчаная і іх выразная этнічная прыналежнасьць. Сёньня нават у Сьвята-Духавым манастыры ў Вільні пра іх гавораць як пра літоўцаў, што спазналі сьвятло праваслаўя. І гэта нягледзячы на тое, што некалькі гадоў запар праваслаўнае беларускае брацтва Трох Віленскіх Мучанікаў прыязджае ў Літву, дзе знаходзяцца нятленныя мошчы, каб адзначыць сьвята сваіх аберагальнікаў.*

*Пакуль усё яшчэ не "вяртаецца" да беларусаў і Альгерд – князь, пры якім Вялікае княства Літоўскае дасягнула велізарных памераў – ад Чорнага да Балтыйскага мора, а беларуская мова квітнела як адзіная дзяржаўная мова краіны.*

*У гэтай аповесьці мне хацелася зьвярнуцца да тых старонак нашай гісторыі, якія складаюць яе духоўную славу і якія павінны быць аднаўленыя, каб над нашай краінай прасьціралася ахоўная моц пакутнікаў, якіх ушанавалі яшчэ ў XIV стагоддзі і якія, як вечная загадка для атэістаў, засталіся нятленнымі ў сьвеце, дзе рассыпаюцца камяні і царствы…*

## *ВЕКША*

Велізарны, з залатымі вусамі драўляны Пярун нерухома глядзеў удалячынь. Ён нібыта забыўся на людзей, якія корпаліся ля ягоных ног, мітусьліва прывязваючы да іх – тоўстых, абутых у чырвоныя ўсьмавыя боты – маладую дзяўчыну. Ён як бы думаў сваю адвечную думу, сягаючы ў далёкія, непадуладныя нікому пласты часу.

Дзяўчына была маладзенькай, яе тонкія рукі былі падобныя да маладых чарацінак, зламаных упэўненай, бязьлітаснай рукой. Залатыя валасы, акуратна заплеценыя ў касу і ўпрыгожаныя вянком са сьвежых рамонкаў, аздаблялі яе спалатнелы твар з роўным, прыгожым носам і вачамі, што былі той цёмнай, суцэльнай сінечы, якою цяжка адблісквае ў лістападзе ціхая лясная рэчка. Відавочна было, што яе напаілі адварам маку: яна не крычала, ня тузалася, а цьмяна глядзела, як пяньковыя вяроўкі абвіваюць ільняны падол ейнай сукні, як пяюць, ціха і працягла, жрацы ў белых

нагавіцах і кашулях, паступова паскараючы сьпевы, як цьвёрда стаіць амаль насупраць яе ў канцы агромністае залы вялікі князь Альгерд.

Вярхоўны жрэц Перуна Бурыла узяў з блакітнае парчовае падушкі нож, які ярка і злавесна бліснуў ў сьвятле безьлічы смалякоў, што зырка гарэлі па сьценах, упраўленыя ў сярэбраныя зацiскі.

Лоўчы Кумец, стоячы ў багатай, бліскуча-вытанчанай купе прыдворных, адчуў, што ў яго сутаргай сьціснула горла. Дзяўчыну, якую зараз аддадуць у ахвяру Перуну, клікалі Векшай. Яна расла на суседняй з ім вуліцы, дзе жылі майстры, што абслугоўвалі вялікакняскі замак і багатае баярства Вільні. Ня раз яна прыносіла да ягонай маці, баярыні Людміліцы, сярэбраныя бранзалеты, колты і пярсьцёнкі, якія выраблеў ейны бацька, знаны залатых справаў штукар. Даўганогае, як бацянок, няўклюднае дзяўчо толькі ў апошнія два гады раптам акруглілася, заружавела маладым, прыгожым кветам, і вечна ўскудлачаныя ейныя валасы, таксама неяк раптоўна, зазьзялі колерам бледнага золата, а вочы сталі сінімі і глыбокімі. Ён часам думаў пра яе, калі маці, ласкава пасьміхаючыся, нагадвала, што хутка два ейныя сыны, як буслы ў вырай, адляцяць да іншых жанчын – такі закон жыцьця. Але думаў мімаходзь, бо хапала пры княскім двары і прыдворных дзяўчат, за кожнай з якіх стаяла багатая і магутная радня, і жанчын, якія згодныя былі падарыць мімалётную радасьць прыгажуну Кумцу. Віленскі Горні замак* ужо досыць даўно зрабіўся для яго месцам, дзе нямала куткоў было абазначана кароткімі, але надта салодкімі прыгодамі: то ў пустой параднай зале, за шэра-зялёнай тканаю шпалерай, то ў ваеннай вежы, дзе гулка аддаюцца крокі вартавога, які, атрымаўшы ў руку талер, адварочваецца і глядзіць удалячынь, нібы не заўважаючы пару, якая юрліва сьлізгае ў памяшканьне…

Цяпер жа, калі Векша назаўсёды адыходзіла ў Ірый, улагоджваючы багоў, ён адчуваў сябе абакрадзеным. Ніколі, ніколі не дакранецца ён да гэтых залатых валасоў, не абдыме тонкі стан, і рука ягоная не памацае грудзі, што высока ўздымаюцца пры кожным сутаргавым выдыху. Вочы Векшы раптам спыніліся на ім, яна, здаецца, пазнала яго, а можа, проста выдзеліла ягоны твар між чэлядзі, што абкружала князя Альгерда. Мабыць, нечым ён вызначаўся сярод іхніх вышытых золатам і серабром каптанаў, гладка голеных маладых і старых твараў. Ды не, наўрад ці яна пазнала яго здаля, толькі, можа, у сваім перадсьмяротным быцьці проста адчула нейкую спагаду ў твары высокага гожага хлопца: твар яе пакрывіўся, яна хацела нешта сказаць, але ў гэтую хвіліну нож з сілай ударыў у ейныя грудзі, і яна, спалохана выпрастаўшыся, тут жа абвяла, апала на вяроўкі, якімі была прывязаная да ног Перуна. Ногі божышча тут жа афарбавала ў густую чырвань кроў...

І адразу натоўп радасна загуў – агонь за сьпіной Перуна ярка ўспыхнуў, у сьвятле полымя пабляклі смалякі. Бог прыняў ахвяру, значыць, скончыцца страшны мор, які быў насланы злымі сіламі на свойскую скаціну, мор, ад якога здохла ледзь не траціна сьвіней і кароў у ваколіцах Вільні.

Людзі з воклічамі захапленьня сталі кідаць на вялікія тарэлы, якія тут жа зьявіліся ў руках жрацоў, каліты з манетамі, пярсьцёнкі, а некаторыя баярыні – уласныя колты, што, сьпяшаючыся, выцягвалі з вушэй.

---

* Аўтарскія тлумачэньні з такой пазнакай падаюцца ў канцы тэксту.

Колты тыя былі найбольш сьпіральныя – крывічоў сярод насельнікаў Вільні было непараўнальна болей, чым балтаў, дрыгавічоў ды яцьвягаў.

– Брат, ты што дрэмлеш? – пачуў Кумец голас старэйшага брата Няжылы, і схамянуўся. Выцягнуў з каліты, што вісела на паясным кручку, залаты пражскі грош і шпурнуў на тарэлу так, што ён адскочыў ад меднае паверхні і пляснуўся на яе другім бокам.

– Ты што, брат? – зьдзіўленыя вочы Няжылы трохі астудзілі полымя, што бушавала ў грудзях Кумца.

– Нічога! – буркнуў той. Няжыла зьдзівіўся яшчэ болей – ніколі яшчэ малодшы брат ня быў такім злосным. Наадварот – ягоны твар быў заўсёды вясёлым і прыветным, усьмешка амаль не сыходзіла з яго.

Браты любілі адзін аднаго. З таго часу, як у Нямеччыне загінуў іхні бацька, лоўчы Драмак, пакінуўшы чатырох дзяцей – двух сыноў і столькі ж дачок, яны ва ўсім дапамагалі маці. Баярыня Людміліца доўга і цяжка хварэла, і родзічы яе пачалі прыбіраць да рук багацьці, што засталіся пасьля мужа. Няжыла тады пайшоў у свой першы паход у войску Гедзіміна на Баербург, дзе загінуў вялікі князь і шмат ваяроў. Вярнуўся ён параненым, лячыўся барсучыным салам, часта езьдзіў у розныя сьвяцілішчы Віленшчыны ў пошуках найбольш магутных валхвоў. Шаснаццацігадовы Кумец тады неяк неўпрыкмет узяў усё ў свае рукі. Паціху, бяз звадаў і спрэчак, зьніклі з дому хцівыя родзічы, вярнуліся на свае месцы сярэбраныя келіхі, падораныя некалі бацьку за верную службу і Гедзімінам, і княжычам Альгердам. Сямейнікі Драмака ганарыліся, што ён служыў пры сыне вялікага князя Гедзіміна яшчэ тады, калі Альгерд толькі падрастаў і быў толькі спадчынным князем Крэва. Пры двары свайго бацькі тут, у Вільні, Альгерд вучыўся пазіраць на жыцьцё з вышыні ўладара, падпарадкоўваючы маладыя жаданьні няўмольнай сіле Неабходнасьці. Адсюль паехаў у багаты Віцьбеск, калі ажаніўся з князёўнай Марыяй і дзе прыняў тамтэйшы тытул пасьля сьмерці ейнага бацькі Яраслава.

За шэсьць гадоў, якія прайшлі пасьля гібелі Гедзіміна, шмат што зьмянілася ў Вільні. На сталец* спачатку сеў малодшы з братоў – княжыч Яўнут. Тады Няжыла так і ня змог стаць падчашым пры двары, хаця тая служба павінна была дастацца яму – так абяцаў Драмаку вялікі князь Гедзімін. Але Яўнут не зьбіраўся даваць ганаровую пасаду прыдворнага таму, хто служыў ягонаму брату і галоўнаму суперніку – Альгерду. Альгерд сядзеў у Віцьбеску, у родавым гнязьдзе сваёй жонкі Марыі, і Няжыла зусім ужо ўзбурыўся ехаць на службу да яго, але ўсё хварэла, ніяк не магла ачомацца іхняя маці, ды і сёстры падрасталі, трэба было шукаць ім добрых жаніхоў.

Але неўзабаве Альгерд і яго стрыечны брат Кейстут скінулі Яўнута – той падчас аблогі зьбег з замку ў адным кажушку, ледзь ня босы. Вярнуўшыся ў палац праз тыдзень пасьля ўкнязяваньня Альгерда, Няжыла адразу ж атрымаў месца хаця і ня чашніка, які адказваў за вінныя падвалы, але яго памочніка, што адразу паставіла яго ў трэці шэраг прыдворных. Першы, як усім вядома, займае маршалак, канцлер, земскі ды ваявода. Другі – кашталян і яго штат, уключаючы чашніка. А памочнікі – яны таксама могуць многае, і віленская знаць хіліцца перад імі часам ці ня больш, чым перад іхнімі чальцамі...

Узвышэньне Няжылы ня ўсе прынялі аднолькава. Яўнутавы стаўленік Кісель, які займаў раней гэтае месца, прыціх, стаіўся і болей не паказваўся

нідзе – ні ў капішчах на сьвяты, ні ў дні народзінаў вялікага князя ці ягонай княгіні Марыі, калі на замкавым двары зьбіраецца ледзь ня ўся Вільня – купцы і рамесьнікі, баяры і сьмерды. А за Кісяля прасіў некалі сам ваявода Гаштольд, і цяпер ён непрыязна глядзеў на новага падчашага, калі той слугаваў за сталом вялікага князя.

А праз нейкі час Альгерд наблізіў да двара і малодшага брата, ды таксама на зайздроснае месца – памочнікам галоўнага лоўчага. Паляваньне – вялікая ўцеха амаль усіх валадароў, таму слугам толькі пасьпявай круціцца – даглядаць сокалаў, ганчакоў, выменьваць ды купляць лепшае ў краіне дый сачыць, ці ёсьць што вартае зайздрасьці пры іншых каралеўскіх ды княжых дварах. Узвышэньне братоў ашчасьлівіла іх маці, яна ўстала з ложка, і хаця з цяжкасьцю, але зноў узялася гаспадарыць у двары. Пайшлі ў хату адзін за адным і сваты. За апошні год выдалі замуж абедзьвюх сясьцёр – Бярозу і Радагосту. Адну – за гарадзенскага вознага, другую за віленскага купца Чура, і ў абедзьвюх сем’ях ужо чакаліся першынцы.

Няжыла, зьбіраючыся на сёньняшнюю ахвярную дзею, пачуваўся зусім шчасьлівым. Учора, калі князь прыехаў з ловаў і дужа хваліў сваіх лоўчых за ўдалае паляваньне, на яго брата Кумца ласкава паглядзела сама княгіня Марыя. Вечарам князь упадабаў аздабленьне стала, і зноў княгіня ласкавым позіркам аддзячыла памочніку падчашага Няжыле, а з-за яе сьпіны кінула на яго хітра-прывабны погляд ейная прыслужніца, дачка багатага купца Баравіка Рэчыца. Княгіня ўзяла дзяўчыну насуперак парадам старых прыдворных, якія ківалі, што дзяўчына не з баярскага роду.

Яе бабуля аказала некалі маладой Марыі важную паслугу, зьняла з яе твару вогнік*, і ўдзячная княгіня ўзгадала пра яе, калі села разам з Альгердам на вялікакняскі пасад. Рэчыца – не прыгажуня, але ёсьць у ёй тое, што падабаецца Няжыле – надзейнасьць і моцнае здароўе. Магутныя клубы, румянак на шчоках, кроў, здаецца, ажно кіпіць… Вядома, калі яны пабяруцца, ён даможацца, каб жонка пакінула гэтую службу, хай і занадта шаноўную для яе радні. Занадта многа ласых да дзяўчат малойцаў ашываецца пры двары...

Невысокі, каржакаваты, Няжыла быў зусім не падобны да свайго прыгажуна-брата, але, можа, якраз таму і любіў яго, спадзяваўся, што Кумец атрымае некалі вялікую пасаду пры двары. Што ён у параўнаньні з братам, які страляе з лука лепей за ўсіх прыдворных? Хто і ўзімку пераплываў імклівую Вяльлю, хутчэй за ўсіх караскаўся на сьвяточны слуп перад замкам, калі зьняць галоўны прыз з немалой вышыні зьбіраліся лаўкачы ледзь не з усяго Княства?

Стаць бы першым памочнікам чашніка, потым, калі дазволіць Пярун, і самім чашнікам, мець добры двор, жонку і шмат дзяцей – пра што яшчэ марыць? А вось Кумец з яго прыгажосьцю мог бы… можа, нават ажаніцца з дачкой маршалка альбо кашталяна, а то і ваяводы, а з цягам часу і самому ўзьбіцца на адну з гэтых пасад. Ён разумны і разважлівы. Няжыла на свае вочы бачыў, як сястра знатнага баярына Кругляца, далёкага іх родзіча, глядзіць на брата закаханымі вачыма. Ды колькі іх, такіх юных дзяўчатак, зіркае на брата з надзеяй і зацікаўленьнем?

Тым часам чэлядзь расступілася, каб прапусьціць да выхаду вялікага князя Альгерда. Абапіраючыся на служку Кужаля, трохі пакульгваючы, ён павольна прайшоў пад аркамі з чырвонай цэглы да выхаду, дзе чакаў

яго любімы конь Зьвер. Ні высокая шапка з тонкай скуры, аблямаваная собалем, ні вышыўкі з вялікімі жоўтымі і чырвонымі рубінамі на шаўковай зялёнай кашулі, ні пурпуровы аксамітавы плашч з залатой шнуроўкай па рукавах – нішто б не вылучыла яго з гэтае гурмы прыдворных (некаторыя з іх былі апранутыя ня горш за самога гаспадара), калі б ня велічная пастава галавы і невыказная словамі, але надта ж адчувальная для навакольных сіла, якая зыходзіла ад усяе яго постаці.

Усё схілялася перад вялікім князем. Але былі сярод натоўпу вочы, якія глядзелі на яго з прыхаванай нянавісьцю. Мікша, цяперашні просты служка храма Макошы, усяго два гады назад быў галоўным жрацом капішча Рагуціса, разбуранага па загадзе княгіні Марыі Віцебскай дзеля таго, каб на яго месцы паўстаў храм Параскевы, нарачонай Пятніцай*. Тады гэта выклікала вялікае паўстаньне літоўцаў і жамойтаў, часткова задушанае, часткова шчодра аплочанае пасьля з казны вялікага князя, якому давялося прыкласьці шмат намаганьняў, каб ня даць скінуць сябе са стальца. Тое паўстаньне выкарысталі і прыхільнікі Яўнута – шмат каго з іх давялося вярнуць на княскую службу. Але хутка Альгерд спыніў пагадненьне з непрыяцелямі, бо на дапамогу брату-суправіцелю пасьпеў Кейстут з яго магутным войскам.

Мікша пасьля задушэньня паўстаньня не схаваўся ў дрымучых лясах, якімі была абкружаная Вільня, як тое зрабілі іншыя жрацы. Ён застаўся ў стольным горадзе, атабарыўся на дробнай, нязначнай пасадзе. Але ён чакаў свайго часу. Ня можа быць, каб князь Альгерд, з якім ён сябраваў з юначых гадоў, калі той яшчэ не пабраўся з гэтай хітрай віцяблянкай, гэтай ласіцай, што змагла акруціць самога вялікага Гедзіміна, так што той дазволіў ёй завесьці ўласны, хрысьціянскі двор са сваімі сьвятарамі – ня можа быць, каб князь урэшце не аднавіў храм Рагуціса! Калісьці малады Альгерд любіў той храм і адорваў яго часьцей за іншыя, можа, якраз таму, што мог пагаварыць са сваім аднагодкам Мікшам больш даверліва, чым з іншымі – хаця цалкам даверлівым Альгерд ня быў ні з кім. Можа, дзякуючы менавіта той даўняй юнацкай прыязьні вялікі князь заплюшчыў вочы на тое, што адзін з галоўных завадатараў вялікай калатнечы застаўся ў сталіцы. Але да сябе ён больш яго не набліжаў.

Мікша шмат разоў спрабаваў падлабуніцца да Альгерда, шукалі паразуменьня і іншыя жрацы. Былі і тыя, хто вырашыў змагацца да апошняга.

Але, нягледзячы на ўсё супраціўленьне жрацоў, месяц за месяцам царква Параскевы Пятніцы атрымлівала ад вялікай княгіні падтрымку і ахвяраваньні, багацела, уздымалася, і ўсё болей моладзі заходзіла туды, каб схіліць калені перад маляванымі дошкамі, з якіх глядзелі новыя, візантыйскія багі. А бронзавая статуя Рагуціса, ледзь не ў апошнюю хвіліну выратаваная ім і жрацом Молам, ляжала пад адным са сьвяшчэнных дубоў у Перуновым гаі, закапаная ўначы жрацамі.

Пры ўспамінах аб тых несправядлівасьцях нянавісьць усё болей авалодвала Мікшам. Ён стаяў, сьпіной адчуваючы холад чырвонай цэглы, і холад гэты працінаў ягоную душу.

– Як добра, што багі прынялі ахвяру! – пачуўся голас побач з ім.

– Мне шкада яе. Векша магла б жыць ды жыць! – адказаў другі, мяккі і ласкавы.

– Шкада?! Яна пойдзе адразу ў Ірый. А мы з табой яшчэ колькі нажывём, столькі награшым!

Гаварылі браты. Мікша пазнаў іх. Язычнікі, яны часьцяком прыносілі ахвяры і ягоным балцкім багам, а ня толькі сваім, славянскім. Асабліва шчыравала маці. Ейная бабка была жамойткай, таму ў маладосьці яна хадзіла найболей у храм багіні ранішняй зары Аўшры, якая падарыла ёй добрага мужа. Пасьля, калі стала ўдавой, тая ахвярнасьць згасла, жанчына прыносіла ахвяры да Рагуціса рэдка. З гадамі часьцей пакланялася Макошы і Роду з парадзіхамі – прасіла за сыноў і дачок.

І сыны ўдаліся на зайздрасьць усім. Абодва служылі пры двары. Іх ведаў і цаніў сам вялікі князь. І цяпер Мікша раптам пазайздросьціў ім – іхняй бестурботнасьці, весялосьці, лёгкасьці.

Нейкая патаемная, цёмная думка нараджалася ў былога жраца, калі ішоў ён за хлопцамі, якія бестурботна дзяліліся паміж сабой сваімі таямніцамі. Ды якія там былі і таямніцы!

– У Рэчыцы сярод пасагу ёсьць шапка з нямецкага аксаміту. Паверыш – якраз па маёй галаве! Нібыта на мяне шылі. А ты ж ведаеш, галава ў мяне – што той чыгунок! – рагатаў старэйшы.

Малодшы адказваў нехаця. Ён быў яўна прыгнечаны. Жрэц, які краўся ззаду, даведаўся з размовы, што ён заўтра ідзе да Кругляца. Здаецца, гэты Круглец таксама служыў у замку, бо размова ішла пра тое, каб паклікаць яго пасьля службы на бяседу, што ладзілася ў адной з мураванак пад замкам. Усё гэта былі дробязі, ня вартыя таго, каб іх слухаць. Аднак жа Мікша ведаў – чым болей дазнаешся пра набліжаных да валадароў людзей, тым больш моцным робішся сам. І праўда: у размове нарэшце прагучалі словы, якія прымусілі Мікшу навастрыць вушы: Кумец прыязна ставіўся да хрысьціянства! А гэта ўжо была нагода, каб ісьці за братамі. Якраз таму, што жонка вялікага князя была хрысьціянкай, жрацы раўніва сачылі за кожным крокам самога Альгерда – ці моцна абараняе ён язычаства? Адна справа жонка – яна прынесла княжычу Альгерду Віцебскае княства, ён змушаны быў ахрысьціцца. Але тут, пры двары, хрысьціянам хадоў не было. Альгерд не ўтрымаўся б на стальцы, калі б жрацы ў свой час не падтрымалі яго, а найперш ягонага брата Кейстута, зацятага язычніка. Аднак і ў жрацоў не было сілы, каб узьвесьці на сталец самога Кейстута, больш любага ім, чымся Альгерд. Ды Альгерд валодаў вялікімі землямі на ўсходзе, куды большымі, чым былі ў Кейстута. А сутыкнуць стрыечных братоў значыла б разьвязаць вялікую калатнечу. І таму яны цярпелі Альгерда. Пакуль што, да лепшага часу...

Браты даўно схаваліся ў двухпавярховай пабеленай мураванцы, дзе яны жылі разам з маці, а былы вярхоўны жрэц Мікша стаяў ля вугла і пазіраў на высокія вокны, зацягнутыя не слюдой, як амаль ва ўсіх дамах у Вільні, а дарагім шклом. Твар яго крывіўся і зайздрасьцю, і бясьсільнай злосьцю.

Як спыніць новае вучэньне, чым выпальваць яго ў душах? Як змагацца за веліч багоў, якім пакланяліся спрадвеку?

Поўня, што адзінока і велічна плыла над Горнім замкам, на імгненьне кранула яго сваім серабрыста-жоўтым промнем, і ён пасьпешліва адхіснуўся ў цень, каб ніхто, нават поўня, не маглі пабачыць ягонага твару…

## *КРУГЛЕЦ*

Сын памерлага пасла Леся, некалі ўлюбёнца самога Гедзіміна, Круглец рос у атачэньні тых, каго віленскі люд уважаў за вышэйшую ўладу Кня-

ства. Прыгожы кучаравы хлопчык, кругленькі, як снапок лёну, ня раз сядзеў на каленях вялікага князя, калі той прыязджаў у іхны дом, каб падчас вячэры пагутарыць з бацькам пра хітрыя стасункі з замежнымі краінамі, а таксама абгаварыць патаемнасьці свайго двара, якія маглі ведаць зусім нямногія.

Калі сын стаў падрастаць, бацька аддаў яго спачатку ў школу пры замку, дзе вучыліся дзеці прыдворных і паслоў, але пасьля, першы ў краіне, завёз сына ў Нямеччыну, каб там спасьцігаў ён навуку, якая ўзвышае чалавека амаль да Бога.

Можа, таму, што мала бываў у сваёй краіне і быў чуйны да новага, Лесь першым з паслоў Княства прыняў хрысьціянства. Праўда, ахрысьціўся паводле ўсходняга абраду і ў самым канцы жыцьця, але Гедзімін гэтага ніколі ня ўведаў. Ягоны пасол, вяртаючыся дадому, старанна, разам з усімі прыдворнымі, наведваў найважнейшыя капішчы і кланяўся багам як належала. Калі жрацы мазалі чалавечай крывёй вусны прыдворных, ніводная жылка на ягоным твары не выдавала, што насамрэч адчуваў ён у тыя хвіліны – пасол умеў хаваць пачуцьці. Ён езьдзіў у многія краіны сьвету, асабліва часта пасылаў яго Гедзімін у Рым, каб перадаць самому Папу чарговае пасланьне. Тое, што пасол пад старасьць сабраўся наведаць грэцкі Царгорад, ды яшчэ разам з сямействам, нікога не зьдзівіла – праваслаўныя баяры Полаччыны, Наваградка, Турава ды іншых гарадоў Княства здаўна, пакаленьне за пакаленьнем, пакланяліся менавіта царгародскім сьвятыням. Нават і тады, у амаль легендарныя часы, як Царгорад належаў рыцарам заходняга абраду*, плынь гэтая не мялела. Езьдзілі ў Афон да манахаў, падарожнічалі па манастырах, асабліва ж любілі Улахерну*, цуды якой былі зьвязаныя з домам Усяслава Полацкага.

Для маладога Кругляца падарожжа ў Візантыю стала нібыта вялізным нажом, што разрэзаў яго жыцьцё на дзьве палавіны. Тое, што засталося ў першай, ужо пражытай – і вясёлыя калядаваньні, і юрлівыя шаленствы купальскай начы, і таямніча-страшныя ахвярапрынашэньні ў капішчах паганскіх багоў, і яшчэ многае іншае, чым жыў і што здавалася звыклым і прыемным, – усё гэта адышло кудысьці ў незваротнае. Прыйшло іншае, уладна захапіла душу і не адпускала. Сталася ўсё гэта ў час падарожжа ў Цар-горад, дзе сустрэлі і пранізалі душу хлопца-язычніка вочы мазаічнага Хрыста на сьцяне велічнага храма сьвятой Сафіі. Былі ў гэтых вачах тужлівасьць, але адначасна і непарушны спакой, і спагада, і разуменьне… Было тое, чаго не давалі навукі ва ўнiверсітэце, на што не маглі знайсьці адказу жрацы ў капішчах, хаця яны ведалі хаду зорак і прадказвалі зацьменьні і мор.

Ён памятаў кожны свой крок у агромністым, ці не да нябёсаў, храме сьвятой Сафіі, дзе ў гулкай пустэчы рэхам адгукаліся самыя ціхія рухі. І тое імгненьне, калі спыніўся ля зеленаватай калоны з парфіру, падобнай на высачэзны дуб у сьвятой дуброве за замкам Гедзіміна. Якраз каля яе архірэй Нікас распавядаў бацьку пра спляценьне пальцаў на руках у сьвятых, мазаічныя выявы якіх глядзелі на наведвальнікаў. Гэтыя спляценьні правераныя стагоддзямі, яны кіруюць боскае сьвятло ў тыя ці іншыя чалавечыя органы, дапамагаюць пры розных хваробах і называюцца мудрамі. Круглец жа любаваўся на мазаічныя фрэскі, дзе залацістая смальта нібы сьвяцілася ў паўцемры храма. Раптоўна вочы яго, якія да гэтага

няўцямна сьлізганулі па фрэсцы, зноў сустрэліся з жывымі, пранізьлівымі і разам з тым спакойнымі вачыма Хрыста.

Ён застыў, нібы ў яго адняліся ногі. Разам з тым адчуў, што ўсю ягоную істоту напаўняе нейкае новае для яго пачуцьцё — магутнае, як марская хваля, з тых, што нядаўна узносілі і кідалі іхні карабель на Понцкім* моры. І гэтае пачуцьцё было любоўю.

Круглец любіў маці і бацьку. Ён любіў гульбішчы, калі жанілі Цярэшку ці гукалі вясну і калі можна было прыціскацца да пругкай і гнуткай, як маладая вярбіна, дзеўкі. Усё роўна, хто была яна – дачка баярына ці прыдворнага блазна, ці – аднойчы – нават дачка вялікага князя. Ён любіў сустракаць узыходы сонца, калі пасьля бяссоннай ночы, праведзенай у княскім скрыпторыі над кнігай, з вышыні замкавай гары добра было глядзець, як павольна, велічна ўстае з-за сіняватай, пасыпанай ружовым попелам хмары залаты бог сонца Сур'я*. Любіў блінцы, посную драчону на макавым малацы, флячкі – рубцы з падліўкай… І пергамены, на якіх пісцы золатам і цынобраю* выводзілі літары. Зьведаў ён хвіліны найвялікшай радасьці, калі браўся чытаць вяроўчатае пісьмо, якое памяталі ўжо нямногія жрацы… Любіў таксама свае варцобы з рога тура, залатую чашу для пітва. І многае іншае, чым шчодра надзялілі яго багі.

Але ніколі, ніколі не абыймала яго душу такая гарачая пяшчота да навакольнага, ніколі ня поўнілася ягонае сэрца такой спагадай… У гэтую хвіліну, што, здавалася, доўжылася вечна, ён узгадаў свайго старога служку Вусеня, якога штурхануў штосілы, калі той падаваў брэцьяніцу з мядовым пітвом і незнарок праліў трохі вільгаці на яго расшытыя золатам нагавіцы. Тады Вусень, адляцеўшы да сьцяны і ўдарыўшыся ў яе так, што заняло дых, ссунуўся на падлогу і сьмешна лыпаў вачыма, стараючыся хапануць паветра, а яны, маладыя, весела рагаталі з яго сьсінелага маршчыністага твару і каравых рук, якія варушыліся, як клешні ў злоўленага рака. Успомнілася Кругляцу і тое, як, палюючы на мядзьведзя, злавілі яны, маладыя баяры, у князевых уладаньнях сьмерда, што ўпаляваў зайца, і як, атачыўшы яго, штурхалі коньмі на сярэдзіну кола, а ён, утоптваючы сьнег каленьмі, дзе на пералатаных портах адразу ж зацьмянелі вільготныя кругі, маліў аб дараваньні. Ды не дапрасіўся – яны, гікаючы, урэшце затапталі яго і, не сышоўшы з коней, паімчаліся прэч, гнеўныя, але задаволеныя… І яшчэ, і яшчэ…

Пры тым ўспаміне сэрца моцным штуршком ударыла ў грудзі. Стала так цяжка, быццам усе ягоныя правіны абярнуліся жалезьзем і пацягнулі некуды ў бездань, як няшчаснага, што ў латах трапіў пад лёд.

– Што з табою, сыне?

Толькі тады Круглец заўважыў, што і бацька, і архірэй Нікас пільна глядзяць на яго.

– Ты зьбялеў. Табе блага?

Цяжка прамаўляючы словы, ён азваўся:

– Штосьці ў грудзях… Даўка…

Архірэй узяў ягоныя рукі, склаў вялікі і ўказальны пальцы*. Сьціснуў іх. Ад гэтага служкі хрысьціянскага бога пахла духмянымі зёлкамі, ягоная простая чорная вопратка, аздобленая толькі залатым медальёнам на тоўстым ланцужку, здалася Кругляцу сьветлай. І хлопец абвострана, амаль празорліва адчуў у гэтым высокім, худым, з пранізьлівымі чорнымі вачыма грэку часьцінку тае магутнай, спагадлівай, усёдаравальнай сілы

любові, якой так неспадзявана напоўнілі яго душу багі. Багі? Не, тут іх няма – ні Перуна з яго залатой барадой і сярэбранымі вусамі, ні Вялеса з нагамі, запырсканымі крывёю ахвяр, ні ўладаркі мораку і сьмерці Мары… Тут ёсьць толькі адзін бог, загадкавы Хрыстос, які спалучае ў сабе ажно тры сілы, тры іпастасі. Але яму, Кругляцу, у гэтым ніяк не разабрацца. Гэта занадта складана і… і ўвогуле яму непатрэбна.

Нешта ў ім запярэчыла ўсяму, што адбывалася тут – і храму, і выявам сьвятых, і самому архірэю...

Ён жыве сярод свайго, звыклага, знаёмага, і нашто яму мучыцца загадкамі – чаму людзі пакланяюцца мёртваму богу, богу, які настолькі бездапаможны, што ня мог нават сам абараніць сябе? Дзе была ягоная сіла, якой ён мог страсануць сьвет і паказаць усім сваю магутнасьць? А калі не паказаў – значыць, ён слабы. У сьвеце ж шануюць толькі сілу. Слабы проста ня выжыве. Ды і што такое слабы чалавек? Ягонае месца – за сьпінамі моцных, ягонае слова нічога ня вартае…

З тым помсьліва-зласьлівым пачуцьцём выскачыў, як вырваўся з храма сьвятой Сафіі.

Але не сыходзіў з сэрца ўспамін пра імгненьне, калі шкадаваў усіх – слабых жа асабліва. Ці такі ўжо вінаваты быў той сьмерд, якому трэба было карміць сям’ю? Ці справядліва гэта – плаціць жыцьцём за ўпалёванага зайца бацьку шасьцёх дзяцей?

Ноччу ж доўга думаў пра ўсё, што адбылося ў храме. Калі прыняць Хрыста, трэба мяняць жыцьцё. Але навошта, калі яму так добра?

Яснасьць сьвету, яго непарушнасьць вярнуліся да яго. Але, як стрэмка, засталося і тое, што перажыў ён перад вялікай мазаічнай іконай, што асьвятляла паўцёмны храм залатым зьзяньнем.

Яно жыло ў ім і тады, калі вярталіся яны з Царскага, севастам* Канстанцінам пабудаванага горада, уволю падзівіўшыся на вялізныя мармуровыя палацы імператарскай сям’і, дзе іх прымаў намесьнік прэфекта гэтага велічнага, сапраўды царскага горада, і на іпадром, дзе здаля бачылі яны самога імператара, абкружанага еўнухамі, і на вуліцы, дзе спрэс стаялі пяці-, а то і шасьціпавярховыя мураванкі, і на многае іншае, што, нават расказанае, уражвала сяброў Кругляца. Ніхто з іх, аднак, ня мог здагадацца, што іхні сябар іншым вярнуўся з таго далёкага падарожжа і што бацька яго там ахрысьціўся. Лесь узяў з сына слова, што той захавае ўсё, што там адбылося, у глыбокай таямніцы. І сын імкнуўся жыць, як і ўсе іншыя, ня надта вытыркаючыся з купы маладых бесклапотных пахолкаў, але і не адстаючы ад іх. Стараўся схаваць і сваё найвялікшае захапленьне навукамі – вясёлыя прыдворныя і так часам кпілі з яго частых прыходаў у Горні замак. Некаторыя меркавалі, што Круглец стараецца быць бліжэй да двара вялікага князя, і зайздросьцілі прывілеям маладога баярына.

Вой-дружыньнік, Круглец карыстаўся яшчэ бацькавым правам – свабодна заходзіць у замкавы скрыпторый, альбо, як часьцей называлі яе, бібліятэку. Пасьля сьмерці пасла права гэтае сын пацьвердзіў у вялікага князя Яўнута, а пасьля і ў Альгерда. І гэта сталася для яго сапраўдным шчасьцем. Можна было колькі хочаш сядзець у вялікай зале палаца, заставленай паліцамі з вялікімі, у цёмных скураных пераплётах кнігамі і рознымі – крохкімі і зшарэлымі, новымі і старымі – скруткамі пергамену. Некаторыя, асабліва важныя, захоўваліся ў футаралах, часам аздобленыя

каштоўнымі камянямі, – каменьчыкі выблісквалі сінім, жоўтым і зялёным у ранішнім ці вечаровым сьвятле... Тут былі копіі, зробленыя з найважнейшых дзяржаўных актаў і пасланьняў, што прывозілі вялікім князям паслы з усяго сьвету.

Раней хлопец прагна чытаў менавіта тое, што тычыла дыпламатыі, стараўся, сьледам за бацькам, разабрацца ў хітрасплятцаньнях вялікай палітыкі, калі тут, у Вільні, ня толькі стараюцца разгадаць чужыя намеры, але і схаваць свае інтарэсы за красамоўнымі сказамі і рыторыкай.

Але цяпер яму было гэта нецікава. Цяпер браў ён і чытаў Вялікую Кнігу, перапісаную з той, што ў храме Параскевы Пятніцы ўрачыста і нясьпешна гартаў архірэй храму і духоўнік вялікай княгіні Марыі Нестар, каб нарасьпеў прагаварыць патрэбны абзац і патлумачыць яго нешматлікім яшчэ хрысьціянам Вільні.

У скрыпторыі было некалькі Бібліяў, падораных і Міндоўгу, і Віценю, і Гедзіміну гаспадарамі розных хрысьціянскіх краінаў. Былі гэтыя кнігі на лаціне, на грэцкай і нямецкай мовах. Было некалькі і на старaславянскай, прывезеных цьвярскімі князямі, што шукалі прытулку і дапамогі супраць сваіх маскоўскіх супернікаў ужо ў Альгерда. Гэты былі атуленыя разьбянымі дошкамі або закутыя ў сярэбраныя аклады, альбо проста пераплеценыя цялячай скурай лісты, дзе хавалася Вялікая Мудрасьць.

Круглец чытаў спачатку на нямецкай – яна была найбліжэйшай яму пасьля славянскай: нездарма колькі гадоў штудыяваў навуку ў Нямеччыне, з вясёлымі буршамі вёў дыспуты наконт стварэньня сьвету. Пасьля наняў настаўніка грэцкай мовы – здавалася яму, што так стане ён бліжэй да сьвету, што гэтак уразіў душу ў Візантыі. Грэцкая мова давалася надзвычай лёгка, нібы ўжо ведаў яе спрадвеку, і праз які год павольна, дапамагаючы сабе тэкстамі па-нямецку, чытаў Круглец па-грэцку пасланьне апостала Паўла карынфянам:

“Ніхто не шукай свайго, але кожны п а т р э б ы другога”.

Амаль кожны раз пры чытаньні гэтай дзіўнай, ні да якой іншай не падобнай кнігі, усё ў ім пераварочвалася.

Як жа не шукаць свайго? На гэтым і трымаецца сьвет. Кожны хоча атрымаць як болей слодычы, задавальненьня і радасьці. Калі ўжо і не за кошт бліжніх, дык за кошт сваіх здольнасьцяў, альбо багацьця бацькоў і іхняга высокага становішча. Хіба не багі – тут ён кожны раз папраўляў сам сабе: Бог! – дык вось, хіба ня Бог дае тое, што мае кожны на гэтым сьвеце? Хіба ня супраць Бога ідзеш, калі ня дбаеш аб сваёй карысьці, не чужой, а сваёй уласнай! Чаму ж другому, аб чыёй патрэбе я стану клапаціцца, ня даў Бог таго, што ён даў мне?!

Але нешта падказвала яму ясна і цьвёрда, што сьвет, хаця і стаіць ён сёньня на патрэбе для самога сябе, не павінен быць такім. А калі дапаможаш іншаму – атрымліваеш такую радасьць, якой ня ведаеш, калі зрабіў нешта толькі для сябе. Вось жа толькі адно пацікавіўся ён, як жыве Вусень, і даў яму на лячэньне хворай жонкі сорак шэлегаў*, як сэрцам адчуў гарачую ўдзячнасьць чалавека, якога ён, здаецца, добра ведаў ад самага дзяцінства – але разам з тым ня ведаў пра яго нічога. Ні пра тое, што Вусень мае залатыя рукі і пляце лапці для ўсіх сваіх родзічаў, ні таго, што ў ягоную жонку ўсялілася Трасца* і страшэнна мучыць яе па начах. Калі ж, упаўшы ў ногі, шчыра дзякаваў служка свайму маладому

гаспадару, зноў адчуў Круглец, як ахапіла яго гарачая хваля радасьці... Падымаючы слугу, пабачыў ягоныя вочы. Сустрэліся позіркі – і адкрылася сыну пасла Леся, што і Вусень – такі ж чалавек, як і ён сам.

Дзіўным было для яго тое адкрыцьцё. Як і многія іншыя адкрыцьці, што, нібы згаварыўшыся, апаноўвалі адзін за адным ягоную душу. Ажно да часу, пакуль не пачаў усьведамляць усім сэрцам, што звыклы для яго сьвет, магчыма, інакшы, і іншыя законы пануюць у ім, толькі іх трэба і ўбачыць, і адчуць…

“Не рабі іншаму таго, чаго ня хочаш, каб рабілі табе”…

І ён зноў думаў, у душы перабіраў усё, што назапасіў за нямногія яшчэ гады свайго жыцьця.

Так проста гэта – і так пакуль неспасьціжна! Бо ёсьць слугі і гаспадары, ёсьць багатыя і бедныя. Вусень пакліканы лёсам, каб служыць іхняй сям’і. Яго прадалі некалі дзеду за капу грошай, яшчэ маленькім. Прадалі віленскія сьмерды, каб не памерці з голаду. І цяпер варта Вусеню ўцячы, як яго будуць шукаць імем закону, а зловяць – загадаюць сьцяць горлам*.

А ён, Круглец, недасяжны ні для кога, апрача самога вялікага князя. Ён можа ехаць у Нямеччыну, да грэкаў, і ніхто яму таго не забароніць. Ён можа піхнуць Вусеня, можа, калі надта разгневаецца, забіць слугу. А ці хацеў бы ён, каб яго піхнуў Вусень? Каб раб забараніў яму ехаць у далёкія краіны, як таго хочацца? Калі ўяўляў тое, кроў закіпала і гарачая хваля гневу шугала ў грудзі. Тады хацелася забіць слугу, які, сам таго ня ведаючы, хадзіў перад ім нейкім вечным дакорам жыцьцю, якое вёў Круглец – жыцьцю бесклапотнаму і вольнаму.

“Але жывуць жа іншыя!” – казаў ён сам сабе. “Мае аднагодкі не задумваюцца над тым, што такое іхнія слугі – тыя, што падаюць пітво, чысьцяць коней, мыюць дубовую падлогу ў замку і аруць на палях у сьпёку, калі так добра сядзець у сьвятой дуброве, слухаючы развагі разумных жрацоў! Чаму ж мне, у самую тую хвіліну, калі стомлены слуга, сапучы, здымае боты з маіх ног, хочацца то забіць яго, то, наадварот, упасьці перад ім на калені і абняць яго, як свайго брата? Можа, зазірнуўшы ў вочы яму, я ўбачу, што і ён такі ж самы чалавек, і яму баліць тое, што баліць мне, калі мяне ўдараць. І тая ж чырвоная кроў пальецца на зямлю, калі меч пасячэ ягонае цела… Хто адкажа мне на гэтыя пытаньні, хто дапаможа маёй душы?”

А тым часам ішлі месяц за месяцам, і аднойчы хлопец ня вытрымаў. Зімовай раніцай, калі сьнегам, як пярынай, была ахутаная ўся Вільня так, што толькі чырвона-шэры Горні замак і сьвятая дуброва за ім вытыркаліся з гэтай бяскрайняй белі, ён пайшоў у храм хрысьціянскага Бога.

Страх скоўваў ягоныя рухі. Што калі багі – так любімыя раней – кінуць у адступніка сваімі вогненнымі паліцамі, што, калі разаб’е яго паралюш? Суцяшаў сябе: княгіня Марыя адкрыта пакланяецца Хрысту, ейныя дзеці ўсе хрышчаныя, як і сам вялікі князь Альгерд. Але ж ён мусіў ажаніцца з віцебскай князёўнай, бо гэта дадавала да земляў Княства магутны надзел. Ды нават яе, хрысьціянку, усё роўна тры разы абвялі вакол сьвятога дуба, бо іначай народ не прызнаў бы ейнага шлюбу. Жрацы, хаця і з вялікай неахвотай, згадзіліся на хрысьціянскі абрад, бо ведалі, што князь Альгерд усё ж выхаваны ў язычніцтве, і менавіта ў язычніцкія храмы дае найбольшыя ахвяры. А што ён па вялікіх сьвятах ходзіць у царкву і нават запрашае туды паслоў – дык гэта з цягам часу было таксама прызнанае

жрацамі, бо вакол – сьвет хрысьціянскі, і трэба шукаць паразуменьня і з ім. Тое робіцца дзеля міру ў краіне і дзеля яе карысьці…

Іначай могуць паставіцца багі да яго. Яму, як Альгерду, ня трэба лаўчыць сярод вялікіх хрысьціянскіх кранаў – з каторай сябраваць выгадней. Яму вольна і весела жывецца ў сталіцы, у іхнім доме поўна слугаў і багацьця, сабранага дзедам і бацькам. Круглец, хоць і лічыцца дружыньнікам, аднак пойдзе ў войска са сваёй уласнай харугвай і сотняй вояў толькі калі аб'явяць паспалітае рушэньне на вайну альбо Пагоню*. Частку сабранага скарбу іхняя сям'я штогод ахвяруе на розныя капішчы, і задаволеныя багі даюць ім шчасьце і слодыч жыцьця. Тры сястры, адна за адну прыгажэйшыя, ужо замужам, яны зьехалі за сваімі мужамі ў розныя краіны: Чэхію, Нямеччыну. Польшчу. Чацьвёртую, Уну, здаецца, упадабаў сын маршалка, але Уна на яго не зважае. Ёй даспадобы, мабыць, малады Кумец, памочнік галоўнага лоўчага, іхні далёкі родзіч. На яго самога, варта толькі зьявіцца на княскім баляваньні, употай зіркае не адна зaverблівая нявеста. Чаго яшчэ жадаць?

Навошта ж ён пераступае высокі дубовы парог, ступае на каляровыя кафляныя пліты, дзе ўсе зараз, на момант перашкодзіўшы чытаньню Вялікай Кнігі, павернуцца, каб убачыць неверагоднае: воін-дружыньнік Круглец, сын пасла Леся, заходзіць у хрысьціянскі храм?

## *НЕСТАР*

У маленькім, цёмнакарычневым пакойчыку пры новым віленскім храме Параскевы Пятніцы было душна. Пахла зёлкамі і ладанам. Вялікая княгіня Марыя цяжка сядзела на нізкім дубовым крэсьле, што стаяла ля сьцяны, пад выявай сьвятой Параскевы. Новая разьба на ім нібы ўгрызалася ёй у сьпіну, ногі, трохі апухлыя падчас службы, цяпер невыносна балелі, нібы тонкія юхтавыя боцікі ссохліся і сталі зацеснымі. Пакаёўка Рэчыца, сеўшы на невысокі зэдлік, церла тонкую чырвоную скуру абутку, намагаючыся аблегчыць пакуты сваёй гаспадыні. Стражнік Дрыгайла чакаў у калідоры, задуменна разглядаючы маляваныя дошкі з невядомымі яму тварамі зацных людзей і хрысьціянскага бога, і раздумваў над тым, што яны зусім нястрашныя, а значыць, няма ў іх сапраўднай моцы. Ці ж параўнаць іх з Перуном альбо Вялесам – вялізныя, яны ўзвышаюцца над усімі, і нават высокі князь Альгерд здаецца перад імі маленькім карузлікам!

Архіерэй Нестар, высокі, ужо сутулы, з сівой барадой і пранізьлівымі шэрымі вачыма, прайшоў у пакой, вялікая княгіня, седзячы, схілілася перад ім. Пацалавала руку. Коратка загадала Рэчыцы:

– Выйдзі.

З-за нямогласьці княгіні быў дадзены дазвол не ўставаць перад духоўнікам, але яна кожны раз падчас споведзі адчувала няёмкасьць. Як расказаць пра тое, што найбольш мучыла – схаваную ад усіх трывогу за лёс мужа і дзяцей? Вядома, Альгерд любіць іх. Але ж і вялікі князь Гедзімін, яе магутны свёкар, таксама любіў дзяцей і ад Віды, і ад Вольгі. А вялікакняскі сталец пакінуў малодшаму, якога хітрая Еўна, яго апошняя жонка, дачка полацкага Івана Усеваладавіча, назвала сваім імем – Яўнут – і якога заўсёды пры розных нагодах падсоўвала старому ўжо бацьку, адцясьняючы іншых сыноў! І вось – у княстве звады, неспакой, выгнаны

Яўнут бадзяецца па сьвеце, шукае падтрымку то ў немцаў, то ў маскавітаў. Што, калі яна неўзабаве памрэ? Альгерд, відавочна, ажэніцца зноў. Ён яшчэ поўны сілаў і жадны да ўцехаў жыцьця. Але калі будуць яшчэ дзеці, то што станецца з ейнымі сынамі?!

Нават зараз, хаця шмат гадоў яна пражыла ў Вільні нявесткаю Гедзіміна, а цяпер ужо пяць гадоў і вялікаю княгіняй, адчувае яна, якая моцная сіла, як раць, стаіць супраць яе і мужа. Гэта перш за ўсё староньнікі язычніка Кейстута: жрацы, вешчыя старцы, сваяк Гедзіміна апантаны прыхільнік Рагуціса Ерыдоне і ўся іхняя язычніцкая купа. А яшчэ ўдава Гедзіміна княгіня Еўна, амаль ейная равесьніца і былая вялікая княгіня, і яе дзеці, самы страшны з якіх – Яўнут. Бо якраз ён законны спадкаемца на вялікім стальцы! Альгерд і Кейстут перамаглі яго, але ж Еўна да самай сваёй сьмерці не прымірыцца з гэтым!

Небясьпечная яшчэ і іншая групоўка. Яе ачольвае ваявода Пётра Гаштольд, які спавядае хрысьціянства заходняга абраду і схіляе да таго гаспадара Княства. Ня варта верыць і Кейстуту, ягонай шляхетнасьці. Тут, у Вільні, моцныя карані жамойцкага князя. Яго, якога шалёны шал вайны нясе заўсёды да перамогі, любяць болей, чым разумнага, але стрыманага і халаднаватага Альгерда. Не было б за мужам ейнага пасагу – віцебскіх харугваў, ня ўзносіла б яна разам з нешматлікімі хрысьціянамі штодзённых гарачых малітваў за яго – невядома, ці стаў бы ён вялікім князем. А іншыя браты Альгерда – яны што, зьмірыліся з ягонай перамогай?

Яна не захацела ўзгадваць далей свае трывогі, і духоўнік Нестар стаў супакойваць вялікую княгіню, хаця ў яго самога было турботна на душы. Хаця Марыя была яшчэ зусім не старая – усяго васемнаццаць гадоў, як пабралалася з Альгердам, – але твар яе пайшоў дробнымі маршчынкамі, вялікія вочы нібыта паменелі на трохі азызлым твары, скура стала нібы мяккая вільготная гліна. Мучылі вялікая слабасьць, бяссоньніца і боль у грудзях. Доктар-іншаземец Ганс ня мог справіцца з хваробай, а люд шаптаўся, што гэта помсьцяць Марыі багі, якіх яна пакрыўдзіла, асабліва ж Рагуціс і Медзін*.

Нестар з болем адчуваў – неўзабаве давядзецца несьці на сабе ўвесь цяжар праўдзівай веры тут, у Вільні, аднаму, бо Гаспадар рана прыбярэ вялікую княгіню, ня жыць ёй доўга. Апроч яе, саюзьнікаў тут няма – людзі, што ходзяць у царкву, ня маюць пры двары вялікага ўплыву. З Навагародку, дзе больш за чвэртку веку заснаваная метраполія*, дапамога таксама ідзе невялікая, бо там думаюць, што яму, Нестару, пад крылом вялікага князя жывецца лягчэй, чым ім. Але ў Навагародку хрысьціян здаўна болей, чым у язычніцкай Вільні, жрацы там ня маюць значнага ўплыву. У тамтэйшым храме вернікаў прываблівае Замкавая ікона Багародзіцы, якая яшчэ сто гадоў таму ў цудадзейным сьне князя Войшалка натхніла яго на прыняцьце манаскага сану.

У Вільні ж усё трэба пачынаць самому. Япіскап Вільні няроўны са жрацамі, хаця і бліжэйшы да вялікакняскага стальца, чым яны. У яго ўсяго толькі нядаўна пабудаваны храм – а да іхніх капішчаў дарога пракаветная, пракладзеная прадзедамі і дзядамі, багацьці, сабраныя таксама не за адно пакаленьне...

Але пра гэта трэба думаць не цяпер. Зараз трэба ўважліва слухаць вялікую княгіню...

Расказаўшы пра свае трывогі, княгіня хацела ўжо прасіць дараваньня грахоў, але раптоўна ўзгадала:

– Пазаўчора, калі я пайшла ў скрыпторый, каб узяць там запісы аб шлюбных дамовах вялікіх князёў, да мяне падышоў Круглец, сын Леся.

– Ён часам прыходзіць у наш храм, – асьцярожна заўважыў Нестар.

– Мне цяжка запамінаць твары маладых, яны для мяне ўсе на адзін капыл. Але гэтага хлопца я добра ведаю, бо надта падобны да бацькі, – нецярпліва прамовіла Марыя. – Ён хоча пахрысьціць сваю сястру і папрасіў мяне быць ейнай хроснай маці.

– Гэта вялікая радасьць, – ажывіўся Нестар. – Яго любіць моладзь, ён разумны і рахманы. Але чаму не зьвярнуўся адразу да мяне?

– Ты для яго чужы. А мяне ён памятае яшчэ з дзяцінства. Здаецца, я яго нават трымала на руках, але зараз ужо і ня ўспомню, ці ён гэта быў. І зараз бачу яго рэдка. На баляваньні ў замак ён не сьпяшаецца, яго там я ня бачу. А на дружынныя трызны не прыходжу я.

– Дык ці зробіць ласку вялікая княгіня і ці стане хроснай маці для гэтай божай авечкі?

Марыя згодна кіўнула. У апошнія гады, калі Альгерд стаў вялікім князем у выніку змовы з Кейстутам, яна нездарма пачувала сябе тут, у даўно знаёмай Вільні, адзінокай. Колішні двор Гедзіміна, хаця і спрэс язычніцкі, абкружаў жонку княжыча пашанай: яна прынесла ў пасаг багатую Віцьбескую зямлю. Аднак пасьля таго, як памёр Гедзімін, усё памянялася. Былых прыхільнікаў засталося няшмат, а колішнія маўкліва асуджалі княгіню, бо ўважалі ўзвышэньне Альгерда за надкуртачаньне, ашуканства. Выгнаньне Яўнута і гвалтоўны захоп Вільні Альгердам і Кейстутам мучылі Марыю. Ёй усё здавалася, што, парушаючы запавет бацькі-нябожчыка, браты моцна саграшылі.

Адзінокім пачуваў сябе і Нестар. Часам, праходзячы па Вільні, чуў ён злавесны шэпт за сьпіной. Ня раз здавалася яму, што, каб ня страх перад Альгердам і не апека вялікай княгіні, язычнікі разьдзерлі б яго на кавалкі і без усялякай літасьці выкінулі сабакам.

Ён з трывогай паглядзеў на азызлы твар вялікай княгіні і, як клапатлівы бацька, беражліва накінуў на ейныя плечы цёплую вязаную хустку.

Рэчыца, стоячы ў калідоры разам са стражнікам, спакойна глядзела на дзьверы. Радасна думалася пра жаніха – надзейнага, дужага Няжылу, пра вясельле і будучых дзяцей. Але калі б зараз глянуў на яе самы вядомы ў Вільні празарліўца, вялікі жрэц Сварога Лойка, то са спачуваньнем пагладзіў бы яе па галаве і пашкадаваў бы. Ён бы ўгледзеў, што ля левага пляча дзяўчыны стаяла Нядоля, адштурхнуўшы сваю сястру, багіню шчасьця Долю, і ўсьміхалася зласьліва, таму што нічога з гэтых мараў не адбудзецца ў жыцьці высокай, белатварай, мажнай дзяўчыны, якая пяшчотна падносіць да вуснаў маленькую драўляную Мокаш, цалуючы багіню жытла і прадзіва з надзеяй хаця б на кавалачак шчасьця…

## *САРАКІ*

Круглы каменны храм багіні каханьня Лады, што стаяў на левым беразе Вяльлі, недалёка ад Горняга замку, ледзь сьвяціўся ў зімовай цемрадзі слабымі жоўтымі абрысамі вокнаў – сьвятло тачылася зьнізу. Каля дзьвярэй,

якія былі зачыненыя, валуны сьценаў з роўнымі палоскамі вапны слаба адлівалі вільгацьцю ў сьвятле адзінокага смаляка, схаванага пад гонтай.

Удзень тут тупацеў, усхвалявана-пажадліва дыхаў і скакаў у карагодах велізарны натоўп віленчукоў, сьвяткуючы Саракі. Карычнявата-шэрыя шматы ад Сьнегавіка, якога таптталі з прыгаворамі і замовамі, а таксама груды аскабалкаў ад старых глякаў, збаноў і брэцьяніц, з якімі прадвесьнікі Вясны ішлі да багіні, доўга, да самага вечара, прыбіралі храмавыя служкі.

Кожны мог бы падумаць, што сьвята скончылася: бяззорная, туманова-сьнежная як кучма ноч панавала над Вяльлёй, над ракой, што нячутна шумела ўнізе. Але ў сярэдзіне храмавай агароджы стаялі багатыя вазкі, з недалёкай канюшні чулася іржаньне коней, а з дзьвярэй, якія вялі ў лёхі і якія раз-пораз адчыняліся перад гасьцямі, вырывалася такое зыркае, гарачае і яркае сьвятло, што кожны, хто назіраў бы зараз за храмам, даўмеўся б: сьвяткаваньне толькі пачынаецца.

Сьвята вiравала, захопліваючы ўсё больш і больш мужчынаў і дзяўчат, якія сабраліся ў падземнай залі. Тут, нягледзячы на ледзяныя гурбы вакол храма і сьцюдзёны вецер, што гудзеў у шчылінах агароджы наверсе, цёпла, амаль горача. Нягледзячы на тое, што вясна яшчэ не пачалася, шмат жывых кветак у цёмна-брунатных лазовых кошыках, прымацаваных на гладка abструганыя сьцены з тоўстага брусу, аздаблялі залу. Там жа віселі скураныя шчыты з сярэбранымі насечкамі (іх прыносілі Ладзе ашчасьліўленыя каханьнем воіны). Аздаблялі памяшканьне бронзавы і медны посуд на вялікіх ланцугах, курыльніцы з празрыстага сьветлага каменю, якія струменілі востра-казытлівыя колцы пахкага дыму, вянкі, выкаваныя з рэдкім майстэрствам ды многае іншае, што прымушала прысутных з захапленьнем углядацца ў рэчы, падораныя самаму, бадай што, улюбёнаму храму віленчукоў. І гэта нягледзячы на тое, што большасьць з прысутных былі пастаяннымі ўдзельнікамі абрадаў.

Кумец таксама быў тут. Як заўсёды, вясёлы, жыцьцярадасны, сёньня ён, аднак, адчуваў пэўную разгубленасьць. Вялікая жрыца Нара раніцай адмыслова паслала да яго служку, якая перадала яму чорную, з пярлінамі скрыначку.

Кожны юнак у Вільні марыў атрымаць гэты знак увагі. Пахкасьці, што месьціліся там у залачоных шкляных сасудах, былі прывезеныя з усходніх храмаў, і купіць іх нельга было ні за якія шэлегі. Уцёртыя ў скуру, яны рабілі мужчыну няўрымсьлівым ў каханьні, нястомным і моцным, як разьюшаны тур. І тады ён мог дастойна прымаць чароўныя ласкі вялікай жрыцы, вынослівай і вынаходлівай у каханьні, як ніводная жанчына ў Вільні. Кожны год яна прысылала чорную скрыначку з пярлінамі мужчыне, якога лічыла вартым сябе. І тыя, хто праводзіў з ёю ноч на Саракі, маўчалі так красамоўна, што іншым заставалася толькі ўяўляць, якою былі ночы з тою, якую любіла сама Вясна.

Але Кумец ня стаў націраццa ніводным з чараўнічых алеяў. Уна, сястра далёкага родзіча Кругляца, стала перад вачыма, калі ён працягнуў руку да скрыначкі. І невядома было, чаму паўстала ў ягонай памяці і сэрцы менавіта гэтая худзенькая дзяўчынка з вялікай тоўстай касой, з трохі сумнымі, нібыта ў параненай аленіхі, поглядам. Але насланьнё было

такім моцным, што яму здалося – яна сапраўды прыйшла і бачыць ўсе тыя бессаромныя карціны, якія звабліва было закалыхаліся перад ім...

І цяпер, стоячы ў патаемным сьвяцілішчы, даступным толькі для абраных, ён адчуваў, што яму, мабыць, ня варта было наагул прыходзіць сюды.

Пасярэдзіне залі грувасьціўся памост, пакрыты белым шоўкам, – тонкая, амаль празрыстая тканіна каштавала столькі, што на яе можна было купіць ня меней як трыццаць рабоў. Над узвышшам, не абапіраючыся ні на якія падпоры, нібыта ў паветры, вісела драўляная, цёмная ад часу постаць багіні Лады, альбо, як тут часьцей яе называлі, Лялі. Жаночы сілуэт з тонкім станам і высокімі грудзьмі, з залатым вянком на пышных, раскіданых на плячах кудзерках, сінія лазурыты вачэй, умела падсьветленых сьвятлом каганца, пунсовыя вусны, выразаныя з вялікага рубіна, што пажадліва-капрызна ірдзеў на твары, імклівае загібаньне сукні, нібыта багіня бегла кудысьці, – усё гэта неўпрыкмет заварожвала і настройвала на лад дрыготліва-чакальны, неспакойны, як заімглёная будучым дажджом далеч.

Ад хмельнага напою, які ў сярэбраных чашах разносілі прыслужніцы, пачыналі кружыцца галовы нават у самых моцных. А іх, зацных – славутых – людзей стольнага гораду, было тут роўна сорак. Толькі пяцёра, самых немаладых, прыйшлі з жонкамі, якія таксама хацелі бачыць абрад. Астатнія імкнуліся ў храм не па відовішча, а па тое, што давала ва ўсёй Вільні толькі яна адна – багіня Вясны і Каханьня.

Змоўклі размовы. Напружанае чаканьне тонка і настойліва прарэзала жалейка. Яна павяла сваю мелодыю, і тады разам згасла амаль палова сьвяцільнікаў, а драўляная багіня нібыта растаяла на вачах, пакінуўшы за сабой вогненны віхор, які нібыта вырваўся з апраметнай. У вочы прысутным як ударыла – і асьляпіла. Калі ж яны ачомаліся, на памосьце ўжо стаяла жывая, рухлівая і асьляпляльна-вабная жанчына.

– Нара! Нара! Вялікая жрыца! – пранеслася па зале.

Яе моцная постаць з пукатым жыватом і вялікімі грудзьмі, што бессаромна тырчэлі ў бакі, была прыкрытая адно празрыстай адзежынай, схопленай на плячах вялікімі залатымі фібуламі. На бялявых, струменліва-пераліўных валасах быў такі ж залаты вянок, што і на выяве багіні Каханьня. Доўгія мускулістыя ногі цьвёрда стаялі на невысокім сярэбраным трохножніку, які таксама невядома як і адкуль паўстаў на белым шаўковым покрыве.

Яна падняла руку – і ціхае шаргаценьне прайшло па залі: вакол яе на меншых, але таксама сярэбраных трохножніках узьняліся і ціха закачаліся, як чорныя водарасьці, чатыры вялікія, амаль у ейны рост, зьмяі. Нехта баязьліва войкнуў. Жанчына ўсьміхнулася, колькі хвілінаў пагайдалася ў такт музыкі і зьмяіных выкрутасаў, пасьля шчоўкнула пальцамі. Служкі, апранутыя ў пругкія бліскучыя апранахі накштал латаў, што аберагалі іх ад сьмяротных укусаў, адначасна вылезьлі з-пад памосту і працягнулі да зьмеяў драўляныя рыдлёўкі з доўгімі чаранкамі. На кожнай курчылася спалоханае трусяня, якое, аднак, чамусьці не спрабавала ўратавацца. Зьмеі, адна за адной, злосна і коратка дзюбнулі свае ахвяры – і трусяняты забіліся ў сутаргах. Іх, ужо ў апошніх канвульсіях, тут жа вынесьлі з залі. І зноў коратка, як па камандзе, таргануліся прысутныя – раптоўная гібель маленькіх кволых істотаў як падхліснула нешта ўнутры кожнага, як ад-

чыніла нейкія заслоны, што стрымлівалі і аберагалі ў чалавеку чалавечае. Яны нібы адразу адчулі сябе іншымі – першабытны страх сьмерці адначасна з пажадлівасьцю да ўцехаў і асалоды ахапілі пякучымі абцугамі ўсіх – старых і маладых.

Тады пачаўся Вялікі Танец. Жанчына выгіналася, круціла клубамі, і зьмеі пакорліва, як зачараваныя, паўтаралі ейныя рухі. Жалейка паскарала рытм, у яе голас упляліся дуда і барабан, гукі нібы загусьцелі, апускаючыся ніжэй і ніжэй…

Кумец адчуў, што ягоныя клубы стала паступова, але няўхільна зводзіць салодкай сутаргай. У сутарзе былі свае перапады: яна то азывалася, то нібыта зьнікала. Ён неўпрыкмет глянуў навокал – ужо ўсе, і мужчыны, і нешматлікія жанчыны, былі ва ўладзе рытму. Адкрытую, нястрымную юрлівасьць, жаданьне чужой плоці і лютасьць выпраменьвалі іхнія вочы. Нават немаладыя сямейнікі не маглі стрымацца – рукі іх сутаргава шукалі нечага, твары непазнавальна пакрывіліся...

І тады ў залю ўвайшлі, як пратачыліся скрозь сьцены, жанчыны. Не, гэта ўсё былі маладыя дзяўчаты – у вянках з танюткімі срэбнымі і меднымі лісточкамі, у тых жа празрыстых покрывах, якія не хавалі ані грудзей, ані чорных, русых альбо бялявых валасяных трохкутнікаў паміж роўненькіх, нясьцерпна-заваблівых ног...

Першым ня вытрымаў, кінуўся да высокай бялявай жрыцы баярын Хведар. Яна імгненна, нібы чакала таго, прытулілася да яго ўсім целам, а пасьля сьлізганула ўбок, да дзьвярэй, і яны абое, ледзь ня выбіўшы дзьверы, вываліліся з залы. Тады і астатнія сталі хапаць дзяўчат, мацаць іх гарачымі, дрыготкімі рукамі, тузаць за грудзі і цягнуць з залі.

Чашнік Ярамір схапіў чарнявую, з раскосымі, хітрымі вачыма дзеўку і павалок яе за сабою на шаўковую тканіну, адной рукой учапіўшыся ў тонкі стан, а другой разьвязваючы порткі. За ім пасьпяшалася другая, трэцяя пара… І тады ў зале ўсчалося тое, дзеля чаго і прыходзілі сюды зацныя мужы Вільні – храбусьценьне чалавечых костак, віскат жанчын, утробныя рыкі разьятраных, распатланых істотаў, што яшчэ раніцай важна сядзелі на радзе, прымалі дзяржаўныя рашэньні, судзілі іншых… Зараз яны спляталіся ў скурчаныя, шматрукія і шматногія клубы, рагаталі і тузаліся. Аднекуль, нібы падкінутыя зьверху, там і тут зьявіліся мяккія атласныя падушкі, іх хапалі, як падарункі.

Рэзка абарвалася мелодыя. Некуды зьніклі зьмеі. Жанчына на памосьце працягнула рукі да Кумца, і ён міжволі зрабіў крок наперад.

Ён ня першы раз бываў у храме багіні Каханьня. Пажадлівасьць, якая магутнай хваляй абдала яго і напачатку затуманіла галаў, таксама была паспытанай не аднойчы. Ды і хто з прысутных ня даў бы ўцягнуць сябе ў ашаламляльны вір уцех, якія напоўніцу можна было адчуць толькі тут, са жрыцамі Лялі-Лады?

Але зноў як паўстала перад ім дзяўчынка з тоўстай касой – чыстая, юная, недасягальная Уна. А праз яе, як прабіўшыся скрозь віраваньне пажадлівага натоўпу, зусім нечаканым глянулі яму ў душу і вочы Векшы, што нядаўна ў перадсьмяротным забыцьці нібыта ўвайшла ў яго са сваёй усьмешкай, поўнай невыказнага жалю і спазнаньня роднаснасьці абоіх. Векшы, якая глядзела з нейкае далечыні, куды яна ўжо зазірнула і таму нібыта шкадавала – усіх: яго, сябе, людзей, што зьбіраліся забіваць яе.

Чаму ў ейных вачах быў жаль? Чаму яна, якой заставалася жыць некалькі імгненьняў, шкадавала яго, які заставаўся тут, у гэтым, такім прываблівым, поўным уцехаў сьвеце?!

Ён адступіў. Вочы яго і Нары сустрэліся. Яна спачатку не зразумела, што адбылося, але ўсьмешка сышла з ейнага твару, яна павярнула галаву ўбок і падала знак адной са сваіх служак.

Кумец адступаў назад, спатыкаючыся. Адхіліў рукі ружова-белай, з сунічнымі саскамі і вогненна-гарачым лонам жрыцы, што хацела падвесьці яго да Нары, і пасьпяшаўся, паскараючы крокі, прэч, да бакавых дзьвярэй, далей ад вялікай жрыцы, якая застыла – як ужаленая адной са сваіх зьмеяў.

А дзяўчына-служка трушком пасьпяшалася за ім, і яе спрытныя рукі агладжвалі яго цела, а бессаромныя словы зьляталі з вуснаў…

Ён пабег.

Пабег, як спалоханы хлопчык, пакінуўшы цёплую, з водарам кветак і вострых пахкасьцяў залю, міма вазкоў, ужо забеленых рэдзенькім сьняжком, які віўся ў паветры, у браму, дзе на яго насьцярожана і неадабральна зірнуў вартавы.

Кумец не заўважаў холаду і таго, што ягонае бабровае футра засталося ў храме Лады, што сьнег пабяліў і ягоную галаву. Стаміўшыся ад бегу, ён, задыхаўшыся, перайшоў раку і пашыбаваў сам ня ведаючы куды. Прамінуў Дольні замак, прамінуў сьвяцілішча з вечным агнём Перуна і даліну Сьвятарога, дзе над магіламі былых вешчуноў стаяць засьнежаныя дубы. Ён сьпяшаўся, нібыта за ім гналіся, і няўцямна паднімаўся ўверх, да сьвяшчэннага Перуновага гаю.

Раптам ногі яго спыніліся. Ён быў перад брамай, вароты якой былі адчыненыя. Роўныя, ціхія сьпевы плылі з дзьвярэй, і яго як панесла да іх – да мелодыі, якая супакойвала ўскаламучаную душу і прыцягвала сэрца.

Цяжкія, каваныя жалезам дзьверы адчыніліся на дзіва лёгка і нават нібыта радасна, быццам чакалі яго даўно. Сіняваты дым ад сьвечак расплываўся ў паветры, Нестар у жоўтай парчовай рызе, са срэбным кадзілам у руцэ стаяў пасярэдзіне і ахутваў духмяным дымам людзей, якіх было недзе пад дзесяць і якія азірнуліся, каб паглядзець, хто яшчэ адважыўся далучыцца да Усяночнай службы ў вялікую ноч веснавога раўнадзенства.

Кумец, зусім нечакана для самога сябе, апынуўся ў хрысьціянскім храме Параскевы Пятніцы, і густы сьнег з яго галавы, растаючы, сьцякаў на лоб і плечы, на скураны каптан з нашытымі срэбнымі грыўнамі.

## *НЯЖЫЛА*

Драўляная тарэла была поўная смажанага разам з цыбуляй мяса. Яна стаяла на вышытым абрусе, тоўстыя, крываватыя лусты хлеба горкай ляжалі побач. Яшчэ далей перад Няжылам вольна месьціліся на доўгім стале місы з мочаным гарохам і бобам, варанай капустай і грыбной поліўкай. За імі, па другі край стала, на дубовай лаве сядзелі Баравік і Зайка. Рэчыца, іхняя дачка, месьцілася збоку. Усе трое з любасьцю пазіралі на хлопца, але шэра-блакітныя з зялёным адценьнем вочы нявесты поўніліся асабліва адкрытай і гарачай пяшчотай.

– Гай выражу, а жытло пабудую такое, каб уся Вільня дзівілася! – са смакам чэрпаючы драўлянай ложкай гарох, хваліўся Няжыла. – Найму

майстроў, можа, іншаземных, каб кожную дошку абгаблявалі як во ейную далоньку! А ў яе далонькі – што табе ў вялікіх князёўнаў – мя-я-а-к-кія!

Рэчыца млела ад шчасьця. Няжыла пазіраў на яе з задавальненьнем. Яе, вядома, не параўнаць з князёўнамі, далонькі ў іх сапраўды як аксамітавыя, бо, ведама, нічога ня робяць. Але ж і яна ня зломак які. Навышывала ручнікоў як ніводная нявеста на іхняй вуліцы. Каго толькі яна там не зьмясьціла – і Рода з парадзіхамі, і Мокаш, і Перуна, і Вялеса. Вышывала – шаптала замовы, прынаджвала шчасьце.

– Дык і наш дом ня цесны, – басіў Баравік. Тоўсты і нізенькі, ён, аднак, быў адважным як тур. Калі аднойчы на ягоны купецкі абоз напалі крыжакі, ён здолеў, паваліўшы вакол вазкоў колькі ялінаў, арганізаваць са сваімі малайцамі сапраўдную абарону, і, паклаўшы колькі вояў, крыжакі паскакалі далей, пакінуўшы ўпартых віленчукоў.

Дом Баравіка быў сапраўды вялікі і прыгожы, складзены з цэглы, якую рабілі пры княжацкім двары. Мураванка выйшла на два паверхі, з лажніцамі для гаспадароў і дачкі наверсе. Унізе, пад сьвятліцай, гандлёвай каморай і кухняй, месьціліся склады, дзе ўсё было закладзена таварамі. Сьвятліца ж, дзе зараз прымалі дарагога жаніха, была гонарам гаспадароў: сьцены яе тынкаваныя, на іх вапай* нанесеныя квяцістыя ўзоры, а ў вокнах замест звычайных бычыных пузыроў празрыста зыркала ў водблісках агню нядаўна прывезенае і яшчэ нязвыклае для гораду шкло. У чырвоным куце на бажніцы перад Родам, Перуном і Мокашшу гарэла газьніца з чыстым ільняным алеем, палымнеў запаветнымі ўзорамі багата вышыты ручнік. Печ у Баравіка была, па новай замкавай модзе, кафляная, зеленаватая кафля з узорамі паблісквала пры сьвятле лучын, устаўленых у медныя зажымы. Бабін кут, дзе на вясельлі сядзе нявеста, аддзяляў ад печы кавалак абшытага сярэбранай аблямоўкай ільнянога палатна, пячны слуп, ці, як яго называлі віленчукі, конь, быў чыста пабелены. Усё тут сьведчыла аб багацьці і ўдачы гаспадароў.

Гэты багаты віленскі купец ганарыўся тым, што ягоны будучы зяць чалядзінец самога вялікага князя, што ягоная дачка пакаёўка княгіні Марыі. Ужо адсьвяткавалі заручыны, а цяпер Баравік рыхтаваўся да вясельля, што адбудзецца пасьля Купальля: падлічваў у сваіх еўнях і кладоўках гарнцы жыта, бочкі піва і хмельнага мёду, а яшчэ рыхтаваўся да закупу мядзьведзіны, ласяціны і птаства – дробнага і буйнага. Баравік зьбіраўся запрасіць на вясельле вялікакняжацкую пару, і яму здавалася, што, калі Альгерд і Марыя прыедуць у ягоны дом, ён памрэ ад шчасьця.

Усе яны: і гаспадары, і Рэчыца, і найперш сам Няжыла не маглі дачакацца Купальля. Менавіта там, пасьля вогнішча, калі скокі праз зыркія языкі полымя ачысьцяць маладых і запаляць іх першародным юрам, надыдзе для Рэчыцы і Няжылы вялікае выпрабаваньне. У спаборніцтве – хто спрытнейшы, у шалёнай пагоні, калі зловіць ён дзяўчыну за косы і кіне на мяккі мох, спазнаюць яны адзін аднаго. Хаця і тады яшчэ не даведаюцца, ці прыдатныя для самай галоўнай мэты, з якою сыходзяцца маладыя: ён – аплёдніць яе, а яна – нарадзіць здаровых нашчадкаў, перадаць ім сьвяшчэнны агонь быцьця, але пачатак будзе пакладзены. Без яго вясельле ладзіць нельга. Ведама, што ў тых, каго сілком зводзяць бацькі дзеля багацьця ці розных хцівых мэтаў, дзеці родзяцца слабымі, болей хварэюць, а значыць, меней у іх сілаў і магчымасьцяў захоўваць магутны

корань жыцьця. Патрабуюць багі, а найперш ён, цудадзейны ачышчальнік Купала*, каб не пераводзіўся ў людзях агонь жаданьня, без якога заледзянее сьвет.

Вясельле ладзіцца неўзабаве пасьля цялеснага спазнаньня адно аднаго. Потым ужо тройчы ўрачыста абвядуць вакол сьвятога дуба, зьбяруць блізкіх і далёкіх сваякоў, гасьцей ды пастараюцца ўсіх прысутных так накарміць-напаіць, каб яны памяталі вясельны пачастунак усё астатняе жыцьцё.

Цешыліся Баравік і Зайка, што спадабаўся іхняй дачцы ня сьмерд які, ня таць, што квапіцца на багацьце, а радавіты баярын з добрай, набліжанай да князя сям'і. Таму і лавілі кожнае слова Няжылы, падтаквалі яму ды пераглядаліся, угледзеўшы, як хараша ўпраўляецца ён з лыжкай: любіць паесьці, дык будзе слаўна і працаваць!

Яшчэ ня ўсталі з-за стала, як пачулі ад служкі, што ў сядзібу завітаў малодшы брат Няжылы, памочнік галоўнага лоўчага Кумец. З задавальненьнем прынялі тую вестку. Прыгожага, вясёлага хлопца шанавалі ў замку, нездарма князёўны радасна ўсьміхаліся, калі прыносіў да іх Няжыла кубкі з шыпучым заморскім вінам альбо падаваў тарэлы са смажанай рыбай – узгадвалі, мабыць, пры тым прыгажуна Кумца. Альгерд заўсёды браў яго з сабой, калі ехаў на ловы альбо ў паходы. Кумец, як ніхто, адчуваў сокалаў, і яны, трапляючы на яго парчовую рукавіцу нават з затуленымі каўпаком вачыма, спакайнелі. Звычайна якраз ён, Кумец, урэшце вырываўся наперад падчас паляваньня, даганяючы сокала, які дзёўб і дзёўб упаляванага зайца. Гэта ён куды хутчэй за галоўнага лоўчага ўмеў суцішыць разьятраную пагоняй птушку. У замку шапталіся, што вялікі князь хутка памяняе сваіх лоўчых месцамі, і памочнік нарэшце зойме належнае ягонаму таленту становішча...

Брат Няжылы ўвайшоў, як звычайна, вясёлы, хаця ў душы быў моцна заклапочаны. Праз тыдзень павінен быў ён прымаць хрост, і хацелася яму, каб пры тым быў брат. Але як завабіць Няжылу ў царкву? Дзікім здаецца брату вобраз Бога, які, валодаючы *сілай*, дазволіў расьпяць сябе на крыжы. Які, магучы зьнесьці з зямлі сваіх ворагаў, сьцерці іх у попел, сам узьнёс на свае плечы непасільны для яго крыж і нёс яго, губляючы прытомнасьць, на гару, каб там працягнуць ворагам свае рукі, у якія яны і забілі цьвікі. Колькі разоў гаварыў пра тое з Няжылам, а той жартаваў ды адмоўчваўся, а то і абяцаў калі-небудзь зайсьці нарэшце ў храм. І цяпер Кумец спадзяваўся пагаварыць аб усім гэтым ня ў хаце, а менавіта тут, пры будучых родзічах. Ведаў, чым можа закрануць іхнія сэрцы: бацькі Рэчыцы мараць пра тое, што вясельле ўшануе вялікакняская пара. Таму, калі яго запрасілі да стала, ён, як і Няжыла, не адмовіўся ні ад смажанага ўюна, ні ад вяпрачыны, пасыпанай чырвоным пякельна-вострым парашком, які называўся перцам і які звычайна падаваўся толькі пры княжым двары. Усё гэта, асабліва ж дарагая замежная прыправа, сьведчыла пра тое, што яго тут прымалі як высокага госьця.

Гаворка пра будучае вясельле ішла доўгая, зацікаўленая. І, пасылаючы ў рот апошні кавалачак мядзьвежага языка, прамовіў Кумец як бы між іншым:

– Праз тыдзень я прымаю хрышчэньне. У царкве будзе сама вялікая княгіня. Шкада, што Няжыла ня хрышчаны. Мабыць, давядзецца вам бяз нашых вялікіх гаспадароў ладзіць вясельле... Да нехрысьцяў вялікая

княгіня наўрад ці пойдзе. А вялікі князь без яе да вас не зьбярэцца. Усё ж ня зацныя вы людзі, не баяры...

Баравік падскочыў, пераглянуўся з жонкай.

– А… а ці пусьцяць у царкву, ёрш вас забяры, язычнікаў?

– А чаму ж не? Кожны, хто хоча, можа зайсьці.

– Ну дык мы… мы можам… таксама…

Жонка глядзела на яго з жахам. Няжыла ўпарта маўчаў. Але тут у бяседу ўплішчылася Рэчыца:

– Я часта бываю ў храме, і ніхто мне слова не сказаў. І духоўнік гаспадарыні Нестар такі ціхі і прыветны. Зусім ня тое, што вялікі жрэц Бурыла. Той, калі і з вялікім гаспадаром гаворыць, супіць бровы і ўсё з нейкай пагрозай, пагрозай… Гаспадарыня яго ненавідзіць, а ўжо ён яе... о! Цяпер пры двары нядобра быць язычнікам. Я заўважыла: як схаджу з вамі, тата і матулечка, да Вялеса – адразу галава балець пачынае, і слабасьць ахутвае. А ў царкве мне добра…

– І ты туды ж! – у Няжылы ссунуліся бровы. Ён адпіхнуў ад сябе тарэлу, устаў і з падзякай пакланіўся гаспадарам, а тыя, таксама падняўшыся, адказалі гэтак жа. Хлопец падышоў да бажніцы, і магутная рука яго дастала драўлянага Перуна. Вочы боства, зробленыя з чорнага агата, змрочна бліскалі на прысутных. Няжыла пацалаваў яго зашмальцаваныя калені, паставіў на месца.

– Гаспадара неба ты, дзяўчына, ужо не баішся?! І вы, мае будучыя бацькі, таксама?

– Баюся, ёрш вас забяры ўсіх! – ссунуў жыдзенькія русявыя бровы Баравік. – І тут страшна, і не патрапіць новаму богу таксама страшна. Бо вялікія гаспадары ўжо ідуць да іншага бога, яго прызнаюць! А што ж нам, нікчэмным зямлянам, рабіць? Ісьці ўсьлед за ўладай. Яна для нас, хлопчыкі, самая галоўная. Калі яшчэ той Пярун да тваёй душы дабярэцца, а вялікі князь… вялікі князь і цівуны ўжо тутака… Так, жонка?

– Як скажаш, гаспадар, – Зайка пакорліва схіліла галаву, у вачах яе на імгненьне мільганула любасьць да свайго сьсівелага мужа, але адначасна і жаночая мудрасьць гаспадыні, якая не паказвае, хто сапраўдны ўладар у хаце.

– Ну вось маё слова: мы пойдзем на хрышчэньне! – рашуча сказаў Баравік. Тады і Няжыла сумеўся, раздумліва гледзячы на бажніцу.

– Тады пайду і я, – вымавіў нарэшце.

Кумец хітра паглядзеў на брата, засьмяяўся радасна.

– Ня бойцеся. Вялікая княгіня абароніць нас усіх, – сказаў упэўнена. – За ёю Віцьбеская і Полацкая зямля, а там усе баяры хрышчаныя, усюды ў гарадах цэрквы, нават для купцоў ёсьць свае, купецкія. Сам бачыў у Віцьбеску, калі яшчэ з бацькам туды езьдзілі. А гэта – вам у падарунак ад мяне.

І ён таксама ўстаў, падышоў да бажніцы і, дастаўшы вялікі, ростам з Перуна, драўляны крыж з сярэбранымі насечкамі, паставіў яго паперадзе Перуна так, што зусім захіліў бога-грамавіка, які раптам здаўся ня грозным, а як бы нават разгубленым, ягоныя чорныя агатавыя вочы нібыта згасьлі, падпарадкоўваючыся непазьбежнаму. Толькі Вялес побач з ім глядзеў непрымірыма і насьмешліва, нібыта ведаў нешта такое, што дасьць яму магчымасьць паставіць на сваім, чаго б гэта ні каштавала....

– Як добра, што мы ўсе пойдзем у царкву! – сьпяшалася Рэчыца.— У царкве адразу сьветла робіцца на душы. Там пяюць так ціха і хораша…

– Замоўч! – цыкнуў на яе бацька. – Мы, ёрш цябе забяры, самі вырашым.

І сказаў цьвёрда:

– Ідзем у царкву. Можа, вялікая княгіня нас заўважыць ды нешта зробіць для цябе, зяцёк… Хаця ты ў нас і так высака ўзьляцеў.

І ён ласкава пагладзіў Няжылу па плячу, з задавальненьнем адчуўшы цьвёрдыя мускулы і ўсю надзейную сілу маладога прыдворнага. Яму на імгненьне памроіліся сьветлыя, як у яго, і цёмнарусыя, як у жонкі, валасы будучых унукаў. Жыцьцё наперадзе было ясным і такім жа надзейным, як гэтае цьвёрдае маладое мужчынскае плячо пад рукой. Адно на імгненьне азмрочыла добры настрой Баравіка: раптоўна з грукатам бяз дай прычыны ўпаў з бажніцы драўляны Род. Яго паднялі, і, пацалаваўшы, паставілі зноў на ільсьняную ад ільнянога ахвярнага масла дошчачку – хай беражэ ён і там, у бязьмежным Ірыі, дзядоў-прадзедаў, расказвае ім аб тых, хто жыве пакуль што на зямлі. І не скупіцца на клопат аб будучых пакаленьнях непераводнага крывіцкага роду, часьцінка якога – ягоная дзяўчына – ласкава глядзіць на чужога ім па крыві, але ўжо бязьмерна блізкага і любага ёй хлопца, чыя кроў-руда заструменіцца ў жылах ягоных, Баравіка, унуках.

Яны сьмяяліся і гаманілі, а Род змрочна глядзеў на іх раўнадушна-далёкімі вачыма, зазіраючы ў невядомую пакуль для іх сьцяжынку жыцьця, дзе атожылак роду Баравіка не буяў на галіне радаводнага дрэва, а ляжаў, пасечаны і пакрышаны сілай, якая непадуладная людзям і якая завецца ў іх Лёсам....

## *ІНТРЫГА ЖРАЦОЎ*

Вялікая жрыца Нара хуталася ў шэрую пушыстую хусту, ляніва варушыла пальцамі ног у мяккіх, мехам унутр, цёплых боціках. На ейных каленьках, абцягнутых доўгай ваўнянай спадніцай, ляжала белая вязаная падушачка, пасярэдзіне якой чырванела выява Лады. Размова доўжылася трэцюю гадзіну, і хаця печ напалілі з самай раніцы, ад вакна, зацягненага сьлюдой, дзьмула, і жанчына час ад часу закідвала назад галаву з пышнымі бялявымі валасамі, каб ня ныла шыя, а яе сінія вочы прымружваліся, як у вялікай, сытай кошкі, якая схавала пад пульхнымі падушачкамі лапак гострыя кіпцюры.

Толькі нядаўна стала яна адчуваць, што цела, здавалася б, яшчэ па-юначы маладое і пругкае, усё ж пачынае няўлоўна стамляцца як пасьля шалёных оргіяў у гонар багіні каханьня Лады, так і падчас сур’ёзных бяседаў, калі яна разам з іншымі вялікімі жрацамі Вільні вызначала агульную палітыку язычаства і ягоныя патрабаваньні да вялікага князя. У глыбіні сьвятога дубовага гаю, адрокшыся ад сьвету і яго спакусаў, сем вешчых старцаў вызначалі тую палітыку для вялікіх жрацоў, а ўжо тыя несьлі яе далей, да людства і ўлады.

Але сёньняшняя размова, хаця і ішла яна пра лёс Княства і вялікую палітыку, вялася ў храме Лады, у асабістых пакоях вялікай жрыцы, што дазваляла жанчыне паўляжаць у высокім крэсьле, сярод аксамітавых паду-

шак. Звычайна ж у такіх выпадках даводзілася сядзець ў сьвяцілішчы вешчуноў, выпрастаўшыся, высока ўзьняўшы галаву, сярод сьсівелых нямоглых старцаў. Замест утульнай хатняй адзежыны яна мусіла быць у доўгай белай сукні і сярэбраным вянку, з калінавым кіем у руцэ і ў жрэчаскім каўпаку, чаго жрыца моцна не любіла: каўпак той выразна старыў ейны твар.

У пакоі, дзе задушліва пахла сушанай мятай і дзе лавы былі абцягнутыя зялёным сукном, а курыльніцы ледзь улоўна дыміліся пахкасьцямі, месьціліся, таксама зручна ўладкаваўшыся на лавах і абклаўшыся падушкамі, тыя, хто дапамагаў Нары ў яе нялёгкім жыцьці вялікай жрыцы: ейны дзядзька, кашталян Нарбут, вярхоўны служка Лады Лелюш і ягоная каханка Гайна – пакаёўка старэйшай князёўны, жрэц Мікша. Наводдаль, на такім жа высокім, як у Нары, крэсьле сядзеў галоўны жрэц Перуна Бурыла. Яго твар, плоскі і расьцягнуты, як у жабы-рапухі, быў сур’ёзны, вузкаватыя зялёныя вочы глядзелі ўладна і пагрозьліва. Ён зьвяртаўся да прысутных, нібыта папракаючы іх кожным сваім словам:

– Нашы сьвяцільні пачынаюць чадзець, а нашы старажытныя багі дзень за днём губляюць тое, што ім належыць ад веку – чалавечыя душы. Хрысьціянскі бог, бог мёртвых і нямоглых, авалодвае імі. Распаленымі сякерамі трэба адсякаць адступнікаў, каб гніль не пайшла далей!

– Чаму ж вы ўсе не адстоялі Рагуціса? – з горыччу прашаптаў як бы пра сябе Мікша. Але Бурыла не прамінуў і гэтага ціхага шэпту:

– Таму што ты тады не насьмеліўся на тое, чаго я патрабаваў у цябе перад галоўнымі жрацамі і на што тады не рашыліся і яны!

– Атруціць вялікую княгіню?

– Цішэй вы! – выпрасталася ў крэсьле Нара. – Цяпер не даверышся і самым адданым служкам!

– Не атруціць, а адправіць яе ў Ірый! – амаль шэптам, але гэтак жа горача пранізаў Мікшу зялёнымі разьятранымі вачыма галоўны жрэц. – І тады ўсё зьмянілася б адразу. Тады заглухла б будаўніцтва царквы. І мы аднавілі б храм яшчэ больш велічным і прыгожым, чым ён быў раней.

– Але галоўныя жрацы адмовіліся…

– Хто менавіта? Гэты агаломшаны прывідамі Лойка, які даўно жыве ня ў гэтым сьвеце? Служка жамойцкага Лелевеля, які дрыжыць за сваё месца, як палахлівы заяц? Гэтыя браты – кастраты, што спавядаюць Ашвінаў*?

– Не далі згоду і вешчыя старцы…

– А нашто ў іх пытацца? Ня ўсё і яны могуць спасьцігнуць. Мы таксама нешта цямім. Морак накрые ўсё, што мы захочам, калі… калі мы возьмемся за гэта разам. С і л а ёсьць у яе, – ён кіўнуў на Нару, – ёсьць яна і ў цябе, Мікша. Я ўгавару яшчэ некалькіх. Мы правядзём патаемны абрад. І тады… тады ні вешчыя старцы, ні Лойка не здагадаюцца, чаму віцьбеская паляндра* узьнялася да продкаў раней, чым яны яе паклікалі…

– Ня варта гэтага рабіць, – знарок ляніва пацягнуўшыся, так што зазьвінелі сярэбраныя падвескі-колты ў вушах і бранзалеты з бомамі на доўгіх мускулістых нагах, прамовіла Нара.

– Яна ўсё роўна памрэ. Судзяніцы* сказалі мне гэта ўчора ўначы.

– Ты гадала па зорках? – ускінуўся Бурыла.

– Не, па дыме з начнога кастрышча. А яшчэ па палёце арліцы, якую задзяўблі сьвяшчэнныя вараны.

– Памрэ… Але наколькі хутка? Тут дарагі кожны тыдзень! – усклікнуў Мікша.

– Памрэ! Тады… тады трэба хутка шукаць яму сапраўдную жонку. Не з Полцеску альбо Віцьбеску, не з Цьвяры ці Германіі. Усе яны там ужо хрышчаныя! – загарачыўся Лелюш.

– Нашу! Якая будзе ўсёй душой аддадзеная старым багам і перакрэсьліць у душы Альгерда ўсё, што заклала там гэтая... прышлая, – ускінуўся Нарбут.

– Але надзвычай важна, з якога яна роду. Ці н а ш гэта будзе род? Ці іншыя багі завалодаюць Альгердам, а мы будзем адсунутыя ад яго і ад самога княжага двара? – задумаўся Бурыла.

І яны сталі перабіраць усіх вятшых людзей Вільні і ўзгадваць пра іхніх дачок. У кожнай то адзін, то другі знаходзілі нейкія хібы, ажно пакуль Нара працяжна і як бы нехаця не прамовіла:

– Я ведаю, хто будзе найлепшай жонкай для Альгерда. На каго мы можам спадзявацца і хто дапаможа язычаству супрацьстаяць новым багам.

– І хто гэта? Якая-небудзь служка вялікай багіні? Дзеўка, якая аддавалася безьліч разоў усім зацным мужам Вільні? З-за якой нас падніме на сьмех усё Княства? – ускінуўся Бурыла.

Нара вытрымала паўзу, абводзячы ўсіх усьмешліва-няўлоўным позіркам, пад якім, аднак, праглядалася моцная воля і настойлівасьць.

– Няўжо вы, высакародныя мужы Вільні, можаце падумаць, што я лёгкадумна стаўлюся да такой важнай падзеі, як новая жонка князя? І што я не прадбачыла будучага, гледзячы, як друзьнее Марыя?

– І што, у цябе ёсьць нехта на прыкмеце? – нецярпліва ўсклікнуў Нарбут.

– Вядома, ёсьць. Гэта мая сястра Дзівейна.

– Сястра?! – разам усклікнулі ўсе, а грамчэй за ўсіх – Нарбут. Яны ўтаропіліся ў жанчыну, ня ведаючы, як успрымаць ейныя словы. А тая загадкава ўсьміхалася, вытрымліваючы паўзу.

– Так, у мяне ёсьць сястра. Праўда, толькі па бацьку, ведамаму вам усім высакароднаму Мікуле. Вырасла яна ў храме Ашвінаў на Нёмане і ніколі ня ведала мужчыны. У яе няма варагаў... пакуль няма. За ёю, праўда, не стаіць нейчы магутны род, толькі галоўны храм і ўплывовыя вернікі іншых храмаў сьвятых братоў, але, думаю, што найперш станем апораю ёй мы. Ці ня праўда, тыя, хто сабраўся тут, нечага ўсё ж вартыя?

Прысутныя дружна захіталі галовамі.

– Але як нам зьвесьці іх? – задумаўся Лелюш.

– Яна ўзьнікне ў адпаведны час перад Альгердам, і багі падкажуць яму ўсё астатняе…

– Чаму ж мы нічога ня ведалі пра яе дасюль? І… і твой бацька да самае сьмерці ніколі ня згадваў яе! – падазрона ўпіўся ў вярхоўную жрыцу пагляд Бурылы.

– Таму што ён сам даведаўся пра тое амаль што перад тым, як легчы ў дубовую калоду*. Ці мала высакародных мужчынаў, што, як браты Ашвіны, магутнымі жарабцамі апладняюць кабыліц – прыгожых жанчын? Парода, што ад іх нараджаецца каля храма Ашвінаў, лепшая ў нашым краі, больш магутная, чым нават пры храме багіні Лады. Мне сказаў тое ўсяго пяць гадоў таму сам бацька, і я апекавалася гэтай дзяўчынкай, рыхтуючы яе для служэньня Ладзе. Яе маці, жрыца боскіх братоў, па-

мерла рана, і я перадала ў храм нямала падарункаў, пакуль яны аддалі яе мне і зьнялі з яе апеку Ашвінаў.

– З Ашвінаў… Гэта добра, вельмі добра. Найстарэйшыя багі, яшчэ ад арыяў. Але ці валодае яна старажытнымі ведамі? – усхвалявана пытаўся Мікша.

– На якія забываюцца сёньня нават жрацы? – ушпіліў яго Нарбут.

– І – дзе яна? – Бурыла ўпіўся зялёнымі вачыма ў Нару, погляд яго пацьмянеў. Сінявокая, ружова-белая прыгажуня адказала яму нявінным позіркам.

– Калі хочаце, я пакажу яе вам.

– Зараз?!

– Канешне. Яна ўжо некалькі дзён гасьцюе ў маім храме, і мы шукаем для яе будынак, каб тут, у Вільні, для будучай жрыцы Лады, а, магчыма, і вялікай княгіні, быў свой дом…

Яна лёгенька стукнула доўгім пальцам у вялікі пругкі бубен, што вісеў каля яе на сьцяне. Праз колькі доўгіх імгненьняў – такіх нясьцерпных, нібы ўсім прысутным разам казыталі пяткі, дзьверы расчыніліся.

Гнуткая і зграбная, як маладая аленіха, з доўгімі попельнымі валасамі, на якіх зіхацеў сярэбраны абруч са скроневымі колтамі-кругамі, з яснымі шэрымі вачамі і ледзь прыкметнымі ямачкамі на пругкіх і круглых, як рэпка, шчочках дзяўчына стала перад прысутнымі. Колты з тонкага срэбнага дроціку, закручанага ў прыхаматлівыя ўзоры, аздобленыя эмальлю, надавалі жывы бляск яе ружовай, амаль празрыстай скуры. На серабрыстай сукні і на лёгкіх скураных поршнях зьзялі аднолькавыя, золатам вышытыя выявы коней. Жрацы ведалі: гэта знак таго, што Ашвіны – дзеці кабыліцы, якая выганяе са сховішчаў Ноч і Дзень.

– Мая сястра Дзівейна, – з асалодай назіраючы за разгубленасьцю мужчын, прамурлыкала Нара.

“Цнатліўка”, – адразу вызначыў надта вопытны ў гэтых справах Нарбут, “плоць у ёй яшчэ не прачнулася, ад таго такая моц і яснасьць, як у дзіцяці”.

Ён неўпрыкмет зірнуў на Нару. “Яны трохі падобныя. Але ў пляменьніцы, якая зьведала мноства мужчынаў, сіла іншая. Сіла в е д а н ь н я, а не чысьціні. Яна ўмее абудзіць у любым, нават у самым стрыманым мужчыне, таго зьвера, таго асьпіда, які знаходзіцца ўнутры кожнага і якога мы так і ня можам да канца ўтаймаваць. Але і ў гэтай ёсьць свая перавага – у яе ўсё наперадзе. На шчасьце, я ня родзіч ёй, бо Нара пляменьніца мне па маці”.

Бурыла маўчаў. Дзяўчына яго ашаламіла. І не сваёй прынадлівай, гарачай і неадольна – чараўнічай вабнасьцю. За свае гады ён пабачыў шмат прыгажунь. Заняты больш важнымі, чым уцехі з жанчынамі, рэчамі, ён браў кожную, якая хаця на імгненьне абуджала ў ім жаданьне, і тут жа забываўся на яе. І так доўжылася гадамі, пакуль да яго, немаладога ўжо мужчыны, прыйшло тое, што ён сам спачатку не разумеў – жаданьне мець адзіную, атрымаць ад яе дзіця. І такая знайшлася. Гэтая сьвежая, як ранішні гурочак на гародзе, бялянчка была надта падобная да той, якая трывожыла яго думкі, сама ня ведаючы аб тым.

Да Уны, дачкі пасла Леся.

Даўно зазіраўся ён на Уну – яшчэ з той памятнай хвіліны, калі пасол Лесь атрымліваў ад Гедзіміна залаты медальён за пасьпяховыя перамовы

з Ватыканам. Было гэта ў вялікай дубовай зале, дзе сабралася ўся знаць Княства. Тады яркія, каляровыя, з зялёнымі вінаградным лістамі шпалеры на сьценах цьмянелі перад безьліччу парадных сукняў з атласу, парчы і адамашка, а сонца ўспыхвала ў зіхоткіх дыямантах прыдворных баярыняў. Былі там і вялікія жрацы ўсіх храмаў Вільні. Калі вяртаўся пасол ад трона, дзе вялікі князь сам начапіў на ягоную шыю зіхоткі кругляк са сваім родавым гербам Калумнамі, ён радасна і ўсьмешліва глянуў у кут, і, прасачыўшы за ягоным позіркам, пабачыў Бурыла дзяцей Леся Кругляца і Уну. Помніў іх круглатварымі, шэравокімі дзіцянятамі па трыпяць гадкоў і цяпер бы нізавошта не пазнаў – так яны падрасьлі. Але калі Круглец яшчэ ня выцягнуўся ў юнака, то Уна ў свае трынаццацьчатырнаццаць пераляцела праз тую нябачную, але адчувальную мяжу, што аддзяляе зялёнае, цыбатае дзеўчанё ад паненкі. І ён, абмацаўшы чэпкім, шматвопытным позіркам яе юную постаць у зялёнай ядвабнай сукні, з зіхоткім абручыкам на попельных валасах, адчуў не пажадлівае і ліпкае жаданьне, якое ня толькі задаволіць, але і выклікаць у сабе з гадамі рабілася яму ўсё цяжэй і цяжэй. Не – ён раптам успыхнуў, як смаляк, па жылах прабег жывы агонь. І дзіўна: увесь час, як жрэц непрыкметна назіраў за Унай, агонь ня толькі не згасаў, але і мацнеў, разгараўся. Даўняе пачуцьцё радасьці ахапіла яго душу, і ён радаваўся і грэўся ў гэтай радасьці, як трапяткі аўсянік у сонечным сьвятле.

Тады ж ён вырашыў завалодаць гэтым дзеўчанём. Але падступіцца да Уны было нялёгка – бацьку яе шанаваў і нават любіў Гедзімін, ёю апекаваўся сам жрэц Сварога Лойка. Бурыла змушаны быў чакаць. Чакаць і бесьперастанку сачыць за кожным крокам Леся і яго сям'і.

Пасьля сьмерці Гедзіміна ён паспрабаваў завабіць брата і сястру ў вернікі храма Перуна, але тыя не паддаліся, трымаліся абасоблена. Калі зьязджаў кудысьці па справах бацька, яны былі пад апекай маршалка, у доме вечна віравалі ахоўнікі і слугі. Усе яны хадзілі пераважна ў храм Сварога, бо любілі слухаць Лойку. Ішоў час, падрастаў Круглец, рабіўся мужным воем, якому падуладныя дзіда і меч, корд і нож. Калі памёр бацька, юнак быў залічаны ў княжацкую дружыну. І Бурыла зноў ня мог падступіцца да гэтай сям'і і ўсё чакаў зручнае хвіліны.

Зьяўленьне Нарынай сястры ўскалыхнула ў ім тое, што за цягам дзён некуды нібы адышло. І ён стаяў, а яго вузкі рот сьціскаўся ў такую пажадлівую злосную і рашучую лінію, што нават Гайна зірнула на яго з няясным пачуцьцём трывогі. Толькі Нара нібыта не заўважала стану свайго блізкага сябра, хаця яе шматвопытны позірк імгненна адзначыў бледнасьць, якая на кароткі час пакрыла лоб служкі Перуна.

– Сядай з намі, ня бойся, – вялікая жрыца ляніва паказала госьці на зялёны покрыў лавы.

– Дзякуй, сястра. Але зараз час маленьня Ашвінам. Я не хацела б прапусьціць яго. Шкада, што ў цябе госьці – мы маглі б памаліцца разам.

– Я думаю, што мая дарога ў Ірый ужо тройчы ўсьцеленая малітвамі, – усьміхнулася Нара. Але Дзівейна не зразумела ці не захацела разумець іронію. Яна глядзела сур'ёзна і строга.

– Зараз я пазнаёмлю цябе з маімі сябрамі. Яны стануць і тваімі, дзіця, бо без сяброў ты ня знойдзеш у жыцьці правільнай сьцяжыны…

Жрыца па чарзе назвала ўсіх прысутных. Дзівейна глядзела на кожнага ўважлівым позіркам, нібы імгненна ацэньвала ўсе ягоныя вартасьці,

пачціва схіляла галоўку кожны раз, калі называлася чыёсьці імя. Прысела за лаву, узяла прапанаваную Нарбутам падушку і паклала за сьпіну.

Тым часам слугі падалі прысутным залатыя краціры з віном. Дзівейна асьцярожна пасмакавала густы чырвоны напой, пасьля стала піць яго маленькімі глыткамі, час ад часу праводзячы маленькім чырвоным язычком па краёчку кубка. Нарбут адчуў, як сьцёгны яго нібы кусаюць мурашкі, і хутчэй адвёў погляд ад пульхных вуснаў цнатліўкі.

– І чаму яна навучылася ў Ашвінаў? Што яна можа? – запытаўся Бурыла, як быццам дзяўчыны ў пакоі зусім не было.

– Можа лекаваць многія хваробы і разьбіраецца ў зёлках. А яшчэ... – зноў загадкава ўсьміхнулася вялікая жрыца. – Яна валодае Гукам.

Жрацы – Бурыла і Мікша – пераглянуліся.

Валоданьне Гукам давалася нямногім, для гэтага трэба былі здольнасьці, якія даюць багі толькі абраным, а менавіта: адчуваць сьвет як адзін агульны вялізны гук, дзе выказвае сябе ня толькі чалавек, але і кожная расьліна, нават камень ці простая пясчынка. Адрозьніваць кожны такі голас – валодаць вялізнай сілай, бо вышэйшыя жрацы ведалі і тое, што гук сам можа зьмяняць форму і абрысы існага*.

– А... можа яна паказаць гэта? – запытаўся Мікша. – І... на якім яна ўзроўні?

– На простым, – коратка растлумачыла Нара. – На тым, дзе ня бураць цьвержы*, а даюць асалоду і забыцьцё.

– І яна можа даць... гэтае? Ну, асалоду? – ажывіўся Нарбут.

– Можа.

Нара зірнула на сястру, тая ледзь улоўна ўсьміхнулася, так што паглыбіліся ямачкі на круглых шчоках. Пасьля, ня зводзячы вачэй з магутнага каржакаватага, падобнага да мядзьведзя мужчыны, выцягнула вусны, акругліўшы іх у выглядзе гарлачыка.

Ціхі, але такі нізкі, быццам нёсься з глыбокага падзямельля, гук прымусіў усіх уздрыгнуць. Дзівейна пачала і вяла яго бесьперастанку, як быццам залівала ў кожнага з прысутных гляк густога залацістага мёду. І гэты салодкі, вязкі, напоўнены водарам чабору мёд паступова запаўняў цела, цьмяніў галаву і расслабляў волю. Дзяўчына ўзмацніла голас – і Нарбут адкінуўся ў крэсьле, твар яго скрывіла грымаса, адначасна радасная і пакутлівая, а Гайна затрэслася, як у ліхаманцы. Жрацы не паддаліся насланьню, але і ў іх пачырванелі твары і кроў хутчэй пабегла па жылах.

– Хопіць! – Нара махнула рукой, і гук замоўк.

Нарбут расплюшчыў вочы.

– Што гэта было? Падлога пада мною зыбалася, як кладка!

– А ў мяне ледзь не адваліліся грудзі, іх як быццам лашчыў дзясятак Лелюшаў! – паскардзілася Гайна.

– А я... – Лелюш махнуў рукой. – Ат, і казаць ня буду!

– Ну што, даволі? – Нара шматзначна зірнула на прысутных, усьміхнулася Дзівейне. Тая таксама ўсьміхнулася – яснай, нявіннай усьмешкай, і стала надта падобнай да вярхоўнай жрыцы нейкай уладна-халаднаватай цьвёрдасьцю, што прамільгнула ў ёй і гэтак жа раптоўна зьнікла.

Потым, пакланіўшыся, адступіла назад і імгненна зьнікла за дзьвярыма.

Стукнулі дзьверы, з калідора дыхнула пахам чабаровага мёду. Прысутныя моўчкі глядзелі адзін на аднаго. Нарбут апамятаўся першым.

– Ці не занадта… – ён пакруціў рукой у паветры. – Ці не занадта незвычайная яна для вялікай княгіні? Ды ад яе ўсё жывое трапеча!

– І маладая?

– І прыгожая? – раздаліся галасы.

– І ці можна будзе ёю… кіраваць? – выказаў самае галоўнае сумненьне Бурыла. – Яна, здаецца, да таго ж і бяз меры набожная?

Але Нара толькі засьмяялася.

– З самых зацятых цнатлівак, – сказала яна спакойна, – выходзяць самыя вялікія распусьніцы. Можаце мне паверыць. Хто-хто, а ўжо я ведаю гэта лепей за вас усіх. Але для таго, каб Дзівейна ўрэшце трапіла ў вялікакняскі палац, нам трэба мець там як болей сваіх людзей. Гэтая твая справа, крэўны, – кіўнула яна Нарбуту.

– Ня ўсё я магу. Вось, вазьмі, напрыклад, падчашага Няжылу, забі яго Стрыга! Гэта ня наш чалавек, а толькі Альгердаў. Ягоная нявеста прыслужвае вялікай княгіні. Брат – памочнік лоўчага, яго гаспадар цэніць больш за самога лоўчага. І іхнія сябры маюць там вялікі ўплыў. У гэтай чарадзе і Круглец, сын пасла Леся. І ўсіх іх трымае і любіць вялікі князь – ці сама гаспадарыня.

– Круглец сябруе з сынамі Драмака? – адразу ж азваўся Бурыла.

– Так. І Круглец, я чуў, хацеў бы выдаць за аднаго з братоў сваю сястру! – рады, што можа ўкласьці ў агульную гаворку і нешта сваё, азваўся Мікша.

– Гэта каторую?

– Здаецца... здаецца, яе клічуць Унай.

– Во як… – працадзіў вялікі жрэц. Яго вочы яшчэ болей звузіліся. – За каторага ж з братоў, цікава ведаць?

– За Кумца. Але той, пасьля таго як ахрысьціўся, можа, і не захоча ўзяць язычніцу! – з гатоўнасьцю дакладаў Мікша.

– Гэта цэлае ахрап’е*, забі іх Стрыга! Гняздо павучынае! Разьмесьці яго хутчэй! – з гарачнасьцю стукнуў па стале Нарбут.

Пачакай! – асьцерагла Нара. – Адразу толькі жабы скачуць. Трэба перачакаць, нагледзець за гэтымі хлопцамі, ну хаця б спачатку за Кругляцом, нейкую правіну ці грэх, каб валадар неўзьлюбіў яго. Тады і за яго, і за сястру, і за ейнага мужа (яна азірнулася на Бурылу) заступацца ён не стане.

Яна пільна паглядзела Мікшы ў вочы.

– Што пра яго кажуць віжы? Ці ты сам віжаваў?

– Не віжаваў, а назіраў, – пакрыўдзіўся той.

– Добра! – нецярпліва абарвала жрыца. – Што ты выгледзеў?

– Ды пакуль нічога такога не заўважыў. Гэты малойчык надта цікавіцца скрыптамі, таму часта бывае ў замкавым скрыпторыі. Пасьля гуляе са сваімі хартамі. Прымаюць гасьцей – найчасьцей Няжылу і Кумца. Сястра таксама ў яго адукаваная, ведае многія мовы, дзеці шмат езьдзілі з бацькам то ў Рым, то ў Візантыю. Цяпер яна вышывае модныя шпалеры…

– Да Стрыгі тыя шпалеры! – ня вытрымаў Нарбут. – Кажы нешта істотнае!

– Няхай дакладае ўсё. Кожная дробязь можа спатрэбіцца, – холадна абарваў яго Бурыла.

– Бавіцца з кветкамі… – працягваў Мікша. – У іхняй хаце ўсё цьвіце, як у капішчы Мілды. Ну, нядаўна Кумец з іхняе хаты тройчы хадзіў у хрысьціянскі храм. Праўда, адзін.

– У храм?! – узьвіўся Бурыла. – І ты не сказаў пра гэта адразу?

– Ну дык жа сама вялікая княгіня…

– Ёй можна, яна ня з нашай зямлі. А гэтым… гэтым мы не дазволім!

Яго расьцягнуты, з шырока расстаўленымі жабінымі зрэнкамі твар пацьмянеў, іскры, здавалася, так і пасыпаліся з вачэй:

– У храм Кумец ходзіць пастаянна. А нядаўна быў там са сваім братам. А нявеста брата – пакаёўка ў самой вялікай княгіні, яна і сваіх бацькоў у храм прыводзіла, калі там была гаспадарыня – уставіла сваё і Гайна.

– З братамі справіцца прасьцей, чым з Кругляцом. Яны пастаянна на вачах вялікага князя, і даказаць, што яны хрысьціяне, лёгка – задумаўся Бурыла. – А там і да Кругляца дабяромся.

– І да ягонай сястры, – нявінна ўставіла Нара, ды Бурыла так пагрозьліва зіркнуў на яе, што яна як падавілася – закашлялася, схавала твар у цёплую хусту. Мікша паслужліва паднёс ёй квасу з пазалочанай брэцьяніцы.

Бурыла задаволена пацёр свой калінавы жэзл.

– Калі ў замку будуць нешта сьвяткаваць, кашталян?

– Ну калі? Вядома, на Дажджбога.

– Ну так, так… На Вялічка-чырвона яечка.

Ён задумаўся. Вялікая жрыца нецярпліва хуталася ў накідку. Яна шкадавала, што дазволіла сабе пакпіць з Бурылы. Нара добра ведала гэтага чалавека. Гэта ён, упершыню паспытаўшы ейных уцехаў і адчуўшы ў дзяўчыне роднасную душу, некалі прывёў яе на месца галоўнай служкі храма Лады, пераканаўшы вешчых старцаў у тым, што менавіта гэтай бялявай гнуткай, як ласіца, жрыцы найбольш падуладнае Будучае. Яна была тады зусім нявопытнаю, і перад выпрабаваньнем Бурыла добра яе падрыхтаваў. Найперш расказаў пра падзеі, якія хутка павінны будуць адбыцца пры двары вялікага князя, – разумны і хітры, ён ведаў многае, што было схаванае ад простых людзей. Загадзя падказаў ёй, як трымацца перад старцамі, што казаць. Бурыла вучыў яе тым таемным ведам, якія вядомыя адзінкам, і ён жа ў галоўным сьвяцілішчы Перуна, падкупіўшы служак каго страхам, каго золатам, загадаў непрыкметна павыцэджваць яд у сьвяшчэнных зьмеяў якраз перад тым, як паміж імі пройдзе, выконваючы свой галоўны іспыт, будучая вялікая жрыца. Менавіта яе бясстрашша перад зьмеямі (у душы яна калацілася ад страху, ды змагла схаваць пачуцьці) найбольш і пераканала пяцёх вешчых старцаў. Два з іх, аднак, паўсталі супраць Нары, ды калі яна перамагла, абодва праз год памерлі таямнічай, загадкавай сьмерцю....

Бурыла пасьля ўсяго гэтага займеў жаночую душу, якая была яму аддадзеная да самых патаемных глыбіняў, якая разумела яго раней, чым ён пасьпяваў сказаць слова. І хаця на агульных жрэчаскіх нарадах яна заўсёды трымалася нібыта наводдаль, Бурыла ведаў: вялікая жрыца Лады дапаможа ў самых цьмяных і страшных справах, зможа тое, на што нават ён ня здольны, таму што ёй багі далі хараство і спакусьлівасьць,

якія будуць дзейсныя датуль, пакуль будзе стаяць сьвет. Праўда, ня ўсе сьляды ўдалося схаваць. Заўважылі шматмудрыя вялікія жрацы іншых сьвяцілішчаў, што менавіта той вешчы старац, які першым падняў голас супраць новай служыцелькі Лады, чамусьці неўзабаве памёр, хаця быў рухавым і спрытным. І абставіны яго сьмерці былі дзіўныя: ён быў знойдзены мёртвым у адным з вясковых храмаў Каханьня, а сямнаццацігадовая прыгажуня-служка расказала на распачатым сьледстве, што сівы вяшчун так быў апантаны яе вабнасьцю і маладосьцю, што забыўся на ўсё, апроч яе цела, і таму памёр у самы непрыдатны для таго час… У нагавор спачатку не паверылі, бо мудры старац ніколі не грашыў на хоць, аднак Бурыла засьведчыў, што, прадчуваючы хуткі адлёт у Ірый, паддаўся-ткі вяшчун спакусе хоць аднойчы паспытаць уцехаў Лады і сам прасіў павезьці яго ў вясковы храм – далей ад сталіцы... Астатнія мудрыя старцы сабраліся былі на агульнае маленьне, каб спытацца ў нябожчыка, што ж здарылася на самой справе, ды цяжкім было тое маленьне. Маўчалі, не захацелі гаварыць з імі ні багі, ні душа іхняга сабрата. Да таго ж, вялікі князь Гедзімін якраз прапанаваў на месца памерлага свайго чалавека... На тым і скончылася ўсё, і заціхлі размовы, бо ўсіх урэшце ці то залагодзіла, ці то застрашыла вялікая жрыца, і праз гады ніхто і ня памятаў, як яно ўсё пачыналася. Не дазналіся і прычыны няўдалага звароту ў Іншы Сьвет.

Ведалі толькі Нара ды Бурыла, ды некалькі бязьмерна адданых ім служак, што на агульным тым маленьні ў сьвяшчэннае вогнішча падкінутыя былі сьцяблiны чамярыцы, якая атуманьвае галаву, таму і не дайшоў агульны покліч да тых месцаў, дзе можна сустрэцца з мёртвымі, і дарэмна плакала на страшным скрыжаваньні двух сьветаў душа памерлага, не вінаватага ні ў якім граху…

І, калі б ведалі бесклапотныя маладыя людзі – Круглец, Кумец і Няжыла, якія цешыліся жыцьцём, павагай вялікакняскай сям'і ды рознымі іншымі зямнымі радасьцямі, што задумваецца зараз супраць іх у ціхім пакоі з высокімі вокнамі, яны, мабыць, здрыгануліся б калі і не ад страху, дык ад агіды і наіўнага недаўменьня, што такое можа быць на гэтым сьветлым, сонечным і пакуль што такім бязьмерна ласкавым да іх сьвеце…

## *ЛОЙКА*

Магутным і суворым яго бачылі тыя, хто прыходзіў у храм на маленьні ці на ахвяры. Але вялікі князь Альгерд, часьцяком гаворачы з вялікім жрацом Сварога, ня раз суцяшаў гэтага жвавага, то вясёла-парыўнага, то маркотна-задуменнага саракагадовага чалавека, які даўно адчуваў, што багі ўсклалі яму на плечы занадта цяжкі груз.

Вось і сёньня, калі, скінуўшы шэры суконны каптан і застаўшыся ў кашулі-вышыванцы, сядзеў Альгерд у пакоі вялікага жраца, змагаючыся супраць таго касьцянымі выявамі варцобаў*, гаварылі яны пра тое ж самае.

– За апошнія стагоддзі язычніцтва амаль страціла свой жывы і яркі агмень, застаюцца вугольлі, а мы, жрацы, замест таго, каб шукаць дровы,

спрабуем на тых вугольлях засмажыць для сябе хто курапатку, а хто і быка – маркоціўся Лойка.

– Ці табе скардзіцца на лёс? Табе, якому багі адкрываюць болей за ўсіх астатніх жрацоў! – забіраючы з дошкі касьцянога гарцука-пешку, сарамаціў яго вялікі князь.

– Калі б не любілі мяне багі, то іншыя жрацы даўно прынесьлі б мяне самога ў ахвяру ці Перуну, ці Вялесу!

– Лепей тады Ладзе…

– Жартуеш, княжа! А між тым я кажу праўду. Жрэчаства абмялела душой, бы тая рэчка, страціла вешчы дух, і некаторыя храмы – сорамна сказаць! – падсылаюць да мяне пасланцоў, каб даведацца, ці будзе ўдалым твой будучы паход. Я ня раз раіў, як лячыць іхніх хворых, асабліва тых, у каго ўсяліліся злыя духі. А гэта ж павінны ведаць і яны самі!

– А нашто ты адгукаешся? Думай пра свой храм. Сварог жа некалі шанаваўся нароўні з Перуном, а цяпер больш занядбаны. Мяне яшчэ ў дзяцінстве вучылі, што ўсё жыцьцё трэба рыхтавацца да таго, каб цябе прыветна сустрэла Сварга*, а цяпер пра тое ўжо нават ня ўзгадваюць у храмах, – казаў Альгерд, перастаўляючы пешку.

– Старажытныя запаветы забываюцца. Хто цяпер пасадзіць на даху маладзіла, каб адвесьці гнеў Тора*? Расьліну тую цяпер месьцяць там, дзе паляць цела, яна стала магільнай, а прызваньне яе – славіць і павялічваць жыцьцё. І так перайначваецца многае. А пра іншыя храмы… Як жа не адгукацца? Там жывыя людзі, ім блага. Калі і я перастану душой балець за кожнага, багі адвернуцца і ад мяне. Такі закон сьвету.

– А па-мойму, закон сьвету – кожны за сябе і сваю сям'ю. За с в а ё Княства.

– І ты так ня думаеш, бо цябе вучылі лепшыя, чым цяперака, жрацы, але ты жывеш зямным, грэшным жыцьцём. Ты ступаеш, як на купіны ў балоце, на слабыя чалавечыя месьцейкі – хцівасьць, зайздрасьць, нянавісьць – і выйграеш, таму што яны сёньня кіруюць сьветам.

– Ну, ёсьць жа і дабро, вернасьць, адданасьць…

– Яны другасныя сёньня, а трэба, каб былі наперадзе. Тады сьвет ня будзе перакрыўляцца. А зараз ён перакрыўлены, і нават мы, жрацы, ня можам яго вярнуць да асноваў, на якіх ён быў закладзены багамі.

Альгерд задуменна круціў у руках пацямнелую, выразаную з зубрынае косткі постаць Жыжаля, якою можна падчас пэўнай камбінацыі зьняць з дошкі самога Перуна. На грудзях боства ледзь віднеўся старажытны рунічны знак – калісьці гэта быў балцкі Патолс, бог падземнага агню і памерлых продкаў.

Зямля, якою Альгерд валодаў цяпер і дзе быў вяршыняю, куды сыходзіліся памкненьні і спадзяваньні мноства люду, яшчэ з тых глыбінных часоў, куды сягалі легенды, калісьці належала балтам-жамойтам і аўкштайтам. Пасьля сюды прыйшлі славяне, і ўжо іхнія боствы пачалі авалодваць чалавечымі душамі і змагацца са старымі багамі. Але наступіў пэўны час, і ўсе яны – і славянскія, і балцкія багі зараз аб'ядналіся, каб выстаяць супраць новага, яшчэ больш магутнага бога, якому пакланяецца ягоная жонка Марыя і яе спадчыннае Віцьбескае княства, а яшчэ самае вялікае з усіх Полацкае, і тураўскае, і Заслаўскае...

Тут, на гэтай зямлі, яны ўсё яшчэ магутныя. Ды толькі і лепшыя са жрацоў – а Альгерд ведаў усе віленскія капішчы і тых, хто там валадарыў

– адчуваюць сваю слабасьць. Яна ў замутненьні, у зацьменьні агульнага чалавечага, а значыць і жрэчаскага Духу.

– Скажы мне, мудры Лойка, – асьцярожна пачаў ён, – багі ўсё ж адкрылі табе, што пакуль я жывы, мая дзяржава будзе вялікай, ад мора да мора. Але Нестар кажа, што нельга чалавеку зазіраць у будучыню, а трэба адно спадзявацца на міласьць Божую. Ці ня значыць гэта, што ён проста ня хоча нічога казаць пра тое, што будзе пасьля маёй сьмерці? Ня хоча гнявіць мяне, бо весьніку благога недарэмна калісьці адсякалі галаву. Ды і ты мне ніколі не казаў, што ж будзе пасьля мяне?

Худы, з глыбокімі маршчынамі пад упалымі шэрымі вачыма і на высокім ілбе, у белай ільняной кашулі і воўчымі каралямі на высокай шыі Лойка замаркоціўся:

– Колькі я ні тлумачыў табе, валадар, што багі – ня служкі, якіх мы выклікаем, калі захочам, ты ніяк не паверыш маім словам. Скажу табе адно – ня ведаю! Калі я прашу багоў адкрыць мне будучае нашай краіны, я бачу пажарышчы і людзей сярод багны, што, учапіўшыся адзін у аднаго, адначасна нікому не даюць выкараскацца наверх. А разам з тым – вышыні, аблокі і сонца. Так што мне ўвогуле часам здаецца, што мы ўсе, разам з нашай краінай, аднойчы ўздымемся ў Ірый і растанем там…

– А ў чым жа прычына таго, што мы, людзі, так мучым адзін аднаго, што зайздрасьць душыць нас, хаця жыцьцё такое кароткае?

Лойка не пасьпеў адказаць. У дзьверы пакою ціха пастукаліся. Жрэц незадаволена ўстаў, лёгка ступаючы, падышоў да дзьвярэй. Там стаяў спалоханы служка. Адштурхнуўшы яго, у пакой уварвалася і адразу бухнулася на калені нейкая дзяўчына. Альгерд з глыбіні пакою адразу пазнаў яе – гэта была пакаёўка вялікай княгіні Рэчыца. Лойка не пасьпеў нахмурыць бровы, як служка таропка пачаў тлумачыць, што пусьціў дзяўчыну толькі таму, што... Але Альгерд перабіў яго, адразу зьвярнуўшыся да Рэчыцы:

– Што з Марыяй?

І тут жа паправіўся:

– З вялікай княгіняй?

– Вялікі гаспадар, Родам і парадзіхамі клянуся, ня брала! Ня крала! – закрычала дзяўчына і на каленях папаўзла да яго. Зачапілася сукняй за парог і, парваўшы яе, рухалася далей, бесьперапынна выціраючы спалатнелы, заліты сьлязьмі твар. Рознакаляровыя стужкі з вяночка на галаве падалі на ейныя вочы.

Альгерд, гледзячы на яе, грозна вымавіў:

– Ты з-за нейкага свайго глупства насьмелілася сюды ісьці?!

– Не з-за сябе... З вялікай княгіняй… вохці мне, бяда… ой, нашто мне тыя смарагды! Я чужога на макавае зерне не вазьму! – калацілася перапужаная да паўсьмерці Рэчыца.

– Што ты пляцеш? Якія смарагды?

– Смарагдавыя каралі! Княгініны!

– Дык што з імі?

– Яны прапалі, зьніклі, нібы сам Лядашчык вынес іх праз комін! А цьвердзяць, што гэта я… Але ж я макавінкі…

– Хопіць! А княгіня?

– Я ж і кажу, што яна зьнямела і рукой не варушыць…

Тады вялікі князь жвава, як малады, ускочыў з крэсла:

– Каня, хутчэй! – загадаў ён – Гэтую… пад варту. З крадзяжом разьбярэмся пазьней. Паедзеш са мной, вялікі жрэц?

– Паеду, калі твой лекар Ганс не пакрыўдзіцца.

– Апранайся!

Альгерд імгненна нацягнуў на сябе каптан, увесь адразу як падцягнуўся, пастражэў. Небясьпека падхліствала яго дух, у ёй, як некаторыя птушкі ў навальнічных перападах над зямлёй, адчуваў ён сябе тым, кім яго і стварыла жыцьцё – барацьбітом і ўрэшце пераможцам.

Сьпяшаючыся і, як заўсёды, не пасьпяваючы за вялікім князем, улазіў у прасторны жрэчаскі плашч вялікі жрэц Сварога, у той час як служка таропка падаваў яму жэзл і востраканечную шапку з белага лямца, абшытую собалем, а другі служка надзяваў гаспадару на шыю каралі з мядзьвежых зубоў – абярог супраць нечысьці.

Пакуль не прыбег стражнік, што падагнаў да дзьвярэй Зьвера, які неахвотна ішоў са стайні, яны абое зразумелі з плачу Рэчыцы галоўнае: паралюш разьбіў княгіню Марыю тады, калі яна даведалася, што зьніклі яе любімыя, падораныя бацькам, віцьбескім князем, смарагдавыя каралі. Яны былі надзвычай каштоўныя – некалі з самой Візантыі прывезьлі іх полацкія князі, вяртаючыся пасьля высылкі на радзіму. Тыя смарагды суправаджаліся рознымі паданьнямі. Казалі, што адзін з іх, самы вялікі, ярка-зялёнага зьзяньня, быў тым, праз які некалі глядзеў на падпалены ім Рым сам жахлівы кесар Нерон.

Вешчуны Вільні ведалі, што смарагд – вешчы камень, праз іх Саламон мог бачыць будучае, а Альберт Вялікі цьвердзіў, што смарагды палохаюць нячыстую сілу і супакойваюць сэрца. Лойка, якому аднойчы на цэлую ноч перадалі тыя каштоўныя камяні ў сьвяцілішча, каб выгнаў з іх усё благое, правёў абрад ачышчэньня, аднак усё ж ня раіў доўга насіць іх на целе. Ён нават адкрыў валадарцы таямніцу, што рэчы, якія пераходзяць ад аднаго чалавека да другога стагоддзямі і асабліва тысячагоддзямі, пачынаюць жыць сваім уласным, асобным ад іхніх уладальнікаў жыцьцём, а часам і дарэшты забіраюць клёк у новых гаспадароў. Аднак княгіня Марыя нібыта трапіла ў палон да любай ёй рэчы: трымала каралі ў разьбяным сандалавым куфэрку каля свайго ўзгалоўя і часта надзявала на шыю падчас вялікіх прыёмаў у палацы. Яны нагадвалі Марыі заручыны з Альгердам, першы погляд на яго і імгненную дзявочую захопленасьць. Яна памятала, як востры позірк будучага мужа дапытліва спыніўся на ейным твары, затрымаўся на белай сукні і шыі, дзе пераліваліся смарагды (ёй казалі, што яны ўдала адцянялі зеленаватасьць вачэй), і памякчэў, і нібы аддаўся ў палон ейнай маладой вабнасьці.

Вось чаму зьнікненьне бацькавага падарунку вострым сярпом падкасіла княгіню, адняло ў яе мову і спаралізавала. А здароўе і жыцьцё гаспадарыні Княства – гэта ўжо ня толькі справа княжацкай сям'і. Гэта – вялікая палітыка. Таму і Альгерд, і Лойка сьпяшаліся: кожная хвіліна сапраўды магла пераважыць шалі Лёсу у той ці іншы бок.

– Выклікаць кашталяна, а таксама вознага і земскага! – распараджаўся Альгерд, пакуль слуга нацягваў на яго падбіты мехам плашч. І тут жа,

прапусьціўшы наперад жраца, разам з ім зьнік у зімовай віхуры, што шалёна крутанула дзьвярыма.

Ніхто не заўважыў, як упаў і адкаціўся пад лаву драўляны Пярун з шахматнай дошкі і застаўся ляжаць там, забыты ў мітульзе. Толькі Лойка, вярнуўшыся з палаца, узгадаў пра яго і пасьля доўга стаяў пасярэдзіне сьвятліцы, углядаючыся ў абрысы старажытнай, адпаліраванай пальцамі многіх папярэднікаў постаці вярхоўнага славянскага бога, нібыта тужліва ўглядаўся ў невядомае і неспасьцігальнае будучае…

***СЬВЯТА ДАЖБОГА***

Разьбяныя галовы ільвоў на парэнчах загадкава і, як заўсёды, трохі адрачона выглядалі з-пад доўгіх парчовых рукавоў сьвяточнага кунтушу* вялікага князя. Альгерд, адбыўшы вялікае служэньне ў храме, сядзеў на абедзенным крэсьле, над якім, здаецца, яшчэ бачыўся цень папярэдняга валадара, і госьці перашэптваліся, наколькі сёньня ён падобны да свайго бацькі Гедзіміна: нахмураны лоб, спакойная, абцяжараная многімі дзяржаўнымі клопатамі веліч, асабліва ж пастава галавы, на якой зьзяў залаты княскі абруч з каштоўнымі камянямі, што час ад часу адсьвечвалі чырвонымі, зялёнымі і малінавымі зіхоткімі іскрынкамі.

Гасьцей за вялікімі сьвяточнымі сталамі было шмат: замежныя паслы, паны-рада, зацныя людзі Вільні, купцы. На фоне чырвонай плінфы сьценаў іхнія аксамітавыя, парчовыя, шаўковыя каптаны, залатыя і срэбныя фібулы, гаплікі, апухі рукавоў выглядалі ўпрыгожаньнямі самой залы, яе неад’емнымі складнікамі. Сярод іншых выдзяляліся жрацы. Яны сядзелі на асобнай лаве ў сваіх высокіх белых каўпаках, з жэзламі ў руках і белых ільняных кашулях, на якіх магічнымі ўзорамі былі нашытыя залатыя і сярэбраныя кругляки-абярогі. Адзіная жанчына сярод іх, Нара, вялікая жрыца Лады, на гэты раз уразіла ўсіх ярка-чырвонай сукняй, на якой золатам былі вышытыя трохкутнікі – на грудзях і на лоне. Сукня была з найтанчэйшага шоўку, таму ўсё зграбнае цела жанчыны, асабліва ейныя грудзі і выразныя гузічкі вялікіх сасочкаў, былі як выстаўленыя на агляд, ад чаго жарсьцю, нягледзячы на строгую цішыню першых хвілінаў урачыстага абеду, запальваліся позіркі мужчынаў.

Жанчын было няшмат. Усё гэта былі жонкі самых зацных мужоў Вільні, і на кожнай было столькі ўпрыгожаньняў, што, як пажартаваў блазен Альгерда Костка, кожная коштам была з добры карабель, так што можна было пускаць іх уніз па Вяльлі.

Клопатамі як Лойкі, так і прыдворнага лекара Ганса ўстала са свайго ложа і цяпер цяжка сядзела побач з мужам вялікая княгіня Марыя, стараючыся, каб мноства цікаўных вачэй не ўпалявала таго, што рука, якою яна трымае лыжку, калодай ляжыць на стале і амаль ня рухаецца.

– Слухай, госьці пярэстыя, як птушкі ў матуліным пакоі, – шапнула старэйшая князёўна Ганна сястрычцы Еўне. Сапраўды, княгіня Марыя трымала ў сваіх пакоях мноства яркіх, як баяры ейнага двара, замежных птушак і часта раніцай ляжала ў ложку гадзінамі, разглядаючы сваіх улюбёнцаў і слухаючы іхнія галасы. Цяпер яна пачула голас дачкі і востра глянула ў ейны бок, адначасна скоса пазіраючы на свайго духоўніка Нестара, нібы баючыся прапусьціць кожны самы нязначны ягоны рух. Трывога была ў ейным паглядзе, і нешта задушлівае, як перад навальніцай, вісела ў вялізнай залі, хаця хіба маглі заўважыць высокія госьці, што

сёньня не было дваіх звыклых для большасьці з іх княскіх слугаў: ні Рэчыцы, ні падчашніка Няжылы, які звычайна рабіў сэрвіроўку сьвяточнага абеду. А яна была няпростаю: трыста сорак сярэбраных тарэлаў стаялі на доўгіх, тканых княжацкімі, яшчэ Гедзімінавымі ініцыяламі настольніках, а паміж імі месьціліся велізарныя падносы з закусьсю: мочаным гарохам, яблыкамі, рэдзькай і іншай бацьвінай*. Кіраваў усімі слугамі стольнік: ён толькі паварочваў галаву – а тыя ўжо ляцелі да гасьцей, несучы то смажаных качак на срэбных падносах, то вялізных, з чалавека, шчупакоў, то наліваючы ў масіўныя кубкі з прыгожымі пукатымі ўзорамі медавіцу, настояную на руце і сьвятаяньніку.

Усе елі са смакам. Ежа ня лезла ў рот толькі аднаму Кругляцу, які сядзеў у канцы стала.

Учора вечарам Кумец прыбег да яго ў такім выглядзе, у якім, мабыць, ніхто ніколі ня бачыў прыгожага, заўсёды ўпэўненага ў сабе памочніка лоўчага: парваныя на грудзях брунатнага каптана аплікі, на бурскіх* дарагіх партах чорныя пырскі, лісіная шапка з зялёным аксамітавым верхам стаяла на галаве тырчком. Ён задыхаўся ад гора. Высьветлілася, што кашталян замку Нарбут, возны Сухта і земскі Капец дапытвалі ўчора Рэчыцу, і яна сказала, што ўкрала смарагдавыя каралі ў вялікай княгіні і аддала іх свайму жаніху Няжыле, якога тут жа схапілі і кінулі ў ніжняе падзямельле замку, дзе трымаюць толькі самых вялікіх злачынцаў.

– Яго, мабыць, катуюць там, а я нічога не магу зрабіць! Я рваўся да вялікага князя, але кашталян сказаў, што пасадзіць і мяне, калі я буду перашкаджаць сьледству. Я хацеў сустрэцца з Сухтам – мы добра знаёмыя, – але і ён мяне не прыняў!

– А можа, нячысьцікі сапраўды спакусілі дзяўчыну на гэткае злачынства? – асьцярожна запытаўся Круглец, зачыніўшыся з Кумцом у самым аддаленым пакоі, каб іх не падслухаў ніводны са слуг.

– Я магу прайсьці вялікі агонь праўды*, каб даказаць, што брат мой ня злодзей і ня дурань, бо такую каштоўнасьць нават прадаць ня так проста! Ды і хіба патрэбныя яму гэтыя каралі! – гаварыў Кумец, захлынаючыся словамі. – І можа, Рэчыца таксама ня брала іх. Бо яе відавочна прымусілі паказаць на Няжылу! Але навошта?!

Яны доўга абмяркоўвалі, як і да каго трэба зьвяртацца, каб даведацца, што ж адбылося насамрэч. Цяпер, на гэтым сьвяточным абедзе, куды на вялікае зьдзіўленьне хлопца запрасілі і сына пасла Леся, Круглец абдумваў магчымасьць зьвярнуцца альбо да самой вялікай княгіні, альбо да земскага Капца, якога ён ведаў з дзяцінства. Як дазнацца пра вытокі гэтага незвычайнага крывапрысяжства, калі нявеста сьведчыла супраць свайго жаніха? Што стаіць за ўсім гэтым? Ён і сумняваўся, і верыў Кумцу, якога ведаў з дзяцінства. Ведаў яго праўдзівасьць і разам з тым лёгкадумнае жаданьне ўцехі, таму і ня надта хацеў для сваёй сястры Уны такога мужа. Захапляўся Кумцовым умельствам у стральбе – і зьдзіўляўся нежаданьню таго хоць зрэдку зазірнуць у скрыпторый і даведацца мудрасьці старажытных.

Толькі што скончылася агульнае маленьне ў гонар Дажбога – жрацы ўсіх віленскіх храмаў сьпявалі сьвяшчэнныя гімны так, што ледзь ня ўвесь горад сабраўся пад сьцены княжацкага Горняга замку, і ў чыстым весна-

вым паветры, здавалася, можна было ўбачыць, як ціхаструйным воблачкам падніmaліся да вечных багоў чалавечыя малітвы. Сьпевы доўжыліся ледзь ня тры гадзіны, і цяпер, усеўшыся за доўгія дубовыя сталы, усе згаладнела накінуліся на прысмакі так, нібыта ня елі цэлы год.

Паступова хрумст, чмоканьне, пыхценьне, з якім стараліся госьці спатоліць голад, сьціхалі. Нара пасьля кароткага роздуму ўсё ж загадала пакласьці сабе на тарэлу кавалак фаршыраванага шчупака. Яе пульхныя, заваблівыя вусны час ад часу сьціскаліся ў жорсткую лінію. Яна чакала перапынку, калі лоўчыя, па просьбе Бурылы, пакажуць на замкавым двары новага сокала, якога прыслалі ў дар Альгерду з двара цьвярскіх князёў. Там абавязкова будзе гэты прыгажунок Кумец. Ён і не здагадваецца, што нанесены брату ўдар хутка насьцігне і яго самога. Ня толькі Бурыле, але і ёй патрэбная помста: хлапец пасьмеў збегчы, калі сьвяткавалі Сарaкі і калі яна сама прыслала да яго знак асаблівай увагі. Пазьней яшчэ раз са служкай Вольхай вялікая жрыца перадала Кумцу запрашэньне ў храм. У адказ памочнік лоўчага ахвяраваў храму дарагі падарунак – скрутак парчы, але сам туды не зьявіўся. Разьятраная, яшчэ ажно два разы яна пасылала ганцоў, апошнім жа разам з пасланьнем на бяросьце, абвінаваціўшы ў тым, што ён зьняважае саму багіню каханьня, але Кумец нават не адказаў.

За ўсе тыя злачынствы пакараньне яго чакае ня меней жорсткае, чым Няжылу. І сьмерць тая лёгкаю ня будзе.

Нара раздумліва выпіла глыток медавухі. Неўпрыкмет абвяла вачыма залу.

Але гэта залежыць ад таго, ці будзе сёньня на ягонай шыі хрысьціянскі крыж. Праверыць гэта павінна Гайна, каханка Лелюша, вернага слугі вялікай жрыцы. Дзяўчына ўжо ціха шапнула Нары, што Кумец, чакаючы перапынку сьвяточнага абеду, разам з іншымі лоўчымі і з сокаламі сядзіць унізе, у каморы, побач з вялікім лоўчым.

Нара спадцішка ўглядалася ў румянкавы, з прыжмуранымі шэрымі вачыма і ледзь прыкметным шнарам на шчацэ твар вялікага князя – яму зараз давядзецца прымаць няпростае рашэньне, і яна ведала, што яно павінна быць на карысьць жрацоў. У яго проста няма іншага выйсьця!

Яна чакала сігналу. І вось Гайна, якая служыла князёўнам, падаючы ім то вышытыя бялюткія ручнікі, то мяняючы кубкі, ледзь прыкметна кіўнула галавой. Нара ўсьміхнулася, глянуўшы на Бурылу. Усё ішло так, як задумалі яны. Павуціньне было сплеценае. І яны цярпліва чакалі, пакуль туды патрапіць няшчасная маленькая муха. Спачатку адна, за ёю – яшчэ і яшчэ...

Нарэшце Альгерд зрабіў знак кашталяну, і той гучна абвесьціў гасьцям, што зараз, пакуль на сталах паставяць новыя заморскія прысмакі і пірагі, яны змогуць убачыць новага княскага сокала.

Забава гэтая, што завялася ва ўсіх княскіх дварах, каштавала нямала. За вывучанага сокала маглі заплаціць як за некалькі кніг альбо за цэлы табун коней. І таму ўсе валам павалілі ў двор, дзе ўжо стаяў галоўны лоўчы, а за ім яго памочнікі. Кумец, у жоўтай атласнай кашулі і аблямаванай вавёрчынай скуркай шапцы, трымаў на парчовай рукавіцы новага сокала. Галава ў птушкі была накрытая лёгкім скураным каўпачком, магутныя лапы спакойна і ўчэпіста трымаліся за рукавіцу.

Калі госьці ўладкаваліся ля замкавай сьцяны і кашталян падаў знак

пачынаць, усё сьціхла ў напружаным маўчаньні. Княгіні падставілі разьбяное крэсла, яна цяжка села ў яго, раўнадушна гледзячы перад сабой.

Галоўны лоўчы коратка крыкнуў, і адзін з падручных страсянуў мяшок, які трымаў у руках. Адтуль вываліўся брунатна-шэры заяц і, на імгненьне азірнуўшыся, ашалела скокнуў наперад і пайшоў бязладна сігаць туды-сюды па вялікім прасторным двары. Усе погляды гасьцей зьвярнуліся да Кумца і сокала, з якога хлопец не сьпяшаючыся зьняў каўпачок. Птушка імклівa, як сарваная са спружыны, узьляцела ўверх, і, не пасьпелі прысутныя апамятацца, як яна маланкай сьлізганула ўніз. Раздаўся тонкі заечы крык, сокал узьняўся далёка ўвысь, трымаючы ў сваіх вострых, як лезівы, кіпцюрах перапалоханага зьвярка, але, па кароткай камандзе Кумца, плаўна паруліў на ягонае плячо. Другі памочнік перахапіў зайца, з якога цурком сьцякала кроў, выдраў яго з сокалавых кіпцюроў і кінуў у мяшок. Паляваньне адбылося так хутка, што госьці нейкі час стаялі аслупянела, пасьля загучалі пахвальныя крыкі, і задаволены Альгерд паклікаў да сябе галоўнага лоўчага і Кумца – мабыць, каб узнагародзіць абодвух.

І тады вялікая жрыца, дачакаўшыся, калі Кумец будзе праходзіць міма і ўсе погляды скіраваныя на яго, спыніла памочніка лоўчага, учэпістажорстка, але з лагоднай усьмешкай узяўшы таго за рукаў.

– Пакажы, Кумец, рысіныя зубы, якія табе, кажуць, падарыў братзлачынца. Магчыма, некалі ён аддасьць табе і смарагдавыя каралі, на якія можна купіць палову Вільні!

Яна добра ведала, калі і пры якіх абставінах нават ціхія словы прагучаць аглушальна. Усё адразу сьціхла. Гаманліва-рознакаляровая купа прыдворных нібы скамянела. Круглец, які стаяў у купе прыдворных, адчуў, як глуха тахнула ягонае сэрца. Увесь час ён адчуваў набліжэньне бяды – і яна прыйшла спачатку да Кумца, якога, як ён здагадваўся, кахала Уна. А значыць, бяда прыйшла і ў іхні дом.

– Дык пакажы! – працягвала Нара.

Знарок ляніва, як бы гуляючы, яна пацягнулася да грудзей лоўчага, не адпускаючы яго (Кумцу здалося, што ейныя кіпцюры, нібы ў страшнай Стрыгі, імгненна вырасьлі і ўпіліся ў ягонае сэрца), расшпіліла аплік, другі… Нізкі яе голас прагучаў для хлопца аглушальна:

– Ды ў яго тут, аказваецца, крыж! Ты – хрысьціянін?

І амаль імгненна з купы жрацоў пачуўся гучны голас Бурылы:

– Якая ганьба!

І слугі, што стаялі за вялікім жрацамі, зладжана падхапілі:

– Ганьба!

– Якая ж гэта ганьба? – падаў голас Нестар. – Отрак сей спадобіўся Хрыста, як і вялікая гаспадарыня наша…

Але ягоны голас патануў у воклічах, што, здаецца, ляцелі з усіх куткоў вялізнага двара:

– Ягоныя дзяды ў сваіх дубовых калодах перавернуцца!

– Попел іх у пыл ператворыцца!

– Вось чаму і брат яго стаў злодзеем!

І, нарэшце, грозна і гучна раздалося з купы жрацоў:

– Ты абяцаў нам, князь Альгерд, што твая жонка і яе служка ня стануць спакушаць нашых вернікаў!

Вялікі князь, які стаяў сярод усяе гэтай мітусьні адзінока і спакойна,

назіраючы за тым, што адбываецца, дачакаўся цішыні. Усе глядзелі на яго. Ён гэтак жа спакойна і велічна зьвярнуўся да Кумца, што той, падобны да толькі што злоўленага зайца, нібы здранцьвеў у кіпцюрах вялікай жрыцы:

– Я апекаваўся табой, як сынам, бо бацька твой шмат выручаў нас у паходах. І ведаю, што ты не адрокся ад старадаўняй веры. Дык скажы праўду: крыж ты носіш толькі з павагі да княгіні, ці ня так?

Гэта была падказка. Выратавальная вяроўка, па якой грэшнік з бездані выкараскваецца наверх. Бурыла пачырванеў так, быццам уся кроў ударыла яму ў галаву. Кумец паглядзеў на Марыю. Яе заступніцтва магло б дапамагчы. Яна бачыла яго ў храме. Значыць, для Альгерда ў тым таксама не было сакрэту. Але цяпер, выкрытае перад усімі, яго хрышчэньне сапраўды выглядала злачынствам.

Вялікая княгіня млява і няўцямна глядзела перад сабой. Яна, мабыць, нават не разумела, пра што ідзе гаворка. Уся яе пастава сьведчыла: ёй блага, яна вось-вось страціць прытомнасьць, але стараецца трымацца ў крэсьле, нібыта яно, крэсла, само жыцьцё, якое ёй так ня хочацца пакідаць.

Гурба людзей напружана чакала, што ж адкажа Кумец. І той, бледны, як мярцьвяк у дубовай калодзе, ня мог расьціснуць зьледзянелых вуснаў. Ён, які не ўздымаў вачэй на навакольных, а бачыў толькі Гаспадара і ягоную жонку, раптоўна нейкім неспасьцігальным чынам спасьціг бязьлітаснасьць зялёных вачэй Бурылы, старанна схаванае акруценства* кашталяна Нарбута, аблуднае і халоднае лязо вуснаў Нары. Узгадаў вокамгненна, як два гады таму на ловах вялізны сякач са страшнымі паўмятровымі іклямі пратараніў і раскідаў ахову Альгерда. І ён, Кумец, кінуўся напярэймы, пасьпеўшы за якое імгненьне да непапраўнага ўсадзіць свой востры корд якраз у разьятранае сэрца кабана і выратаваць гаспадара Княства.

– Не маўчы – кажы!

Нешта ўсё ж паспрабавала выказаць вялікая княгіня, але рука Альгерда непрыкметна сьціснула яе так, што Марыя ледзь не закрычала.

– Твой брат злодзей, так, але ты... ты заўсёды верна служыў багам і мне. Я ведаю, што сьвяцілішча Лады заступіцца за цябе.

Маўчаньне запанавала пасьля гэтых слоў вялікага князя. Але доўжылася яно нядоўга.

– На Саракі ён абразіў маю багіню, ён адмовіўся ад абраду і зьбег. Куды? Цяпер я ведаю – у царкву. Не, я не заступлюся за яго, – цьвёрда сказала Нара, і ярка-сінія вочы яе заблішчэлі помстай.

– Тады жрэц Бурыла пацьвердзіць, што адна з самых верных прыхажанак ягонага сьвяцілішча – маці Кумца, – мерна казаў Альгерд.

– Маці – так, але ён пры ўсіх казаў свайму брату, што прыносіць ахвяры Перуну жорстка і неразумна. У мяне ёсьць сьведкі, – павольна-змрочна, ды вельмі выразна вымаўляючы склады, аспрэчыў князевы словы вярхоўны жрэц. – У цямніцу яго, гаспадар!

І, здалося, увесь двор разам ускрыкнуў:

– У цямніцу яго!

Але Альгерд не здаваўся. Ён нібыта хацеў удыхнуць у маладога лоўчага сваю сілу і ўпартасьць:

– Кажы: гэтага не было?

– Кажы! – уклаўшы ўсю сілу перакананьня ў свае словы, выгукнуў

і Круглец. Трэба ратавацца зараз, бо праз імгненьне можа быць запозна. І ён яшчэ раз, перакрыўшы галас, што ўзьняўся пасьля ягонага крыку, паўтарыў:

– Гавары! Не было, не!

Круглец абвёў вачыма вялікі гурт людзей, што глядзелі на яго: хто са злосьцю і нянавісьцю, а хто і са спачуваньнем. Можа, варта ратавацца – прынамсі, хаця б паспрабаваць. Але тады… Чаго тады вартыя ягоныя словы, ягонае рашэньне прыняць хрост? Сумленны чалавек ня можа хлусіць, як многія з гэтых людзей, што вучаць людзей і кажуць ім прыгожыя словы, але самі ня вераць у іх.

І тады Кумец як страпянуўся. Ён вырваў рукаў з кіпцюроў вялікай жрыцы і сказаў гэтак жа гучна, як і Бурыла:

– Было.

І ў раптоўным здранцьвеньні натоўпу разьнесьліся ціхія, але вельмі спакойныя словы, зьвернутыя да жрацоў:

– Я даўно спавядаю Хрыста і люблю яго ўсім сэрцам. Ён ня жорсткі, як вы. Ён ня хцівы, як вы. І ён ніколі ня хлусіць, як хлусіце вы, вялікія жрацы, што даўно ашукалі сваіх багоў гэтак жа, як і сваю паству.

І тады ўсё зноў закружылася, завіравала, загаласіла – галасамі Нары і Бурылы, загадамі Альгерда і ваяводы, сьлязьмі Марыі, роспачным воклічам Кругляца.

Праз якую гадзіну закуты ў жалезьзе Кумец вісеў на сьцяне страшнай падземнай вязьніцы, страціўшы прытомнасьць ад нязвыклага і неспадзяванага болю. А брат яго Няжыла, пачуўшы, што некага таксама кінулі ў каменны мяшок, крычаў у сьмярдзючую цемру падзямельля, а драўляны ашыйнік бязьлітасна ўпіваўся ў яго надзьмутыя ад напружаньня жылы:

– Хто там, гэй! Хто там ёсьць? Перадайце вялікаму князю і майму брату, што я не вінаваты! Перадайце, чуеце?!

## *АЛЬГЕРД*

Сьвяшчэнны дуб высока і вольна ўзносіў свае жылістыя, натруджаныя доўгімі гадамі рукі-галіны над пагоркам каля сьвяцілішча Перуна.

Прыціснуўшыся да яго сьпіной, вялікі князь Альгерд адчуваў, як спакойна, нібы празрыстая вада ў жарале крыніцы, струменіцца па ствале магутная сіла, якая перадаецца і яму. Пастаўшы вакол дуба, жрацы сьпявалі сьвяшчэнны гімн, зьлёгку прыстукваючы драўлянымі дошчачкамі ў канцы кожнай страфы.

Мову, на якой яны нараспеў прамаўлялі казаньні, Альгерд добра разумеў – у дзяцінстве яго вучылі ўсяму, што спатрэбіцца для валадара. Ведалі яе і браты вялікага князя. Але сёньня княжаты, мабыць, забыліся на тыя заняткі – заняўшыся кожны сваім удзелам, яны больш ваявалі, чым прыходзілі да жрацоў. І сам ён, калі быў толькі валадаром Віцьбеску і Крэва, таксама, як і ўсе яны, бясконца круціўся ў віры падзей, якія скаланалі княства.

Толькі стаўшы вялікім князем, шмат часу стаў ён аддаваць сьвяцілішчам. Жрацы былі сілай, якая цяпер толькі і магла зьмесьці яго са стальца. Нягледзячы на тое, што войска Альгердава было яму вернае і ня раз даказвала сваю перавагу над нахабнымі і фанабэрыстымі

крыжакамі, усё ж чым яно было ў параўнаньні з чалавечым мурашнікам, які шчыраваў тут, у сталіцы? Покліч жрацоў – і мурашнік гэты імгненна аблепіць яго, ягоных вояў і жменьку купцоў-хрысьціян, абсмокча і згрызе да касьцей, як згрызаюць нябачныя простым вокам зяпы мурашак зьмяю, што трапіла да іх. Яна яшчэ выгінаецца, сіпіць, а хвост яе і тулава на вачах распаўзаюцца, адкрываючы белыя храсткі шкілету…

Вось такі кліч можа кінуць і вярхоўны жрэц Бурыла, які ўгодліва, з ветлай усьмешкай зазірае яму ў вочы. Але пад гэтай мяккасьцю і лагоднасьцю – жалезная воля, гадамі інтрыг замацаваная і крывёй палітая ўлада. Кейстут, магутны брат, і той схіліўся перад Бурылам, просячы ягонай падтрымкі, каб скінуць Яўнута. І вялікі жрэц Перуна абяцаў дапамогу, узамен атрымаўшы нямала золата і каштоўных камянёў. Але галоўнае, чаго патрабаваў Бурыла, – каб хрысьціянам не было аніякага спрыяньня пры двары, каб двор вялікага князя цалкам заставаўся язычніцкім. І Альгерд абяцаў яму тое. Вось чаму, як бы не заўважаючы хрышчэньня Кумца і Кругляца, хаця, вядома, пра тое дакладала яму Марыя, ён змушаны быў рабіць выгляд, што дазнаўся аб тым толькі прылюдна, быў змушаны падтрымліваць Бурылу.

Маўчаньне панавала ў Вільні, калі Яўнут у адным кажушку зьбег з замку, хаваючыся ад братоў. А скажы колькі слоў Бурыла, а за ім Мікша, Нара ды іншыя вярхоўныя жрацы – і натоўп, страшны сваёй непахіснасьцю і верай у волю багоў, адрэзаў бы ім дарогу да замку, і нічога не змаглі б зрабіць праслаўленыя Альгердавы і Кейстутавы воі.

Вось і цяпер, скончыўшы сьвяшчэнныя сьпевы, Бурыла выступае наперад, схіляецца перад князем:

– Табе добра зараз, вялікі гаспадар? Ці прыйшла да сябе СІЛА?

Некалі ён сатрэ гэтую ўсьмешку на жабіным твары, згасіць затоенанасьмешлівую іскрынку ў вузкіх зялёных вачах! Але зараз Альгерд адказвае спакойна і ветла, і румянак на яго шчаках ня блякне ад гневу, што закіпае ў самых патаемных закутках душы:

– Дзякую, вялікі жрэц. Тваё слова, як заўсёды, дайшло да багоў.

Ён устае, бярэ з рук новага падчашага, што замяніў Няжылу, срэбную брэцьяніцу, куды той налівае віна і мёду, і пырскае гэтай сумесьсю на дуб. Брэцьяніцу ж як падарунак перадае Бурылу. Зялёная іскрынка ўспыхвае ў вачах жраца: па баках чашы залатой вязьзю ўпаяныя два цёмна-барвовыя рубіны вялікага кошту.

– Прашу да майго стала, вялікі гаспадар – зноў схіляецца перад ім жрэц. І ласкава падтрымліваючы князя пад руку, вядзе з пагорку. Асьцярожна пытаецца:

– Ці не было ў цябе, калі сядзеў пад дубам, колікаў у баку?

Альгерд зьдзіўлена глядзіць на валасатае вуха вярхоўнага жраца.

– Былі, вялікі жрэц, але хутка прайшлі. Але адкуль ты ведаеш пра тое?

І загадкава ўсьміхаецца Бурыла:

– Я многае ведаю, вялікі гаспадар. Нават пра тое, што ты шкадуеш братоў-хрысьціянаў Кумца і Няжылу. Што рашэньне тваё няцьвёрдае. Але зараз, кажуць багі, цябе чакае больш важнае: на вагах быцьця і нябыту жыцьцё тваёй жонкі. Яна разбурыла капішча Рагуціса. І нехта павінен выкупіць тую віну. Дык няхай гэта будуць лепей два маладыя прыдворныя, чым вялікая княгіня.

Трывога мацней апаноўвае Альгерда. Як лоўка яны прыдумалі! На адным баку ў яго сэрцы Марыя, на другім – два маладыя прыдворныя. Ці ж будзе ён выбіраць?! Усё разьлічана правільна. Але вялікі князь спрабуе супраціўляцца:

– Мая жонка не старая. Магчыма, прыдворны лекар яшчэ паставіць яе на ногі.

Рука ў Бурылы нібы расплываецца пад локцем Альгерда:

– Хлеб паказаў, што лекар гэтую хваробу не адолее. І агонь у печы сказаў тое ж. Яна ўжо ступіла на дарогу да Ірыя. Але можна, можна яшчэ вярнуць яе адтуль! Калі ты вырвеш з сэрца шкадаваньне да хрысьціянаў. Калі мы ўбачым, што сэрца тваё цалкам аддадзенае старым багам!

– Гаданьне на хлебе? Вы пасьмелі без мяне гадаць на Марыю, кранаць яе?! – вялікі князь аднак асекся. Ня час, ня час сварыцца з Бурылам... І ўсё ж – няўжо т а к і м быў вынік гаданьня? Здаўна кожны ведаў гэты старажытны звычай: хвораму клалі падмышкі па кавалку хлеба. Калі да раніцы хлеб засыхаў, гэта сьведчыла аб тым, што хворы мусіць разьвітвацца з жыцьцём. Але Марыя нічога не казала яму пра гэта! Можа, ёй паклалі хлеб, апаіўшы макам, альбо соннай, калі прытомнасьць пакінула яе?

І Альгерд адчувае, як дробна пачынае дрыжаць у ім страх. Жрацы зьведалі тое, што пакуль было таямніцай для яго, гаспадара Княства, бо ён верыў, што самае страшнае для княгіні яшчэ далёка наперадзе, што яна выкараскалася з небясьпечнай хваробы і маленьні жрацоў дапамаглі ёй. Яны паслухалі і печ, якая стаіць у княгінінай лажніцы*. Калі ўсё гэта праўда... Хуткая сьмерць Марыі можа сапраўды істотна пагоршыць яго становішча: Віцьбеск адразу пачне думаць не аб ягоных інтарэсах, а аб сваіх уласных – сапраўдным спадчынным князі, сынах Альгерда. А ці можа ён давяраць уласным дзецям? Ці не захоча старэйшы Андрэй адасобіцца?

І што такое, сапраўды, жыцьцё двух хлопцаў перад вялізнымі, на паўсьвету, праблемамі Вялікага княства, створанага такімі намаганьнямі, такой крывёй і потам?!

Бурыла ўсьміхнуўся, прачытаўшы ў вачах князя рашэньне, у якім ён ніколькі не сумняваўся.

– Загад аб тым хутка будзе падрыхтаваны. А тады я перадам у твае рукі Кумца. Няжылу, як злодзея, будзе судзіць суд зямны!

– Ты мудры валадар. Але дазволь паправіць: я ўсяго толькі адзін са жрацоў. І таму не ў мае рукі ты аддасі нягодніка, а на агульны суд вешчых старцаў...

Бурыла ледзь хаваў сваю радасьць. Было чым ганарыцца: аддаючы ім Кумца, вялікі князь прызнаваўся ў сваёй слабізьне, не разумеючы, што гэта толькі пачатак. Хутка чарга дойдзе і да іншых. Да дому нядаўна ўсемагутнага Леся, да яго сына Кругляца. Да недаступнай пакуль Уны...

## *У ВЯЗЬНІЦЫ*

Пацук грыз ягоны бот, і толькі калі востры, як нож, зуб упіўся ў нагу, Няжыла прачнуўся, тузануў нагой. Тлусты і моцны, як вепручок, зьвярок адляцеў у кут, коратка віскануў і зьнік.

Абуджэньне было такім цяжкім, нібыта падземныя гарцукі* ператварылі ягоныя ногі ў жалезьзе. Няжыла памацаў нагу – не, ягоныя ногі на

месцы, проста іх да аняменьня сьціснулі драўляныя калодкі. Навобмацак дрэва было гладкім – мабыць, яго сваімі целамі адпаліравалі ранейшыя вязьні. Хлопец адчуў, што палец пачынае балець і тачыцца крывёй.

Учора ён шмат крычаў. Непадалёку, за павароткай доўгага цёмнага калідора, да жалезных уступаў у сьценах прыкавалі нейкага збродня. Збродня – таму што нават не адгукаўся ні на крыкі, ні на заклікі. І цяпер Няжыла сам не хацеў яго клікаць зноўку. Зараз наглядчык прынясе міску сьмярдзючай поліўкі, якая на кароткі час залье агонь, што цяпер увесь час смактаў ягоныя вантробы. І ён цярпліва чакаў ужо знаёмых крокаў на калідоры.

Наглядчык Заяц не ішоў – ляцеў да свайго вязьня. Радасьць, мабыць, перапаўняла яго. Ён ведаў навіну, якою хацеў дабіць маладога прыдворнага, якому зайздросьціў нават цяпер, калі яго дарагі, з белай воўны каптан ператварыўся ў рызьзё, а тонкія юхтавыя боты былі абгрызеныя пацукамі. Заяц не паднёс, а шмарганўў на падлогу драўляную тарэлу з поліўкай, а ягоныя словы нібыта секлі няшчаснага, змучанага вязьня гострай, як сьмерць, шабляй:

– Ну во, абодва саколікі папаліся! Былі сакаламі, цяпер палятаеце дробнай пташачкай! Ды дзе там палятаеце – поўзаць будзеце, як вужы!

– Што ты вярзеш?

– Браток твой таксама тут! Вялікаму князю пасьмеў пярэчыць, затое цяпер язык у яго зацугляны!

– Кумец тут?!

– А дзе ж? Тут яму самае месца! Каптан яго дастаўся мне, у пару прышоўся! Во, паглядзі!

Прыжмурыўшыся, Няжыла сапраўды пазнаў малінавы, са срэбнымі кругамі на плячах, каптан брата.

Ён завыў, нібы паранены воўк, нагой паддаў тарэлу, поліўка палілася на жмут гнілой саломы, дзе ён ляжаў.

– Скуголь, скуголь, ты, зладзюга, і няхай цябе чуе і служка мёртвага бога! – зьдзекліва глядзеў Заяц.

– Што я табе зрабіў, скажы? За што ты так мучыш мяне? – прастагнаў Няжыла.

Нахабны пацук зноў вылез з дзіркі, прабраўся да саломы і цяпер прагна грыз мясьціны, дзе пралілася поліўка.

– За тое, што ты спаў на мяккай пярыне, еў на срэбры! – вызьверыўся наглядчык. Яго круглы, з маленькім кручком-носам і складзеным у гусіную гузку ротам твар расчырванеўся.

– За тое, што княгіня дазваляла цалаваць ручку, а князёўны табе… табе! усьміхаліся! Мне дык толькі і шэнціла ў гэтым жыцьці, што на цемру ды вязьніцу, на злодзеяў ды на поліўку! Паскавычаш цяпер і ты!

Заяц так скакаў і рагатаў, такая грымаса крывіла яго рот з гнілымі аскабалкамі зубоў, што Няжыла раптоўна супакоіўся.

– Значыць, багам заўгодна, каб я трапіў да падземных духаў, і Пярун ад мяне адступіўся. А ты не наглядчык Заяц, а Злыдух, і ад цябе я адцураюся тройчы.

І ён тройчы прачытаў напамяць заклінаньне ад Злыдуха, якому з дзяцінства навучыла яго маці. Але Заяц ня зьнік, ён толькі сьціх і, выцягнуўшы шыю, чакаў, што адбудзецца. Убачыўшы, што багі яго не караюць, зноў пасьмялеў:

– Не, тут табе не падземны сьвет. Гэта вязьніца самога вялікага князя, тут сядзяць яго ворагі і ворагі нашых багоў. Твой брат вораг багоў, а ты – вораг князя. Тут вам самае месца.

Няжыла нават не заўважыў, як Заяц перад тым, як выйсьці, нагой паддаў нахабнаму пацуку так, што той пранізьліва завішчаў. Навіна яго прыціснула, цяжкім камлём легла на душу. Ён падумаў пра тое, што ўвечары прыйдзе іншы наглядчык, Ліс, а той дабрэйшы, чым Заяц, і ад яго можна будзе даведацца, што ж здарылася з братам.

Кумец! Няжыла памятаў яго маленькім хлопчыкам, які ўвесь час стаяў ля бычынага пухіра, стараючыся праз яго разгледзець белы, у прыхаматлівых карунках зімовы сад насупраць іхняй мураванкі. Помніў яго ў школцы пры замку, дзе той, высалапіўшы язык, старанна крэмзаў жалезным пісалам па белай з шэрымі плямкамі бяросьце. Помніў той цёплы дзіцячы пах, якім абдаваў яго брат, калі яны спалі, абняўшыся, на печы, а завіруха шкрэблася па сьценах, шарудзела на ганку.

Калі яны пасталелі, брат трохі як бы аддаліўся ад яго. Здаецца, разам хмельна бегалі за дзеўкамі па купальскім лесе, маліліся багам і абмазвалі боты крывёй, што лілася перад постацямі багоў. Ды ў часы, калі ён, Няжыла, увесь аддаваўся шалу і радасьці, Кумец нібыта быў аддалены ад усяго, што адбывалася, нейкай нябачнай сьцяной. Але нават тады, калі малодшы брат пахрысьціўся, Няжыла ня надта супраціўляўся: малодшанькі заўсёды быў – не, не разумнейшы, але нейкі нібы танчэйшы, уражлівейшы. І Няжыла апошнія гады ўсё болей паддаваўся нябачнай, але выразнай сіле, што адчуваў у сваім браце. Усьлед за ім нават намерыўся і пахрысьціцца – але не таму, што сам хацеў таго, а таму, што прывык ва ўсім давяраць Кумцу, а яшчэ таму, што цесьць, Баравік, таксама настойваў на тым.

Тое, што да яго, брата хрысьціяніна, ставяцца горш як да сабакі, ён адчуў толькі ў гэтым падзямельлі. Калі б быў проста злачынцам, такога зьдзеку не было б, – цяпер ён быў у тым упэўнены. І ў гэтым была падвойная несправядлівасьць. Несправядліва, што ён пакутуе за хрысьціянства, якое яшчэ нават не прыняў усьлед за братам, ня надта ў ім талопячы. Несправядліва, што яго лічаць злодзеем, які падгаварыў Рэчыцу ўкрасьці каштоўныя каралі.

Узгадаўшы пра Рэчыцу, ён адчуў яшчэ большы страх: што з ёю? На дазнаньні, якое ўвечары ў судовай палаце праводзіў сам князь і куды ў калодках прывялі Няжылу, яе нібы асядлаў Злыдух: дзяўчына плакала, кідалася ў ногі Гаспадару, калацілася галавой аб жоўтыя масьніцы. На яго амаль не глядзела. Няспраўджаны цесьць таксама ўразіў да самага нутра: Баравік бажыўся Перуном, што ніколі не зьбіраўся выдаваць за яго дачку, бо адразу адчуў: такі можа падгаварыць і на забойства, і на рабаўніцтва, хай ратуюць нас усіх  Род і парадзіхі!

На другім допыце Рэчыца зусім зьехала з глуздоў: паказала, што ўкрала смарагды па загадзе жаніха. Цьвердзіла, што адразу ж перадала іх Няжылу, бо ён "чарамі навёў на яе морак". І, калі зусім ачамярэлага, вялі яго ў вязьніцу, дзе будзе ён чакаць суда – альбо пакараньня сьмерцю, альбо вечнага захланьня ў цемры – яна закрычала з нянавісьцю і пракляла яго, а потым цяжка, як аржаны сноп, упала на падлогу без прытомнасьці.

І, зноў як перажыўшы ўсё гэта, Няжыла завыў немым голасам і стаў біцца аб каменную сьцяну.

А калі ўпаў зьняможаным і скрываўленым, раптам пачуў, як нейкі далёкі, але знаёмы голас нібы б'ецца ў дзьверы, спрабуючы дастукацца да слыху:

– Брат! Брат! Няжыла!

– Ратуй мяне Дажбог! – хлопец падняў аціжэлую галаву. І закрычаў што сілы:

– Ку-мец!

– А-а-а! – панеслася рэха – уздоўж вільготных каменных сьцен, сатлелых чарапоў і ўсё яшчэ прыкаваных да сьценаў шкілетаў. І вярнулася назад:

– Бра-а-ат!

Дзіўны спакой сышоў на Няжылу. Брат тут, дык, можа, гэта і да лепшага? Ён прыдумае нешта, яны ўратуюцца. Быць таго ня можа, каб іхнія жыцьці скончыліся тут, сярод камянёў, у сырасьці падзямельля, дзе і зараз толькі што бліскалі ў глыбіні калідору чырвоныя вочы гарцукоў і дзе зусім блізка, амаль пад нагамі, бушуе полымя падземных кузьняў Жыжаля.

Ён мусіў берагчы сілы, каб некалі ўстаць на поўны рост і крыкнуць усяму сьвету, што ён нявінны ні ў якім зладзействе. Ня трэба дапускаць нават думкі пра тое, што тут гадамі гніюць жывыя людзі, якім няма ходу наверх, да сьвятла і сонца, і можа, гэтыя людзі таксама невінаватыя, як і ён. Як і ягоны брат...

***МАЛЕНЬНЕ***

Ласіныя рогі вытыркаліся паўсюдна, нібы цэлы статак гэтых лясных жыхароў пастаў навокал круглага стала, за якім сядзелі вярхоўны жрэц Лойка і мечнік Сьвідрыгайла. Але не – гэта толькі полымя сьвечкі пахіствала цені прыбітых да сьценаў касьцяных атожылкаў, на якіх віселі зялёна-шэрыя пукі сушаных зёлак, яркія стужкі і ручнікі.

Лойка быў без свайго звычайнага белага каўпака. Яго круглая галава з глыбокімі пралысінамі па скронях і рэдкімі валасамі, што тырчком стаялі на макушцы, хісталася ў такт словам, якія жрэц казаў павольна і разборліва, нібы ўбіваючы іх у лоб субяседніку:

– Выказаўшы жаданьне стаць хрысьціянінам, Няжыла сышоў з-пад апекі нашых багоў. Мне давядзецца шукаць яго душу ў іншых прасторах, а туды заходзіць я яшчэ не магу, дый гэта і небясьпечна.

– Нават табе, вялікі жрэц? Наймацнейшаму сярод усіх нашых мудрацоў?

– Нават мне. Нязьмерныя прасторы, куды сыходзяць чалавечыя душы, як жывыя, так і мёртвыя, бо сьмерці няма! Хрысьціянскі прастор для нас яшчэ невядомы, нам не было патрэбы прарывацца ў яго і там пытацца пра важныя, але зямныя рэчы. Язычніцкі Ірый – вось дзе мне лёгка і звыкла, але і там бываюць цёмныя сьцежкі...

– Але я не прашу цябе ўздымацца ў Ірый. Няжыла тут, сярод нас, і ён ня краў смарагдаў – іначай хай мяне неўзабаве павязуць у дубовай калодзе! Ды і які ён будучы хрысьціянін! Проста любіў брата – вось і вырашыў падтрымаць яго ў гэтай дурасьці.

Лойка строга глянуў на мечніка – маладога, натапырлівага, з чорнымі макавінамі шчэці, што праступала на шчоках, нягледзячы на галеньне.

– Сын мой, гэта ня дурасьць. Хрысьціянства – надта небясьпечнае вучэньне, яно залівае нашу зямлю гэтак жа няўхільна, як паводка – нізіну. Хай твой сябра лепей згніе ў вязьніцы, чым выйдзе на волю хрысьціянінам.

– Але гэта надта жорстка, вялікі жрэц. Няжыла – просты і добры хлопец, ягоны ж брат Кумец – стралок з лука, якога ніхто ня можа пераўзыйсьці ў Вільні.

– Бяз жорсткасьці мы не абаронім нашых багоў.

– А мне здаецца – і без справядлівасьці. Невінаваты чалавек немінуча пракляне багоў, якія яго не абаранілі ў цяжкі час.

– Ён адрокся ад іх! Сын мой, я любіў твайго бацьку, і таму згадзіўся сустрэцца з табой. Ды і цябе некалі трымаў на руках. Ваш дом заўсёды быў апорай нашага храму. Але ратаваць амаль што хрысьціяніна?!

– Вялікі жрэц, хаця я і мечнік, і сяку ў баях галовы, як качаны капусты, але мне шкада сябра. Ты сам казаў некалі ў школе, што літасьць сэрца – самы кароткі шлях да Ірыя.

– Тады быў іншы час – задуменна прамовіў Лойка. Ён вагаўся. Адчуваў, як няпроста ўсё сплялося ў гэтым загадкавым крадзяжы. Зьнешні вынік яго бачыўся ясна – на месцы Няжылы цяпер служыў чалавек, які быў чалавекам Нарбута і пакланяўся вялікай жрыцы Нары, што значна ўзмацняла ейную вагу. Значыць, сілы, якія даўно тайна варагавалі з ім, Лойкам, могуць хутка перайсьці ў наступ. Літасьці яму ня будзе, хаця і належыць Лойка да агульнага, як здавалася шараговым людзям, сьвету жрацоў.

Так, паміж жрацамі даўно не было міру. Некалі адзіныя ў сваёй магутнасьці і веры, яны, пакаленьне за пакаленьнем, страчвалі старажытныя веды і ад таго слабелі. Але каб схаваць ад простых сьмяротных гэтую сваю слабасьць, клапаціліся пра багацьце храмаў, песьцілі сваю асабістую ўладу і ўсімі сродкамі шукалі рычагі ўплыву на вялікага князя. Калі ж нехта, падобна Лойку, спрабаваў аднавіць даўняе, чыстае, шчырае вучэньне, яны казалі, што зараз трэба абараняць і багоў, і сябе ўсімі сродкамі. Сродкі ж тыя часта былі несумяшчальныя з Вучэньнем, і жрацу цяжка было бачыць тое, супраць чаго паўставаў ён усё сваё жыцьцё – агульнае пацямненьне чалавечага духу вакол. Усё было ўзаемазьвязанае: жрацы саступалі ў галоўным, цемра паступова залівала сьвет, сьвятло згасала з кожным новым пакаленьнем людзей... А гэта, у сваю чаргу, выклікала тое, што назіраў ён зараз і што, як вучыла старажытнае вучэньне, некалі згубіла магутных волатаў – папярэднікаў сёньняшняга чалавецтва. Гэта была бязьмерная хцівасьць і самалюбства, суперніцтва за ўладу і багацьце. Страшны патоп абрынуўся на Зямлю, апошнія волаты дажылі свае жыцьці задоўга да сёньняшніх пакаленьняў, але зараз, вось ужо стагоддзе за стагоддзем, усё нібы пачынаецца спачатку.

Таму барацьба сярод служкаў, што узмацнялася з кожным годам, нагадвала Лойку сумны канец волатаў і прымушала яго напружваць усе сілы...

Выгнаньне маладых прыдворных са сваіх пасадаў закранала і ягоныя інтарэсы. Магчыма, яму сапраўды трэба ўмяшацца ў калатнечу вакол смарагдаў – можа, праўда аб іх выкраданьні высьвеціць цёмныя постаці, што стаялі за ўсім гэтым?

І другі вынік усяго, што адбылося, праглядалася Лойку: вялікі князь напалоханы. Ну, можа, лепей – занепакоены. Ён не паказвае таго, але на душы ў яго цяжка. Жрацы занадта напорыста вырвалі ў яго Кумца, і ён ня можа не разумець, што ўсё няпроста і з Няжылам. Навошта хлопцу красьці смарагды, якія ён наўрад ці зможа прадаць? І хто купіў бы іх? І дзе яны, нарэшце?

Вось аб гэтым – знайсьці сапраўднага злодзея – і прыйшоў прасіць вешчуна Лойку сябра маладога падчашага. Адмаўляючы яму, Лойка тым самым як бы адварочваўся ад таго, што важным было і для яго самога. І ён, ці то адмаўляючы, ці то згаджаючыся, нарэшце матлянуў галавой:

– Добра. Тады пачнём маленьне.

– Зараз? – ня верачы вушам, перапытаў Сьвідрыгайла.

– Зараз. Твой пыл удыхнуў у мяне новыя сілы. Я даўно не выходзіў да багоў. А гэта важна – часта гаварыць з імі. Іначай яны перастаюць цябе пазнаваць. А цяпер выйдзі. Я абмыю рукі і цела, а таксама пераапрануся. Табе таксама трэба абмыцца – тыя, хто прыдуць, не павінны загневацца.

І ён падрабязна расказаў мечніку, што той павінен рабіць.

…Рыпнулі ў скрэпах патаемныя дзьверы, што былі схаваныя за ласінымі рагамі і ручнікамі, і зачыніліся за Лойкам. Абмыўшыся з сярэбранага рукамыйніка, дзе вада лілася з рота разьбянога эмалевага Сварога, мечнік і служка сталі чакаць, пакуль там, за дзьвярыма, вымыўся і пераапрануўся сам вярхоўны жрэц. Яны чулі, як пасьля ён доўга маліўся багам, падняўшы рукі ўгору і, нарэшце, выпіў пьянкога пахкага адвару, ад водару якога мечнік, што стаяў непадалёку ад дзьвярной шчыліны, нібы ачмурэў.

У белым балахоне, белым, чысьцюткім, як сьнег, каўпаку, з арэхавым жэзлам* у руках, Лойка кінуў у круглую гліняную чашу-печ, што месьцілася пасярэдзіне схаванага ад усіх пакою, чырвоны вугаль. Быў ён прынесены ад цяпельца перад невялікай постацьцю меднага Сварога, што стаяў звонку перад дзьвярыма Лойкавага жытла. Агонь, што дакрануўся да сухіх пахкіх сьцяблін запаветных зёлак, узьвіўся так ярка і нечакана, што мечнік адхіснуўся. А Лойка спакойна акрэсьліў вакол яго, а потым вакол сябе кола і, перасьцярогшы мечніка, каб той нават палец ня высунуў з-за круга, пачаў чытаць заклінаньні.

Сьвідрыгайла так потым да канца жыцьця нікому ня змог расказаць, што ён убачыў у патаемным пакоі і што за здані абкружалі жраца, цягнучы да яго то чорныя, то празрыстыя рукі, якія крыкі чуў ён там, хаця тросься як ліст, закрываючы вушы і заплюшчваючы вочы. Агонь кідаўся чырвонымі касьнікамі, то абпальваючы Лойку, то адхінаючыся ад яго, нібыта кіравалі ім нейкія сілы. А пасьля, прыціхлы, пеўнікавым грабеньчыкам лёг да ног галоўнага жраца, і той пагладзіў яго, нібыта сапраўднага пеўніка, зморанага ў бітве. Затым моўчкі, ня кажучы ні слова, пайшоў, як паляцеў са сьвяцілішча, не апранаючы ні футра, ні бабровай шапкі. А мечнік разгублена, трушком пасунуўся за ім, але таксама ня мовіў ані гуку – такая была папярэдняя дамова паміж імі. Ішоў і служка – танклявы худы дзяцюк, паклаўшы на плячо лісінае футра для гаспадара…

Начная Вільня была засьнежаная і нямая. Поўня, шчарбатая і ахінутая аблокамі, як галодная жабрачка лахманамі, скалілася над замкавай вежай, дзе адно ўнізе мільгацелі цьмяныя агеньчыкі, – там сядзела варта. Вокны мураванак сьлепа і цёмна глядзелі на вуліцу, па якой ішлі і ішлі тры чалавекі: жрэц у доўгай белай кашулі, нямы і доўгі, як навец, мечнік, разгублены і праставалосы, сутаргава сьціскаючы ў руцэ дзяржальна мяча. І даўганогі служка, спакойны і звыклы да ўсяго.

Нарэшце Лойка спыніўся. Спраўляючыся з дрыжыкамі на целе, мечнік пабачыў, што вялікі жрэц ішоў, не расплюшчваючы вачэй, як быццам

вяла яго нейкая магутная сіла, а ён толькі не супраціўляўся. Працягваючы дрыготкія рукі наперад, Лойка нарэшце сказаў голасам, што, здавалася, ішоў аднекуль здаля:

– Яны тут. Смарагды на шыі ў дзяўчыны-цнатліўкі, і закляцьце ляжыць на іх. Закляцьце супраць вялікай княгіні. Шукайце праклятыя смарагды тут!

Ён расплюшчыў вочы, некаторы час няўцямна азіраўся навокал, пасьля падняў на мечніка атуманены твар. Сьвідрыгайла спалохаўся: звычайна цьвёрды і разумны погляд Лойкі цьмянеў, згасаў. Але ён ужо не глядзеў на яго, а прагна ўзіраўся ў вокны за плячыма жраца.

Яны ўсе стаялі перад аднапавярховым доўгім будынкам з разьбяной брамай. Мечнік ведаў яго. Як ведала ўся моладзь Вільні, што гатовая была зрабіць гэтую двухпавярховую ўтульную мураванку з высокімі паўкруглымі вокнамі яшчэ адным храмам вечна маладой багіні каханьня Лады. І таму ён ня мог паверыць сваім вачам.

Гэта быў дом, дзе жыла сястра вярхоўнай жрыцы Нары Дзівейна.

Пачуўся глухі крык, мечнік зірнуў на Лойку і другі раз за гэты час аслупянеў: жрэц падаў на рукі спалоханага служкі, вочы яго закаціліся, белая пена выступіла на вуснах.

– Што з ім? – ускрыкнуў Сьвідрыгайла.

– Ударылі... яны ўдарылі... – мармытаў Лойка.

– Каралі... праклятыя каралі і яна... яна... На...

– Хто – яна?

Адказу не было. Вялікі жрэц Сварога абвяла і бездапаможна хіліўся долу, на сьнег, вытаптаны іхнімі нагамі, на вуснах у яго выступіла пена, а вочы страшна закаціліся пад лоб. Спалоханыя мечнік і служка, параіўшыся, сплялі рукі і, пасадзіўшы на іх зьнерухомелага жраца, пацягнулі яго назад, у храм...

## *УНА і КРУГЛЕЦ*

Дзяўчыну калацілі дробныя дрыжыкі. Сьлёзы цяклі па круглых, як рэпкі, шчоках, стужкамі з вяночка яна выцірала вочы.

– Табе застаецца жыцьцё! – па-нямецку сказаў ёй Круглец. Гэтым сказам, які крыжакі крычалі воям Княства перад боем, спрабуючы падарваць іхнюю ўпэўненасьць, брат і сястра абменьваліся, калі хацелі суцешыць адзін аднаго. Але на гэты раз Уна не ўсьміхнулася, як звычайна. Яна ўскінула на брата вочы і прастагнала:

– Яго павеся-аць!

– Ды што ты! Княгіня Марыя абароніць. Яна ўгаворыць вялікага князя зьмякчыць прысуд, а пасьля… пасьля мы аддадзім за яго выкуп жрацам. Мы прынясем багам ахвяры. І ён зноў вернецца да нас.

Гаворачы гэта, ён ведаў, што надзеі на выратаваньне Кумца амаль не засталося. Круглец спрабаваў пагаварыць з княгіняй, ды яму, які заўсёды мог прайсьці да вялікай княгіні, цяпер адмовілі. Да таго ж, гаспадарыня хварэла. Яна ляжала, цяжка ўздымаючы грудзьмі пуховую пярыну пры кожным хрыплым удыху і выдыху – тое ўбачыў ён, дабраўшыся да самых дзьвярэй лажніцы. Але далей яго не пусьціла варта. Новая пакаёўка вя-

лікай княгіні Гайна ўсё ж выйшла да сына Леся, якога і дасюль шанавалі ў замку, насьмешліва выслухала хлопца і прамовіла зласьліва:

– З-за такой драбязы турбаваць вялікую гаспадыню? Цябе, відаць, акруціла Стрыга, а гарцукі падсмажылі галаву. Княгіня хворая, а ты хочаш тлуміць яе клопатам пра злачынцу!

– Ён мой сябар! – загарачыўся і засьпяшаўся даказаць сваё Круглец. – І брат яго таксама невіноўны!

– Адкуль ты ведаеш?

– Адчуваю душой!

– Душой! Яго абвінавацілі жрацы, а яны не памыляюцца.

Тады ён паспрабаваў пераканаць яе іншым.

– Паслухай: жрацы служаць багам, а мой сябра прыгожы, як Лель, ты ж яго бачыла. Няўжо табе яго не шкада? Нават багі ня любяць, калі мы, людзі, нішчым прыгажосьць.

– Ён сам нішчыць багоў, – строга адрэзала, адразу пасур'ёзьнеўшы, Гайна. – Ён ня верыць нашым сьвятыням, раз адрокся ад іх. Я не дапамагу такому чалавеку!

Круглец услухоўваўся ў ейныя словы. Нешта падазронае было ў цьвёрдасьці і непрыступнасьці дзяўчыны. Але што? І ён зноў паспрабаваў угаворы:

– Ты яго абвінавачваеш у хрысьціянстве. Але ж княгіня сама хрысьціянка!

І тады служка, гордая сваёй прыналежнасьцю да ўлады, да яе залатога зьзяньня, сказала, як адрэзала:

– Князям можна. А нам – не!

...І цяпер, гледзячы на бездапаможны плач Уны, на сярэбранае шытво ейнай сукні, прамоклай на грудзях, малады чалавек змрачнеў усё болей. Старэйшы за сястру, ён заўсёды быў для яе апорай, асабліва пасьля сьмерці бацькі. Багаты іх дом паступова рабіўся ўсё цішэйшым: сёстры яго і Уны выходзілі замуж, адна за адной пакідалі свае дзявочыя сьвятліцы, і цяпер у двухпавярховай мураванцы засталіся толькі брат з сястрой ды іхняя старая цётка, якая амаль не ўставала з ложа.

Пакуль сястра ціха ўсхліпвала, ён разважаў аб тым, каму спатрэбілася гэтая вялікая каламуць. Добра ведаючы віленскае жрэчаства, сын пасла не сумняваўся, што за перасьледам братоў стаяць найперш інтарэсы жрацоў, страх перад новым няведамым богам, які забярэ іхнюю паству. Ён, як і іншыя, слаба верыў у тое, што Няжыла і ягоная нявеста маглі скрасьці смарагдавыя каралі. Ды магутным довадам супраць Няжылы было тое, што сваю віну прызнала Рэчыца – а яе ж не каталі. Яна прама паказала на былога жаніха, які нібыта загадаў ёй вынесьці каштоўнасьць з княгініпай лажніцы. А яна, маўляў, кахала, таму і ўчыніла злачынства. І хаця пад самымі страшнымі катаваньнямі не прызнаўся ейны былы жаніх, дзе тыя каралі і нашто яны яму, у горадзе не сумняваліся ў віне Няжылы. Шапталіся, што тут замешанае чараўніцтва, бо гэта зрабіў хрысьціянін, а яны ўсе чараўнікі. Яшчэ казалі, што тое зьдзейсьнена, каб давесьці да сьмерці Марыю. Але Круглец разумеў: Няжыла не злачынец, ён ахвяра. Бачыў ён і зладжанае, як быццам аб тым дамовіліся загадзя, выкрываньне Кумца ў замку.

Іхняе затачэньне ў вязьніцу, амаль адначасовае, насьцярожвала, як добра сыграная камбінацыя. Браты, блізкія да князя, маглі стаяць на шляху

многіх, што прагнулі наблізіцца да трону, ды ўпершыню на вачах Кругляца супернікаў, да таго ж ня надта значных, скідалі з рахунку так жорстка, амаль адкрыта. І Круглец раздумваў над пытаньнем: якую ж асабістую крыўду маглі нанесьці невядомаму ворагу ці то Кумец, ці то Няжыла?

Ясны зімовы дзень скрыпеў пад вокнамі валёнкамі, лапцямі і ботамі. На недалёкай Вільлі курылася парам палонка, грак мітусьліва спрабаваў напіцца з яе, баязьліва падскокваючы і зазіраючы ў жывую чарнату. У пакоях было цёпла, кафляная печ была з раніцы добра напаленая, з калідора пахла альховымі дровамі і коленскай вадой, якую нядаўна разьліў неасьцярожны слуга.

Было чуваць, як нехта загрукаў кулакамі ў браму. Круглец зьдзіўлена прыўзьняўся: яны нікога не чакалі.

– Хто там, Кругленькі? – па-латыні спытала сястра, таропка выціраючы вочы.

– Зараз паглядзім.

І адразу ўскочыў:

– Вялікі жрэц Бурыла!

Яна падскочыла. Нібы ваверка, шуснула ў калідор, а адтуль наверх, у сваю сьвятліцу. Круглец пасьпяшаўся да дзьвярэй. І ў час – Бурыла і трое ягоных слуг урачыста запаўнялі передпакой сваімі каўтрышовымі*, на мяху, плашчамі, якія ўжо пасьпешліва хапалі гаспадарскія слугі .

Калі б тое адбывалася на людзях, Круглец мусіў бы ўпасьці перад вялікім жрацом на калені. Але яны даўно і дастаткова ведалі адзін аднаго. Бацька, пасол Лесь, часьцяком прывозіў у храм Перуна розныя каштоўныя рэчы: тонкі белы шоўк, якім так прынадна ахінаюць свае постаці храмавыя танцоркі, розныя алеі, парфуму і пахкасьці, а таксама, хаця і зрэдзь, ахвяраваў то срэбны, то залаты брусок. На багацьці, сабраныя ў месьцічаў, храм купляў новыя землі, будаваў дамы. Часам золата ішло і на мясцовага вырабу чашы, чары і тарэлы, з якіх у час сьвяточных прыёмаў у храме елі самыя паважаныя госьці. Бурыла быў удзячны сям'і пасла, але з гадамі, калі памёр пасол, гэтая ўдзячнасьць слабела, і некалькі апошніх гадоў малады гаспадар ужо не атрымліваў ад храму запрашэньні на маленьні, дзе ўдзельнічалі самыя зацныя людзі Вільні.

Таму Круглец толькі зьлёгку пакланіўся вяльможнаму госьцю і, правёўшы таго ў сьвятліцу для гасьцей, прапанаваў яму сесьці. Слугі засталіся ў передпакоі.

Чырвоны ад марозу твар вярхоўнага жраца быў сурова-ўрачыстым. З гэтым выразам ён піў брэцьяніцу з гарачым мядовым пітвом, які хутка падалі хаця і нечаканым, але надта шаноўным гасьцям слугі, з ім жа пачаў гаварыць, нібыта баючыся страціць хаця кроплю таго напорыстага, ладнага настрою, з якім ішоў у дом Кругляца.

З яго важкіх, як дубовыя круглякі, слоў вынікала, што падчас вялікага маленьня ў сьвяцілішчы Перуна жрацам адкрылася, што храму патрабуюцца тры новыя жрыцы. І імёны, што былі названыя ў час ахвяraпрынашэньняў, належалі да самых знакамітых родаў Вільні. Сярод іх – гэта госьць вымавіў важка і са значнасьцю – аказалася і Уна.

– Але мая сястра ніколі не зьбіралася быць жрыцай. Яна кахае зямнога

чалавека і ня згодзіцца ахвяраваць сабой! – запярэчыў ашаломлены Круглец.

Зялёныя (як у жабы, падумаў раптам Круглец) вочы Бурылы глядзелі на яго са спагадай і шкадаваньнем. Ён, трымаючы срэбную брэцьяніцу, пагладзіў на ёй кароткім мяккім пальцам пукатыя зьвівы расьлін, нібы гэта былі жаночыя грудзі, і ціха, зусім ціха прамовіў:

– Вялікі князь згадзіўся са жрацамі.

– І што мне з таго?! – ускочыў Круглец, адштурхнуўшы стол з брэцьяніцамі, якія са звонам пападалі на жоўтыя палавіцы. – Мы яму не належым, мы не рабы княскія!

На грукат у пакой ускочылі слугі Бурылы, рукі іх звыкла ляглі на дзяржальні мячоў, але вярхоўны жрэц зрабіў няўлоўны жэст рукой, і яны сьцішыліся, чакаючы далейшага.

– Вялікі князь – наш уладар, і толькі жрацы і багі стаяць над ім, але ня вы, сьмяротныя людзі.

Кругляцу падалося – злосны рогат і зьняважлівасьць ажно клякочуць у грудзях Бурылы, хаця твар вярхоўнага жраца быў спакойным, нават нявінна-зьдзіўленым. Гнеў і злосьць віравалі ў душы гаспадара, ён адчуў, што бляднее. І што стрымлівацца яму ўсё цяжэй.

Момант для ўдару быў выбраны найлепшы. Яго магчымыя заступнікі пры княскім двары былі кінутыя ў цямніцу. Яго самога не прыняла вялікая княгіня. Альгерду ж увогуле было не да яго: хвароба Марыі магла каштаваць яму вялікакняскага стальца. І ўсё ж маўчаць Круглец ня мог:

– Я даўно адчуваў, што ты заглядаешся на Уну, і чуў ад бацькі, што ты ня надта адмаўляешся ад жаночых уцех. Але – забраць маю сястру?! Ты бярэш на сябе замнога – мы не апошняя сям'я ў Вільні!

– Гэта не я. Гэта вялікі Пярун.

– Пярун?! Гэта ад яго ў вашым храме штогод нараджаюцца крапіўнічкі? Гэта ён смакуе лепшых дзяўчат Вільні раней за мужоў і падкідае ў знатныя сем'і сваё семя?!

Бурыла сурова выпрастаўся. Постаць яго нібыта заняла ўвесь пакой.

– Ты блюзьнерыш, нечасьцівец! Ты абражаеш багоў і вялікага Перуна!

– Ты – не Пярун! Я не аддам табе Уну!

І тады злосны рогат нарэшце вырваўся з грудзей Бурылы. Ён скаланаўся ад зьдзеклівага сьмеху так, што сьлёзы пацяклі па ягоным чырвоным, спацелым ад гарачай медавухі твары:

– Я – вялікі жрэц, а ты? Ты ўсяго толькі нікчэмны чалавечак, які ўмее кідаць дзіду. Ты – родзіч двух дзяржаўных злачынцаў, якія гніюць у вязьніцы. І вялікі Альгерд цябе не абароніць. Глядзі!

Ён кіўнуў слузе, і той імгненна выцягнуў з сумкі пергамент, скручаны ў трубку, запячатаную малой пячаткай княскай канцэлярыі. Бурыла працягнуў яго Кругляцу:

– Чытай!

Праз чырвоную смугу ў вачах чытаў Круглец загад аб тым, каб сёньня ж, згодна волі жрацоў, была адпраўленая дачка пасла Леся ў храм вялікага Перуна, дзеля таго, каб вялікі бог гэты даў княству спакой і плоднасьць жывёле.

– Ты лепей цалаваў бы мне рукі, бо добра ведаеш, што чакае ў храме неслухмянак. Сястра твая – ціхмяная, мяккая. Але не спакушай яе непас-

лушэнствам, наадварот, прасі быць добрай да нас: тады праз нейкі час мы вернем яе табе і таму, каго яна кахае.

– Ты кажаш – добрай да **нас**?!

– Тады памяняй словы сам – да **мяне**, вярхоўнага жраца, які адкрые ёй волю багоў.

Хлопец адчуў, як схаладнела ў яго нутро, нібыта нехта сьціснуў ягоныя вантробы вялізнай ледзяной рукой. Ён абмяк і ціха прашаптаў – хрыпата і амаль неразборліва:

– Наша сям’я заплоціць выкуп за Уну. Вазьмі любую іншую дзеўчыну. Я аддам табе столькі срэбра, што ты зможаш купіць дзясятак рабынь.

– Я сам аддам табе столькі ж срэбра, калі Уна правільна зразумее волю багоў, – зьдзекліва прамовіў Бурыла. Ён нецярпліва паторгаў плячом. Азіраючыся на дзьверы, уладна сказаў:

– Мы забіраем яе зараз жа.

– Пачакай! Я прывязу яе сам. Ня зараз. Ня сёньня.

– Я табе ня веру, – зноў гэтак жа ўладна, як заўсёды, прамовіў вярхоўны жрэц, кіўнуўшы слугам. Тыя адразу ж таропка пайшлі да дзьвярэй.

– Куды вы? Ці яна злачынца, каб чужыя мужчыны лезьлі да яе ў сьвятліцу?! – закрычаў Круглец, перасьцігшы іх ужо ля дзьвярэй і раскінуўшы рукі крыжам. Ён адчуваў, што ляціць у нейкую бездань. Бясьсільным стала ягонае ўменьне змагацца, бясьсільным аказалася багацьце і ўся слава іхняга рода. Альгерд, які часта бываў у іхнім доме і быў заўсёды ласкавым да іх усіх, раптам зрабіўся недасяжным, нібыта Горні замак узьняўся ў неба і цяпер вісеў у нябёсах, як загадкавы і таемны для сьмяротных людзей Ірый. Як ня выканаць загад вялікага князя? Каб жа быў нейкі час! Але і яго ня даў яму страшны жрэц Перуна, чорны цень ад якога нібы зацьмяніў ня толькі пакой, але і ўвесь гэты такі ўтульны і такі, як цяпер высьвятляецца, ненадзейны дом, які ня можа нікога з іх схаваць ад зла…

– Тады пакліч Уну сам! – нібыта зьлітаваўся вярхоўны жрэц, зноў усьсеўшыся ў крэсла.

Круглец пасьпяшаўся з пакою ўсьлед за слугамі і, спыніўшыся ля лесьвічкі, што вяла ў сьвятліцу, паклікаў дрыготкім голасам:

– Сястра!

Але на ягоны голас ніхто не азваўся. Тады слугі кінуліся ўверх, але пабачылі толькі расчыненае вакно, у якое нетаропка ўляталі рэдкія сьняжынкі...

Дарэмна абышлі слугі Бурылы ўсе пакоі, скляпеньні і сьвятліцы вялікага дому. Уна зьнікла з бацькоўскага гнязда, нібыта вылецела птушкай праз акно альбо ўзьвілася дымам праз комін.

## ДАРЭМНЫ ВЫШУК

– Імем вялікага князя і войта Вільні! Адчыняйце!

У дзьверы грукалі ўладна і груба. Дзівейна разгублена стаяла пасярод пакою, малінавы ваўняны плашч зваліўся з ейных плячэй, твар пабялеў і выцягнуўся.

Служка чакала загаду, але маладая гаспадыня ня ў сілах была вымавіць ні слова, і таму грукат мацнеў і нарастаў.

– Затрымай іх каля парога – нарэшце прашаптала Дзівейна. – І пашлі каго па сястру. Хай едзе хутчэй сюды…

Здранцвеньне яе паступова праходзіла, і калі служка, тупаючы драўлянымі калодкамі, стала спускацца ўніз, дзяўчына як ачуняла. Яна кінулася ў лажніцу, садрала з драўлянае рагаціны насупраць ложку тое, з-за чаго ламіліся ў ейны дом стражнікі, абгарнула каштоўнасьць у парчовую хустку і, хуткамгненна адчыніўшы разьбяную дзьверку пад бажніцай, запіхала скрутак у сакрэтную схованку. Калі падняліся наверх стражнікі і з імі сам войт Вільні, яна ўжо зноў стаяла пасярэдзіне пакою – у малінавым плашчы з залатой фібулай пад точаным падбародкам, і яркі румянак на яе моцных круглаватых шчоках гожа адцяняў чорныя вейкі і лазуровае адценьне вялікіх вачэй.

– Няўжо ў мой дом трэба ўрывацца так, нібыта тут жывуць таці? – наіўна ўсьміхаючыся, яна зірнула на войта і апусьціла вочы, нібы саромеючыся мужчын, што запоўнілі пакой і ўсе разам глядзелі на яе як на дзіва. Войт Тачыла трохі сумеўся. Сярдзіты ад таго, што давялося доўга стаяць пад дзьвярыма, ён разам ахалануў і сьцішана прамовіў, гледзячы на дзяўчыну:

– Я ведаю, які гэта дом і чыя ты сястра. Але загад вялікага князя... У тваім доме схаваныя каралі вялікай княгіні, а гэта злачынства. Таму...

– Каралі вялікай княгіні?! – Дзівейна пахіснулася, пашукала вачыма крэсла, села на яго. Вялікія вочы яе былі шырока расплюшчаныя. – Ты кажаш: каралі вялікай княгіні? Тыя, смарагдавыя, пра якія гаворыць уся Вільня?!

Тачыла сумеўся. Ён чакаў іншае рэакцыі. Не аднойчы даводзілася яму весьці да дубовай калоды* зламысьнікаў спачатку Гедзіміна, цяпер жа ягонага сына Альгерда, заўсёды гатовы ён быў сьцяць горлам* таго, на каго ўкажа яму гаспадар. Але цела ягонае добра памятала тую нечуваную асалоду, якую час ад часу меў ён у храме багіні Лады, асабліва ж тады, калі выбірала яго сама вялікая жрыца Нара. І хаця ейная сястра была цнатліўкай, міжволі, увайшоўшы ў пакой, прамацаў ён поглядам мужчыны, які разьбіраецца ў жаночай прыгажосьці, тонкі выгіб клубоў і высокую шыю, белыя рукі і моцныя, шчодрыя вусны маладой гаспадыні. Ён ведаў такія вусны – адзін дотык іх адпраўляе ў Ірый, дзе існуе вечная насалода і вечнае жаданьне...

Таму ён адказаў больш мякка і памяркоўна, чым зьбіраўся раней:

– Ты лепей скажы мне, дзе яны. І я буду прасіць для цябе літасьці ў вялікага князя. Бо мае паслугачы больш хітрыя, чым сабакі, яны пранюхаюць кожную палавіцу і кожную шчыліну ў сьценах.

– Але чаму яны павінны быць у маім доме? Хто навёў на мяне і маю вялікую сястру гэтую нечуваную хлусьню?

Замест адказу войт абвёў поглядам пакой. І Дзівейна, апярэджваючы яго, прымірэнча сказала:

– Хай яны шукаюць, калі так. Але што перашкаджае табе, гаспадар Вільні, выпіць тут са мною салодкага грэцкага віна? Калі вы знойдзеце тое, што шукаеце, я нікуды ня дзенуся ад цябе. Калі ж ня знойдзеце...

У ейным мяккім, нізкаватым голасе прагучала ледзь улоўная перасьцярога. Войт перасмыкнуўся. Ня меней, чымся гневу гаспадара, баяўся ён гневу багоў. Вялікая жрыца Лады, як ведалі ўсе, магла накіраваць гнеў багіні супраць вінаватага. А што, калі ён, гаспадар гораду, будзе раптам пазбаўлены мужчынскай сілы? Што яшчэ дасьць яму ў жыцьці асалоду, якую хаця адда-

лена можна параўнаць з тым любоўным шалам, якую атрымлівалі ў храме Лады? Таму ён прымірэнча згадзіўся на прапанову Дзівейны і разам з ёю сеў за разьбяны бліскучы столік з пярлінавымі ўстаўкамі, на які служка паставіла карчагу віна і два вялікія шкляныя келіхі, а таксама паклала жаўтаватыя кавалкі заморскага ласунку – цукру, а яшчэ гарэхі і фінікі. Тым часам войтавыя стражнікі расьцігнуліся па пакоях, каб шукаць тое, на што ўказана ім было з усёй строгасьцю і пагрозамі. Сам жа Тачыла нібыта забыўся на тыя пагрозы. Ён сядзеў насупраць найпрыгажэйшай дзяўчыны стольнага гораду, якім упраўляў паводле даверу Альгерда і, гледзячы на шаўковыя попельныя валасы, прамы прыгожы нос, сустракаючы ясны лазуровы позірк красуні, адчуваў, што галава ў яго пачынае кружыцца. Ці віно аказалася такім моцным, ці чараваў погляд Дзівейны, але калі праз нейкі час ля мураванкі зарыпелі палазы санак і пачуўся знаёмы ўсёй Вільні голас вялікай жрыцы Нары, слуга вялікага князя пачуваў сябе расчуленым і разьмяклым, нібыта кавалак воску. А калі, гнеўная і невыказна – прыгожая, нібыта сама багіня (толькі вопытнае вока магло разгледзець на твары Нары румяны і старанна ўцерты белы парашок, што хаваў зморшчыны)*, гэтая вялікая жанчына Вільні ўвайшла ў пакой, войт адчуў, што ён нібыта трапіў у рукі бязьлітаснага, але выдатнага майстра, які пачне з яго, воску, ляпіць нешта, вядомае толькі самому гэтаму майстру.

– Ты шукаеш смарагдавыя каралі вялікай княгіні тут?!

Яе голас запоўніў пакой.

– Такі загад вялікага князя... – слаба прамармытаў Тачыла, ужо разьмяклы ад віна і слодычы.

– Яго зачаравалі вялікім моракам, – упэўнена і гнеўна сказала Нара. Яна сьлізганула запытальным поглядам па сястры, і тая адказала ёй ясным нявінным поглядам. Тады прасьвятлеў і погляд вялікай жрыцы.

– Вы шукаеце тут, дзе іх ніколі не было і быць не магло, у той час як зламысьнікі чакаюць сьмерці вялікай княгіні!

– А яна сапраўды памрэ? Ці адкрылі табе гэта багі? – наіўна, нібыта ня быў ён шматмудрым войтам, а юным хлопцам, які разгублена стаіць ля дзьвярэй храму, запытаўся Тачыла.

– Адкрылі. Жыць ёй сапраўды нядоўга. Такая воля багоў. І морак, што напаў на вялікага князя, пройдзе. А нам з табою яшчэ ня раз сустракацца, Тачыла, так? – на ейных вуснах зазьмялася і тут жа прапала ўсьмешка, ад якой войт ачмурэў нанова, і ўжо не Дзівейна, а Нара здавалася яму прыўкрасьнейшай жанчынай на сьвеце.

– Так, гэта морак... – нечакана для сябе згадзіўся службовец. – Але ж шапталіся ў замку, што багі ўказалі менавіта на гэты дом...

– Багі? – яна наморшчыла лоб. – Няўжо гэта праўда, Тачыла? Няўжо нехта з багоў мог памыліцца? Але багі не памыляюцца, толькі людзі, што тлумачаць іхнюю волю. Дык хто з людзей мог навесьці на гэты дом?

Яна знарок падрэсьліла голасам “людзей”.

– Ня ведаю, вялікая жрыца.

– Але хто аддаў табе загад? Хто быў пры тым?

– Загад аддаў сам вялікі князь.

– Вялікі князь... І што ён казаў?

– Ды нічога асаблівага… Як звычайна: абшукайце дом, каралі там.

– А яшчэ што? Узгадай, Тачыла. Толькі ты можаш дапамагчы...

Яна глядзела на яго, і, п’ючы маленькімі глыткамі медавуху, раптам адставіла брэцьяніцу, павольна аблізала вусны тонкім, як у зьмяі, ружовым языком. Ён назіраў за тым нібы зачараваны.

– Ты ж хочаш… сябраваць з нашым храмам?

Сябраваць! Ён пачынаў задыхацца ад нясьцерпнага жаданьня ўпіцца ў гэтыя чырвоныя вусны, дабрацца да цела, якое ведаў ад гнуткай шыі да кончыкаў нафарбаваных заморскімі фарбамі пальчыкаў і якое па-ранейшаму цягнула да сябе.

– Ён сказаў… сказаў адзін толькі незразумелы сказ… – войт мармытаў, нібыта ён быў злачынцам, а яна, гэтая прыўкрасная жанчына – абвінаваўцам. Спыніўся. Прысяга і страх перад князем стрымалі яго.

– Які? Скажы, і нашая падзяка будзе бязьмернай!

Яна паклала руку на калена Тачылы – як прапаліла яго.

– Вялікі князь вымавіў… вымавіў: “Спадзяюся, мой сябра не памыліўся!” А больш я нічога ня ведаю!

– Сябра? Хто? Хто сябра вялікага князя? – прашаптала яна, раздумваючы, і раптам вусны яе сьціснуліся. Імя, пра якое яна ўзгадала, гатовае было прагучаць у паветры, але нездарма яна ўмела валодаць сабой, і таму ўстрымалася, пранікліва зірнула на войта.

– І я хачу табе даверыцца, – пачала яна. – Хаця і ня ватра раскрываць сакрэты храмаў, – голас яе быў даверлівым і шчырым, – але я ведаю, што толькі нядаўна вялікі жрэц Лойка трохі акрыяў ад атруты. Малады служка выпадкова даў яму сому, якою паліваюць вогнішча, але якую піць нельга. Шчасьце, што багі ўвогуле выратавалі Лойку, ды толькі пакуль душа яго толькі напалову вярнулася ў цела... Я баюся, што ягоныя прароцтвы недакладныя, атрутныя…

– Дык ты... ведаеш, што гэта Лойка прыходзіў сюды, пад дом тваёй сястры? – ашаломлена ўсклікнуў войт.

– Багі мяне любяць... – загадкава ўсьміхнулася Нара. – Хаця ты сказаў мне ня ўсё, але я хацела цябе праверыць. Ці ты наш... па-ранейшаму? Дык пра што яшчэ ты не сказаў?

– Я толькі чуў... што мечнік прыбег да вялікага князя і даклаў яму пра Лойку. Сам жрэц нібыта моцна захварэў...

– А… мечнік… Гэта той, высокі, са шнарам… Як яго?

– Не, у Сьвідрыгайлы няма шнара…

– Будзе… Бо Сьвідрыгайла памрэ на гэтым тыдні, і нішто не ўратуе таго, хто наводзіў морак на вялікага князя...

– А скажы, вялікая жрыца... калі памрэ Марыя? – прашаптаў, азіраючыся па баках, зусім спалоханы і ўжо прыніжана-лісьлівы войт.

– А гэта я не адкрыю табе. Бо і так, памятаючы нашыя... сустрэчы, замнога расказала табе, Тачыла. Дык ці скончылі твае стражнікі шукаць у доме маёй сястры тое, чаго тут няма?

– Я зараз праверу, – мармытнуў той і хуценька выскачыў з пакою. Сёстры ізноў моўчкі абмяняліся поглядамі. Вочы Нары прасачылі позірк сястры, і яна супакоена прымружыла вочы.

Войт вярнуўся даволі хутка. Адзін са стражнікаў, які шныпарыў у лажніцы маладой жанчыны, вінавата выглянуў адтуль:

– Нідзе нічога няма!

Войт абвёў вачыма пакой, дзе яны знаходзіліся. Позірк яго сьлізгануў

па гладкіх сьценах, абабітых зялёным з залатымі разводамі адамашкам, ён, па чэпкай звычцы наглядчыкаў, зачапіў пальцамі ручнік, які спадаў з бажніцы. Цяжкае яго дыханьне паварушыла чырвоныя кутасы, якія зачапіліся за разьбу ўнізе бажніцы. Учэпістыя мужчынскія пальцы памацалі разьбу, зачапіліся пазногцем за чорны злакіраваны завіток. Адзін рух направа, і... У Дзівейны здрыгануліся тонкія пальцы, але тут Нара засьмяялася звонка і весела:

– Ну вось і праверыў! Можаш сьмела адказаць вялікаму князю, што кожная дошка і палавіца тут прамацаная тваімі малайцамі. І давай скончым непрыемную справу тым, што павячэраем разам... ня тут і ня зараз, а пазьней, там... у нашым храме.

– Сёньня?! Удваіх… з табой… – войт радасна ўскінуўся, і тут жа, спахапіўшыся, пакасіўся на стражніка, якому рукой даў знак выйсьці. І, ужо амаль забыўшыся на Дзівейну, прагна глядзеў на вялікую жрыцу, тоўстыя яго пальцы пацягнуліся да яе. А Нара, сьмеючыся, адступіла назад і скінула лісінае футра, што ахутвала яе малочна-белыя плечы. Белая, амаль празрыстая, як з камкі*, сукня шчыльна абхоплівала тонкі стан, пругкія плечы і вялікія грудзі служкі Лады, і чамусьці ізноў здалося войту, што гэта сама багіня стаяла перад ім, запрашаючы ўвайсьці ў яе вабнае цела, дзе ён рабіўся маленькім і нібыта патанаў у абвостранабалючай, бясконцай і адначасна нясьцерпна-кароткай асалодзе...

## ЦЯМНІЦА

Падвечар, калі разамлелыя ад смачнай сьвініны з тушанай капустай стражнікі гралі ў бірулькі, паставіўшы на кон заўтрашні куфаль піва, які выдаваўся кожнаму пасьля дзяжурства, да ніжняй брамы Горнага замку падышоў юнак, захутаны ў цёплы, з бабровай падбіўкай плашч. Яго саф'янавыя боты падмоклі ў сьнезе, які няспынна сыпаўся на Вільню ўжо трэці дзень і які не пасьпявалі ўтоптваць жыхары. Ды тут, наверсе, сьнегу было нашмат меней, чым унізе: княжавыя слугі няспынна, гадзіна за гадзінай, зграбалі яго драўлянымі шуфлямі і скідалі ўніз, да ракі, што няспынна цурчэла ўнізе, так і не замёрзшы да самай сярэдзіны зімы.

Галоўны стражнік Воўк паважна выйшаў са старожкі, што месьцілася на першым паверсе вартавой вежы замку. Вопытным вокам ён адзначыў, што юнак ня з бедных: срэбнае шытво на каптане было новым і тускла блішчэла пад плашчом, аблямоўка якога таксама яшчэ не абтрапалася і не звалялася. Таму ён прыцішыў свой голас, які ўсё роўна падаўся прышламу рыкам:

– Каго вам, гаспадзін?

– Я прыехаў з Полцеску, каб сустрэцца з памочнікам лоўчага Кумцом, маім родзічам па дзядзьку.

Закарэлы твар Ваўка спахмурнеў:

– Твой родзіч – злачынца. Яго чакае кара як адступніка.

– Няўжо гэта праўда? – вочы ў юнака напоўніліся сьлязьмі. – І ён сядзіць у замкавым падзямельлі, як аб тым казалі на віленскіх вуліцах?

– Праўда, гаспадзін, і лепей будзе, калі ты хутчэй пойдзеш адсюль. На злачынцаў абрынуўся гнеў усіх жрацоў Вільні, і нават княгіня Марыя адступілася ад іх.

– Але мой бацька хворы, а іхняя сям’я абяцала нам дапамогу віленскіх жрацоў.

– Тады ідзі да іхняй маці Людміліцы, яна, кажуць, добрая жанчына. І багоў шануе.

– Дзякуй, добры чалавек.

Срэбны шэлег з рукі юнака нібы сам пераляцеў у каравую далонь Ваўка, і твар стражніка зноў памякчэў. Нешта кранула яго касматае сэрца ў наведвальніку – можа твар, сьвежы і па-дзявочы румяны, а можа, сарамлівы, як у нетутэйшых погляд. І ён прыязна выслухаў просьбу:

– Ці не дазволіў бы ты мне хоць зірнуць на тую цямніцу, дзе сядзіць мой высакародны родзіч? Я раскажу нашым месьцічам пра княжы замак і ягоныя муры. Усё ж вялікі князь адначасна валадар віцебскі, і ў Полцеску шмат цікавасьці да стольнага гораду Вільні.

– Я дазволю табе толькі падняцца да брамы Верхняга замку. Унутр, у княжы двор, цябе ня прапусьціць ніхто.

– Ну што ж. Тады я падыду да брамы, пастаю там. А табе яшчэ раз дзякуй.

Зноў сярэбраны шэлег лёгка пераляцеў да Ваўка, і той стаў зусім прыветным. У добрым настроі вярнуўся ён у вартоўню і, падсеўшы да стражы, захапіў сабе ажно жменю бірулькаў, каб неяк скараціць доўгі час нялёгкай сваёй службы. Нялёгкай – таму што ўвесь апошні час пасьля сьмерці вялікага Гедзіміна ішла замятня вакол вялікага стальца. І хто ведае, ці надоўга затрымаецца тут Альгерд? Ці раптам вернецца Яўнут альбо мяцежны Сьвідрыгайла? Але бывалі ў службе і прыемныя моманты, калі прыходзіў прасіцца на прыём да вялікага князя альбо кагосьці з прыдворных такі вось месьціч з правінцыі і добра плаціў за паслугі.... Воўк узгадаў твар юнака: круглы, яшчэ безбароды, але з лёгкімі вусікамі над верхняй губой і доўгімі, да плячэй, валасамі пад пушыстай бабровай шапкай.

– Як дзяўчына, – падумаў ён і, калі той вярнуўся назад і лёгка пакрочыў уніз, забыўся на наведвальніка. Шмат іх было, цікаўных ды ахвочых, паглядзець на Горні замак і ўзьняцца на стромкую гару, што валадарыла над усёй Вільняй...

Аднак праз тыдзень, калі стражнікі, як звычайна, уздымаліся на гару, а Воўк заставаўся ўнізе, у вартоўні, ён зноў убачыў колішняга юнака.

– Зьязджаю ў Полцеск, – сказаў той, і зноў шчодрая ягоная рука дала Ваўку шэлег.

– Ці дапамагла табе чым Людміліца?

– Дапамагла. Я вязу ад яе просьбу ўзяць майго брата на службу. Можа, і прыдасца ейнае пасланьне.

– А чаго прыйшоў сюды?

– Ці не дазволіў бы ты зірнуць на замак зблізку? Я пакіну ў залог срэбную грыўну, і я адзін. Хачу паглядзець ужо на княскі двор. Можа, нават убачу кагосьці з князёўнаў. Будзе што расказаць у Полцеску! Вярнуся – атрымаеш яшчэ тры шэлегі.

Воўк прагна глядзеў на белыя далікатныя рукі наведвальніка. Тры шэлегі! Калі кожны дзень будзе такім удалым, ён неўзабаве зможа купіць карчму каля Вяльлі, недалёка ад цесьця, які вечна папракае яго за тое, што ён у вольны ад дзяжурстваў час не вылазіць з карчмы. Тады сапраўды яму ня трэба будзе ісьці на апрыкрую службу...

– Ну што ж, добра. Але ў нас такі парадак: ты атрымаеш медны круг-

ляк з нумарам, і тады цябе прапусьцяць наверх, ажно на самы княжы двор. Але пасьля ты аддасі яго мне, бо ўвечары, калі саступаць на службу другой зьмене, усе круглякі павінны быць у вартоўні. Уцяміў?

– Я хутка вярнуся, – запэўніў яго юнак, і Воўк выдаў яму медны кругляк з пяцьцю насечкамі. Варта, што вярталася зьверху, без зьдзіўленьня агледзела маладога чалавека – кожны дзень нехта прыходзіў у замак, і калі Воўк выдаў пропуск, чаго ж сумнявацца ім?

Але малады чалавек не вярнуўся ні праз гадзіну, ні праз дзьве. І Воўк, які хацеў быў падняць трывогу, бо блізіўся час перадачы сваёй зьмены іншай, раптоўна заўважыў – кругляк з пяцьцю насечкамі ляжаў у грудзе іншых, нібыта яго прынесла сюды нячыстая сіла! Срэбная грыўна, што была дадзеная ў залог, заставалася ў яго, але малады чалавек – і Воўк мог бы ў тым паклясьціся! – з замку не сыходзіў! У вартоўню, праўда, заходзіла некалькі чалавек, але ўсе яны былі знаёмыя: альбо прыдворныя, якія вярталіся з гораду і прыходзілі пагаварыць з вартай, альбо тыя, хто ішоў са службы ў замку дадому.

Праўда, двойчы заходзіў у замак сын пасла Леся, які апошнім часам зачасьціў у скрыпторый, дзе перапісвалі кнігі. Ён сышоў з замку апоўдні, але пасьля ізноў прыцягнуўся, кажучы, што забыўся на перапісаны ім пергамент, над якім будзе працаваць уначы. Але сына пасла Воўк ведаў столькі, колькі служыў у гэтым замку, таму нічога дзіўнага ў тым, што той заходзіў у вартоўню, ледзь не заначаваўшы сярод кніг, не было.

Таму заставалася думаць, што юнака зьнесьлі са сьценаў замку вараны альбо ён ператварыўся ў ваўкалака і ціха праслізнуў незаўважаным.

Калі б Воўк падняў трывогу, многае магло б выйсьці наверх, у тым ліку і прычына, па якой незнаёмец быў свабодна прапушчаны наверх, хаця звычайна невядомага наведвальніка вёў у княжы двор нехта са стражнікаў і асабіста перадаваў тым, да каго той ішоў. У выпадку трывогі срэбную грыўну, магчыма, давялося б аддаць. І начальнік варты змоўчаў і пра юнака, і пра гэтае незразумелае для яго здарэньне.

Пра яшчэ адну прычыну свайго зацятага маўчаньня аб непарадку ён баяўся нават думаць: добры яго сябра, мечнік Сьвідрыгайла, нядаўна быў сьцяты горлам за тое, што абгаварыў вялікую жрыцу. Аднак Воўк добра ведаў, што ніякай хлусьні з боку мечніка не было, бо ён чуў абрыўкі размоў аб гаданьні жраца Сварога Лойкі – ціхіх і патаемных. Аб тым, што жрэц прывёў мечніка да дому сястры вялікай жрыцы, а пасьля раптоўна страціў прытомнасьць, чулі іх і іншыя вартаўнікі, і служкі ў замку, бо і ў сьценаў ёсьць вушы.. Мечнік дабраўся да Альгерда – і вось вынік: дом быў абшуканы, але смарагды, відаць, пасьпелі кудысьці схаваць альбо вынесьці.

А хто і па чыім загадзе – пра гэта трэба было маўчаць. Каб самому застацца жывому, бо да сяброў Сьвідрыгайлы і так падазрона прыглядаліся слугі кашталяна Нарбута.

А жыць Ваўку вельмі хацелася. Хацелася стаць уладальнікам карчмы каля Вяльлі, жыць уежна і ўлежна, у меру грашыць і заўсёды мець шкварку і добрую чарку медавухі.

Сярэбраную грыўну ён схаваў, але доўга яшчэ, правяраючы свой пакуль што невялікі скарб, цёр манету і ўглядаўся ў яе, нібы чакаў, што і яна раптам растворыцца ў прасторы, як растварыўся невядомы яму юнак...

### *Уцёкі НЕ АДБЫліСЯ*

Ноч таемна шапацела сьнегам, ляпіла з вартавых, калі яны хаця на хвіліну выходзілі з вежаў, дзівосныя фігуры, падобныя да тых, якія спальваюць з прыходам Вясны-Лялі. Сьнег падаў і падаў, і варта ўжо з гадзіну нават і не спрабавала выходзіць з утульных, з цёплай печачкай, старожак, толькі час ад часу хто-небудзь высоўваў галаву і спрабаваў углядацца ў цемру, якую дарэмна спрабавалі разагнаць смалякі, што натужна трашчалі і шыпелі пад металічнымі, з адтулінай, накрыўкамі.

Начальнік другой зьмены ля Верхняе брамы Дрозд, які нядаўна зьмяніў варту Ваўка, нудзіўся. Цэлую ноч змагацца са сном нялёгка. І хаця ён добра выспаўся перад дзяжурствам, сёньня ў яго ламіла косьці і ныла ў вантробах. Чым і як лячыцца ад гэтае напасьці, ён добра ведаў. Але сёньня ў замку не было аніякіх баляваньняў, і наперадзе не сьвяціла нават глытка добрага цёмнага піва, ужо ня кажучы пра медавуху. Таму ён паныла сядзеў у куце і назіраў, як вартаўнікі робяць выгляд, нібы яны слухаюць ноч. Хутка ён зноў пагоніць іх аглядаць сьцены, перагукацца з ніжняй вартай і ўтоптваць сьцяжыны, па якіх раніцай першымі пабягуць кухары і пакаёўкі, а за імі малодшыя дружыньнікі, каб да таго часу, пакуль прачнецца вялікі князь, навокал усё было гладка і Альгерд мог пакрочыць па двары альбо ўніз, не баючыся замачыць свае тонкія юфтавыя боты.

Але калі маліцца багам ды слухацца іх, то шчасьце прыходзіць нібыта само сабой. У тым Дрозд пераканаўся, калі зарыпелі дзьверы і, здымаючы адной рукой з галавы башлык, у вартоўню зайшла памочніца малодшага кухара Бярозка. У другой яе руцэ гнулася лазовая ручка ад аплеценага лазой гляка, у якім – Дрозд імгненна вызначыў гэта па паху – штурхалася ў сьценкі вышэйшага гатунку медавуха.

Бярозка зьявілася ў замку ўсяго тыдзень таму, і бачыў яе Дрозд толькі некалькі разоў, калі яна прыносіла ежу для вартаўнікоў і для тых некалькіх вязьняў, якім быў аказаны гонар – сядзець у замкавых сутарэньнях. Адкуль жа медавуха?

– Што гэта? – асьцярожна запытаўся ён, старанна хаваючы радасьць. Раптам яна нясе гэты гляк кудысьці, і толькі зайшла да іх на якую хвіліну! Але Бярозка яго супакоіла:

– Вялікая княгіня загадала занесьці гэта вам. Табе... – паправілася яна, зьвяртаючыся да Дразда.

– Ну, калі ты, вядома, захочаш падзяліцца з іншымі.

І, апярэджваючы пытаньні, дадала:

– Яна не спадзяецца пражыць гэтую ноч. І помніць, што некалі ты ўратаваў ёй жыцьцё. Таму хоча разьвітацца з табою, пасылаючы гэтае пітво.

Дрозд з радасьцю перахапіў гляк, ад паўнаты пачуцьцяў ушчыкнуў дзяўчыну, а яна, лоўка вывернуўшыся, папярэдзіла:

– Вы ж толькі па глытку зрабіце тут, а то ўгледзіць хто, данясе ваяводзе. Зараз я і есьці прынясу.

Яна хуценька выскачыла за дзьверы, а Дрозд, адкаркоўваючы старанна засмалены лычык пасудзіны, апавядаў даўно вядомую стражнікам гісторыю аб тым, як летась княгіня Марыя, спускаючыся да

брамы, пасьлізнулася, і яе па першым зімовым лядку панесла напрасткі на вострыя драўляныя, абабітыя жалезьзем калы, да якіх прывязвалі стражнікі коней. Аднак Дрозд перахапіў гаспадарыню і, штурхануўшы яе ў мяккі сьнег і адвёўшы ад калоў, сам не ўратаваўся і ўпіўся-такі плячом у жалезьзе, расьсекшы лапатку. Было шмат крыві, давялося клікаць шаптуху, якая, да жаху прыдворнага лекара Ганса, заматала рану павуціньнем, і яна на дзіва хутка зацягнулася. Вялікія ўладары дзячылі Дразду пастаянна. Адразу ж ваявода зрабіў яго старшым над вартай Верхняга замку, а княгіня адарыла выратоўцу вялікім срэбным талерам. Цяпер, бязьмерна расчулены, ён наліў у драўляны, выразаны з ясеню ладны глячык напой і з воклічам "За нашу гаспадарыню!" выліў яго ў свой губасты, прагны да пітва рот. Пасьля перадаў глячык іншым.

Калі Бярозка вярнулася з чарпаком і драўляным вядром з аўсянай кашай, адкуль патыхала парам, у старожцы стаяў гул і рогат. Дрозд адмахнуўся ад дзяўчыны, калі тая запрасіла іх павячэраць.

– Ты лепей бы салёных гуркоў прынесла!

– А што я буду рабіць з кашай?

– З кашай?

Дрозд падумаў. Хмель ужо віраваў у ім, туманіў галаву. Звычайна стражнікі каштавалі ежу, пасьля астаткі несьлі самым знатным вязьням. Рабілася так дзеля таго, каб, ратуй Пярун, не атруцілі па нейчым заказе кагосьці з іх. Бо некаторыя вязьні ўсё яшчэ захоўвалі таямніцы, пра якія хацелі даведацца як вялікі князь, так і яго акружэньне.

– Ат, занясі ты ім сама!

Звычайна варыва заносілі стражнікі, але сёньня, па ўсім відаць, ніхто не хацеў адрывацца ад медавухі. Пойдзеш – і нічога не пакінуць табе прагныя да напою хлопцы! Дразду ж хацелася сёньня быць добрым. Сама вялікая княгіня адзначыла яго!

– Глядзі толькі, каб яны ня зьелі цябе замест гэтай кашы! – п'яна крыкнуў ён і зноў прыпаў да гляка. Ноч на дварэ, сьнег шалясьціць па цагляных сьценах, трашчаць смалякі... Дарогу да Верхняй брамы праглядае ніжняя варта – чаго асабліва турбавацца!

...Дзяўчына пацягнула вядро ўніз, па вышчарбленых пляскатых прыступках, і, хаця яно было цяжкае, крокі яе паскараліся. Яна перадыхнула імгненьне і, пакінуўшы вядро ля дзьвярэй, упэўнена дайшла да чацьвёртае каморкі і зазірнула ў яе цёмную зяпу. Пасьля паклікала таго, хто павінен быў там знаходзіцца.

Спачатку было ціха, але прайшло некалькі імгненьняў, зазьвінела жалезьзе, і слабы голас, ад якога яна ўся задрыжэла, прашаптаў зьдзіўлена і недаверліва:

– Уна?!

– Гэта я, я. Кумец. Ты не чакаў мяне, канешне. Але я прыйшла. Прыляцела, каб вызваліць цябе адсюль.

Яна задыхалася, сэрца яе калацілася – не ад цяжкага вядра, якое яна толькі што правалакла па высокіх прыступках, а ад таго, што там, у каменнай пячоры, жывым азваўся да яе той, аб кім яна думала ўсе гэтыя пакутныя месяцы. Яна сама ніколі не прыйшла б да яго першаю, калі б ён ня быў бязьлітасна вырваны са свайго асяроддзя і ня кінуты ў шэрагі адрынутых і багамі, і ўладай, і людзьмі. Урэшце, так сталася і з ёю. І хто мог бы асудзіць яе цяпер?!

Ёй ужо не было месца ў Вільні, яна і зараз, застаючыся тут амаль ужо на два месяцы пасьля наведваньня іхняга дому Бурылам і шукаючы паратунку для Кумца, падстаўляла пад пятлю ня толькі сябе, але і галаву брата, які бязьмерна любіў яе і дапамагаў. Наўрад ці маглі б уратавацца і тыя, хто дапамог ёй зьявіцца ў замку, амаль усутыч з людзьмі, хто мог яе апазнаць, выдаць, затрымаць.

У яе ўжо не было нават часу. Небясьпека ішла па ейных сьлядах, як ішла за ёю нянавісьць аднаго з самых магутных людзей у сталіцы – вярхоўнага жраца Перуна.

Коратка, таропка яна перадала Кумцу сваю гісторыю.

– Цябе ўсюды шукае Бурыла, а ты прыйшла ратаваць мяне? – запытальна-недаверліва сказаў Кумец, і голас яго перарваўся.

– Не пытайся ні аб чым, бо пад замкавай гарою чакаюць Круглец і наш слуга Рамша з коньмі. Ты паімчышся куды хочаш: у Германію ці Рым, у Візантыю ці Чэхію. Ты будзеш свабодным!

– А Няжыла – ён таксама паедзе са мною?

– Вядома! Мы купілі каня і для яго.

– А іншыя?

– Хто пасьпее выскачыць – той уратуецца. Стражнікі наверсе ўсе сьпяць, і можна непрыкметна выпаўзьці ўніз, пад гару. Але я не змагу адчыніць усе замкі. Часу зусім мала!

– У мяне яго зараз стала замнога...

Яна амаль ня слухала:

– Вось абцугі – трэба хутчэй зьняць жалезьзе. Ты, відаць, нацёр ногі да крыві!

Яна тузала ланцугі, якія паблісквалі ў слабым чырванаватым сьвятле смаляка, запаленага ў калідоры, але рукі яе сутыкнуліся з ягонымі, цьвёрдыя пальцы абхапілі запясьце дзяўчыны.

– Уна, пачакай. Я хачу табе нешта сказаць...

– Брат, хто там з табою? – данёсься да іх устрывожаны голас Няжылы.

– Пачакай, брат, памаўчы!

У каморцы сьмярдзела потам і гнільлём. Салома пад нагамі Уны была вільготнаю. Са сьцяны тачылася вільгаць, у яе за колькі імгненьняў ужо скарчанелі ногі. Яна не разумела спакою Кумца. Чаму ён ня рвецца адсюль? Чаму абцугі, якія яна амаль сілком уклала ў ягоныя рукі, яшчэ не выварочваюць цяжкія ковы, якімі ён, гэты разумны, прыгожы хлопец, прыкаваны да сьцяны? Жаль да яго, што захапіў яе істоту тады, калі яна толькі дазналася аб ягоным арышце, а яшчэ жах быць злоўленай, небясьпека і захапленьне ўжо зьдзейсьненым прымушалі яе гарачкава гаварыць і пытацца.

– Ты можаш варушыцца?

Ён не адказваў, сядзеў у нейкім здранцвеньні.

З кожным імгненьнем расло і мацнела нешта непапраўнае, тое, на што не разьлічвалі яны з братам, два месяцы рыхтуючы дзёрзкі і, як ім здавалася, беспамылковы план пабегу братоў з вязьніцы. Абое яны, добра ведаючы замак і ягоныя патаемныя хады, разьлічылі ўсё наперад: і службу Уны пад выглядам дачкі аднаго з віленскіх месьцічаў, і атручанае сонным парашком віно, якое зараз павінна было ўжо падзейнічаць на варту, і вераўчаную лесьвіцу, па якой вязьні вылезьлі б за муры замку і, асьлізнуўшы ўніз, селі б на коней, якія чакалі іх непадалёк, і нават пропускі

беглякам, якія пад выглядам пасланцоў князя маглі без усялякіх перашкодаў выехаць праз Вострую браму пасярэдзіне начы... Адзінае, чаго яны не змаглі – гэта загадзя папярэдзіць Кумца і Няжылу аб сваіх планах. Але хто мог падумаць, што ён, той, да каго ірвалася ўся яе душа, замест таго каб сьпяшацца з вязьніцы, стаіць на сьмярдзючай саломе і спакойна глядзіць на яе, нібыта з нейкай далечы!

– Чаму ты не вызваляешся ад ланцугоў? – амаль выкрыкнула яна нарэшце. – Можа, на цябе навялі морак гарцукі? Ці сам Жыжаль?

Ён усё глядзеў на яе, міргаючы. Як асьлеплены слабым водсьветам недалёкага смаляка. Нарэшце устаў, патузаў жалезны пояс з замком, на якім мацаваўся ланцуг. Адарваць яго было немагчыма.

– Мяне трымае ня гэта, – сказаў ён нарэшце амаль бязгучна.

– А што?!

– Ня ведаю, як табе сказаць...

– Бяры абцугі, Кумец! Ці давай я сама раскую твой ланцуг!

– Пачакай, не сьпяшайся, – ён адвёў дзявочую руку. – Тут, у цямніцы... да мяне прыходзіў Усявышні... Я бачыў яго як зьзяньне. І гэта... дало мне такое сьвятло! Такую радасьць і такую моц!

– І... што?! – яна не разумела.

– Я ўзгадаў, што казаў мне аднойчы Лойка: такое сьвятло ідзе з далёкіх зорак, з самога Ірыю.

– Кумец, стражнікі хутка ачомаюцца, тады нам ня выбрацца!

– А ці стане Сьвятло прыходзіць да мяне... там? – ён паказаў рукой у накірунку лесьвіцы. – Там, дзе тлум, пагоня за багацьцем, за ласкаю князя... дзе няма калі думаць аб тым, навошта дадзенае нам жыцьцё? Думаю, яно мяне пакіне. Т а м я стану ранейшым – трохі веры, трохі ўцехаў. І ўсё як ва ўсіх.

– Чаму ж пакіне?... да цябе яно будзе прыходзіць усюды! Чаму ж не? – яна разгубілася, як губляюцца перад вялікім няшчасьцем. Гэта было так неспадзявана, так... несправядліва! Колькі яны з братам зрабілі дзеля таго, каб зьдзейсьнілася немагчымае: уцёкі з замкавае цямніцы, дзе днём амаль ні хвіліны двор не бывае пустым, дзе столькі варты, дружыньнікаў, гасьцей!

– А твой брат... Ты вырашаеш і за яго?

– Майму брату перабілі нагу, і я, тым болей ты, яго адсюль ня вынесу. Што ж – значыць, і яму, як і мне, варта падумаць над усім, што з намі адбылося, – раздумліва адказаў Кумец, і рука яго звыкла падклала пад плячо, да крыві нацёртае (цяпер яна бачыла гэта і ў скупым сьвятле) жалезьзем, кавалак таго, што засталося ад ягонага парчовага каптана. Дарагія некалі рэчы, што цяпер сталіся толькі рызьзём, глядзеліся на ім так, нібы ён усё жыцьцё насіў толькі гэтае: рызьзё, лахманы, бядноцьце, і не заўважаў таго. Але смуглявае маладое цела было ўсё тым жа – пругкім, цьвёрдым, нібыта і ня месяцы праседзеў ён тут без анікага руху, а толькі ўчора прыйшоў з паляваньня альбо балю ў палацы князя. І пачуцьцё, што яе зашпурнулі ў бездань, што яна ляціць уніз, не адчуваючы пад сабою нават далёкага дна, прымусіла яе заплакаць і прагаварыць ужо з папрокам, з горыччу:

– Нас з Кругляцом павесяць на сьвяшчэнным дубе, калі зловяць і дазнаюцца, што мы спаілі варту…

– І хацелі вызваліць нас з братам? – дагаварыў Кумец. – Думаю, што

Усявышні ахіне вас крысом свае літасьці, і ворагі вас ня выкрыюць. Ідзі адсюль, Уна, ідзі хутчэй, і забудзься на мяне. І твой брат няхай таксама забудзецца. Іначай нашае сваяцтва дорага вам абыдзецца. Дзякую за ўсё, і за тое, што клапоцішся нават пра такіх далёкіх сваіх сваякоў, як мы...

Яна сьцялася, як ад удару. Не сваяцкае пачуцьцё вяло яе сюды, і не ад яго хацелася маладой дзяўчыне прыхінуцца да гэтага прыгожага, такога спакойнага ў сваіх няшчасьцях юнака. Яна адчула, што ён наўмысна загаварыў аб сваяцтве. Не сьляпы ж ён і не глухі, каб не адчуць, што вяло яе сюды, чаму яна, плачучы, ня хоча сыходзіць. А варта толькі каму-небудзь зайсьці да варты і пабачыць, як валяюцца гэтыя мацакі па вартоўні, сонныя і ачмурэлыя, як адразу ж уздымецца трывога, і тады яна ніколі ня выйдзе з гэтае страшнае цямніцы! Ён падштурхнуў яе:

– Ідзі ж!

– Я не пайду без цябе! Я... я застануся тут!

– Падумай пра Кругляца!

– А іншыя? Ім таксама патрэбнае тваё зьзяньне? Яны маглі б атрымаць свабоду!

– Тут два забойцы і тры злодзеі. Думаю, Бог ведаў, што ім трэба, таму яны ў вязьніцы, дзе падумаюць над тым, як і чым жыць. Віленскаму люду будзе бяз іх спакайней. Але рашай сама, Уна. Вызвалі іх замест мяне.

Тады яна пайшла, хістаючыся, да выхаду. Спатыкнулася аб вядро, якое глуха шмякнулася аб падлогу. Застыглая зьверху каша засталася гарачай і балюча абвалакла нагу. Ужо ступіўшы на першую прыступку лесьвіцы, дзяўчына азірнулася:

– Чаму?!

І пачула дзіўны адказ:

– Таму што люблю.

– Мяне?!

– І цябе таксама.

– Таксама?!

– Я люблю ўсіх людзей, Уна. І цябе сярод іх.

Дзяўчына кінулася ўверх па лесьвіцы, спатыкаючыся і плачучы ўголас. І пакуль адольвала прыступкі, усё чула трывожны голас Няжылы:

– Хто там, брат, хто там?

– Хто там? – крычалі і іншыя вязьні – хрыпата і адчайна, нібы глоткі іх зацягнула цінай доўгага маўчаньня і яны адвыклі вымаўляць нават простыя словы.

І глуха-глуха, нібы з бездані, гучаў спакойны голас Кумца:

– Захавай, Божа, душы нашыя, а ня целы, пакінь нам сьвятло тваё, каб мы ачысьціліся…

Варта яшчэ спала – каго дзе застаў нечакана моцны і небясьпечны хмель, аднак Дрозд, што зваліўся на лаву, пачынаў пакутліва варушыцца, нават прыўзьняў галаву. Было ціха, адно трашчалі на сьценах смалякі. Уна асьцярожна дастала з вышытага скуранога футаралу, што вісеў на пасе аднаго са стражнікаў, шырокі блішчасты нож, вой таргануў нагой, павярнуўся на дубовым пяньку і тут жа зноў заплюшчыў вочы.

Яна асьцярожна, амаль ня дыхаючы, прайшла па сонным калідоры, прасьлізнула за сьпіной вартавога, што, аблеплены сьнегам, нерухома

стаяў непадалёк ад дзьвярэй і глядзеў на дарогу наперадзе, дзе вялізным белым памазком бяліла і бяліла зямлю завіруха.

Тут, на вышыні, вецер завываў асабліва моцна, і ў яго злавесным завываньні пataналі іншыя гукі. Уне, абдзіраючы рукі і дзе-нідзе насякаючы зарубкі забраным нажом, удалося пралезці па ледзяным сьлізкім каменьні сьцяны да месца, дзе на ўбітым загадзя круку была замацаваная вяроўчатая лесьвіца. Перад тым як учапіцца за хрумсткія ад наледзі вяроўкі, яна зірнула на сьцяну высокай круглай вежы. Там, у вузкай шчыліне акна, слаба сьвяціўся жоўты агеньчык. Як савінае вока, цікаваў ён за Вільняй, за ўсім Вялікім Княствам.

Яна ня ведала – вялікі князь сядзеў над сталом, дзе ляжалі данясеньні віжоў аб тым, што кажуць пра яго вязьняў-хрысьціянаў замежныя паслы і купцы. Ён таксама думаў пра тых, хто пакутаваў унізе, і думкі яго былі надта невясёлымі...

## КРУГЛЕЦ У РОЗДУМЕ

Расчараваньне і жаль, якія ахапілі Кругляца пасьля таго, як Уна вярнулася адна і расказала аб адмове малодшага з братоў выбрацца з падзямельля, патроху праходзілі. У сьнежнай крутаверці дзяўчыне ўдалося шчасьліва спусьціцца з замкавае кручы, разам са сваім надзейным суправаджэньнем незаўважна і хутка аддаліцца ад княскай гары, тым уратаваўшыся ад небясьпекі. Пра сёньняшняе яе жыцьцё з таго часу, як з адчыненага акна роднай сьвятліцы яна скочыла ўніз, ня ведаў ніхто, апроч брата.

Тады ёй пашанцавала так, нібыта несьлі дзяўчыну на крылах самі залатыя браты Ашвіны. А можа, і сапраўды яны паслалі ў тыя кароткія імгненьні, калі яна, скочыўшы ўніз, не зламала нагі і кінулася да дарогі, той карычневы вазок з залацістымі ўзорамі? У ім з гасьцяваньня вярталася дахаты багатая ўдава Вольха, некалі закаханая ў ейнага бацьку Леся. Удава пазнала дзяўчыну, схавала яе ў свой вазок, а пасьля прывезла дахаты. Яна ж узрадавала Кругляца вестачкай аб сястры, і гэта па задуме Вольхі замест сапраўднай Бярозкі ў замку пад ейным імем атабарылася іншая. Яна павінна была выбраць патрэбную хвіліну і патрапіць да вязьняў. Бярозку ж разам з яе бацькамі паслалі ў Чэхі, дзе яны змаглі адкрыць уласную карчму на грошы, шчодра ахвяраваныя Кругляцом.

Вольха надта старалася надаць Уне іншае аблічча, каб, ня дай Мокаш, не пазнаў яе хто са знаёмых. І праўда, было аднойчы, калі памочніцы малодшага кухара давялося несьці вячэру ў вартоўню: галоўны стражнік Воўк неяк дзіўна прыглядаўся да яе, пакуль яна разьлівала па тарэлах поліўку. Уна нават зьніякавела ад таго, хаця попельныя валасы яе, пафарбаваныя гарэшкамі альшыны, выглядалі касматымі і грубымі, а начарнёныя тым жа гарэшкам бровы зусім перайначылі яе прыгожы і пяшчотны тварык. Яна ўпарта шукала хаця якой зачэпкі трапіць да братоў. Аднак, хаця як і належала тое памочніцы, начавала яна ў пакойчыку каля кухні, каб першай, яшчэ да сьвітаньня, распальваць печ, за ўвесь тыдзень ні разу не давялося нават наблізіцца да лесьвіцы, якая вяла ў падзямельле: варта дзень і ноч пільнавала сховы. І тады разам з братам яны прыдумалі іншы план – дзёрзкі і нечаканы, з сонным парашком у віно стражнікам і вызваленьнем Кумца і Няжылы.

Але тыя разьлікі ня зьдзейсніліся. Упартасьць Кумца здавалася неспасьцігальнай, і ўсе вырашылі: яго акруціў Злыдух і памуціў розум хлопца.

Праўда, слуга Рамша з асьцярогай выказаў шкадаваньне, што гаспадары не зьвярнуліся да галоўнага жраца храма Сварога Лойкі. Шапталіся ў народзе, што перад Лойкам расчыняюцца ўсе дзьверы таму, што некалі прыдбаў ён чароўную разрыў-траву. Ня кожны вядун можа яе дастаць, бо шлях да яе акрутны: замазаць глінай гняздо адной з вешчых птушак – сойкі, сарокі альбо савы, каб тыя птушкі не маглі насіць ежу сваім дзеткам. Паляціць тады птушка-маці шукаць разрыў-траву, каб ёю прабіць загароду і накарміць птушанят. А калі паляціць тая трава ўніз, трэба пільнаваць пад дрэвам, разаслаўшы белы абрус, а пасьля разрэзаць правую далонь і зашыць пад скурай чароўнае зельле. Тады, калі штурханеш гэтай рукой любыя дзьверы, яны расчыняцца.

– Чаму ж не даўмеўся Лойка таемна прабрацца ў хату да Дзівейны, каб там знайсьці каралі? – загаварыла было Уна, ды абсеклася. Нягожа Лойку шныпарыць па чужых хатах, як якому вышуканцу ці віжу! Але Рамша растлумачыў па-іншаму:

– Людзі кажуць, што яго спыніла Нара. Мацнейшаю яна аказалася за Лойку. Ды толькі травы ў яе няма – не далася ёй разрыў-трава, бо ня кожныя рукі прыдатныя да таго!

Ніхто не гаварыў пра самае балючае: нашто была тая разрыў-трава, калі ўсе іхнія высілкі ўсё роўна сталіся марнымі!

Той жа ноччу Уна, зноў пераапрануўшыся хлопцам, як і тады, калі прыходзіла ў замак, ад’ехала ў Нямеччыну. Кумец застаўся ў Вільні. Наўрад ці дазнаюцца возны ці кашталян Нарбут аб тым, што зьніклая з замку Бярозка была насамрэч ягонай сястрой Унай. Ніхто ня мог ведаць аб тым. Яны пабачыліся ў замку толькі аднойчы, калі яна перадавала кругляк з нумарам, які трэба было падкінуць да вартаўнікоў, і ў скрыпторыі, як і па ўсім доўгім калідоры, тады не было ніводнае душы.

З таго дня, як іхняе з Унаю мірнае, спакойнае жыцьцё перапыніў вярхоўны жрэц, а любімая сястра мусіла хавацца і будучае для яе нібыта зьнікла, ён перастаў спаць па начах. Ляжаў, утаропіўшыся ў столь, глядзеў, як цені ад сьвечкі трапечуць па чырвоных цаглінах, як варушацца па кутах тонкія, ледзь улоўныя абрысы нейкага іншага жыцьця, якое – ён адчуваў гэта – пранізала іхні час і іхнія лёсы. Можа, гэта былі душы продкаў, якія спачувальна спрабавалі ахутваць іх заслонай ад няшчасьцяў, а можа, гэта ажывала будучае, якому ніякай справы не было да таго, што адбудзецца з ім і Унай.

Яе каханьне забрала цямніца. Але і ейнае жыцьцё сталася цямніцай. На яе наладзіў паляваньне сам вярхоўны жрэц, і калі б яна засталася тут, ягоныя віжы-выжлы рана ці позна выйшлі б на сьлед, сястру знайшлі б, каб аддаць у ахвяру Перуну. Выйсьця не было – ні яму, ні ёй.

План, які здаваўся яму самым дзейсным – каб Кумец разам з Унай і братам выехалі ў іншую краіну, не ажыцьцявіўся. А мог бы. Яны, зацныя людзі Княства, не прывязаныя да аднаго месца, ім адкрыты ўвесь сьвет. Багацьця ягонай сям’і дастаткова было для таго, каб сястра атрымала тое адзінае, чаго яна хацела і чаго заслугоўвала сваёй прыгажосьцю і самаахвярнасьцю – каханага мужа.

Аднак Кумец адмовіўся уцякаць, і цяпер, калі ўсё абрушылася і спроба

вызваленьня не ўдалася, Кругляцу карцела самому сустрэцца з Кумцом і зразумець нарэшце, чаму ён застаўся тут, у Вільні.

Чаму? Гэтая думка не давала яму спакою. Хаця і быў ён хрышчаны і верыў у адзінага бога, усё ж круцілася, тузалася ў ім сумненьне: няўжо сапраўды такая магутная ў Кумца вера, каб перамагчы нават страх сьмерці? Каб пераадолець у ім прагу шчасьця, каханьня, свабоды, хай сабе і ў чужой краіне? Але якая ж іншая прычына прымусіла б Кумца застацца ў сьмярдзючай каменнай дзірцы, гніць жывому і ня мець надзеі выбрацца?

Але выйсьце, хаця і інакшае, чымся ўцёкі з цямніцы, павінны знайсьціся. Сітуацыя ня бачылася яму беспрасьветнай. Украдзеныя смарагды недзе ж былі, і душа яго адчувала, што не Няжыла быў прычынай іхняга зьнікненьня. Рэчыца вярнулася дадому. Чаму? Хаця яе апанавалі нячысьцікі і яна амаль нікога не пазнавала, ды занадта вялікай была правіна, каб проста так адпусьціць яе дахаты. Да таго ж, Круглец ведаў, што допыты Няжылы не далі ніякага выніку. Яго дваццаць разоў усьцягвалі наверх на дыбе, яму палілі пальцы, але ён не сказаў, дзе каралі. Каб ведаў, ня вытрымаў бы гэткіх зьдзекаў. Круглец мог бы яшчэ паверыць у адчайную вытрымку чужога невядомага злодзея, якому, калі б віна была даказаная, пагражала страшная, з нялюдскімі пакутамі сьмерць. Аднак Кругляца ён ведаў. Перашкаджала паверыць у яго віну і іншае: зьвязьнілі амаль адразу, хаця і па розных прычынах, адразу абодвух братоў. Кумец трапіў у цямніцу не таму, што быў братам злачынцы, а таму, што быў хрысьціянінам.

Каму спатрэбілася зьмясьці са сваёй дарогі і Кумца, і Няжылу? Узьнікаў і адказ: таму, хто заняў іхнія месцы. А гэта былі людзі, зьвязаныя з Бурылам і, асабліва, з вярхоўнай жрыцай Нарай.

Круглец ведаў і пра вобыск у доме Дзівейны, які ня даў ніякага выніку. Але ня проста ж з нічога ніякага ўзьнікла падазрэньне ў Лойкі! Ды і не падазрэньне, а ўпэўненасьць, калі сам ён пайшоў да дому ды яшчэ пасьля маленьня.

Аднак, крычала ў ім нешта, Лойка ўпаў ля хаты, і магчыма, ішоў ён ужо апоены чамярыцай?

А калі паўставала перад вачыма Дзівейна, у ім нарастала трывога і агіда да яе. Ён зноў і зноў перабіраў у памяці падзеі апошніх тыдняў.

Нейкая сувязь была між тым, што менавіта Нара, яе сястра, першаю заўважыла крыж на грудзях Кумца – крыж, які быў схаваны ў таго пад кашуляю. І тым, што якраз на Дзівейну паказаў вялікі жрэц Лойка, ды пасьля таго ўпаў бяз памяці. Хаця ўсё гэта і трымалася ў вялікай таямніцы, але пра тое пасьпеў расказаць свайму сябру мечнік Сьвідрыгайла, які суправаджаў Лойку ў ноч гаданьня. А той расказаў Кругляцу падчас сустрэчы на вуліцы, пры тым бесьперапынна азіраўся па баках – ад страху. І нездарма.

Сьвідрыгайлу сьцялі горлам за нібыта хлусьню. Лойка пасьля таго гаданьня ледзь выжыў – мабыць, зайшоў занадта далёка ў іншы сьвет. Калі ж ён страціў прытомнасьць і быў перанесены ў храм, яго лячыў жрэц Вакула. Ды толькі хворы чамусьці не здаравеў. Наадварот – ён траціў сілы штодзень і, калі вярхоўнаму жрацу стала зусім блага, сьсінеў як мярцьвяк. Спруцянелага Лойку паклалі на сьмяротнае ложа і праз тры дні намерыліся спаліць, як тое і належала. Пайшлі перамовы: хто стане галоўным жрацом,

каго выбера вялікі князь і зацьвердзяць мудрыя старцы. Перашкодзілі таму Ашвіны – з іхняга галоўнага сьвяцілішча на пахаваньне Лойкі прыехаў надта абазнаны ва ўсіх атрутах старац. Ён і адкрыў, што Лойка яшчэ жывы, і сам прыгатаваў для яго напой, пасьля якога той расплюшчыў вочы. Жрэц Вакула некуды зьбег, яго шукаюць па ўсім Княстве.

У храме Сварога пасьля таго паставілі моцную ахову супраць злыдухаў, і Лойка стаў папраўляцца. Але ж каму патрэбная была ягоная сьмерць? Нары ці самому вялікаму князю? Але нашто?

Шукаць смарагды ў доме сястры вялікай жрыцы не маглі б без дазволу самога вялікага князя. Чаму ён даў такі дазвол?

І Круглец вырашыў дзень і ноч сачыць за домам дзяўчыны, чый лёс уплёўся ў лёс Кумца, а праз Уну – і ў ягоны. Ён бачыў Дзівейну толькі два разы, і тое адбывалася ў час пакланеньняў у храме Лады, куды прыходзіла ўся знатная моладзь Вільні нават часьцей, чымся ў храм Перуна ці Вялеса. Прыгажуня, моцная, як маладая рэпка, глядзелася нявіннай і чыстай, як крынічка, але абвостраны позірк Кругляца у гэтай гарачай усьмешлівай маладосьці адчуваў нешта трывожнае для яго, нейкую схаваную глыбока чарнату...

І ён загадаў свайму слузе, каб той заняўся віжаваньнем разам з даверанымі людзьмі Лесевага дому. Маладога затворніка напачатку моцна бянтэжыла тое, што ён змушаны карыстацца віжаўствам, але іншага выйсьця, каб вызваліць Кумца і Няжылу з вязьніцы і выратаваць сястру, ён ня бачыў. Падазраваў ён і сувязь Бурылы з Нарай – таксама сувязь таемную, нябачную для іншых, але такую моцную, якая магчымая толькі паміж людзьмі, зьвязанымі агульнымі інтарэсамі. Якія былі тыя інтарэсы? Жрацы таго ці іншага бога часам варагавалі адзін з адным, змагаючыся за ўплыў, але храмы Лады і Перуна заўсёды жылі ў згодзе.

Усе ягоныя падазрэньні былі хісткімі – такімі ж, як цені на сталі, але ён думаў над усімі падзеямі, што пранесьліся праз апошнія месяцы бурапеннай віхурай, кожныя дзень і ноч. А з таго часу, як віжы пачалі дакладаць яму аб тым, хто і калі прыходзіў у дом Дзівейны, ён стаў упэўнівацца, што душа ягоная прадчувала многае з таго, што схаванае пад покрывам сьвятасьці і жрэчаскіх інтарэсаў.

Ён даведаўся аб тым, што Дзівейна некалькі разоў удзельнічала ў закрытых сьвяшчэннадзействах у храме Лады, дзе ва ўкрадзенае адзеньне вялікага князя Альгерда былі ўшытыя магутныя заклёны аб каханьні. Дазнаўся і аб тым, што з храма Перуна пачалі разыходзіцца чуткі, што толькі прыгажуня Дзівейна прынясе шчасьце Вільні, калі стане вялікай княгіняй. Ніхто не сумняваўся, што Марыя Віцебская памрэ, а князю бяз жонкі не абысьціся. Дык няхай возьме ён тую, якая верная старым багам, і тады яны змогуць адвесьці ад Вільні няшчасьці... А няшчасьці стаялі ля парога княства – законны гаспадар Яўнут, як даносілі весткі, зьбіраўся адбіраць свой сталец. Не спакайнелі і іншыя браты Альгерда, а між тым набіралі сілу і іхнія сыны, спадчынныя княжычы.

Паступова ў галаве яго пачалі складацца, кавалак за кавалкам, дэталі вялікага плану, задуманага жрацамі. Браты Кумец і Няжыла былі не вінаватыя, але па задуме жрацоў іхнія жыцьці павінны легчы пад нейчыя колы, каб стаць гацьцю, па якой праедуць іхнія калясьніцы. Ганеньні на хрысьціян былі зараз патрэбныя жрацам, як ніколі. Новы шлюб Альгерда павінен узмацніць іхні ўплыў. Першым вынікам арышту братоў сталася

тое, што ў замку павялічыўся ўплыў Нары. Яна заклікае да сябе княжычаў і першаю віншуе з народзінамі маладых князёўнаў... Замененая пакалёўка, як пачало здавацца многім, адсоўвае ў цень тых, хто любіць Марыю і цягнецца да яе. Можа, гэта і выпадкова. Але чаму Рэчыца, не пасьпелі яе як сьлед дапытаць, адразу ж паказала на свайго жаніха? Вядома, як кахала яна яго, як радаваўся іхняму будучаму шлюбу Кумец, брат Няжылы. Што ж зрабілі з ёю, чым запалохалі?

Калі ўзвысіцца Дзівейна, то Альгерд будзе цалкам у іхніх, сквапных і бязьлітасных руках. Так, Круглец цяпер мог казаць гэта пра жрацоў. Сьвяцілішчы былі поўныя каштоўнасьцяў, але летась, у голад, толькі маленькая часьцінка тых багацьцяў пайшла бедным людзям, але які шум паднялі жрацы, апавяшчаючы віленскі люд аб сваёй дапамозе!

Ды ён быў бясьсільны. Упершыню ён, знатны і магутны чалавек, адчуваў сябе пясчынкай на дарозе, якую можа ўзьняць і перанесьці куды захоча магутны вецер. Ён баяўся таго, што ягоныя з сястрой захады дапамагчы братам будуць выкрытыя жрацамі – у іхняй магутнай сіле ён пераконваўся ня раз.

Што, калі яны адкрыюць, што не раптоўна зьніклая служка Бярозка прыслугоўвала на княскай кухні, а ягоная сястра Уна, якую паўсюль шукалі выжлы Бурылы? Ёй бы трэба было зьехаць адсюль нашмат раней, была б цяпер яшчэ далей ад небясьпекі, але тады моцна трымаў яе тут Кумец. Яна не хацела шчасьця без яго.

І ён, ейны брат, быў таксама прывязаны да ўсяго, што раптоўна завязалася тугім вузлом здрады, хцівасьці і чужых планаў і зацягнула ў гэты вузел іх з Унай.

І ўсё ж ён вырашыў змагацца. Няхай ён загіне, ды затое не як палахлівы заяц, што туліцца пад кустом у спадзяваньні, што яго не заўважаць драпежныя валадары лесу. Ды нават і заяц, калі выганяць яго з прыбежышча, аддае сваё жыцьцё толькі ўжо канчаткова змогшыся, аддае ў апошнім, сьмяротным, але высокім скачку. Няўжо ён, Круглец, здасца абставінам і замрэ, заляжа, ажно пакуль тугі вузел не захопіць яго горла ў пятлі, з якой ня выбрацца? Не, ён загіне ў адкрытым баі, ён будзе біцца да апошняга!

Дзьверы скрыпторыя выходзяць на лесьвіцу, а адтуль – усяго некалькі прыступак да пакояў вялікай княгіні, якія часта бываюць адкрытыя – у зачыненым пакоі яна задыхаецца. І ён вырашыў каравуліць ля дзьвярэй скрыпторыя і па магчымасьці назіраць ці хаця б чуць нешта з таго, што ў гэтыя дні віравала – ён адчуваў гэта – вакол княгіні Марыі.

На чацьвёрты дзень, адзінока седзячы ля адчыненых наўмысна дзьвярэй у вялікай залі, застаўленай куфрамі з кнігамі і сьпіскамі, бяздумна ўчытваючыся ў словы грэчаскага пергамена аб узяцьці вялікай Троі, ён пачуў шэпат, які, адбіваючыся ад вузкіх сьцен, быў выразна чуцён у скрыпторыі:

– Пачакай, яна яшчэ ня сьпіць...

Ён ціха спусьціўся па лесьвіцы, стараючыся, каб каптан не зачапіўся за шурпатую паверхню сьцяны, каб тоўстыя дубовыя палавіцы не рыпелі пад ботамі, і асьцярожна вызірнуў з-за вуглавога каменю, што востра вытыркаўся з каменнай кладкі.

Зімовае сонца з верхніх акенцаў залатымі чатырохкутнікамі клалася на шэрую каменную падлогу, высьцеленую каля пакояў княгіні калматымі баранковымі скурамі, высьвечвала звычайна цёмныя і панурыя куткі пра-

сторнага калідору, ясна паказвала тых, хто, магчыма, хацеў бы схавацца ад яго – пакаёўку старэйшай князёўны Гайну і новую прыслужніцу вялікай княгіні, чарнавалосую і высокую Зязюлю, якую Марыя загадала пахрысьціць як Васілісу, бо не жадала карыстацца паслугамі язычніцы. Васіліса была ў клятчастай хусьце, накінутай на блакітную кашулю з чырвоным аксамітавым гарсэтам, Гайна ж была ў зялёным каптанчыку са срэбнай аблямоўкай.

Дзяўчаты шапталіся, але маладыя душы яшчэ не навучыліся лаўчыць і хітраваць па-сапраўднаму, таму галасы іхнія гучалі даволі гучна і выразна, так што Круглец чуў кожнае слова:

– А што, калі гаспадарыня загадае праводзіць сьледства? – турбавалася малодшая, спалохана азіраючыся па баках.

– Стрыга цябе забяры, дзяўчына! Няўжо мала табе двух срэбных талераў?

– Ня мала, не, але ж жыцьцё даражэйшае...

– Няма ўжо калі перарабляць усё, што задуманае, чуеш – няма, – Гайна павысіла голас, і Зязюля-Васіліса спалохана зашыпелала:

– Цішэй, яшчэ пачуе хто!

– А ты рабі тое, што абяцала!

– Баюся, галубачка, ой баюся.

Гайна выпрасталася. Круглец ня бачыў вачэй пакаёўкі, але з тым большай увагай глядзеў на невялічкі скрутак у ейных караткапалых, моцных пальцах, і белым ільняным скруткам гэтым яна ткнула ў грудзі сваёй суразмоўніцы:

– Калі ты, Стрыга цябе забяры, не пакладзеш іх туды, куды мы дамаўляліся, ты не пражывеш і тыдня. Чуеш ты – нават тыдня! Вялікая княгіня павінна надзець іх сёньня!

– Чаму – “іх?” – падумаў Круглец. – Што там такое – “яны”?

І ў той жа момант ён раптам здагадаўся, што было ў белым невялічкім скрутку. Гэта маглі быць толькі смарагдавыя каралі, якія вось ужо некалькі тыдняў шукалі патаемныя службы войта і якія належалі вялікай княгіні.

Першым памкненьнем яго было жаданьне кінуцца да дзяўчат і выхапіць скрутак з рук Гайны, затым абвясьціць пра сваю знаходку варце і самому войту, каб ужо яны дазнаваліся, як апынулася гэтая каштоўнасьць у руках пакаёвак. Аднак абвостранае ўяўленьне адразу падказала яму, што будзе далей: Гайна падніме крык, што гэта ЁН трымаў у руках смарагды, што гэта ЁН быў злоўлены тут як злодзей. І гэтая, другая, пацьвердзіць усё, што скажа першая. І падчашы знойдзе яшчэ пару сьведкаў, якія будуць пераконваць вялікага князя, што бачылі яго тут з гэтым скруткам...

Ён, сьцяўшыся, чакаў далей. І ўбачыў, як, апусьціўшы галаву, узяла скрутак Зязюля-Васіліса, сунула яго сабе ў гарсэт, прамармытала:

– Пайду. Можа, яна яшчэ не прачнулася. А калі ня сьпіць, то я іх… заўтра…

– Сёньня, да заходу сонца. Што хочаш рабі, але яна павінна іх надзець... сёньня! Так паказала гаданьне. Заўтра прыязджае лекар з Візантыі, з гары Афон – чула пра такую? – патрабавала Гайна.

Зязюля-Васіліса шчыльней захутала шыю хустай, згорбілася і, адчыніўшы дзьверы ў пакоі сваёй гаспадыні, панура ўвайшла туды. Гайна са-

чыла за ёю, пасьля пругка, як зьмяя, пацягнуўшыся, азірнулася навокал і, хутка падабраўшы спадніцу, пашыбавала ў накірунку да пакояў старэйшай князёўны, што месьціліся ля супрацьлеглага ўваходу. Прайшоўшы некалькі крокаў, яна нібыта адчула погляд Кругляца, неспакойна паматляла плячыма, нібыта адганяла назойлівую муху, і зноўку хутка, ледзь схіліўшы галаву, агледзела ўсё навокал. Але ён ужо паднімаўся наверх, прыгнечаны і задуменны, абдумваючы, што трэба рабіць яму, і рабіць неадкладна...

Ён ня бачыў, што за ім краўся цень, разрастаючыся па сьцяне, дастаючы галавой высокую столь. Цень размахнуўся даўбешкай... Удар па галаве, храбусьценьне костак – і Круглец грымнуўся на каменную падлогу бяз памяці. Ён ужо ня чуў, як яго цела, засунутае ў мех, валаклі да вакна, як скінулі ў роў, што абкружаў замак, а пасьля – у Вяльлю. Ды толькі Усявышні, якому маліўся ягоны бацька ў Візантыі, відаць, дапамог маладому кніжніку: мех зачапіўся за галіну вярбы і не патануў, а тым часам па беразе скакаў баярын Кіян, які спалохаў нападоўцаў і выцягнуў Кругляца.

Аднак памяць аб тым дні і ўсіх абставінах злачынства да яго не вярнулася нават пасьля колькіх тыдняў, калі лекаваўся і паступова набіраў здароўя. А тым часам супраць яго ўзьнялася крутня: Бурыла і Нара запатрабавалі кары для нававыкрытага хрысьціяніна.

Альгерд жа, як палічылі жрацы, зноў даў круцяля: загадаў, каб сьледства – хто і дзе хрысьціў хлопца, правялі толькі пасьля таго, як Круглец цьвёрда ўстане на ногі. Пакуль жа няхай ляжыць у сваёй лажніцы, а дом будуць вартаваць стражнікі самога князя – каб нікуды ня ўцёк. Загад той мог азначаць і тое, што вялікі князь аберагае Кругляца ад новага замаху і сам хоча яго дапытаць. А раптам памяць вернецца да хлопца? Але княжы загад жрацы пакуль ня сталі аспрэчваць. Мусіў яму падпарадкавацца і Бурыла, бо вялікі князь нібыта сам ішоў насустрач пажаданьням жрацоў. Толькі вось час мяняў абставіны, сам расстаўляючы па шахматнай дошцы ўсіх дзейсных асоб адпаведна яму аднаму вядомай задуме, і яны застывалі ў ім, часе, як казюркі ў бурштыне. Той бурштын праз стагоддзі дастануць нашчадкі і будуць углядацца ў Мінулае, каб нешта зразумець у Будучым...

## *ПАХАВАНЬНЕ МАРЫІ*

Трашчалі, аплываючы, дарагія васковыя сьвечы. Роўна, не спыняючыся, гучаў у храме Параскевы Пятніцы голас сьвятара Нестара. Вялікаму князю здавалася, што ў яго садралі скуру, і таму кожны гук, кожнае трапятаньне сьвечкі было балючым і адчувальным.

Жоўтае, страшнае сваёй нерухомасьцю і незнаёмасьцю цела, што ляжала перад ім у дубовай калодзе, не магло быць княгіняй Марыяй. Яе ён кахаў, абдымаў і лашчыў кароткімі летнімі начамі ў віцебскім замку над Дзьвіной, да яе пругкага жывата прыціскаўся, слухаючы штуршкі свайго першынца Андрэя, яе плечы гладзіў, калі яна ўдзячна схілялася перад ім пасьля чарговага падарунка, якіх ён многа прывозіў ёй са сваіх паходаў. І заўсёды ён адчуваў нейкую асаблівую аксамітнасьць, мяккасьць і вабнасьць гэтай жаночай плоці, нават калі васільковыя вочы жонкі выцьвілі

і маршчынкі пабілі некалі бела-ружовы твар. З таго далёкага ўжо 1318 году, калі ён пабраўся з Марыяй, прайшло амаль дваццаць сем гадоў. Праляцелі яны, як цяпер здаецца, у адно імгненьне…

І ён задаваў сабе спрадвечнае і заўсёды горкае для сьмяротнага чалавека пытаньне: што засталося пасьля яе? І хто гэта ляжаў тут замест яе, над кім схіляўся знаёмы да кожнага паклону хрысьціянскі сьвятар з доўгай сівой і шырокай, як рыдлёўка, барадой?

Малодшыя сыны і дочкі прыехалі ў Вільню. Шкада, што ня будзе тут Андрэя – ён ужо чатыры гады княжыць у Пскове, пасьля таго як яны з Кейстутам баранілі пскоўцаў ад новагародцаў. Пскоў – горад Даўмонта, ягоны меч ляжыць там у храме недалёка ад ягонага цела, і Андрэй кляўся пскоўцам у вернасьці якраз на Даўмонтавай лесьвіцы. Хто мог бы думаць, што стане той родзіч караля Міндоўга сьвятым Цімафеем?

Нялёгкім было жыцьцё Даўмонта, воўкам па глыбокіх сумётах скакаў ён з родавых земляў, забіўшы Міндоўга і тым змыўшы ганьбу, калі той гвалтам забраў ягоную жонку. Колькі ваяваў за пскавічоў, колькі праліў варожай і сваёй крыві! А мог бы тую сілу і імпэт пакласьці за княства Наваградскае, з якога, як з бутона, вырасла Вялікае княства Літоўскае, што набірае моц, як крэпкі, ужо пасталелы дуб, з кожным годам усё шырэй раскідаючы свае галіны... Лепей бы не забіваў, а дараваў ёй грэх і ўрэшце пахаваў Даўмонт сваю жонку, як пахавае заўтра ён, Альгерд, сваю Марыю ці тое, што ляжыць у гэтай дубовай калодзе. Жрацы патрабавалі спаліць яе, як зазвычай тут, у Вільні, ды не пайшоў на тое Альгерд, бо адразу ж узбунтуецца Віцьбеск, а за ім і Полцеск. Але нязгоду са жрацамі давялося аплочваць, падпісваць указы, дзе тым ці іншым сьвяцілішчам рабіліся саступкі. Праўда, усё яшчэ ня вырашанай была справа Кумца і Няжылы. Супраць пакараньня Кумца паўстаў Лойка і вярхоўны храм Ашвінаў. Няжылу абараняў ваявода Гаштольд. Мудрыя старцы не маглі сабрацца – двое з іх па старасьці зьляглі і ледзь ліпелі. Таму, нягледзячы на згоду Альгерда і высілкі Бурылы і Нары, справа пакуль ня рухалася.

Вялікі князь шкадаваў, што Кумец занатурыўся і сам, як муха, палез у сьмяротнае павуціньне багіні сьмерці Марэны, замест таго каб галасна пакаяцца ды пасьля патаемна насіць свой крыж. Альгерд сам зрабіў бы менавіта так. Усё жыцьцё ён, як і ягоны бацька, мусіў выбірацца з найцяжэйшых сітуацый і ўзважваць ня сэрцам, а розумам. А хіба і Міндоўг не хістаўся ўсё жыцьцё паміж язычніцтвам і праваслаўем, паміж каталіцтвам і наваградскімі баярамі? Калі ты гуляеш у хованкі са сьмерцю і няславаем, палюючы на ўдачу і ўладу, мусіш чуйна сачыць за кожным павевам ветру, за шэптам каласкоў на полі і за здрадніцкім бляскам нібыта прыхільных да цябе вачэй.

А пасьля ён зноў вяртаўся думкамі да тых дзён, якія правёў разам са сваёй княгіняй. І вынікала – мала было тых дзён, агурных* і бесклапотных. Усё захілялі доўгія, моташныя гадзіны ў сядле, пад сьнежнай завеяй ці сякучым ліўнем, налогі* на ворагаў ды змаганьні, а паміж імі – цянёты для непрыяцеляў і намаганьні, каб не зацягнулі ў цянёты цябе самога. Колькі памятае сябе: то пры бацьку адбіваліся ад Полюша, за якім стаяў сам вялікі магістр Карл Трырскі, то зусім нядаўна – ад сьмяротных інтрыг хана Узьбека ды крыжакоў, ад сварак Цьверы і Масквы. А ён, гаспадар Вільні, – у цэнтры тых сварак. Старэйшая сястра Марыя была за цьвярскім князем Міхаілам, па-здрайску забітым у Залатой Ардзе з-за даносаў маскоўскага князя Юрыя.

Пасьля ягоны наступнік Іван Каліта заліў Цьвер крывёй і за тое атрымаў ярлык на вялікае княжаньне ад татар. Сястра Аўгуста за Сімяонам Гордым, старэйшым сынам гэтага прагнага і подлага Каліты, з-за якога восем гадоў таму паклаў у той жа залатой Ардзе сваю галаву Аляксандр Міхайлавіч з сынам Хведарам. І зараз Каліта цягне сквапныя лапы свае да Цьвярскога княства, ды Цьвер пакуль не здаецца маскоўскай ганарлівай і па-азіяцку вераломнай уладзе. Шукае падтрымкі ўсюды, а найперш тут, у Вільні, у крывічоў, аднапляменьнікаў. Гатовая прапанаваць яму, вялікаму князю, нявесту, – ужо з таго часу, як занядужыла Марыя, сачыліся ў гаворках паслоў намёкі на прыгажуню Юльяну, дачку Аляксандра Міхайлавіча. Узяўшы яе, ён умацаваў бы сувязі з Цьвярскім Княствам, і, магчыма, яны разам адолелі б Маскву, а землі разам з іншымі маглі б некалі стаць часткаю Вялікага Княства…

Задушлівы водар жоўтых сьвечак туманіў галаву. Сьцены маленькай цэркаўкі, з яе шэрымі сьценамі і багатым, у чырвона-залатых і сініх фарбах іканастасе, плылі, нібы стаяў ён, Альгерд, пасярэдзіне ладдзі, а грабцы штосілы граблі ў шэрым марыве зьвечарэлай ракі.

– Ня сьпі, вялікі князь, – перапыніўшы чытаньне, строга сказаў Нестар. Ліловая раса яго, абшытая залатой кручанай тасьмой, блішчэла, пералівалася ў жоўтым трапяткім сьвятле. І сьвяточнасьць адзеньня як разанула Альгерда, прымусіўшы яго яшчэ раз напоўніцу, да сьмяротнага холаду ў чэраве адчуць урачыстасьць і непаўторнасьць сьмерці. У кутах ціха зашалясьцелі гаворкай памочнікі Нестара і замкавыя слугі, што суправаджалі вялікага князя, – ім давялося колькі гадзін стаяць, гледзячы, як нерухома, сагнуўшы магутную сьпіну, колькі часу сядзіць немалады ўжо валадар ля цела жонкі. Ён сам зажадаў таго, а яны павінны былі з апошніх сіл трымацца, каб не зваліцца з ног і ня ўпасьці прама тут жа на каменную падлогу, засланую ля нябожчыцы карычневым тканым каберцам*, а каля ног князя доўгай пушыстай дарожкай усходняга ткацтва.

– Я не засну – азваўся Альгерд. – Ведаю, што малітвы нашы дапамогуць ёй падняцца да сьветлага Ірыю.

– Да царства Божага, колькі я ўжо казаў табе гэта, княжа! – гэтак жа строга запярэчыў Нестар, і доўгая ягоная барада нібы таксама выцягнулася, сівыя неахайныя пасмы раптам падаліся застыглымі клінкамі, а выцьвілыя старэчыя вочы бліснулі.

– Табе відней, Уладыка – прымірэнча азваўся Альгерд. – Няхай ідзе у царства Божае. Можа, і я спадоблюся некалі. Тады – сустрэнуся з ёю...

Ён ня гневаўся на япіскапа. Таму зараз нялёгка. Памерла яго заступніца, яго верная авечка, якая ўтрымлівала хрысьціянства пры двары нягледзячы ні на што. Яе накладам*, яе клопатамі пабудаваны гэты храм, іканастас, упрыгожаны лепшымі майстрамі Вільні. А цяпер... Нябось, мяркуе сьвятар, прыкідвае – куды хісьнецца вялікі князь?

Сапраўды, Нестар думаў пра гэта і тады, калі ўпершыню занядужала Марыя Яраслаўна, думаў і цяпер, пры ейным целе. Рэчаіснасьць прымушала яго да вялікага роздуму аб тым, што станецца з ім і ягонай справай цяпер. Нават у час хваробы вялікай княгіні не ўдалося Нестару вызваліць з цямніцы братоў Кумца і Няжылу, а пасьля ейнай сьмерці наўрад ці стане яго трымаць пры двары і тым болей слухацца князь, якому патрэбная падтрымка насельнікаў Вільні, сярод якіх пераважная большасьць язычнікаў.

Нестар пачуваў сябе адзінокім. Тым даражэйшым рабіўся для яго малодшы з братоў, якія пакутавалі зараз у цямніцы. Антон, як цяпер называўся хрышчаны ім Кумец, сустракаў сьвятара, які штодзень наведваў яго, са спакойнай, нават радаснай прыязнасьцю, і з ім гаварыў Нестар так, як некалі, яшчэ ў полацкім Сьвята-Духавым манастыры, вёў бяседы са сваімі аднадумцамі – з гарачай верай у сваю місію, з надзеяй на ўваскрашэньне грахоўнай чалавечай душы і на тое, што менавіта яму, Нестару, і ягоным суразмоўцам удасца ўратаваць чалавецтва, якое, нібыта і не за іх быў расьпяты Хрыстос, упарта не хацела ратавацца. Гэтая юная душа слухала яго, яна трапятліва пыталася аб тым, аб чым ён, за штодзённымі клопатамі пры княскім двары, часам забываўся думаць: навошта прыйшоў у гэты сьвет чалавек? Ці нараджаўся ён калісьці, ці толькі аднойчы прыходзіць на зямлю? Ці маюць зоры над галавой якуюнебудзь уладу над лёсам чалавека? Чаму арыяне паўставалі супраць ікон і ці сапраўды на драўляных дошках Дух можа пакінуць свой вогненны сьлед?

Мігатлівыя сьвечкі разганялі па цёмных змрочных кутах царквы прывіды духаў, якія зараз змагаюцца за душу нябожчыцы там, у паднябесных высях. Мясцовы люд верыць, што душа пасьля сьмерці пакутліва паўзе на шкляную гару Меру, дзе яе чакае нябесны суд. Вось чаму кладуць у дубовую калоду зьвярыныя кіпцюры і ўсё зямное начыньне. Вераць, што душы трэба харчавацца, каб не стамілася яна паўзьці наверх, трэба прычэсвацца ды прыгожа выглядаць, каб ня надта строга судзілі яе паганскія багі. Нестар жа цьвёрда спадзяваўся на таго адзінага Бога, што там, наверсе, адразу ўбачыць усе грахі нябожчыка.

Альгерд і Нестар – яны абое думалі і пра нябожчыцу, і пра Вечнасьць. Міжволі прыходзілі ім у галовы думкі і пра тое, якую ролю ва ўсім гэтым адыграў крадзеж. Але калі Нестар ведаў толькі тое, што ляжала навідавоку, Альгерд цяпер ужо не сумняваўся, што зьнікненьне, а пасьля раптоўнае зьяўленьне смарагдаў было кімсьці прадумана. Для чаго? Ці не для таго, каб зьмяніць сітуацыю? А яе зьмяніць унутры Княства магла найперш сьмерць Марыі.

Яго жонка, магчыма, пераадолела б хваробу, пражыла б яшчэ, колькі ёй адвялі багі. Але хутчэй за ўсё падштурхнула яе да Ірыю гісторыя з любімымі каралямі. Украдзеныя, яны раптоўна знайшліся. І дзе? Пад сьвятліцаю вялікай княгіні, на кручку, куды вешала яна, не давяраючы таго нікому, клетку з любімай сінічкай, калі хацела паслухаць птушыныя сьпевы. Марыя цяжка нахілілася – і ад нечаканасьці клетка вывалася з ейных рук... Смарагды пераліваліся ў скупых праменьнях ранішняга сонца, як быццам былі тут заўсёды, нават паціху гайдаліся.

Паднялася вялікая калатня. Дапытвалі пакаёвых дзевак, варту на калідоры. Ніхто нічога ня бачыў, і, нягледзячы на катаваньні, дамагчыся хоць нейкага тлумачэньня ад абслугі не ўдалося.

Нестара папрасілі, каб ён апырскаў знойдзенае сьвятой вадой. Ён папярэдзіў вялікую княгіню, што каралі трэба яшчэ “адмольваць” – на іх можа быць чужая і варожая сіла. Але Марыя назвала яго словы забабонамі і надзела на шыю ўлюбёныя ўпрыгожаньні. І што ж? Праз два тыдні яна памерла ў вялікай гарачцы, не ачуняўшы нават для апошняга прычасьця.

Альгерд ня ведаў, з кім можна яму даверліва параіцца аб усім. Лойка

ўсё яшчэ да канца не ачуняў. У яго хваробе таксама было шмат загадкавага. З кім перасякліся ягоныя шляхі ў загадкавым сьвеце, дзе ўсё адкрыта і ясна, дзе пабачыў ён злодзеяў і прывёў мечніка да іх? І калі ён страціў прытомнасьць – навошта і каму трэба было яшчэ і труціць вярхоўнага жраца? Ці не таму, што ён указаў на дом, дзе каралі сапраўды былі? І што стаіць за таямнічым замахам на Кругляца? Можа, у Вільні пачалося тое, чаго ён заўсёды баяўся – паляваньне на хрысьціян?

Наступае час, калі і яму, Альгерду, трэба выбіраць: Нестар альбо Бурыла, мудрыя старцы альбо хрысьціяне Цьверы і Ноўгараду, а найперш, вядома ж, Рыму. Вялікае княства – гэта разлом, мяжа між Захадам і Усходам, апошняя краіна, дзе пакуль што існуе двоеўладдзе. І калі ён адрыне хрысьціянства, то нібы замкне сваю краіну на моцны замок. Толькі вось – да якога часу?

– Але не язычніцтва, а хрысьціянства дапамагае ў зьнешняй палітыцы! – думаў Альгерд. – І найперш ва ўсходняй. І Цьвер, і гэтая самаўпэўненая Масква, што так неспадзявана набірае і набірае моцы, – яны ўспрымаюць Вільню ці як надзейнага саюзьніка, ці як сілу, з якою трэба лічыцца. І Папа, хаця хрысьціянства ўсходняга абраду яму не да спадобы, усе ж ня можа абыходзіцца з намі як з язычнікамі, чаго дамагаюцца крыжакі… Новую жонку будуць успрымаць як знак – куды, якім шляхам будзе далей ісьці Княства…

…І тады, схамянуўшыся, ён канчаткова зразумеў, што кавалак жыцьця, зьвязаны з Марыяй Віцебскай, назаўсёды ўжо адрэзаны, а ўсё астатняе, што яшчэ чакае – пахаваньне, жалоба, спачуваньні – гэта ўсё ззаду, ззаду. А яму, не спыняючыся, трэба ісьці наперад.

І усё ж ён дазнаецца, дзе былі смарагды і хто хаваецца за ўсім, што здарылася. За войтам здаўна стаяў кашталян Нарбут, і ня дзіўна, што абодва цьвердзілі адно, а менавіта: у хаце Дзівейны абшукалі ўсе куткі, ды не знайшлі ніякіх сьлядоў караляў, а значыць, на яе ўзьвялі паклёп. Але вялікі князь верыў Лойку, верыў яго вешчаму дару, нягледзячы на хваробу, што навалілася на яго потым. Агулам жа за ўсё, што здарылася, асабліва ж за сваё шчырае сэрца заплаціў мечнік Сьвідрыгайла, – але ён таксама быў толькі адчэпным для жрацоў.

І Альгерд рашыў аддаць дазнаньне ў рукі ваяводы Гаштольда. Няўжо не разьбярэцца ва ўсім гэты надзвычай разумны і дасьведчаны чалавек, шчыра адданы дому Гедзіміна?

### *ВАЯВОДА ВЫБІРАе*

Ваявода Пётра Гаштольд хадзіў па залі, дзе звычайна зьбіраліся паседжаньні паноў-рады. Магутны, як мядзьведзь, ён рухаўся лёгка, нягледзячы на гады і раны, якіх яму шмат надарылі ў паходах і бітвах. Кожную ён адчуваў і памятаў, праз некаторыя ледзь не разьвітаўся быў з жыцьцём, ды пакуль багі трымалі яго тут, не даючы спакою, падкідаючы адна за адной цяжкія жыцьцёвыя падзеі.

І цяпер яму трэба было рашаць яшчэ адну, надта ж няпростую задачу – на чый бок стаць у вялікай замятні, якая магла вось-вось успыхнуць у Вільні. Ваявода ведаў амаль усю праўду: возны Сухта, што дасьледаваў справу, выбіў з каханкі Лелюша Гайны многія таямніцы. Яму пашанцавала: Лелюш займеў яшчэ адну каханку, вядомую віленскую вісьлену

Асаку, і раўнівая Гайна ў запале выклала перад возным ягоныя правіны і ўдзел у інтрызе.

Але як даказаць усё гэта? Як паглядзіць на праўдзівы аповед вялікі князь? Ці не загадае сьцяць горлам самога ваяводу, які разблытвае непажаданыя для ўсіх таямніцы? І што будзе далей?

Тое, што каралі Марыі нейкі час былі схаваныя ў сястры вялікай жрыцы Нары, было праўдападобным. Але сьведкаў таму не было – адно прызнаньне Лойкі, зробленае ў гарачцы, нават напоўтрызьненьні. Вешчыя старцы высьмеюць гэткі доказ... І хто дакажа, што смарагды падкінутыя назад? Што не сама забыўлівая Марыя павесіла іх на кручку пад акном, каб сядзець і любавацца пералівамі сьвятла? І хто возьмецца пераконваць, што замах на Кругляца і спроба ўтапіць яго ў Вяльлі неяк зьвязаныя з усім гэтым? Але хто ж зробіць такое без жрацоў? Ды іх чапаць страшна, хаця дапусьціць прычыну таго, што адбылося, можна: яны мелі ў княстве немалую сілу і хацелі яе павялічыць праз новы шлюб Альгерда. Калі ж вялікі князь зробіць па-свойму, выбярэ сабе іншую – яны могуць узьняць супраць яго стольны горад і паспрабаваць вярнуць слабавольнага Яўнута, які нават у думках ня мог дапусьціць таго, каб не паслухацца Бурылу альбо вешчых старцаў. Але ваявода добра разумеў і іншае: князь Альгерд з кожным месяцам набіраў сілу, ён не бязвольны Яўнут, які уцякаў ад братоў і так і не сабраў войска для вяртаньня вялікага стальца. Непазьбежна некалі гаспадар краіны сутыкнецца са жрацамі, і для таго атрымае падтрымку ў хрысьціянскіх краінах, якіх большасьць.

Жрацы баяцца і ненавідзяць і яго, Гаштольда. Нягледзячы на тое, што хрысьціянства заходняга абраду, якое ён нядаўна патаемна прыняў, мела пакуль што староньнікаў толькі сярод іншаземных купцоў ды паслоў, усё ж было і яно выклікам старым вераваньням. Гаштольд адкрыта не хадзіў у касьцёл Дзевы Марыі, ён прыходзіў туды на споведзі ды бяседы позна ўвечары, але жрацы маглі ведаць пра тое і чакаць хвіліны, калі можна ўдарыць і яго. Таму Гаштольду даводзілася хадзіць на ўсе язычніцкія сьвяты і быць асьцярожным удвая, спадзеючыся на тое, што Альгерд некалі пераможа ў сьмяротным паядынку са жрацамі...

Дапамагчы гэтаму дужа ж разумнаму і рашучаму сыну Гедзіміна значыла ня толькі ўтрымацца пры ўладзе сёньня, але і забясьпечыць сваім дзецям добрыя месцы пры княжым двары заўтра. Дапамога жрацам магла даць тое ж самае, але яны запатрабуюць яго ўсяго, яны не абмяжуюцца толькі ім, але возьмуцца і за сыноў. Яшчэ для ягонага пакаленьня жрацы – сіла, але час іх праходзіў, і сынам, калі будуць кідаць яйкі толькі ў адзін кошык, у будучым давядзецца нясоладка....

Павагаўшыся, ён прыняў рашэньне і паслаў ганца да вознага з загадам прыбыць у замак. Няхай Сухта паўторыць усё, аб чым даведаўся, самому Альгерду...

Возны Сухта доўга стаяў на каленях перад Перуном і Мокашшу. Гэтым багам у хатняй малельні прыносілі найболей ахвяр, і толькі яны маглі даць параду: што гаварыць вялікаму князю? Лёс мечніка яскрава засьведчыў, што адбываецца з тымі, хто ідзе супраць жрацоў. Таму кашталян замку Нарбут, якому першаму належала дакладаць аб выніках расьсьледаваньня, ня ведаў многага з таго, што возны расказваў ваяводзе Гаштольду. Гаштольд быў апекуном Сухты, дзякуючы яму малады яшчэ служка заняў гэтую важную пасаду. Але ці зможа ваявода захаваць

галаву вознага? І ці не перастрэнуць яго, Сухту, у шумлівым натоўпе падчас набажэнстваў людзі з воўчай мордай на галовах, якія на сьвяты нясуць выявы багоў па вуліцах Вільні і, як добра ведаў ён сам, умеюць атручанай рыбінай косткай непрыкметна кальнуць у руку ці лытку неслухмяных і непакорлівых? І ня капне хто са служак атруты ў кубак, што пададуць яму ў сваёй жа хаце?

Але… такі яго лёс. Ён мусіць казаць тое, што патрабуе ад яго ваявода. І няхай праз гэта пазбавіцца ён міласьці непасрэднага свайго дабрадзея і кіроўцы Нарбута – можа, як-небудзь здолее выкруціцца і перад ім…

Праз нейкі час у той жа залі возны Сухта дакладаў вялікаму князю вынікі сваіх высілкаў.

– Мечнік казаў праўду, вялікі князь. Два тыдні каралі былі ў Дзівейны, і там штодзень праводзіліся вялікія маленьні. Яна клалася спаць, надзеўшы іх на шыю, і адпраўлялася туды, дзе блукаюць нашыя душы ў час сну.

– Значыць, каралі былі заклятыя на сьмерць княгіні? І на тое, каб я выбраў потым Дзівейну? – задумліва сказаў Альгерд. – Якая яна, гэтая дзяўчына? Чаму – яна? Адкуль узялася? Хто за ёю стаіць, апроч уплывовай і магутнай сястры?

Але Сухта добра падрыхтаваўся. Нездарма ў кожным храме былі ў яго свае людзі, якія бачылі і чулі надзейна схаванае ад чужых вачэй і расказвалі пра гэта толькі яму самому. Праз нейкі час вялікаму князю стала вядома многае з тых таямніц, каторы раз ён падзівіўся спрыту жрацоў, якія пры жывой яшчэ ягонай жонцы разьлічвалі наперад на колькі хадоў. І гарачая хваля гневу ўдарыла яму ў сэрца: яны палічылі, што ён, Альгерд, нібы недальнабачны, неразумны сьмерд, кінецца на сьвежае дзявочае цела, як маладзенькі бычок, апоены сонцам і ветрам, кідаецца на лузе да крэпенькай цялушкі!

– Нікому пра тое ні слова! – загадаў ён. – Хай усё ідзе так, як ідзе. А ты за вялікі спрыт і за тое, што не пабаяўся жрацоў, атрымаеш узнагароду. І табе, ваявода, не забуду адданай службы…

Сухту карцела нагадаць пра мечніка, які паклаў сваю галаву за тое ж, за што ўзнагароджваюць сёньня яго, але спахапіўся. Добра памятае пра пакараньне вялікі князь, і, можа, сёньня пашкадаваў ён мечніка.

Ды ў кожнага ёсьць свой лёс і свой час.

## *У ЧАКАНЬНІ*

…У той дзень княжацкі скарбнік надта дзівіўся: загадаў вялікі князь прынесьці наверх у асабістыя пакоі дзьве грэцкія чашы, запісаныя ў рэестры як “кратэры”, адну – з бронзы, другую – з серабра з чорнай чаканкай, а каму аддаў іх – невядома. Было ў той дзень у яго шмат народу, ды толькі пасланец ад князя Сьвят маўчаў, як вады ў рот набраўшы, а чашы былі запісаныя як “падарункі за асабліва важныя паслугі князю”, а за якія – ведаў толькі Гаспадар ды ягоны служка. Ды яшчэ тыя, хто тыя падарункі атрымлівалі. Калі расказваў тое скарбнік Гайне, якая прагна слухала ўсё, што магло спатрэбіцца яе гаспадарам, то выказаў меркаваньне, што пайшлі тыя каштоўныя чашы вярхоўнаму жрацу Лойку, з якім гаспадар доўга гаварыў у той дзень і якому, як выказаўся прыслужнік, што насіў у пакоі пачастунак, шмат дзякаваў. Вядома, чашы

пайшлі Лойку! Ну не Сухце ж і не ваяводзе, што таксама доўга сядзелі ў троннай залі і, мабыць, раіліся пра злодзеяў, якіх нядаўна выкрылі ў сталіцы, было даваць такія падарункі, што прысталі толькі асабліва важным асобам! А гэтыя – і ваявода, і возны – былі проста слугамі, якія шчасьлівыя ўжо добрым словам, якое ім падарыць гаспадар княства! З тым пагадзілася і Гайна, а пасьля і Нара, якая слухала ўсе навіны, што сарокай на хвасьце прынесла каханка Лелюша. Ацэньвала навіны вялікая жрыца, лежачы аголенай на чорных і бурых мядзьвежых скурах. Пакуль яна зьнешне ляніва, ды насамрэч вельмі чуйна ацэньвала сказанае, дзьве ўмелыя жрыцы спрытнымі, лоўкімі рухамі ўбівалі ў яе пругкае і цьвёрдае, як жалеза, цела пахкія алеі з Эгіпту. Нара глядзела на слугоўніцу, якая пасьля хуткага пахаваньня Марыі мусіла пакінуць сваю службу, і, хітаючы галавой, раздумвала, ці варта пакідаць яе жывою? Занадта важныя рэчы ведае яна, а жаночы язык легкаважкі, любіць ён матляцца памялом…Але, разважыла яна потым, Гайна зьвязаная гэтымі таямніцамі, яна правераная на іх, і такіх людзей трэба заахвочваць і трымаць каля сябе. Да таго ж, яе яшчэ могуць і вярнуць у замак, а тады яна захавае сваё значэньне… І вялікая жрыца літасьціва падарыла дзяўчыне шкляны з залатымі знакамі слоічак, з якога асьцярожна выбірала яе слугоўніца пахкую жаўтаватую мазь і дзе ладна яшчэ яе аставалася. Гайна выбралася з ейнага жытла ашчасьліўленаю, беражліва прыціскаючы да сябе падарунак. Дасьць Пярун, ніхто не дазнаецца пра тое, што гэта яе доўгі язык распавёў вознаму важныя таямніцы!

Праз кароткі час пасьля паховінаў Марыі княжацкі скарбнік выдаў ёй дзесяць шэлегаў – тое, што зарабіла яна за сваю службу ў нябожчыцы княгіні. Аднак у замку яна не засталася, хаця надта імкнулася зачапіцца за яго хаця адным кіпцюрком.

Яе ўзяла да сябе Дзівейна, якая жыла ў Вільні асобна ад сястры і дзе новая служка стала вучыцца майстэрству рабіць вабнаю любую жанчыну, нават калі багі ўзнагародзілі яе брыдкаю абалонкай.

Выкладалі тыя сакрэты вышэйшыя жрыцы храма Лады, і вядомыя яны былі ў храме з самых пракаветных часоў. Нездарма жанчыны ўсёй Вільні, асабліва ж найбольш заможныя, не шкадавалі для храма падарункаў, калі выходзілі адтуль пахарашэлымі, з бляскам у вачах і патаемнымі парадамі для радасьці сужонка ці каханка, а часам і пасылалі сваіх мужчын да багіні каханьня дзеля таго, каб і яны дазналіся пра сакрэты цела і спаталеньне пажадлівасьці.

Дзівейна такімі ведамі не валодала: у храме Ашвінаў галоўным было высьпяваньне душы, а цела лічылі толькі ейным храмам.

Таму жрацы імкнуліся, каб дзяўчына як хутчэй стала жывым увасабленьнем самой багіні і зацьміла ўсіх жанчын Вільні, нават сваю славутую сястру. Мэта апраўдвала ўсе высілкі: Дзівейна мусіла стаць выратаваньнем для ўсяго язычніцтва ў краі! Таму сам Бурыла прыязджаў у дом Дзівейны, каб вучылася яна разуменьню, што ёсьць вялікая палітыка, і зьвяртаўся да яе з пачцівасьцю, якая кружыла дзяўчыне галаву.

Месяцы ляцелі хуткамгненна, і неўзабаве дзяўчына павінна была зьявіцца ня толькі перад маладымі прыдворнымі, якія атабарыліся ў храме і ў доме ейнай сястры, часта прыходзячы ў дом Дзівейны, але і перад усёй Вільняй.

Альгерд, слухаючы бясконцыя размовы прыдворных пра гэтую над-

звычайную прыгажуню, пра яе голас, думаў, што жрацы прымеркавалі ўсё як мае быць: такой дзяўчынай мог бы сапраўды зацікавіцца і сам гаспадар Княства. Мог бы, каб ня тая размова ў троннай залі, перад самым пахаваньнем жонкі, і ня досьвед, з якім ён ужо добра бачыў усю тонкую гульню вярхоўных жрацоў, што рыхтавалі яго да Вялікай Сустрэчы.

Калі ж яны выплюхнуць на яго сваю красуню? Мабыць, на завіваньні вянкоў, калі Маці Сырая Зямля абуджаецца ад зімовага сну і маладая бурлівая сіла бяжыць па жылах нават сівых старцаў? А ён жа ня быў старцам, а быў мужчынам у поўным росквіце сілаў, і нездарма вакол яго двара ўжо, нягледзячы на тое, што па звычаях хрысьціян трэба было трымаць гадавую жалобу па княгіні, пачыналі віраваць залёты замежных паслоў…

Ён ужо нават чакаў Дзівейну. Хацеў памерыцца сілаю са жрацамі, абдурыць іх, пераўзысьці розумам і хітрасьцю. Адчуваў: яму патрэбна гэтае процістаяньне, яму патрэбная перамога. І ніхто ня мог яму дапамагчы ў тым процістаяньні. Нават Лойка. Нават Лойку ня мог ён давяраць болей. І ён з горыччу думаў, што “яны” (так называў у думках жрэчаства Вільні) адабралі ў яго адзінага мудраца, у якога вучыўся таму, што ўсё яшчэ заставалася сілаю язычніцтва – тонкаму адчуваньню прыроды і яе таямнічай магутнасьці, уменьню слухаць навакольны сьвет і ісьці па шляху лёсу. У Лёс ён верыў неадменна: Судзяніцы, што прадуць прадзіва жыцьця, адразаюць яго кавалкі кожнаму і пасьля запісваюць у Кнігу Жыцьця, што каму дасталася – яны часта прыходзілі ў ягоныя дзіцячыя сны. Якраз жрацы Судзяніц прадказалі, што менавіта ён з усіх сыноў Гедзіміна стане вялікім князем – і гэтае прароцтва павяло яго разам з братам Кейстутам на Вільню, прымусіла пасягнуць на запавет бацькі і перайначыць яго – не, ня дзеля сябе толькі, і нават зусім ня дзеля сябе, а дзеля Княства, чыім абаронцам абраў яго Лёс…

Аднак ён ня толькі не паверыў, нават пра сябе пасьмяяўся з прароцтва, што зрабілі яму ў храме Перуна: што ягоная абраньніца выратуе старых багоў і ўзвысіць край сярод усіх іншых менавіта старою верай. “Ты, вялікі сын Гедзіміна, прызваны умацаваць Княства праз старую веру”, – казаў яму малады жрэц, які торгаўся і матляў галавой, нібы нехта гаварыў ягоным голасам і валодаў ягоным целам. Альгерд падзякаваў і аддаў храму належныя ахвяры, але ён выразна бачыў, што гэтыя прароцтвы – не сапраўдныя, што жрацы ілгуць, бо гэта адпавядае іхнім задумам. Яму было горка, што некалі любімы ім храм робіцца чужым і варожым, але, відаць, трэба было прайсьці праз вялікі Агонь і Ваду, каб дазнацца, дзе праўда, а дзе хлусня...

За некалькі тыдняў, што прайшлі пасьля сьмерці жонкі, сьвет вакол яго як згусьціўся. Дыхаць яму рабілася ўсё цяжэй.

Быў Гаспадаром Княства – але ня меў улады над сьмерцю, над мораком, над вышэйшымі сіламі, якія кіравалі і ім, і ўсімі людзьмі. Не ўтрымаў на гэтым сьвеце Марыю. Ня быў гаспадаром над Рэчыцай, якая страціла розум і ў сваёй багатай хаце, пры служках, білася ў сутаргах, калі бачыла нешта круглае, падобнае да караляў, і праводзіла свае дні ў іншым сьвеце, больш літасьцівым да яе. І над Баравіком і Зайкай, якія чарнелі і сохлі ўсе болей, naзіраючы за любай дачкой. І над мечнікам, які быў цяпер у Ірыі і час ад часу ў сьне прыходзіў да яго і глядзеў ясным нявінным позіркам. І над многімі іншымі людзьмі, якія трапілі пад калясьніцу вялікай палі-

тыкі і вялікай улады, – калясьніцу, лейцы ад якой ён, сьмяротны чалавек, трымаў з усяе свае моцы…

Аднак на Завіваньні вянкоў Дзівейна не зьявілася, і ён парадаваўся таму. Ды жрацы не адступіліся – прыдатная для ўдалых зьдзяйсьненьняў часіна была іншаю, чым меркаваў вялікі князь...

## *ШЛЯХІ СПАСЬЦІЖЭНЬНЯ*

Дні рабіліся кароткімі, як быццам укарочвалася жыцьцё. Ды так яно, відаць, і было: Кумец жыў у цемры і адзіноце, і толькі Нестар час ад часу прыходзіў да яго. Тады гадзіны рабіліся такімі, як спаконвеку, яны ўкладваліся ў звыклае вымярэньне часу, якім жыў усе свае кароткія гады малады прыдворны і якім прывык давяраць. Але цяпер ён давяраў і новаму адчуваньню, калі жыцьцё пераходзіла ў трызьненьні, і карціны, што прыходзілі да яго, былі больш яркімі і рэальнымі, чым усё, што зьведваў дагэтуль. Расказваў пра іх Нестару, і той, згорблены і яшчэ больш пастарэлы, тлумачыў хлопцу, што ён прарываецца ў іншы сьвет – той, адкуль прыходзіць чалавек для нараджэньня.

– Гэта Ірый? – пытаўся Кумец. – І сьпевы, і сьвятло, і адчуваньне шчасьця, і нікчэмнасьць ранейшых пакут – усё адтуль?

– Так называеце вы Рай, хай так і будзе, – Нестар ківаў. Расказваў пра сьвятых, што спасьцігалі вышэйшы сьвет праз катаваньні і пакуты.

– Чаму праз пакуты? – не разумеў Кумец. – Няўжо чалавек ня можа прыйсьці да сьвятла праз роздум? Праз душу?

– Грахі… – казаў Нестар. – Чалавеку было падараванае ўсё, але ён захацеў большага. Ён дзёрзка і самачынна замахнуўся на тое, чаго ня мог па тым часе спасьцігнуць, а гэта было небясьпечна для Быцьця. Усявышні даў бы яму ўрэшце ўсё веданьне і ўсю задуму Сусьвету – але для гэтага трэба было пачакаць і зразумець хаця б тое, што дадзена… Сьвет праз грэх пайшоў у іншым накірунку, але як было вярнуцца на раздарожжа, з якога ўсё пачалося? Таму Бог паслаў Хрыста, якому трэба было пераплавіць сваёй крывёй і ахвярнасьцю ўсю чарнату сьвету і тым адчыніць вароты пекла, адкуль не было выйсьця грэшным чалавечым душам.

Кумец і сам адчуваў, што сьвет кіруецца зусім іншымі памкненьнямі, чым, мабыць, было загадана багамі. Гэта падказваў нават ягоны пакуль яшчэ невялікі жыццёвы досьвед.

Мячом можна было прыдбаць у сотні, а мо і тысячы разоў болей багацьця, чым сабраць яго працай – на ральлі, у лесе, у пчэльні.

Выгадны шлюб цаніўся ў людзей куды болей, чым самае моцнае, палкае каханьне. А яны ж ведалі, што толькі шчырае каханьне дае моцных здаровых дзяцей. Нашто ж чалавек, беручы нялюбую жонку, з якою кожны дзень трэба было дзяліць ложак, сам падрываў карэньні ўласнага роду, сваіх будучых нашчадкаў?

Дабіваючыся ласкі Гаспадара, многія трацілі сумленьне і гатовыя былі на любую подласьць, – ён сам паспытаў тое на сабе. Раз за разам узгадваючы зялёныя вочы Бурылы і ілжывыя вусны Нары, курчыўся, як ад болю – зразумеў, што яны згаварыліся загубіць яго і брата дзеля нейкіх сваіх, адным ім вядомых мэтаў. Аднак жа не праклінаў іх, бо адчуў, што цямніца

зрабіла яго іншым. Вера ў тое, што сьвет трэба мяняць, іначай ён загіне, мацнела ў ім нягледзячы на здзекі і пакуты – а можа, якраз дзякуючы ім.

Ранейшыя жаданьні, якія некалі віравалі ў душы і сэрцы, па якія гатовы быў кідацца вопрамецьцю, цяпер страцілі сваю вартасьць, здаваліся нікчэмнымі. Нават ласка князя, які аддаў яго на катаваньні, таму што яму самому трэба было абараняцца, бачылася яму цяпер вартай аднаго жалю... Кумец, чыё хрысьціянскае імя было цяпер Антон, спасьціг пасьля доўгіх роздумаў – забіваць свайго былога прыдворнага, як таго патрабавалі жрацы, Альгерд не хацеў. Хаця дзеля ўлады і выратаваньня Княства яму ня раз даводзілася забіваць нявінных, ды надта моцнаю рабілася ў ім нянавісьць да людзей, што аспрэчвалі ў яго тое, дзеля чаго быў абраны ён Судзяніцамі – самую вялікую ўладу ў гэтай зямлі. Можа, таму гаспадар, як аб тым гаварылі, сапраўды адпрэчваў высілкі Бурылы аб хутчэйшым пакараньні важкім довадам: няхай яшчэ пасядзяць, бо сьмерць для хлопцаў будзе лягчэйшаю, чым замкавая вязьніца.

І так сапраўды думаў Няжыла, старэйшы з братоў.

Ён хацеў сьмерці, прасіў яе ў багоў. Нават Заяц стаў спачуваць чалавеку, які так прагнуў небыцьця, бо сьвет стаў яму нямілым. А нашто яму было жыць? Каханая Рэчыца, чый кожны рух лавіў ён з замілаваньнем і шчасьцем, абылгала яго, ейны бацька адрокся ад самага сватаўства, а князь і княгіня паверылі ў нагаворы і адвярнуліся ад яго. Брат, якога ён так любіў, быў таксама ў цямніцы – з-за яго, Няжылы. Маці іхняя ад ганьбы памерла. Сёстры ж, Бяроза і Радагоста, ні разу не адгукнуліся ні словам, ні хаця б кавалкам вепручыны, які маглі б перадаць брату і яму ў цямніцу. Ад голаду ён гатовы быў грызьці сьцены, калі б яны былі з дрэва, але камень, да якога быў прыкуты ланцугом, не паддаваўся нават яго моцным кіпцюрам, калі ў шаленстве драпаў яго пасьля таго, як ачуньваў ад катаваньняў. Вільготныя ад сырасьці лахманы церліся аб сьпіну, калі ён клаўся на падлогу, каб заснуць і забыцца на ўсё, што было вакол, і раны смылелі, сьвярбелі і адгукаліся невыносным – у тысячы голак – болем.

Нават гаворкі-спрэчкі з любым братам ня надта расьцярушылі той жывёльны стан адчаю, у якім курчылася душа Няжылы.

Браты нібы сталі па абодва бакі ад быцьця, у якім месьцілася чалавечае жыцьцё: Кумец усё болей узвышаўся душой і радаваўся кожнай праяве існаваньня. Няжыла адварочваўся нават ад промню – пасланца Ярылы, што зрэдзь зазіраў у вузкае вакенца наверсе.

Першыя дні, што браты правялі разам, былі надта цяжкімі. Замест чаканай радасьці між імі стаў адчай і нянавісьць Няжылы да ўсяго, аб чым бы ні загаворваў Кумец. Калі б Няжыла мог раздумваць, ён здагадаўся б, што для яго невыносны ня брат, а той стан, у якім той апынуўся: замест вытанчанага, у барвовым плашчы з залатымі абярогамі маладзёна з доўгімі русымі кудзерамі, заўсёды чыста паголенага, перад ім, прыкаваны да вялізнага шэрага валуна, сядзеў змучаны, худы, у пацерлым рызьзі аброслы барадой чалавек, які амаль зьліваўся з шэраньню каменю. І гэта было нясьцерпна, гэта казеліла вочы, як самае горшае пакараньне.

Як радаваўся некалі старэйшы брат, калі малы падрос і стаў лепшым у школцы! Як ганарыўся, разглядаючы братавыя васковыя дошчачкі ці кавалкі бяросты, на якіх амаль не відно было сьвярдзёлка настаўніка, што выпраўляў памылкі! А калі Кумца ўзялі ў замак і той надта

спадабаўся самому вялікаму князю Гедзіміну і ягонаму сыну Альгерду, ён ажно спаць ня мог ад радасьці! Марыў: ажэніцца з Рэчыцай, а пасьля знойдзе і для брата лепшую дзеўчыну з якога-небудзь багатага альбо і знатнага роду, – і тады можна жыць, ні аб чым болей ня думаючы.

І што цяпер? Хлусьлівы нагавор, цямніца, і няма болей дарогі назад. Хіба здарыцца нейкі цуд, дапамогуць багі. Але ён сам, сам здрадзіў ім, сам захацеў яшчэ больш падлабуніцца пад міласьць княгіні, згадзіўся хутка ахрысьціцца ў новую веру. І вось вынік: жыцьцё закончылася, яшчэ не пачаўшыся.

– Не кажы мне нічога пра Хрыста! – крыкнуў ён, як толькі Кумец зьвярнуўся да яго імем гэтага бога, які так падмануў усе спадзяваньні і мары Няжылы.

І больш ня слухаў нічога, толькі біўся галавой аб камень і, дарэшты зьнясілены, заснуў тут жа, на кіце гнілой саломы.

Праз тыдзень ён папрасіў Зайца, каб той паклікаў да яго вярхоўнага жраца Лойку.

– Ты што, думаеш, што вялікі жрэц і сапраўды прыйдзе да цябе ў гэтую гніль? – расьсьмяяўся яму ў твар турэмшчык.

– Калі яго папросіць Круглец, наш родзіч, ён не адмовіцца.

– Кругляцу не да вас.

Убачыўшы, як наструніўся Кумец, Заяц загыгыкаў, выстаўляючы гнілыя зубы:

– Ягоная сястрыца – кугу! Зьбегла, як лісіца з пасткі, нават хвост прышчаміць ей не пасьпелі.

– Куды? – ускочыў з саломы Кумец. Яго худыя рукі затрэсьліся, ён задыхаўся ад хваляваньня. Няжыла глядзеў на яго са зьдзіўленьнем. Ён ніколі ня бачыў брата ў такім узбуджэньні.

– Спачатку дай грош, тады скажу! – пацьвельваўся Заяц.

– Ты ў мяне ўсё выбраў, сьлізень! Заплачу, як толькі родзічы перададуць мне сюды яшчэ штосьці.

– Калі клянешся Родам і парадзіхамі, што аддасі грошы, тады…

– Кажы! – крыкнуў Кумец, трацячы цярпеньне.

– Ніхто ня ведае, куды, – гыгыкаў Заяц. – Адно толькі вядома, што за ёй прыязджаў сам вялікі Бурыла, каб забраць у капішча. Кажуць, што схаваў яе брат, за што трапіў у няміласьць ня толькі да жрацоў, але і да двара. За нечуванае сьвятатацтва!

– Я дам табе дэнарый – раптам сказаў Няжыла. – З умовай – калі прывядзеш сюды кагосьці са жрацоў з храма Вялеса альбо Перуна. Ён мне паможа.

– Цэлы дэнарый! – захлынуўся радасьцю Заяц. – Калі толькі мяне ня кінуць сьвяшчэнным зьмеям, я выпрашу ў яго гэтую міласьць! Мой дзядзька вартуе капішча Перуна… Але што яму казаць? Навошта ён табе?

– Скажы, што ён не пашкадуе.

– Добра, лізун замкавай медавухі! Загадчык чашаў і брэцьяніц! Я зраблю гэта!

– Брат, скажы шчыра: навошта табе жрэц? – як толькі са скрыгатаньнем зачыніліся цяжкія, акаваныя меддзю дзьверы вязьніцы, запытаўся Кумец.

– Дазнаешся заўтра, – коратка адказаў Няжыла. Яго шырокі, круталобы твар паблядней, вусны падцяліся. Вялікае рашэньне, якое ён падспудна насіў у сабе, зараз высьпела ў рашучасьць. Ён павінен ратаваць

брата, калі той ня хоча ратавацца сам. І хаця Кумец заўсёды быў разумнейшым за яго і знаходзіў лепшыя рашэньні, Няжыла быў упэўнены, што ў бязвыходнай сітуацыі трэба не маліцца, не пакорліва чакаць, пакуль іх павесяць на сьвяшчэнным дубе, а дзейнічаць…

Калі пасланы Бурылам Лелюш выслухаў Няжылу, ён зразумеў: пакараньне Няжылы можна адкласьці, таму што ня сьмерць яго, а жыцьцё лепей паслужыць жрацам. Такую ж думку выказаў і Бурыла:

– Марыя памерла, і гэты пахолак нам нястрашны. Наадварот – мы пакажам Альгерду, які так яго шкадуе, што мы не крыважэрныя і што мы лічымся з пачуцьцямі вялікага князя. Хай пакуль пажыве...

## САРАКАВІНЫ. МОРАК

Карчажка з хмельным мёдам стаяла на магіле вялікай княгіні Марыі, што месьцілася ля самай царквы Параскевы Пятніцы, побач на ручніках ляжалі яйкі, кавалкі жытняга хлеба і дзічыны. Паабапал, накрытыя ручніком, стаялі брэцьяніцы, аднак краўчы трымаў у руках залатую з эмальлю грэцкую чашу, з якой будзе піць вялікі князь. Хлопчыкі-памагатыя выстаўлялі наперад чашы меншыя, з серабра, аздобленага пярлінамі – для вярхоўных жрацоў. Вецер ірваў шытыя золатам павязкі на галовах прыдворных жанчын, уздымаў полы сініх, жоўтых, зялёных корзнаў іхніх мужоў, загаляў доўгія рукавы на жрэчаскіх каптанах. Беглі аблокі, адчынялі час ад часу сіні крышталь недасяжна-вечнага неба, адкуль глядзелі на трызну па мёртвай княгіні Марыі тыя, хто прымаў дары і паднашэньні.

Вялікі жрэц Бурыла чытаў маленьне да ўладаркі сьмерці Марэны, якая, як верылі ўсе прысутныя, прынесла сюды, на саракавіны, душу вялікай княгіні, каб магла яна пабачыць усіх дарагіх яе сэрцу людзей і суцешыць іх у вялікай жальбе.

Япіскап Нестар не выходзіў з храму – там зараз рыхтавалася паніхіда па памерлай, і князь Альгерд, пасьля таго як ён праводзіць душу нябожчыцы назад, у чысьцец перад Ірыем, прыйдзе ў храм, каб папрасіць для яе спакою і добрага адказу перад тым, Адзіным, хто судзіць усе справы яе і думкі.

Нямногія маглі здагадацца, колькі жарсьцяў і вузлоў закруцілася вакол гэтай нечуванай для Вільні падзеі, калі вярхоўныя жрацы прыйшлі да хрысьціянскага храму, хай нават і на магілу вялікай княгіні.

– Для нас гэта не царква – для нас гэта найперш сьвяцілішча Рагуціса, хай і разбуранае, – сказаў урэшце на вялікай радзе сьвяшчэнных старцаў і вярхоўных жрацоў стомлены ад шматгадзінных пярэчаньняў і састарэлых крыўдаў Бурыла. – Ягоны дух там, бо стагоддзі запар пакаленьне за пакаленьнем прыходзілі да яго, каб узьнесьці яму пахвалу і маленьні. І калі мы будзем паводзіць сябе абачліва і мудра, можа, неўзабаве верне сабе Рагуціс сваё законнае месца? І каменьне з нечасьцівай будыніны будзе раскрышана маланкамі Перуна?

Тое самае адразу ж загаварыла, як засьпявала, Нара:

– Нам не выпадае сварыцца з вялікім князем, які цяпер у скрусе. Падтрымаем яго зараз – ён падтрымае нас у цяжкую хвіліну. А вы бачыце: вакол нас змыкаецца кола хрысьціянства. Ды і ўнутры: уся усходняя

частка Княства паддалася гэтай заразе, хаця і гвалціў сын рабыні князёўну Рагнеду перад бацькам і братамі! І што ж? Хіба адпомсьцілі палачане так, як гэта належала б воям? Хіба не здрыганулася рука ў Рагнеды? Яна ўрэшце сама стала рабыняй, прыняўшы схіму ў Ізяслаўлі!

– Што згадваць старыя часы! – падняўся з месца Лойка. – Страшнейшае тое, што мы – мы, хто в е д а е! — прыйдзем да апаганенага чарвямі цела – былога сасуду сьвятла і высокай сілы. Ня вам казаць пра тое, што, спальваючы цела, мы дапамагаем вызваліць з цямніцы полымя Духу, якое павінна падняцца ў Сваргу! І як я ўздыму там, ля апаганенай зямлі брэцьяніцу, як буду вітаць дух, які, можа, усё яшчэ ня можа выбрацца з тае цямніцы, ажно пакуль яна не згніе да костак!

Усе доўга маўчалі. Пасьля падняўся адзін з вешчых старцаў імем Вецер. Быў некалі вялікім празарліўцам, ды даўно зацьменіўся спакусамі жыцьця і каханьнем да простай жанчыны, з якою прыжыў сына. Нара, якая даведалася пра тое выпадкова, ня толькі захавала таямніцу, але і вылечыла сына ад цяжкай хваробы. За тое старац быў бязьмерна ўдзячны ёй і падтрымліваў, дзе і як мог. Востры розум дапамагаў яму захоўваць сваё высокае становішча, і ягоныя парады слухалі заўсёды з пашанай.

– Мы можам выклікаць там новы агонь* і такім чынам ня будзем апаганеныя, – прапанаваў ён.

Шэлест прайшоў па прысутных. Выклікаць на кавалку сьвяшчэннага ясеню альбо вярбы новы агонь каля магілы вялікай княгіні, як вышмароўвалі яго сьвярдзёлкам каля магіл высокіх духам старцаў, каб людзі пасьля несьлі той агонь да сябе ў хаты, значыла паказаць князю высокую пашану да ягонай жонкі, і разам з тым ачысьціць сябе ад непажаданага абраду. Гэта быў добры выхад, і ўсе згадзіліся з тым.

У той жа вечар, сабраўшыся ўтраіх у капішчы Перуна, вырашылі Бурыла, Нара і Вецер упершыню паказаць вялікаму князю Дзівейну. Цяпер было гэта надта няпроста: Лойка і яго маленьне моцна сапсавалі ім задуму. Бо, хаця і не знайшліся смарагды ў Дзівейны, усё ж цьмянае падазрэньне вісела над ёю, а значыць, і над ейнай сястрой. І ўсё ж трэба было працягваць – назад шляхоў ужо не было...

...І цяпер, калі маленьне завяршалася, збоку ад магілы вешчы старац Ар з нашытай на белым плашчы знакам Сваргі – рагатым чатырохкутнікам сонцазвароту – стаў шморгаць ясеневым цурбалкам па палене сухой вярбы, якое моцна трымалі з аднаго боку хлопчык у белай кашулі, а з другога – дзяўчына ў празрыстым покрыве, які закрываў ейны твар. Тое, што гэта была маладая дзяўчына, выдавалі яе рукі – тонкія, белыя, далікатныя. Народ, што тоўпіўся ля храму, спачатку не зьвяртаў увагі на старца і яго памагатых. Але паступова агульная ўвага засяродзілася як на Бурыле, так і на старцы, які раўнамерна рухаў сваім цурбалкам па палене. Сьпіна яго ўзмокла, цёмныя пляміны распаўзаліся па кашулі. Бурамір паскараў чытаньне, і ў рытм яму рухаўся цурбалак.

Толькі Нара магла заўважыць, што вопытны Бурыла доўжыў маленьне якраз да той хвіліны, калі з-пад рук Ара ўпершыню паказаўся нясьмелы сіняваты, амаль нябачны ў дзённым сьвятле матылёк агню. Натоўп ахнуў, хлопчык памагаты імгненна падкінуў да матылька пук сухіх сьцяблінак, а памочніца старца схапіла сваімі далікатнымі пальцамі палову таго пучка і кінула сабе ў чашу, дзе ляжала загадзя падрыхтаваная спажыва для агню*, ад чаго ён успыхнуў ярка і весела. Яна адкінула пакрывала,

і вакол раздаўся яшчэ адзін агульны ўздых: гэта была Дзівейна, пра якую віленцы і гаварылі, і слухалі на працягу апошніх тыдняў ці ня болей, чым пра самога вялікага князя.

З новым, толькі што народжаным агнём у руках яна пайшла проста да яго, і ўсім здалося – дзяўчына ня рухаецца, а плыве ў паветры. Цёмныя хмары перадаожжа надалі агню ў ейных руках асаблівую значнасьць: яго чырвоныя пасмачкі здаваліся большымі, а твар Дзівейны – таемным і велічным.

– Вазьмі, вялікі гасудар, гэты чысты і сьвяты агонь, няхай затуліць ён цябе ад чорнай сілы і немачы, – сказала яна рытуальныя словы, і вочы яе – сьветлыя, з чорнымі доўгімі вейкамі, сустрэліся з зеленаватымі, ледзь пачырванелымі на рэзкім ветры вачыма Альгерда. Гук ейнага голасу як абарваў у ім нейкую струну, сэрца вухнула і застыла, пасьля забілася шалёна, быццам хацела выскачыць з грудзей.

Захоплены зьнянацку, ён адразу, усёй істотай, спасьціг тое, пра што ня раз чуў як пра выраз, якому не надаюць асаблівага значэньня: “увайшла ў душу”.

Ды яна не проста ўвайшла – уляцела. Уся, дашчэнту – высокая, гнуткая, з белым лілейным тварам, з румянкам на шчоках і чорнымі прамымі брывамі, з выразнымі, як намаляванымі, вуснамі і гэтым сваім нявінным выразам вачэй, адначасна наіўных і мудрых. Уляцела і, нібы заняўшы належнае ёй месца, тут жа ўладкавалася там, у ім, і нават скруцілася ў клубочак, як котка ці... зьмяя?

Пасьля, калі ён узгадваў гэты момант, спасьціг, што ня толькі голас, які абарваў нешта ў душы, і агонь, які яна несла, паслужылі задуме: яны дашчэнту спапялілі нешта ўнутры яго – можа, гэта была абярожная сьцяна, што ёсьць у кожнага чалавека, а можа, гэта было гало ўлады, што абкружае толькі гаспадара краіны. Іначай чаму ж, прыняўшы агонь, ня мог адвесьці погляду? Ня памятаў, як падхапіў чашу нехта з прыдворных, як сам ён падзякаваў дзяўчыне і ўзьняў брэцьяніцу з хмельным пітвом, каб памянуць нябожчыцу жонку.

І ўвесь той дзень ён быў як апоены нечым: яна, толькі яна стаяла перад ім – цнатліва-белая, як яблыня ў квецені. Недзе па баках ад яе хаваліся погляды, якія ён заўважыў і схаваў глыбока ў памяці: затоена-зласьлівы Бурылы і радасна-дзёрзкі Нары. А яшчэ – чамусьці разгублены – ваяводы.

Ваявода сапраўды разгубіўся: вялікае ўражаньне ад Дзівейны, стаўленьніцы жрацоў, было ў Альгерда настолькі відавочным, што гэта магло скончыцца для яго самога кепска. Ён раскрыў клубок змовы, але пра гэта ведалі толькі тры чалавекі. Калі ж вялікі князь, зачараваны дзяўчынай, раскрые ёй таямніцу, яго, ваяводу, можна толькі пашкадаваць. Ён зьнікне ці то ў водах Вяльлі, ці то ў страшных сховішчах храмаў, і ніхто ніколі не даведаецца пра яго...

Такое ж адчуваньне было і ў вознага Сухты. Гэта ён ставіў бяссонную варту ля камяніцы Дзівейны і ля храму багіні Лялі. Ён падкупляў прыслугу і там, і там. І як толькі штосьці стане вядома гэтай прыўкрасна-страшнай у сваёй нялюдскай гожасьці дзеўцы – яго, менавіта яго абяруць чарговай ахвярай, якую трэба аддаць багам, каб яны ня гневаліся на вільнянаў. Гарэць яму тады на сьвятым вогнішчы, з вырваным языком, каб ня выкрыкнуў у апошнюю хвіліну якую-небудзь таямніцу, якую ведаюць

толькі яны, сапраўдныя гаспадары Вільні! Возны ня быў прыхільнікам хрысьціян, але паступова агіднымі рабіліся яму оргіі ў багіні каханьня, а таксама тое, што высокія баяры-язычнікі мелі па некалькі жонак і мноства наложніц. Ён любіў сваю жонку і не хацеў больш нікога, нават у Купальскую ноч. Цяпер яму заставалася адно – служыць вялікаму князю, і малады чалавек за гэтыя тыдні паступова прыходзіў да высновы, што гаспадар у краі павінен быць адзін. Тое, што калісьці вялікі Гедзімін і жрацы былі заадно, цяпер мянялася. Альгерд іншы, і іншыя цяпер стасункі паміж уладай і багамі.

Альгерд адчуў і іхнія настроі, і тых, хто радаваўся яго мораку: Мікша там, далёка ад магілы, глядзеў на яго змрочна і з надзеяй. Князь ведаў і адчуваў Мікшаву, а разам з ім і многіх іншых надзею: а можа ўсё вернецца на ранейшы кон? Калі замест хрысьціянкі Марыі вялікай княгіняй стане ня прышлая, не заморская, а свая?

Але гэта ўсё асэнсаваў ён пасьля.

А цяпер ледзь вытрымаў Гаспадар заканчэньне маленьня, а пасьля і паніхіду ў хрысьціянскім храме. Змушаны быў загадаць Нестару скараціць яе. Плылі ў ягоных вачах сьвечкі, жоўтымі плямамі клаліся на маелікавую падлогу. Твар Марыі, калі спрабаваў яго ўявіць, таксама струменіўся і мяняўся да непазнавальнасьці, а замест яго ўсплываў іншы – яе, Дзівейны! Вогнішча чыстага, толькі што створанага агню клалася на яе аблічча, яно трапятала, сьвяцілася. Ільняная сукня вымалёўвала абрысы прыўкраснага цела…

Так доўжылася тры дні. Ён не выходзіў са сваёй лажніцы, толькі піў ваду і адвар карэньняў дзівасілу, як пасьля моцнай атруты. Паслоў прымаў за яго ваявода Гаштольд.

Альгерд дакараў сябе: выходзіць, жрацы мацнейшыя за яго, вялікага князя! Ён зноў і зноў уяўляў сабе велізарнае сьвяцілішча Перуна: дзесяцімятровыя сьцены, трохпавярховая цагляная будыніна, каля якой, пад неймаверна старадаўнім дубам, стаяла медная постаць вярхоўнага бога, чые маланкі забівалі непакорных. Дваццаць прыступкаў, што вялі да алтара, мелі выявы месяца ва ўсіх яго квадрах, па іх можна было прадугледзець зацьменьні на сотні гадоў наперад. Гэтак жа можна было і прадбачыць будучае кожнага – але жрацы ўжо не маглі адолець старадаўняй навукі, як тое рабілі іхнія папярэднікі для знатных людзей Вільні, ня кажучы ўжо аб простай чадзі. Можа, таму, што рабіліся ўсе больш цяжкімі для падарожжаў у нязнаны сьвет, там, дзе ўсе рэчы, падзеі і думкі знаходзяцца ўсе разам, не разьдзеленыя ні часам, ні лёсамі.

Выходзіць, будучае існавала, але як угадаць яго нават на некалькі крокаў наперад?

Вялікі князь таксама ня ведаў свайго будучага. Адно ён вызначыў цьвёрда: ніколі, ніколі ня возьме ў жонкі Дзівейну. І нават не таму, што за ёю стаялі Бурыла, Нара і вешчыя старцы, а яны, хаця яшчэ моцныя, усё ж адыходзілі, як адыходзіць час язычніцтва

Дзівейна – гэта сьмерць вялікай княгіні Марыі, гэта здрада і морак. Гэта жаночая сіла, якая накіраваная не на стварэньне і сьвятло, а на захоп і валадараньне. З-за гэтай сілы давялося ў пракаветныя часы вырываць уладу з рук Жанчыны і ўтаймоўваць яе сілай. Аднак, як помсьцячы за тое, яна часам вырываецца з усіх путаў і авалодвае мужчынам. Варта яму толькі аднойчы саступіць.

Яму ж на тыя гады, што засталіся, патрэбная спадарожніца. І, апроч таго, саюзьніца. За ёю павінен стаяць нейчы меч, войска, сіла, якая дапаможа яму ў цяжкі час.

Такой сілай маглі б быць цьверычы. Ён ня раз дапамагаў ім у барацьбе з маскавітамі. Разам яны маглі б выстаяць і перад маскавітамі, і перад крыжакамі. Тыя лезьлі ў край, як клапы: тачыліся ў кожную шчыліну, шукалі кожную зачэпку. Зноў і зноў зьвярталіся да Папы, да іншых гасудароў, схіляючы іх на свой бок. І ўсё дзеля таго, каб захапіць чарговы кавалак зямлі, пашырыць свае ўладаньні. Ім усё мала. Кажуць, іхні замак у Мальбарку расьце ледзь не да неба. Вялікі магістр, калі адчыняе акно, утыкаецца ў аблокі. Вядома, гэта росказьні, але лазутчыкі сапраўды расказвалі пра гэтую цьвержу крыжакаў цуды. Казалі пра добра прадуманую сістэму пропуску, пры якой у замак ня мог пралезьці нават пацук, пра сістэму абпаленых гліняных трубак, што гнала з падполу цяпло ажно на самую вышыню цьвержы, пра тое, што абведзены ракой, замак супрацьстаіць любой хваробе, што прыносяць вецер і непагадзь. Яму, Альгерду, пакуль што такое недаступна. Замак у Вільні нашмат бяднейшы, чым у Мальбарку, бо абапіраецца князь толькі на сваю зямлю ды на тое, што назьбіраў і назапасіў ягоны бацька, вялікі Гедзімін.

Раніцай чацьвёртага дня да яго папрасіўся Нестар. Альгерд прыняў яго з неахвотай. Отрака, што перадаў просьбу, выкінуў з лажніцы, толькі праз паўгадзіны паклікаў яго зноў і загадаў прывесьці сьвятара ў малую тронную залу. Адчуваў перад ім няёмкасьць – шанаваньне саракавін пасьля сьмерці Марыі прайшло больш урачыста па язычніцкім, а не хрысьціянскім абрадзе. Здагадваўся, што ўжо ўсе паслы адпісалі ў свае краіны тое, што пры двары Альгерда існуе вялікая згода паміж князем і язычніцкімі жрацамі, – а гэта ўзмацняла пазіцыі крыжакоў і Масквы, Цьвер жа, як і Ноўгарад з Псковам, тым былі прыніжаныя. Прыніжаны быў і Нестар – усе ведаюць, што хрысьціянскаму храму аддаў вялікі князь куды меней часу, чым жрацам.

Таму сустрэў Нестара насьцярожана, загадзя рыхтуючыся да спрэчкі і доказаў сваёй праўды. Аднак сьвятар ня стаў узгадваць пра саракавіны. Сказаў адразу, як толькі благаславіў князя:

– Адпусьці, мой сын, з цямніцы Антонія.

– Гэта каго? – не адразу зразумеў Альгерд. Ён не цярпеў, калі сьвятар называў яго “сынам”, і той казаў так вельмі рэдка, калі быў настроены рашуча і гатовы быў спрачацца з князем да апошняга.

– Кумца, – патлумачыў Нестар. – Ён пакутуе толькі за тое, што хрысьціянін. Гэта несправядліва. У Вільні шмат купцоў заходняга хрысьціянства, яны маюць свае храмы. І ўсходняга абраду таксама. Цьверычы, якія сюды пастаянна прыязджаюць, таксама ўжо спадобіліся ісьціннай веры. А хлопец у дадатак і твой былы прыдворны. Няўжо ты не шкадуеш маладое жыцьцё? Я дзень і ноч малюся дзеля таго, каб зьмякчыць тваё сэрца.

– Але ж ты колькі разоў ужо прасіў за Кумца, і я табе адмаўляў. Дык як ты асьмельваешся малаціць дзясяты раз адно і тое ж?!

– Ня злуйся, вялікі князь. На гэты раз ёсьць і зьмены. Цябе прыйдуць прасіць за Няжылу. І ты яго адпусьціш. Хаця ён злодзей і ўкраў смарагды.

– Якія зьмены?

Твар Дзівейны плыў перад Альгердам, і не было сіл адмовіцца ад яго. Князь паматляў галавой.

– Няжыла адмовіўся ад хрысьціянства, якое спавядае ягоны брат. Жрацы прыйдуць да цябе з просьбай зноў узяць падчашага да цябе на службу. Розгалас аб гэтым ужо ідзе па Вільні.

І дадаў з горыччу:

– Бурыла ўжо абвясьціў, што Пярун і Вялес даруюць адступленьне ад ісьціннай веры. Кажуць, гэта адбылося па маленьню гэтай… дзяўчыны, якая падносіла табе агонь.

– А прычым тут дзяўчына?

– Яны ўсё робяць, каб паказаць, што могуць дамагчыся болей, чым хрысьціяне. Каб процiпаставіць свае дзівосы ісьціннаму Богу. І таму мне так цяжка змагацца з гэтай цемрай.

Альгерд раздумваў. Вярнуць Няжылу ў замак? Сапраўды, ніхто не даказаў, кім жа ўкрадзеныя смарагды. Ніхто ня ведае ісьціны, і ці ня зьдзівяцца людзі, чаму ўвогуле застаўся жывым такі страшны злачынца? І ён дакараў сябе, што адклаў рашэньне аб лёсе гэтага хлопца. Трэба было ўсё ж пакараць яго. Тады не давялося б зноў гуляць па правілах жрацоў, а не паводле сваіх меркаваньняў…

У пакой нячутна сунуўся бледны отрак, ён чакаў, пакуль вялікі князь зьверне на яго ўвагу, і толькі пасьля дазваляльнага знаку прашаптаў:

– Да гаспадара просіцца вялікі жрэц Перуна Бурыла.

– Ну што я казаў? – падняўся з крэсла сьвятар.

– Я пакуль што не дазволіў табе ісьці, – сурова мовіў Альгерд.

– Ты забыўся: я ня твой слуга, княжа.

– Але ты прыйшоў да мяне з просьбай.

– Ня дзеля сябе. Дзеля літасьці і сьвятла для юнака, якому адкрылася ісьціна.

– Наконт ісьціны мы шмат з табой спрачаліся яшчэ ў раньнія гады. Я памятаю, якім ты быў у Віцьбеску. Ты цяпер стаў куды больш згаворлівым, Нестар, але і зараз ты ня хочаш разумець, што я не магу рабіць так, як загадвае мне сэрца. Я – гаспадар княства!

– Гэта значыць, што ты не адпусьціш Антонія? Але адпусьціш злодзея, які ўкраў каштоўную рэч, толькі таму, што аб гэтым будуць прасіць жрацы?

– Ён ня злодзей, – глуха адказаў Альгерд. – Ты, ойча, многага ня ведаеш. Таму – не асуджай мяне. Ідзі з мірам. Я ня выканаю тваёй просьбы, колькі б ты яе ні паўтараў.

– Я таксама жадаю табе міра. Але яго няма ў тваёй душы. Што ж, я заўсёды гатовы дапамагчы табе, толькі пакліч.

– У мяне няма патрэбы клікаць цябе. Пакуль што.

– Я паўтару табе, княжа, безьліч разоў: калі табе патрэбна будзе дапамога, я ўсё роўна прыйду да цябе.

– Ты, выходзіць, на мяне, як сапраўдны хрысьціянін, ня крыўдзішся, хаця я і адмовіў табе, ойча?

– Я – толькі служка Госпада. Гэта яму ты адмовіў сёньня. Памятай пра гэта, вялікі гаспадар…

## *ПАГАДНЕНЬНЕ*

Высокі, як заўсёды чыста паголены Бурыла ледзь не даставаў галавой

вышыні дзьвярэй. Альгерд пайшоў яму насустрач, але не схіліўся перад вялікім жрацом, як бывала гэта раней, і госьць адзначыў тое з прыкрасьцю, але не паказаў сваіх пачуцьцяў.

– Заўсёды рады вітаць вярхоўнага жраца вялікага Перуна.

У голасе вялікага князя было ледзь улоўнае зьдзіўленьне – роўна настолькі, каб прымусіць нечаканага наведвальніка адчуць няёмкасьць ад таго, што прыехаў зьнянацку. Але той не варухнуў і брывом. Агледзеў залю, дзе ня быў з таго дня, як вялікі князь рабіў тут свой першы прыём для жрацоў усіх язычніцкіх капішчаў Вільні – першы пасьля яе гвалтоўнага захопу і ўцёкаў пастаўленага бацькам Гедзімінам на сталец брата Яўнута. З таго часу гаспадар княства часта мусіў ісьці да жрацоў, прыносячы багам багатыя і пышныя ахвяры, гадзінамі прастойваючы ў час вялікіх маленьняў перад іхнімі выявамі.

– Тут не было гэтых… тканак, – з цікаўнасьцю ўгледзеўся жрэц у сьцены. Сапраўды – вялікія тканыя шпалеры з кветкамі і падобныя на шары пладамі на зеленавата-шэрым фоне зусім нядаўна падарылі Альгерду паслы Папы. Ярка-аранжавыя нетутэйшыя плады рабілі залю ня гэткай змрочнай, як заўсёды. Зброя, што вісела на сьценах і раней, адзіная ўпрыгожвала сьцены, цяпер нібы страціла свой ваяўнічы і злавесны выгляд і мякка адблісквала ў промнях няяркага, яшчэ слабога сонца. Трашчалі дровы ў вялікім каміне, абкладзеным зялёнымі кафлянымі пліткамі, на якіх карычнева выдзяляўся трызубец – сямейны знак Гедзіміна.

Бурыла сеў на крэсла, пачціва падстаўленае яму служкам, расшпіліў аплікі багата аздобленага залатымі шнурамі суконнага каптана, з-пад якога паказаўся вялікі залаты медальён-зьмеявік, і строга зірнуў на князя.

– Пакараньне зламысьнікаў заўсёды прымушае простую чадзь схіляцца перад уладай і пачціва прымаць усе законы, якія мы даём людзям дзеля іхняй жа карысьці, – сказаў ён, выдзяляючы кожнае слова.

– Пра каго ты гаворыш, вялікі жрэц?

– Пра любога, хто не выказвае пакоры багам.

– Але ж ня дзеля таго, каб я пачуў тое, што добра ведаю, ты ўспароў мяне з ложку? Нешта здарылася, аб чым мне не сказалі?

– Табе і не маглі гэтага сказаць: толькі сёньня ў капішча прыйшла вестка аб тым, што бяглянка, якая адмовілася служыць багам, жыве сабе ў Нямеччыне і не зьбіраецца вяртацца.

– Ты гаворыш пра Уну, дачку пасла Леся, якая зьнікла колькі месяцаў таму? Адшукаў яе брат?

– Думаю, што гэты нягоднік сам дапамог ёй уцячы, хаця хлусьліва прыкідваўся, што для яго гэта таксама вялікая навіна.

– Мне якраз здаецца, што Круглец – шчыры і добры хлопец. Калі ён так гаворыць, значыць, сапраўды ня ведае, дзе ягоная сястра.

– Гаспадар, ты можаш яго праверыць: няхай ён сам прывязе сястру ў Вільню.

Альгерд раздумліва глядзеў на Бурылу.

– Але яна – знатная баярыня. Нягожа цягнуць яе сілком, як цёлку на вяроўцы. Бачыш, як ня хоча яна служыць Перуну. А ты, помніцца, казаў, што дзяўчына толькі і марыць аб тваім храме... Што ж – ёсьць сотні іншых, выберыце сабе. З Лесем мы сябравалі. Ён шмат зрабіў для Княства і для майго бацькі Гедзіміна, і я не хацеў бы…

– Вялікі гаспадар! – перабіў яго жрэц. – Калі ня будуць слухацца багоў знатныя баяры – ня стане таго рабіць і простая чадзь. Трэба добра пакараць зламысніцу – нягледзячы ні на заслугі бацькі, ні на знатнасьць ейнага роду. Як жа ты хочаш, каб у нашым Княстве быў парадак, калі людзі ня будуць ведаць цяжару сваіх абавязкаў і несьці іх, як належыць!

У голасе Бурылы Альгерд злавіў нязвыклую для таго гарачнасьць і насьцярожыўся. Але не паказаў таго. Наадварот, спытаўся як бы між іншым:

– А дзе жыве Уна?

Бурыла махнуў рукой, нібы падкрэсьліваючы тым, што гэта дробязь.

– Калі гэты мудрэц паедзе, мы яму скажам, дзе яна. І дадзім двух жрацоў, каб яны… дапамагалі.

– Але пакуль ты скажы гэта мне, – сьцішана прамовіў князь. Ён адчуваў размову, як гульню ў варцобы альбо паядынак на дзідах. Праціўнікі ходзяць адзін вакол другога, шукаюць слабое месца, каб пасьля сабраць усе сілы і перамагчы.

– Яна ў Хайдэльбергу, – спакойна мовіў Бурыла, толькі на імгненьне зялёным выблiснулі яго вочы.

– Яна што, купіла там дом? Ці здымае жытло?

– Ці не зьбіраешся ты, вялікі князь, сам паехаць за ёю? – з усьмешкай паглядзеў на яго жрэц.

– Я не хацеў бы, каб за ёю паехаў ты, – таксама нібыта жартуючы, усьміхнуўся і Альгерд. – Тут столькі ўсялякіх спраў, як жа мне спраўляцца без цябе?

– Якраз я і хачу пагаварыць пра справы, – Бурыла адразу перайшоў на заклапочаны тон, паказваючы, што ўсё, аб чым яны тут толькі што гаварылі, было ня самым значным.

– Кажы. Пра што ты?

– Пра тваю жаніцьбу, княжа, – цьвёрда гледзячы ў вочы Альгерду, адсек вярхоўны жрэц.

– Гэтым займаюцца паны-рада. Ды і ня час: усяго сорак сем дзён прайшло, як княгіня памерла.

– Гэтыя звычаі ўвялі хрысьціяне. Нашыя ж гавораць пра тое, што адразу пасьля трызны, калі праводзілі душу ў Ірый, кожны зноў можа выбіраць сабе спадарожніцу жыцьця. Яшчэ раней жонкі абавязкова ішлі ўсьлед за мужам, але ўжо Гедзімін пакінуў зямны сьвет без гаспадыні. Думаю, душы яго там няўтульна. Але так захацелі вы, ягоныя сыны, і мы, жрацы, праявілі слабасьць.

– І каго ж вы, жрацы, мне знайшлі? Ці яшчэ шукаеце?

Альгерд казаў гэта проста, як быццам гаворка была для яго сапраўды новаю. Бурыла страсянуўся:

– Ты ня раз чуў пра гэта!

– І ўсё ж скажы яшчэ раз.

– Я кажу пра сястру вялікай жрыцы Нары Дзівейну!

– І зноў жа: я ня раз адказваў табе. На гэта ня пойдуць паны-рада. Жонка павінна прыносіць дзяржаве землі, багацце, сувязі з саюзьнікамі.

– Гарачае пачуццё – гэта таксама скарб. Нашы продкі аб тым ведалі і карысталіся гэтым. Усё занядбаньне на зямлі ідзе ад таго, што сталі думаць, як выгадней. А трэба кіравацца запаветамі любові і сьвятла.

...Калі б гэта казаў Лойка! Лойку Альгерд верыў і, гаворачы з ім,

скрушна думаў аб тым жа. А яшчэ аб тым, што ён, гаспадар Княства, ня можа кіравацца пачуцьцямі, нават калі б хацеў, а мусіць рабіць тое, што робіць увесь сьвет: наступае, абараняецца, захоплівае, захоўвае і прымнажае – землі, багацьце, скарбы, якімі купляецца ўсё наўкол. Не, ня ўсё, – паправіў ён сам сябе. – Але тое, што не купляецца, і ня цэніцца ў сьвеце…

Бурыла сам рабіў гэтак жа: цікаваў, дзе лаўчэй можна дабіцца свайго. Купляў, калі трэба было. Загадваў, але калі ня мог дамагчыся свайго сілай, то ўпрошваў, угаворваў, але і быў да супрацiўнікаў бязьлітасным.

– Згодны з табою. Але менавіта за гарачае пачуцьцё да новага бога і сядзіць у цямніцы мой лоўчы Кумец. Ягоны брат Няжыла яшчэ не апраўданы.

– Гэта іншае. Няжыла пакаяўся ва ўсім, і таму я прашу выпусьціць яго на свабоду.

– Ты ня просіш за другога?

– Ён страшэнны злачынца, бо грашыць супраць багоў. У яго гарачае не пачуцьцё, а духоўнае асьляпленьне, і гэта тым болей небясьпечна. Але…

Бурыла спыніўся, нібы захрасла ў горле. Абяцаньне, якое ён гатовы даць, ня ўзгоднена са жрацамі. Ды што рабіць з нязломкам-князем?! І ён дакаўтнуў словы:

– Жрацы, калі ты так хочаш, нават даруюць яму грахі – у дзень твайго вясельля. Ён наўрад ці адмовіцца ад свайго хрысьціянства, але мы ведаем, як ты яго любіш, і нешта прыдумаем…

– Я б не хацеў сёньня гаварыць пра вясельле!

– Я не настойваю, гаспадар. Мы так цябе любім, што ня хочам брацца з табой у сутонкі...

Бурыла усё ж падлавіў яго на агаворцы “сёньня”. Значыць, размова ня скончаная. Князь не адцураецца Дзівейны, тым супрацьпаставіўшы сябе жрацам!

Альгерд пабачыў, як задаволена бліснулі зялёныя вочы на твары жраца. Каторы раз супакоіў сябе: “Мне конча трэба выйграць час, каб пасьля ставіць свае ўмовы ім. Колькі ж мне яшчэ працягваць гэтую гульню!”

Бурыла ўстаў, тым паказваючы, што ён задаволены размоваю. Але ўсё ж напомніў:

– Загадай, гасудар, выпусьціць з вязьніцы Няжылу. Як бы добра было, каб ты ўзяў яго назад у замак. Гэта быў бы знак тваёй бязьмернай літасьці да ўсіх адшчапенцаў.

– Зламаны, ён вам ужо ня страшны? Добра, я вярну яго ў замак.

– Я рады, што мы паразумеліся, вялікі князь, – Бурыла падняў руку над галавою Альгерда, і таму, хоць і міжволі, давялося схіліць яе перад жрацом Перуна…

## *СЁСТРЫ*

Сьвяцілішча багіні Лады поўнілася ажыўленым, адданым людам і ў гэты пахмурны сакавіцкі дзень. Вялікая жрыца са сваёй сьвятліцы зьверху, праз патаемныя адтуліны ў сьцяне, назірала за рэдкімі мужчынскімі постацямі сярод стракатага натоўпу жанчын. А тыя то клалі вянкі і пры-

нашэньні перад алтаром багіні, то ўкленчвалі перад ёю, расьсьцілаючыся на падлозе, то стаялі на каленях, закрыўшы твары рукамі, дасылаючы Ладзе свае просьбы і самыя патаемныя жаданьні.

Абедзьве сястры адпачывалі. Зірні хто зьверху на сьвятліцу, дзе яны сядзелі, параўнаў бы яе з прыгожай клеткай, дзе ўладкаваліся дзівосныя птушкі: чырвоная прасторная сукня Нары і лазуровы каптан Дзівейны, залатыя і срэбныя бранзалеты, колты, абручыкі надавалі абедзьвюм жанчынам падабенства з яркімі заморскімі шчабятуньнямі. І сьвятліца адпавядала таму высокаму становішчу ў Вільні, якое займала вялікая жрыца: сьцены былі абцягнутыя сьветла-жоўтым атласам, на бялюткім абрусе месьцілася чарнёнага серабра амфара з пахкім грэчаскім віном і такія ж кубкі. На круглай пукатай тарэле грувасьціліся крутабокія чырвоныя яблыкі. У куце дымілася празрыстым духмяным дымам пазалочаная курыльніца. Сёстры ледзь ня грузнулі ў мностве маленькіх падушак, а ногі ў мяккіх поршніках паклалі на ніжнюю вузкую лаву, усьцеленую белай аўчынай. Адтуліны ў сьцяне маскаваліся пад узоры, выкладзеныя алавастрам. Нара паказала на чарнавалосую, у пышным вяночку дзяўчыну, што стаяла на каленях:

– Каханка майго дзядзькі Нарбута. Прыходзіць штодзень вось ужо месяц, і дзядзька па маёй просьбе зрэдзь, пасьля кожнага ейнага маленьня, сустракаецца з ёю. У кожнай з іх плача сэрца, – сказала яна і пагладзіла па плячы Дзівейну.

– Сюды цягнуцца пераважна жанчыны. Учора жаданыя для мужчыны, сёньня яны робяцца для яго звыклымі, а пасьлязаўтра – надаеднымі, і ён жадае іншую жонку альбо наложніцу.

– Хрысьціянства тое забараняе, – адгукнулася Дзівейна.

– Хрысьціянства выгаднае жанчыне, бо сужонак вымушаны браць яе на ўсё жыцьцё. Але ж... гаспадар сёньняшняга жыцьця мужчына, і таму якраз ён – галоўная апора нашага храма. Як ваўку патрэбная спажыва, так і мужчыне – сьвежаніна, жаночае цела. А значыць, колькасьць няшчасных не паменшыцца, і яны будуць вечна хадзіць у наш храм!

– Калі вялікі князь не ажэніцца са мною ў царкве, а проста тройчы абвядзе вакол сьвяшчэннага дуба, то я таксама магу яму хутка надакучыць, – усьміхнулася Дзівейна.

– Гэтага не дапусьцім мы. Ён павінен паказаць усяму сьвету, што шануе старых багоў. Што ягоная краіна ня стане хрысьціянскай. А што да надакучнасьці... Хочаш, я раскажу табе пра разумную жонку. Яна жыла недзе там, на ўсходзе, сярод касавокіх народаў. І муж яе, уладыка краіны, пакахаў маладзенькую прыгажуню і ўзяў яе ў дом. Тады жонка пасябравала з прышлай і стала дагаджаць ёй, як толькі магла. Што тая ні пажадае – яна ёй дорыць і ўсяляк задобрывае… Калі пра гэта даведаўся муж, ён надта ўсхваліў сваю жонку: “Такімі паводзінамі яна паказвае, што падпарадкоўваецца майму жаданьню і паважае іх!” І вось, калі абедзьве жанчыны так пасябравалі, што, здаецца, не маглі жыць адна без адной, маладая папрасіла парады, як ёй сябе паводзіць, каб каханьне ўладыкі да яе было яшчэ мацнейшым. І тады старая жонка сказала: “У табе ўсё яму падабаецца, апроч носа. Ты прыкрывай нос хусткай альбо наміткай, і ўсё будзе добра”. Праз нейкі час уладыка запытаўся ў сваёй старой жонкі, чаму маладая ўвесь час прыкрывае нос. “Ах, навошта табе гэта!” – закапрызіла жанчына. Калі ж той пачаў настойваць, нехаця прызналася:

“Яна такая цудоўная, што даверыла мне страшную таямніцу, якую я расказваю табе толькі таму, што не магу адмовіць табе, усемагутнаму”. – “Дык што там з ёю?” – дапытваўся цар.

– Зьлітуйся! Яна не пераносіць твайго паху.

– Ах вось як! Яна не пераносіць майго паху! – зароў абражаны мужчына. – У такім разе, адрэзаць ёй нос, і зараз жа!

І маладой дурніцы тут жа адрэзалі нос…

Дзівейна адкінулася на крэсла, паглядзела на Нару, і абедзьве жанчыны ад душы расьсьмяяліся.

– З такою дарадчыцай, як ты, я не баюся ніякіх памылак, – сказала малодшая сястра.

– І добра. Вер мне, і ўсё будзе па-нашаму, – прамурлыкала вялікая жрыца. – На наш век яшчэ хопіць усяго – і багацьця, і багоў, а там… там, у будучым, усё яшчэ можа зьмяніцца. Ды мы зможам глядзець на ўсё гэта здаля, з Ірыю, і будзем там гэтак жа, як зараз, сьмяяцца… А пакуль – стань вялікай княгіняй, і хай табе дапаможа абярэжніца каханьня!

– А што, калі яна, наадварот, мне... адпомсьціць? – сьцішана запыталася дзяўчына. – Я не кахаю Альгерда, больш таго – баюся яго.

– Пра гэта ня думай! – амаль прыкрыкнула на яе сястра. – Гэта справа жрацоў. Я прымушу князя, каб ён заўсёды хацеў цябе, і каб таго юру было даволі для абодвух!

Наступіла маўчаньне. Дзівейна глядзела ўніз на жанчын, якія раскладалі свае няхітрыя падарункі перад выявай багіні Лады, і аб нечым думала, нахмурыўшы бровы.

– Я веру табе, сястра. Але і табе не заўсёды ўсё ўдаецца. Той малады прыдворны, які табе падабаўся… не застаўся з табою, калі ты таго захацела…

– І дзе ён цяпер? – адрывіста адказала жрыца. – У цямніцы, дзе яго грызуць пацукі і сырасьць выядае гарачыню крыві… Ён неўзабаве стане кастратам… Нават калі застанецца жывым, ніколі ня зможа больш любіць жанчыну так, як таго патрабуюць багі…

– Затое я чула, што пад ягонае акенца зьбіраюцца людзі і слухаюць яго словы так, як ня слухаюць многіх жрацоў…

– Ты гэта чула? Сапраўды?

Нара ўскочыла, скінуўшы пульхную аксамітавую падушку, на якой сядзела. Сказала заклапочана:

– Трэба будзе сказаць пра тое Бурылу.

І, пацягнуўшы носам, раптам перамяніла тэму:

– Нехта з гэтых няшчасных прынёс у сьвяцілішча выдатную медавуху. Для Лады яна не патрэбная, а нам… Апошнім часам у мяне нешта стыне кроў, так што ня шкодзіць трохі сагрэцца. Як ты, вялікая княгіня?

– Не суроч, сястра! – апасьліва прашаптала Дзівейна. – Нешта неспакойна ў мяне на сэрцы. Пакуль ня стану валадаркай…

І з раптоўнай гарачнасьцю амаль крыкнула:

– Каб ня ты, ня вы ўсе... я ляжала б у абдымках Бусла, аднаго з Ашвінаў, і кахала б яго! У яго гладкая скура і магутныя рукі, і я марыла аб Конскім тыдні*, каб аддацца яму!

– Стань валадаркай, і ў маім храме цябе праз які год абдыме Бусел, а ніводная душа пра тое не даведаецца.

– А пасьля я пайду на ложа старога! І буду хлусіць яму!

– Дзіця! Ты яшчэ не спазнала, як салодка млець ад таго, што ты вала-

дарыш над мужчынам, і не над адным. Што ты належыш толькі сабе і сваёй прыхамаці... Сваёй, а не ягонай! О, я хацела б быць валадаркай Княства! Ды Кон* ня даў мне і ценю такога шанца. Дык – сьмялей наперад!

– Альгерда я баюся. Ён усё бачыць...

– Ня ўсё. Мы яго перахітрым. Калі ты будзеш цьвёрдай і пакуль што забудзешся на ўсіх Буслоў, разам узятых.

– Пакуль што, сястра? Але пасьля... хай і праз год...

– Абяцаю! А пакуль будзем піць медавуху і грэць кроў. Холадна мне нешта…

### *ВЯРТАНЬНЕ З ВЯЗЬНІЦЫ*

Калі ён караскаўся па брукаванцы, што крута ўздымалася да замку, у ягоных вушах гучаў голас брата. Калі ў глыбокіх падземных сховішчах, высака ўзьняўшы вогненны смаляк, пералічваў глякі з медавухай і аплееныя павуціньнем бочкі з віном, у яго вачах паўставаў брат. Брат прыходзіў па начах, калі Няжыла спаў, а душа яго блукала па тым сьвеце.

Не па гэтым.

Бо гэты сьвет, пасьля таго як яго выпусьцілі з цямніцы, ператварыўся ў нейкі іншы, нязвыклы і чужы.

У ім не было шмат чаго са звыклага і роднага.

Найперш – Рэчыцы.

Некалі вёрткая і гнуткая як плотка дзяўчына стала вялай і ціхай, яна пазнавала толькі бацькоў, а іншыя для яе былі прычынай бесьперапыннага жаху. Няжыла ня вытрымаў – пайшоў у некалі гасьцінны дом, пастукаўся ў запаветныя дзьверы. Ды бацькі Рэчыцы сустрэлі яго як злачынцу, разам выскачылі ў перадпакой і далей не пусьцілі.

– Гэта ж з-за цябе забраў розум у нашай дачушкі Лядашчык! – загаласіла Зайка. – Каб ня ты, яна б выйшла за Вепра, і дзеці былі б ужо!

– Ідзі ў храм Перуна і сатвары крывавую ахвяру, можа, дачка наша ачуняе ад ляку! – басіў прыгнечаны і хмурны Баравік.

Няжыла чуў – Рэчыца бесьперапынна хадзіла пад дзьвярыма, якія падпіралі бацькі, і слухала, аб чым гаворка. Калі ж ён узвысіў голас і паклікаў яе, яна азвалася такім страшным, нутраным выцьцём, што ён выбег з хаты і нёсься па вуліцы, пакуль не перацяла дых і не адняліся ногі.

Ягоныя сёстры парадаваліся вызваленьню, але ніводная не прыехала ў родную хату, каб даведацца, як жа цяпер ён там жыве: без матулі, бяз брата, толькі з двума служкамі, якія ні аб чым не пытаюцца ў гаспадара.

Не пыталіся пра тое і ў замку. Ды Няжыла адчуў: стаўленьне да яго цяпер іншае. Ён ня стаў зноў сваім. Хрышчэньне сьцяной аддзяліла яго ад сяброў, якія тады, калі гэта адбылося, глядзелі на яго ўжо як на іншага, на чужога... Гэтак жа насьцярожана глядзелі яны і цяпер. Няхай ён вярнуўся да старых багоў, раскаяўся ў сваім адступніцтве – усё роўна для іх ён быў ужо пярэваратнем.

– Княгінінай літасьці захацеў, ды не дачакаўся, га? Памерла яна, га? – захіхікаўшы, аднойчы сказаў яму Спор, княскі ключнік. – А мы як жылі, так жывем. Чужых багоў не шукаем…

Нестар, сустрэўшыся з ім у калідоры замку, моўчкі прайшоў міма, і ён, Няжыла, пабаяўся нешта яму казаць, нават павітацца. Ён ведаў: сьвятар пастаянна прыходзіць у вязьніцу, ён дапамагае Кумцу. А вось ад яго, Няжылы, варта не бярэ нічога для перадачы брату, хаця ён родны для яго, у адрозненьне ад гэтага чужога чалавека. Па начах ён падбіраўся пад акенца да Кумца і слухаў, спадзеючыся, што брат будзе на яго сварыцца, што зломлены пакутамі, ён абярэ той жа шлях, што і старэйшы. Жыць, а ня гніць у сырым падвале, – вось чаго жадаў ён Кумцу. Але той перастаў азывацца на імя "Кумец" і адгукаўся толькі на "Антон", а гэтым імем якраз і не хацеў яго называць Няжыла. Аднак брат на яго не сварыўся, гаварыў з ім мякка, толькі неяк адрачона, нібы яны былі ў розных сьветах, і ён глядзеў на ўсё тут як бы зьверху...

І самым дзіўным для Няжылы было тое, што ён, прakляўшы хрысьціянства і адрокшыся ад яго, раптам стаў як бы відушчым на ўсё, што адбывалася наўкол. Укленчваў на маленьнях у храме Перуна, Лады, Вялеса, але толькі ў жраца Лойкі адчуў гарачую, непадробную любоў да бога, якому той маліўся. Ашаламляльным стала раптоўнае адкрыцьцё, падказанае збалелай душой: Бурыла маліўся Вялесу так, нібыта гаварыў з ім пра сябе і прасіў толькі для сябе! Пакуты абвастрылі зрок і слых Няжылы, ён адчуваў фальш там, дзе раней бачыў веліч і прыгажосьць, адкрыўшы ў людзях, што адзін можа быць з мёдам, а другі – з чамярыцаю... Ён лавіў амаль незаўважныя для іншых інтанацыі ў голасе вялікага князя, калі той гаварыў пра язычнікаў, і адчуваў: Альгерд ненавідзіць сваю залежнасьць ад жрацоў і прагне ад яе выбавіцца. Вялікі князь моцна пакутуе яшчэ ад нейкага цяжару, і таксама хоча ад яго выбавіцца. Можа, ад дзяўчыны, пра якую ўсе шэпчуцца, што яна, як толькі пройдзе год, можа стаць новай жонкай Альгерда. І Няжыла ўзгадваў, як вялікая жрыца Нара на вялікім княскім прыёме, пры ўсіх, палезла сваімі доўгімі кіпцюрамі за каўнер ягонаму брату, нібыта дакладна ведала, што там – крыж. Адкуль жа ведала? Хто мог ёй сказаць? І хто так напалохаў і скруціў Рэчыцу, якая стала сьведчыць супраць яго чорную няпраўду?

Тады зразумеў, што далей так жыць ня можа. Яго думкі ўжо не вілялі хвастамі, яны сталі рашучымі і цьвёрдымі, так што ўжо ня трэба было бясконца выбіраць нарэшце, чаго ж ён хоча, з кім і чым зьбіраецца жыць.

У адну доўгую ноч, калі цурчала за вакном сакавіцкая вада і туман ахутваў дрэвы тоўстым белым покрывам, ён адчуў: яго шлях разам з Кумцом. Толькі з ім, бо там, дзе малодшы брат, там няма Няпраўды. Яна – тут, з ім і вакол яго...

## ЗМУШАНАЕ ПАДАРОЖЖА

Круглец па загадзе князя скакаў у Хайдэльберг, і ажно тры дружыньнікі суправаджалі маладога баярына ў гэтай ганебнай для яго паездцы. Пастараўся Бурыла: ён паказваў, што ані не давярае баярыну і што яго, як таго вераб'я на мякіне, не правядзеш.

Малады вой усяляк стараўся затрымаць сваё падарожжа: у адным з селішчаў, толькі яны ад'ехалі, дружыньніку Ратшы давялося спыніцца і папрасіць усіх разам з ім сатварыць маленьне Перуну альбо вярнуцца: падкова ў ягонага каня зьляцела, і гэта было дрэннай прыкметай, азначала, што багі ня дужа падтрымліваюць падарожнікаў. Для іншых дру-

жыньнікаў гэта стала неспадзяванкай, таму што, калі яны адпачывалі, падкова была, здаецца, надзейна замацаваная на конскім капыце. У другім селішчы ў дружыньніка Аўса схапіла жывот, ды так, што ён качаўся паўдня, ня маючы сіл падняцца.

Толькі Круглец ведаў, што і ў першым, і ў другім выпадку срэбныя абрубкі – рублі, употай сунутыя ім мясцоваму кавалю і гаспадыні карчомкі, забясьпечвалі час, за які сястра Уна магла зьнікнуць з Хайдэльбергу, бо пасланьнік ужо ляцеў недзе наперадзе іх, сьпяшаючыся з благой весткай. Брат жа быў удзячны Альгерду, які раскрыў і яму тое, што ўжо ведама Бурылу, і ў той жа час крыўда на вялікага князя грызла яго душу. Няўжо той ня мог ухіліцца ад прапановы Бурылы, абараніць сына свайго былога сябра? Ён мусіў збавіць ад такой нечуванай ганьбы: уласнымі рукамі аддаць сваю сястру таму, хто, як певень, патопча яе, а потым аддасьць назад, няхай пасьля дзяўчына знойдзе сабе адпаведнага, такога ж знатнага, як яна, жаніха. Круглец расказаў пра тое, як дамагаўся Бурыла Уны, аднак гэта не зрабіла на князя аніякага ўражаньня: кожны ў гэтым сьвеце жадаў нечага, і чым вялікі жрэц адрозьніваўся ад іншых? Прыгажуня, якую бяруць у храм для ўласнай хоці – гэта ўсё ўжо было старое, як сьвет. І не яму, Альгерду, дбаць пра чысьціню жрацоў, тым болей змагацца з Бурылам. Ён зьмяце Бурылу і сваіх ворагаў ня зараз. Ня зараз...

Цяпер важна, каб вялікі жрэц даў згоду на новы паход, які рыхтаваўся ў Вільні супраць татар. Каб ягонае маленьне было ўдалае, бо ня будзе добрых знакаў ад багоў – ня будзе духу перамогі ў вояў, а гэта абавязкова прывядзе да паражэньня. А яму, князю, патрэбныя перамогі. Патрэбна ўмацоўваць Княства і павялічваць яго. Якраз ён спадзяваўся, што Круглец таксама заўдзячыцца: яго ж папярэдзіў аб небясьпецы для Уны. Захіляць сабой баярына ад Бурылы вялікі князь не зьбіраўся – занадта гонару для маладзёна, і хто ён такі, урэшце, супраць усемагутнага жраца?

Круглец засяроджана скакаў і скакаў па вясновай, часамі яшчэ вязкай дарозе, з кожнай новай вярстой набіраючыся духу супраціву. Не прывязе ён сястру, нават калі яе знойдуць у Хайдэльбергу, нягледзячы на пасланца! Ён справіцца з гэтымі малойцамі, і яны ніколі ня вернуцца назад. Магчыма, ня вернецца ў Вільню і ён – нездарма да сядла каня была прымацаваная скураная торба. У ёй – мяшэчак з дынарамі і срэбнымі брускамі. А на ягоным поясе ў капшуку з барановай машонкі, там, дзе звычайна знаходзіцца крэсіва – залатыя манеты з Рыму, якія бацька прывозіў са сваіх паездак. Казаў: “Невядомае нам будучае, але заўсёды выручаюць гэтыя кругляки. Можа, і вам, дзеці, спатрэбяцца”. І вось спатрэбіліся, як спатрэбіліся Уне яе залатыя ўпрыгожаньні і пярсьцёнкі дзеля таго, каб зьбегчы з Вільні і нават зьехаць у далёкую Нямеччыну, схавацца ад грознага перасьледу.

“І ад яго, свайго брата”, – кальнула думка. Ён не абараніў яе як сьлед, не супраціўляўся вялікаму жрацу, гатовы быў нават саступіць, бо паспрабаваў яе ўгаворваць, каб сястра засталася. Але яна не захацела быць пацешкаю для старога памаўзьлівага мужчыны, выбрала небясьпеку, дарогу і невядомасьць.

Аднойчы, калі яны толькі пакінулі карчму-заначоўку і ўвайшлі ў малочную халадэчу вясновай раніцы, Круглец зацеміў, што конь Ратшы, пакуль той папраўляў стрэмя, пільна ўнюхваецца ў гаспадара ды круціць

галавой. Астатнія коні паводзілі сябе як звычайна. Адразу ўзгадалася, што казаў у такім выпадку дзед: любячы коней больш чым кагосьці з людзей, ён ведаў усе іхнія павадкі і часам дзяліўся з унукамі сваімі ведамі. "Калі конь унюхваецца ў гаспадара больш, чым звычайна, можаш быць упэўненым: коньнік памрэ ў бліжэйшыя дні", – усплылі аднекуль з далечыні дедавы словы. Хлопец адразу наструніўся, усё ў ім затрапятала ад прадчуваньня небясьпекі, няхай яна і скончыцца сьмерцю толькі аднаго. Чатыры коньнікі, няхай сабе яны і ўмеюць спраўляцца з мячамі, усё ж ня надта моцны баявы атрад. Хаця апошнім часам дарогі і ў Княстве, і ў Чэхіі, і ў Нямеччыне былі больш бясьпечнымі, усё ж у лесе маглі іх перастрэць рабаўнікі. Толькі яны і несьлі небясьпеку. На заставах і каля брамаў падарожнікі паказвалі ахоўную грамату Альгерда, што давала ім усе тыя правы, якія давалі ў Княстве ахоўныя граматы іншаземцаў. Што ж такое магло іх чакаць у сёньняшняй дарозе?

– Трэба быць надта асьцярожнымі, – пад'ехаўшы да Ратшы, папярэдзіў ён. Але каржакаваты, з магутнымі, як вывараныя карані плячыма дружыньнік толькі зьняважліва засьмяяўся:

– Бачу, пан калоціцца ад страху. Колькі прашлёндалі – усё было спакойна. I далей так будзе. Ці мо пану Лядашчык паказаўся?

– Не, я самую Марэну ўбачыў! – пакрыўджана-злосна адпарыраваў Круглец. Авёс адразу запляваўся, замахаў рукамі:

– Чур мяне захавай! Каб яна на нас забылася як надаўжэй!

– Мяне! – перадражніў яго Ратша. – За ўсіх тады прасі, гарбуз печаны! Ды не калаціся! Нас ахоўвае сам Вялес, нездарма вялікі жрэц атрымаў ад яго добры знак.

– Але мы ўжо далёка, тут жывуць чужыя багі, – нясьмела запярэчыў яму трэці дружыньнік – кучаравы, русы, з залацістым пушком над вуснамі Трэпет.

А Круглец насьмешліва паддаў жару:

– Я Стрыгу, як цябе, бачыў, вунь там, за хатай, яна з цябе вачэй не спускала!

Відавочна ўстрывожаны, Ратша дакрануўся да грудзей, дзе на абярогу быў металічнай паласой навараны знак агню, зашаптаў словы замовы.

Ды толькі гэта не дапамагло.

Вясновы дзень, цяплейшы, чым на радзіме, з жоўтымі вочкамі дзьмухаўцоў і маладым пахкім лісьцем, з вільготным пяском на капытах коней і на ботах коньнікаў яшчэ толькі пачынаў сваю хаду, як на падарожных абрынулася няшчасьце.

Атрад рэйтэраў*, што выпаўз з-за павароткі, спачатку не прадвяшчаў бяды. Недзе з пятнаццаць коньнікаў трусілі па дарозе роўна і амаль лянiва. Хутчэй за ўсё, гэта былі воі, што вярталіся ў горад. Круглец пакасіўся на скураную торбу, дзе ў футарале ляжаў ахоўны пергамент з малой пячаткай Альгердавай канцылярыі. Ратша паправіў на каптане знак ганца – металічны кругляк з трызубцам Гедзіміна. Авёс і Трэпет з цікавасьцю глядзелі на цяжкіх, крутагрудых нямецкіх коней, узгадваючы няхітрыя нямецкія словы, якіх яны нахапаліся пры двары і ў крамах нямецкіх купцоў.

Але нічога з усяго гэтага не спатрэбілася: пачулася гучная каманда, немцы, выхапіўшы мячы, паімчаліся насустрач чатыром коньнікам. Узь-

віўся сьцяжок наперадзе, і вільняне ўбачылі чырвоны крыж на белым полі. Гэта былі крыжакі.

Трэба імгненна прымаць рашэньне, і Ратша яго прыняў: ён рэзка зьвярнуў у лес, на пясчаную дарогу, што адгаліноўвалася ад шляху. Можна было спадзявацца, што толькі там можна, адарваўшыся ад нападоўцаў, схавацца недзе на адной з бясконцых сьцяжынаў альбо затаіцца ў гушчары. Калі б рашэньне прымаў Круглец, ён паспрабаваў бы спыніць крыжакоў, падняўшы футарал з ахоўнай граматай. Аднак, падганяючы каня ўсьлед за Ратшам, ён раптоўна зразумеў, што ў такім разе гібель напаткала б іх тут жа і неадменна: мабыць, крыжакі выдатна ведалі, што чацьвёрка вояў начавала ў горадзе, бо на ажыўленай дарозе нападаць на падарожнікаў маглі толькі яны, што не баяліся ні каралеў, ні радцаўгараджан, а толькі самога Папу.

Пазьней Круглец зразумеў, што іх перастрэлі не выпадкова. Хтосьці даклаў крыжакам пра іх. Хтосьці падказаў, што адзін з падарожных відавочна багаты чалавек. Хаця дарожны плашч ды вопратка Кругляца былі бяз срэбных фібул ды пушыстай аблямоўкі, усё ж напоі і стравы, якія ён заказваў у корчмах, дзе прыставалі на ноч, пакой, у якім начаваў, былі самымі дарагімі. Маглі нападоўнікі разважаць і так: чатырох адолець лягчэй, чым цэлы атрад. Крыжакі, калі яны ехалі ў далёкае падарожжа, часам палявалі на здабычу, бо калі і маглі паскардзіцца ў мясцовы магістрат ацалелыя, хто стане шукаць вецер у полі?

...Што і конь у яго хутчэйшы і лаўчэйшы, чым у спадарожнікаў, Круглец спасьціг таксама тут, на гэтай лясной дарозе. Разумны скакун, нібы зразумеўшы страх гаспадара і небясьпеку, імгненна, скіраваўшы паміж рэдкіх соснаў паабапал дарогі, абагнаў усіх і вырваўся наперад.

– Наперад! Хутчэй! – крычаў Ратша, і Круглец гнаў каня, заплюшчваючы вочы, калі галіны білі яго па твары, гнаў, скіроўваючы каня то ўлева, то ўправа – ажно пакуль зьнямоглы скакун ня ўпаў на калені, і коньнік, перакуліўшыся праз яго, з усяе сілы пляснуўся сьпіной аб зямлю.

Яму пашанцавала: зямля тут была мяккай, зялёны мох даўно нарасьціў на паляне пушыстае покрыва, і тонкія асінкі трапяталі па краях гнуткімі цельцамі. Ускочыўшы, Круглец прыслухаўся. Але нічога ўжо ня тупатала сьледам, не галёкала чужымі варожымі галасамі, ні сьвісьцела – нібыта ўся гэтая шалёная пагоня толькі прымроілася яму. Ён асьцярожна выглянуў з паляны на зарослую быльнягом і травой дарогу, хутчэй, сьцяжыну, з якое збочыў конь, але нікога і нічога не было ані відаць, ані чуваць і там.

Конь цяжка дыхаў, з храпы яго ішла пена. Няўжо загнаў свайго выратоўцу да сьмерці? Круглец агледзеўся, вызначаючы, ці можа быць недзе блізка вада. Можа, рэчка, а можа хоць якая калюжына дасьць каню тыя выратавальныя глыткі, што паднімуць яго з моху.

Выняў са скураных похваў корд – магчыма, давядзецца прасякаць сабе шлях праз кустоўе. Пасьлініў палец, падняў яго ўверх, каб вызначыць, адкуль вецер, і прынюхацца – ці ня пахне ён вільгацьцю. Апускаючы руку, заўважыў у кустах цікаўнае вока – імгненна кінуўся туды і ня даў уцячы клышаногаму, у сьвітцы іржавага балотнага колеру мужыку. На пытаньні той адно матляў галавой і са страхам касіўся на пояс Кумца з выявай Сварожага знаку.

– Ты хрысьціянін! – здагадаўся Кумец і загаварыў да чалавека па-

нямецку. – Ня бойся, я не зраблю табе благога. Мне патрэбна вада, для яго, – паказаў на каня і дадаў: – Я заплачу, ня бойся.

Але чалавек яшчэ болей заматляў галавой, углядаючыся ў вочы Кругляца, як бы штосьці спасьцігаючы ў іх.

– Хай твой конь астыне, – сказаў нарэшце скрыпучым, як бы нават і не чалавечым голасам. – Я прынясу вады, яна тут недалёка. А ты натры яму вушы вось гэтым, – ён паказаў на нейкую непрыкметную зёлачку, якую Круглец ледзь разгледзеў у траве, і зьнік, як растварыўся ў зяляніне…

– Чакай, вазьмі мех! – крыкнуў ён усьлед, але чалавек не адгукнуўся, і хлопец падумаў: а ці не прывядзе той сюды пагоню? Але чым ёй перашкодзіць? Пакінуць каня, з грузам брысьці па невядомай дарозе невядома куды, дзе яго ўсё роўна высачаць гэткія вось лесавікі? Не, ён застанецца тут і будзе змагацца да апошняга!

Конь прыўзьняў галаву, чалавечым, пранiклівым позіркам глянуў на Кругляца.

– Думаеш, кіну? Ня бойся! – хлопец агледзеўся і, нахіліўшыся над купамі травы на ўскрайку, стаў рваць сіняватыя зёлкі і націраць імі чуйныя конскія вушы, слухаючы адначасна, ці не зашалясьцяць дзе крокі альбо перагукнуцца варожыя галасы. Ды лясны чалавек зьявіўся за яго сьпіной так нечакана, што Круглец ажно здрыгануўся і ледзь ня выбіў з рук у таго бяроставы конус, у якім плёскалася вада. Конь прагна пацягнуўся да вады, ды лясны чалавек адхіліўся, спачатку памацаўшы гарачыя конскія вушы. Пальцы яго прабегліся па жываце, шыі, час ад часу спыняючыся, націскаючы на пукліны, і конь, які спачатку спуджана захроп і нават спрабаваў дастаць незнаемца капытом, сьціх і заплюшчыў вочы, нібы на яго напаў раптоўны сон. А пасьля, калі выпіў трохі вады, глыбока ўздыхнуў і як страціў прытомнасьць.

– Ён ачуняе, – праскрыпеў чалавек. – Пачакай і пасядзі побач, ён яшчэ паслужыць табе.

– Вазьмі, – Круглец працягнуў яму залаты дынарый. Чалавек спачатку адхіснуўся, пасьля твар яго загарэўся радасьцю. Ён схапіў кругляк, пацалаваў яго.

– Так любіш грошы? – зьдзівіўся Круглец.

– Дачка… я змагу забраць яе ў Шмідта, яна ў ягоным замку… за даўгі…

На каравым, нібы пасечаная калода, твары паказаліся сьлёзы.

– Хай Хрыстос паможа табе. Мне, бачыш, ён ужо дапамог праз цябе. А Шмідту не. Ягоныя госьці цябе не злавілі, а ў тых хлопцаў грошай было з дулю.

– Ты кажаш пра маіх спадарожнікаў?

– Ня ведаю, хто яны, але іх пералавілі як зайцоў.

– Дык іх усе ж дагналі! Дзе яны цяпер?

– Палеглі у Гансавым бары. Можа, іх ужо расьцягнула зьвяр'ё. А коней забралі, коні ў вас, славян, добрыя. Бачу, што і сэрцы таксама, – чалавек любоўна пагладзіў залатавік. Прадоўжыў тым жа скрыпучым, як у яловага карча ў навальніцу, голасам:

– Каб цябе таксама не пасеклі, едзь па гэтай сьцежцы. Праз паўдня яна выведзе на шлях да наступнай гарадской брамы.

Круглец азірнуўся, але нідзе ніякай сьцежкі ў накірунку, паказаным чалавекам, не пабачыў.

– Вось яна.

Сьцежка там сапраўды была. Захіленая ялінай, яна пачыналася ад самай гэтай паляны і вяла на захад. Чалавек ужо зьбіраўся нырнуць у гушчар, але Круглец яго затрымаў:

– Скажы, чаму ты мяне ня выдаў? Або... не забіў зьнянацку? Я ж бачу, у цябе нож на поясе. І дзяржальна там не такое, якія бываюць у простага селяніна…

Вочы ў ляснога чалавека ўспыхнулі, яго каравы твар асьвяціўся разумнай і іранічнай усьмешкай:

– Ты назіральны, славянін. Я не селянін, а калісьці быў ня проста рамесьнікам, а залатых спраў майстрам, і рабіў упрыгожаньні – разам з бацькам Шмідта. Бывала, разам з ім і іншымі ляснымі братамі вызваляў багацеяў па дарогах, каб набраць паболей круглячкоў, якія са сьмерда робяць сіньёра... Ды ён хітрыкамі забраў усё, што ў мяне было, і купіў сабе дом пад горадам і тытул. За тое яшчэ трэба даплаціць працэнты, вось гэты паганы корч і рабуе патроху падарожнікаў. А мяне ўзяў за лесьніка другі сеньёр, і я развучыўся гаварыць, бо ў лесе толькі зьвяр'ё, якое бывае лепшым за чалавека...

– Але ў нас ахоўныя граматы! Няўжо гэты Шмідт не баіцца самога імператара?

– Ягоныя сябры-крыжакі едуць на наступным тыдні ў Рым. У іх вялікі заступнік. А мёртвыя падарожнікі нічога не раскажуць.

– Я жывы, і я буду сьведчыць супраць твайго ворага!

– Цябе ўжо шукаюць па ўсім лесе. Ты ці ня першы, хто ўцёк. Але ж шлях твой ня скончаны, усё можа быць…

– Дык чаму ж ты ня выдаў мяне? Альбо не забіў сам?

– Таму што я стаў хрысьціянінам і раскаяўся. Таму што спадзяюся некалі ўсё ж павесіць Шмідта на сасьне ля замку. Нягледзячы на тое, што мая дачка мае ад яго байструка…

Ён павярнуўся і зьнік так раптоўна, нібы праваліўся скрозь зямлю, і адразу ж Круглец пачуў, як галёкаюць і крычаць недзе збоку, справа, гартанныя галасы чужакоў. Ён стаіўся, асьцярожна паклаў далонь на цёплую пысу свайго скакуна, каб той не азваўся іржаньнем. Пасьля, счакаўшы, пакуль крыкі аддаляцца, асьцярожна дапамог падняцца трохі ачуняламу каню і, паманіўшы за сабой, ціха, нетаропка паклыгаў па сьцяжыне.

Яліны білі Кругляца па твары, але ён не адчуваў таго, заняты няспынным цікаваньнем за кожным шолахам і скрыгатам навокал. Конь паволі ішоў за ім, і было бачна, што ён, нягледзячы на слабасьць, стараецца рухацца, нібыта добра разумее, што гаспадар ратуе яго і ня хоча пакінуць на здабычу лясному зьвяр'ю, чый пах прымушаў разумную жывёліну таксама сьцярожка ўзірацца ў захілены кустоўем шлях. Раптам коратка і зусім ціха скакун заіржаў, як бы падаючы гаспадару знак, і Круглец прыцішыў хаду, напружыў зрок, стараючыся зразумець, што ўстрывожыла жывёліну. Здаецца, вось яно! Сьвежасьсечаная галіна асіны зьнявечана хісталася ў гушчары, і там, за зеленавата-пярэстым целам пакалечанага мячамі дрэва нешта жахліва-чырвонае распырскала вакол рудыя плямы.

– Стой тут, – ціха прашаптаў хлопец і, таячыся за бярозамі і ялінамі, пачаў набліжацца да асіны.

Чалавечае цела на прагаліне відавочна ўжо скарчанела і застыла ў нежывой страшнай позе, ніцма ўткнуўшыся ў траву. Яно было ў споднім, без карзна, паса і зброі. Толькі падышоўшы, Круглец убачыў, што галавы ў цела няма – яна, сьсечаная страшным ударам, валялася непадалёку. Гэта быў Ратша. Пакутлівая грымаса на сьсінелых вуснах і зажмураныя, нібы ў перадсьмяротным жаху, вочы рабілі гэтую страшную галаву прывіднай і нерэальнай, нібы яна сасьнілася Кругляцу ў жахлівым сьне. Конь ззаду зноў коратка і жаласьліва заіржаў, быццам просячы хутчэй ісьці адсюль, і хлопец, яшчэ раз азірнуўшыся вакол, падабраў тое, што ляжала ля цела. Гэта быў выразаны з ліпы, велічыней з поўдалоні Вялес. Яго вузкія, з цяжкімі павекамі вочы пагрозьліва зірнулі на Кругляца, і адразу ж перад хлопцам паўстаў твар Бурылы – халодны і ўладны позірк, цяжкія, нібы каменныя сківіцы.

Далонь нібы ўкалола нечым халодным і ліпкім. Імгненьне ён павагаўся. Пасьля шырока размахнуўся і шпурнуў драўлянага бога ў гушчар, адкуль з крыкам выляцела нейкая спалоханая птушка. Тады Круглец асьцярожна ўзяў галаву за заскарузлыя ад крыві валасы і прыклаў яе да цела, а пасьля закідаў тое, што засталося ад Ратшы, сабраным насьпех суччом. Павярнуўся. Узяў за повад каня, пагладзіў яго па цёплай шыі, разблытаў пальцамі жорсткае скалочанае ў камякі валосьсе. Трэба было як хутчэй выбірацца адсюль, ды двое вільнян знаходзіліся недзе тут, у гэтым лесе, і бягляк ня мог проста сысьці прэч. Нельга было і адпускаць каня, ды, калі, пабрыўшы далей па сьцяжыне, стомлена выпусьціў повад, той сам пакульгаў за ім. Так і ішлі яны, ажно пакуль наперадзе не паказаўся прагал. А за ім – шлях, відавочна, той, якім яны і ехалі на захад. Тут і спыніўся ў роздуме Круглец. Недзе ў лесе ляжаць яшчэ два ягоныя спадарожнікі. Няхай сабе яны і былі яму непрыяцелямі, ды... Як жа пакінуць сваіх людзей не пахаванымі? А раптам стануць іхнія душы, не дабрыўшы да Ірыя, вяртацца і вяртацца да яго?

– Не чакай нікога, славянін, едзь, пакуль рыцары ў Дубовым гаі ля ракі, – пачуўся знаёмы голас. Хлопец зноў уздрыгнуў усім целам ад нечаканасьці, але, пабачыўшы нядаўняга незнаёмца, супакоіўся: той глядзеў з прыязнасьцю і нейкім нават захапленьнем.

– Паслухай, можа ты, як хрысьціянін, пахаваеш маіх спадарожнікаў? Я заплачу табе яшчэ, бо я наўрад ці знайду іх, – Круглец памкнуўся да запаветнага мяшэчка, але лясны чалавек яго спыніў:

– Ты мне адзін раз заплаціў за ўсё. А яшчэ даў радасьць: Ота Шмідт лаецца на ўвесь лес, бо ня можа цябе адшукаць. Я дапамагу табе, славянін. Да таго ж ты сам хрысьціянін: я бачыў, як ты кідаў ідала ў кусты.

– Я не таму...– пачаў быў Круглец, але спыніўся. І язычнікі ня кідаюць сваіх, але дружыньнікі сваімі яму не былі. Чаму ж душа яго прагла дапамагчы ім, нават пасьля іхняе сьмерці? Чаму не прымала яна Вялеса? Ня толькі таму, што драўляны бог нагадаў яму вярхоўнага жраца, ненавіснага прагавітай пажадлівасьцю, з-за якой павінен быў Круглец ехаць у далёкі сьвет і па загадзе самога вялікага князя аддаць яе ў сквапныя, учэпістыя рукі.

Нечаканы напад вызваліў яго з-пад пагрозьлівай апекі дружыньнікаў, і, калі ён жывым выберацца з лесу, стане свабодным, прадоўжыць шлях і, можа быць, нават застанецца там, у Хайдэльбергу, калі яшчэ засьпее там сястру. Бо вяртацца ў Вільню значыла аддаць сябе на суд жрацоў

альбо князя – а можа, на абодва суды, якія абвінавацяць яго ў тым, што дружыньнікі загінулі, а ён чамусьці застаўся жывым.

І, ужо выязджаючы на шырокі, высахлы за доўгі цёплы дзень шлях, ён зразумеў і яшчэ адно: гэта, несумненна, знак... Знак дапамогі ад хрысьціянскага бога. Ад таго, хто так пранікліва, нібы вызначыўшы яму будучае, глядзеў на яго ў храме сьвятой Сафіі ў Царградзе і даў яму ня толькі свабоду, але і надзею.

А гэта значыць і тое, што ён, сустрэўшыся з Унай, не застанецца ў Нямеччыне, а вернецца ў Вільню. Вернецца, каб праўдзіва расказаць пра тое, што з імі было і аддаць сябе пад ахоўніцтва таго бога, які ахвярue сабою дзеля іншых. Вось і яму трэба ахвяраваць сабою дзеля таго, каб сьведчыць ісьціну – тую, якую, па ўсім бачна, перажылі Кумец і Няжыла, і якую цяпер нанова перажыў ён сам.

## *ЗЬЗЯНЬНЕ*

Залатыя яблыкі схіляліся да ягонай галавы. Цела яблыні было зіхоткасрэбным, пералівалася, вабіла спакоем і адвечнай магутнасьцю быцьця. У ім, яблыневым ствале, на кароткія імгненьні ажывалі, усьміхаліся аблічча, чамусьці знаёмыя яму, і усеабдымнае, амаль нясьцерпнае пачуцьцё асалоды і замілаваньня ахоплівала душу, ён схіляўся перад дрэвам, а залаты яблык раптам ператварыўся ў гало і накрыў цемя, і ён паляцеў па вузкім цёмным жарале, набіраючы хуткасьць...

Лойка прыйшоў, калі затуманеная болем Кумцова сьвядомасьць трохі праясьнілася, мроя зьнікла. Тады замест вялізнага цёмнага калідора, у канцы якога зьзяла жоўта-залацістае сьвятло і клікала да сябе, пабачыў звыклыя сьцены камяніцы і адчуў, што ад сырасьці і пранізьлівага холаду валуна, да якога ён быў прыкуты заіржавелым ланцугом, нібы скамянела сьпіна, якую расьціралі чыесьці моцныя і гарачыя рукі. Азірнуўся – і тузануўся ад нечаканасьці: на яго глядзелі сінія, па-дзіцячы наіўныя і пастарэчы мудрыя вочы вялікага жраца Сварога. Доўгая апранаха з белага сукна, падбітая белай аўчынай, рабіла яго шчуплую постаць велічнай, а высокі лямцавы каўпак з вышытай над ілбом залатой кветкай яшчэ болей узвышаў яго над вязьнем, амаль скручаным у стручок ад начной сырасьці.

– Нашто ты тут, вешчы старац?

– Ты нават не захварэў, хаця закачанеў, як калядны гусь на кірмашы, – са зьдзіўленьнем і нават нейкім абурэньнем прагаварыў той, працягваючы расьціраць застыглую сьпіну вязьня.

– Я не адчуваю холаду.

– Гэтага ня можа быць. Няўжо праўда?

– Ну ведама ж, я кажу як ёсьць.

– Тады раскажаш мне, як табе ўдаецца ашукаць Зюзю.

Кажучы гэта, жрэц даволі бадзёра тузаў лапаткі вязьня, і неўзабаве той адчуў, як цяпло пацякло па целу, вогненнымі струменямі ахінаючы плечы. Жрэц адступіў, выцягнуў са скуранай торбачкі невялікі глячык, паднёс да вуснаў Кумца.

– Пі!

Пітво было з мядовым смакам, ад яго канчаткова сагрэлася схуднелае і ад таго чуйнае да холаду Кумцовае цела.

– Я хацеў бы выратаваць цябе. З вашым бацькам мы разам хадзілі ў

школку пры храме, пакуль вешчыя старцы сярод усіх высакародных вучняў не абралі мяне для служэньня Сварогу.

– Памятаю, што бацька сапраўды казаў, што ты і тады, яшчэ дзіцем, мог бачыць Бога... багоў і пытацца ў іх пра будучае.

– Ну вось бачыш, ты і зараз не цураешся нашых багоў.

– Я сказаў так па старой завядзёнцы. Ня буду ж я называць іх...

– Параджэньнем д'ябла, чорнай сілай, як кажа табе Нестар? – падхапіў Лойка. – Ня бойся спрачацца са мною, тым больш што я прыйшоў сюды, каб пагаварыць з табой і дапамагчы табе.

– Як майму брату? Я чуў, што яму зараз даводзіцца несалодка.

– Табе пра тое сказалі людзі, што тоўпяцца каля акенца гэтай цямніцы? Сёньня іх разганяла варта. Іх сапраўды прыходзіць сюды ўсё болей і болей.

– І гэта трывожыць жрацоў? Ці вялікага князя? Ці іх усіх разам?

– А калі б ты сам быў вялікім жрацом, няўжо ты глядзеў бы спакойна, як чужая, бязьлітасная сіла прыходзіць сюды і разбурае ўсё, на чым трымаецца наш народ?

– Яна не бязьлітасная, а міласэрная, як нішто на зямлі.

– Праўда? А што ты скажаш пра кіяўлян, якіх забівалі тысячамі, каб яны забыліся на сваіх багоў? І Уладзімір, які рабіў гэта, названы царквою вялікім. Ты ж супраць таго, каб у чалавека адбіраць жыцьцё, ці ня так? У аднаго! А там быў не адзін! Ці, можа, Нестар табе таго не расказваў?

– Я ведаю пра тое. Я чытаў у скрыпторыі сьпіскі з летапісаў. Але я веру сабе і сваім пачуцьцям. Хрысьціяне не забілі тут, у Вільні, ні аднаго чалавека. І чаму я павінен верыць таму, што пісалі незнаёмыя мне людзі? Я ня ведаю, ці пісалі яны праўду, ці ілгалі, як ілжэм сёньня і мы – ілжэ нашая ўлада, нашыя жрацы, ілгуць людзі адзін аднаму. І іх ня стрымлівае ні Пярун, ні Вялес, ні Дажбог, ні Мокаш.

– Ты думаеш, іх стрымае Хрыстос?

Кумец паварушыў плячыма, устаў. Нага, на якой бразгаў цяжкі ланцуг, пакутліва ныла.

– Ці ня мог бы ты, вялікі жрэц, паклапаціцца, каб на мне хаця б у час нашай размовы раскавалі кайданы?

Лойка ўскочыў, затупаў нагамі:

– Які ж я забыўлівы! Гэта, відаць, праклятая атрута! Князь дазволіў мне прынесьці табе добрай ежы, а зараз цябе вызваляць ад кайданоў.

Ён пляснуў у ладкі, і за дзьвярыма каморкі пачуліся крокі. Отрак увайшоў з ладнай торбай, азірнуўся ў недаўменьні: у вязьніцы, апроч саломы ды ланцуга, не было нічога. Ён паклаў торбу на падлогу, выйшаў і неўзабаве прынёс дошку і два сухія пянькі, з якіх зрабіў нешта накшталт стала, дзе расклаў прынесенае: хлеб, сыр і мёд, яйкі і вялікі кавалак вепручыны. А яшчэ гляк квасу, ад якога ў вільготнае, з цьвільлю, паветра ўварваўся сьвежы і чысты духмень мяты. Вязень адпіў крыху квасу, сеў на салому сьпіной да ежы і жэстам прапанаваў Лойку таксама сесьці на падлогу. Отрак ускочыў спалохана, скінуў з сябе карзно і беражна паклаў на спарахнелыя сьцяблiны. Лойка апусьціўся побач з Кумцом, яшчэ раз прапанаваў яму падмацавацца.

– Баюся, што пасьля вечнай рэдзькі ды гароху я спруцянею ад гэткае раскошы, – усьміхнуўся Кумец. – Ведаеш, вялікі жрэц, я ўжо часам прымушаю сябе есьці. У мяне ўжо няма той прагавітасьці і асалоды, з якою

я некалі піў чырвонае грэцкае віно, еў прысмакі. І мне дзіўна ўяўляць сябе таго, ранейшага, калі толькі зараз, у цямніцы, я адчуў сапраўдны смак жыцьця і яго бязьмерную прыгажосьць.

– Хрысьціяне адмаўляюць само жыцьцё! Самы вялікі і страшны іхні грэх у гэтым адмаўленьні! Калі ўсе стануць жыць як манахі – што застанецца ад людзей? Хто будзе ўзносіць маленьні, калі перавядзецца ўвесь чалавечы род?

– А ён і так вось-вось перавядзецца. Чарната апаноўвае сьвет. Мы ідзём ня шляхам праўды, дабрыні і спагады, а нянавісьці, хцівасьці і зайздрасьці. Людзям няма выратаваньня, апроч як прыняць закон ахвярнасьці, што даў нам праз Хрыста Усявышні. Усяго дзесяць законаў! Яны такія простыя – і такія неверагодна цяжкія! А што прапануе сёньня язычніцтва?

– Ты кажаш – сёньня. Так, сёньня і язычніцтва ўжо не дасканалае. Але і ў ім жыве спагада, і галоўнае – у ім радасьць жыцьця, паўната чалавечага існаваньня і пакланеньне прыгажосьці прыроды!

Яны сядзелі на гнілой саломе, гаварылі і спрачаліся. Нясьмелы прамень яшчэ неакрэплага сонца паволі поўз па сьцяне, і Лойка зноў адчуваў бездапаможнасьць – тую самую, з якою ён думаў пра будучае, пра жрэчаства, якое пакуль што вяло народ па духоўнай сьцяжыне, але непазбежна павінна было страціць уладу і магутнасьць, таму што даўно страціла глыбінную чысьціню сапраўдных ведаў і сувязі з Небам. Ён ведаў, што скажэньне ісьцін, дадзеных некалі сёньняшняй расе чалавецтва, даўно перасягнула ўсе межы, але бачыў, што і новае вучэньне, дадзенае людзям трынаццаць стагоддзяў таму, ужо таксама абрасло скажэньнямі, разьдзялілася на дзьве вялікія галіны, што варагуюць паміж сабой. Вось і крыжакі лезьлі на зямлю Княства, даказваючы, што тут жывуць ня толькі язычнікі, але і несапраўдныя хрысьціяне, якіх таксама трэба перахрышчваць. Дзе ратаваньне?

І яму цяпер хацелася выратаваць хоць гэтага – чыстага і наіўнага ў сваёй новай веры хлопца. Ён бачыў і адчуваў яго. У ім было сьвятло, была сіла любові і гарачага перакананьня ў сваёй праўдзе. І гэта было самае галоўнае. Толькі гэта і магло ўратаваць сьвет. І жрэц шкадаваў, што ад язычніцтва адышлі і гэтае сьвятло, і гэтая любоў, бо ён, Лойка, не адчуваў такога ні ў кім, з кім сустракаўся штодня на набажэнствах, углядаючыся найбольш у маладых.

– Бачу, гэта непазбежна: цябе павесяць на сьвяшчэнным дубе, – сумна сказаў ён у канцы пятай гадзіны іхніх гарачых спрэчак. – На вялікай радзе я ня змог цябе абараніць, ды гэта і не дало ніякіх вынікаў. Цябе магла б уратаваць хіба Нара альбо ейная сястра Дзівейна. Не для захаваньня твайго жыцьця, не! А хаця б дзеля таго, каб не азмрочваць вясельля нашага гаспадара. Але Нара чамусьці асабліва ненавідзіць цябе. З-за гэтай нянавісьці, мабыць, зламала лёс і твайму брату. Ды і вясельле вялікага князя пакуль што ня надта зладжваецца…

Кумец здагадвўся, у чым прычына таго, што вялікая жрыца прысьпешвала з ягоным пакараньнем і сачыла за кожным крокам Няжылы, які атрымаў свабоду. І ён шкадаваў яе, як і ўсіх, хто загнаў свой бесьсьмяротны дух у твань зайздрасьці і помсты, хто ненавідзеў бліжняга і прагнуў сьмерці. Цяпер ён ведаў, што нішто не заканчваецца са сьмерцю, а наадварот – толькі пачынаецца: заблытваюцца ніты лёсаў, зацягваюцца вузлы будучых сутыкненьняў.

– Адкуль ты пра гэта дазнаўся?!

Лойка не хаваў зьдзіўленьня. Глядзеў на Кумца, шырока раскрыўшы вочы.

– Хто адкрыў табе жрацовыя таямніцы? Хто расказаў пра няспыннасьць і несьмяротнасьць жыцьцяў у плыні часу? Хрысьціяне ведалі тое, але іх прымусілі забыцца, і Нестар ня мог табе расказаць пра Калачакру!*

– Я нічога ня ведаю пра кала... Калачакру. Але я адчуў гэта, калі стаяў ля срэбнай яблыні з залатымі яблыкамі.

– Ты быў у Сварзе?* Ты стаяў ля Дрэва Жыцьця? Але гэта дуб, сьвяшчэнны дуб, а ня яблыня!

– Я ня ведаю ні пра Дрэва Жыцьця, ні пра гэтую... Сва...сва... я кажу толькі пра тое, што бачыў...

Лойка ўзьняўся і ва ўсе вочы глядзеў на маладога хлопца. Было відно, як дрыжаць у яго вусны.

– Над табой зьзяньне. І гэта сьведчаньне, што ты быў т а м.

– Пра што ты, вялікі жрэц? Дзе – там?

– Ты быў т а м, і вялікія багі дазволілі табе дакрануцца да Дрэва, хаця ты хрысьціянін! Нават я... я, які... Значыць, канец жрэчаства зусім блізка!

Доўгімі гнуткімі пальцамі ён закрыў твар. Отрак вытарашчыў вочы, ня верачы ва ўбачанае.

Вялікі жрэц плакаў.

## *СУМНЕНЬНІ*

– Я змушаны лічыцца з хрысьціянскім сьветам, – казаў Альгерд, седзячы ў пакоях вялікага жраца Бурылы і назіраючы за тым, як разыходзіцца віленскі люд пасьля гуканьня Вясны. Яно і сёлета было, як звычайна, бурлівым і разгульным. Пачаўшыся з берагоў Вяльлі, паступова перамясьцілася ў храм Вялеса і скончылася, як заўсёды, ахвярапрынашэньнем. На гэты раз ахвяраю стала прыгажуня Сойка, дачка віленскага гандляра Скора. Альгерд быў запрошаны на храмавы абед у гонар Вясны, пасьля чаго разам з вялікім жрацом яны прайшлі ва ўнутраныя пакоі. Вялікі князь адзначыў, што па ўбраньні жытло жраца не саступала вялікакняскім палатам: чырвоны аксамітавы з залатымі кутасамі абрус на стале, дарагая масіўная курыльніца пад выяваю Сварога ў куце, танюткі, нібы сатканы з туману, покрыў над ложам...

Бурыла гаварыў, як заўсёды, разважліва і спакойна, нібы ўбіваючы цьвікі ў дошку. Аднак пачуваўся ён разгубленым. Заўсёды і ва ўсім згодная з ім Нара цяпер рашуча запатрабавала хутчэйшай сьмерці Кумца. Аднак сьпяшацца з тым не выпадала, яшчэ ня ўсё было адыграна, і жыцьцё маладога прыдворнага магло спатрэбіцца для далейшай гульні. Ужо было відавочна: вялікі князь выбера толькі нешта адно з таго, чаго хацелі жрацы: альбо вясельле з язычніцай і сястрой вялікай жрыцы, альбо пакараньне новаабвешчанага хрысьціяніна і яго брата. Здарылася тое, чаго ніхто не чакаў: Кумец, якога перавялі з княскай турмы ў вязьніцу, дзе ўтрымліваліся злачынцы супраць рэлігіі, раптам набыў красамоўства і стаў прапаведаваць новае вучэньне! Людзі прыходзілі пад вязьніцу, разьбівалі сьлюдзяное вакенца на каморцы, дзе пакутаваў новы прапаведнік, і ўрэшце там зьбіралася столькі народу, што жрацы не маглі даць таму рады. Аднак забіць яго якраз зараз не выпадала. Новае вясельле

князя было, на думку Бурылы, больш важкім – яно давала апору жрацам унутры замку.

Трэба было, аднак, абаперціся на рашэньне вялікай рады жрацоў.

Дамаўляючыся аб тым, першы раз адчуў Бурыла, што ўплыў яго не такі непарушны, якім здаваўся зусім нядаўна, а якраз даволі хісткі: Нара настойвала на сваім, а ён доўга даказваў вялікай жрыцы згубнасьць пасьпешлівага рашэньня і ўпершыню крычаў на гэтую натурыстую, капрызную жанчыну. Нават пастрашыў, што даможацца яе выгнаньня з храму Лады.

– Няўжо ты ня хочаш, каб твая сястра стала вялікай княгіняй?! – роў Бурыла у шаленстве. Але тая ўперлася, як наравістая цёлка:

– Альгерд усё роўна ажэніцца з ёю, я бачыла, як падзейнічалі на яго чары. А сьмерць Кумца і ягонага брата стане нашай канчатковай перамогай!

А пасьля, не ўступіўшы ні на каліва, яна прамурлыкала, расьцягваючы словы і ўсьміхаючыся сваёй чароўнай усьмешкай, за якой (ён добра ведаў гэта) стаялі чыясьці сьмерць і прыніжэньне:

– А ты сам, вялікі жрэц, не баішся страціць сваю высокую пасаду?!

– Што?! – захлынуўся той ад абурэньня і гневу. – Гэта ты кажаш МНЕ?

– А ты палічы сам, хто цябе падтрымае, калі я адхілюся ад цябе хоць на шчопаць?

Бурыла імгненна пралічваў: яму абавязкова будуць процістаяць ня толькі Лойка як жрэц галоўнага ў Вільні сьвяцілішча і тры з сямі вешчых старцаў, але і жрацы Мокашы, а таксама яшчэ галава сьвяцілішча Сьвятарога і трох балцкіх капішчаў, даволі ўплывовых у Вільні. Бурыла быў сам у тым вінаваты: некалькі апошніх гадоў менавіта ягоныя прапановы пераважалі над іншымі, і незадаволеныя тым жрацы, па ягоных зьвестках, гатовыя былі нарэшце даць адпор. Да таго ж у балтаў былі і свае намеры наконт вялікай княгіні – і яны не зьбіраліся на гэты раз саступаць вярхоўнаму жрацу Перуна.

І яго грызла шалёная злосьць: так паверыў у сваю ўладу над Нарай, так неабачліва згадзіўся на ўзвышэньне гэтай дзеўкі Дзівейны! Ды назад, як той рак у Вяльлі, не папрэшся. Замнога намаганьняў і інтрыг укладзена ў справу. Але Дзівейна – гэта перш за ўсё тая ж Нара! І, неймаверным намаганьнем скарыўшы свае пачуцьці, доўга ўводзіў ёй у вушы, што пакуль што варта патрабаваць ад Альгерда толькі аднаго – новай жаніцьбы. Трэба на яго націскаць усёй радай жрацоў, іх аднадушным рашэньнем, супраць якога вялікі князь хутчэй за ўсе ня пойдзе. А вырываць ад яго зараз яшчэ і згоду на недкладную сьмерць Кумца і Няжылы – значыць даць у рукі гаспадара той козыр, які хітры і выверлівы вялікі князь абавязкова выкарыстае.

Так яно, зрэшты, і адбылося. Альгерд, як адчуўшы ўсе гэтыя мітрэнгі (а можа, і добра ведаючы іх), ставіў неадменную ўмову: альбо пакараньне, альбо вясельле. Пры тым нібыта шчыра сьведчыў гатоўнасьць быць разам са жрацамі, ды і яны ж павінны пайсьці насустрач!

– Мне трэба лічыцца і з папам, і з суседзямі, якія ўсе спрэс хрысьціянскія краіны, і таму… таму я згодны пакуль што ў першым: мы пакараем гэтага… прапаведніка. Да канца жалобнага па Марыі году яшчэ ёсьць час. А зараза, аб якой вы, жрацы, мне штодзень гаворыце, сапраўды існуе. Яе трэба выпальваць…

Бурыла нутром адчуваў: вялікі князь, згаджаючыся з імі ў адным, тым аддаляў іншае рашэньне, бо яно магло падарваць давер да яго Папы і Цьверы. А між тым час працуе на вялікага князя, умацоўвае ягоныя пазіцыі ў Вільні. І праз тыя паўгода, якія засталіся да сканчэньня жалобнага тэрміну па княгіні, ён прыдумае нешта іншае. І – зноў вывернецца. Але што рабіць?

Бурыла настойліва дамагаўся канчатковага рашэньня.

– Я прасіў бы цябе, вялікі гаспадар, на гэтым тыдні ўсё ж абвясьціць Дзівейну тваёй нявестай. Заручыны мы правядзем каля сьвяцілішча Перуна, пасьля замацуем іх ахвярай Вялесу. Гэтым ты супакоіш прыхільнікаў старажытнай веры. А іх болей, значна болей, чымся хрысьціян!

– Пакуль што!

– Не кажы так! Бо прамоўленае Слова валодае сілай, яно можа павярнуцца дзеяй.

Трохі памаўчалі. Бурыла зрабіў знак слузе, той даліў у кубак вялікага князя гарачага адвару сьвятаяньніка.

– Мы падтрымлівалі цябе заўсёды. Нават насуперак запавету Гедзіміна...

– Я добра плачу за вашу падтрымку. Так, вы аддалі яе мне, а ня брату Яўнуту. Затое ж і людзі ў Княстве ідуць у старадаўнія храмы, а не ў царкву...

– ...нягледзячы нават на тое, што твой і наш вораг прапаведуе ім нянавісьць да абаронцаў нашага людства і што ты не загадаў вырваць яму язык, – дагаварыў Бурыла.

– Я ўважаю тваю просьбу, але ў хрысьціянскім сьвеце немагчыма сумяшчаць сьмерць і заручыны. Пачакайце. Час церпіць. І больш не хачу пра гэта!

Вялікі князь зноў перахітрыў, перамог яго! І ад таго лютасьць расла і расла ў сэрцы вялікага жраца. Ён апусьціў вочы, каб Альгерд не прачытаў у іх нянавісьці. Няўжо, упершыню за доўгія гады, улада пачынае высьлізваць з ягоных рук? Але што здарылася? Чаму людства бяжыць да цямніцы, дзе гаворыць Кумец? Хрысьціянства было тут здаўна, яго прывозілі купцы і з ім прыязджалі сюды ўжо шмат гадоў таму вялікія княгіні, яго спавядалі нашчадкі полацкіх князёў, што атабарыліся тут пасьля выгнаньня княскай дынастыі ў Візантыю. Яно не было такім небясьпечным, як зараз. І можа, Нара больш праніклiва адчувае: вінны ня толькі час, але і гэты прыдворны, які быў аблашчаны і Гедзімінам, і Альгердам, але які здрадзіў ім усім! Ён ня словамі, а сваім уласным жыцьцём прабівае ў магутнай сьцяне адтуліну, праз якую немінуча ўвойдзе вораг. І гэты... Круглец... таксама! І ён хрыпата прашаптаў:

– Ня можаш ажаніцца – затое можаш пакараць хрысьціянаў! Дай нам павесіць іх на самай магутнай галіне сьвяшчэннага дуба – таго, што ў Перуновым гаі!

І спакойна, нават з нейкім шкадаваньнем да яго лютасьці прамовіў вялікі князь:

– Гэта вы, жрацы, вынесьлі ім прысуд. Я толькі замацую яго вялікай гербавай пячаткай, і хай гэта дае вам дадатковую моц у вачах вільнян. Мы ж уладарым разам, вялікі жрэц, ці ня так?

## ВЯРТАНЬНЕ

Пахкім сіняватым дымком цягнула ад курыльніц па кутках залі, ад чаго яна нагадвала паляну, зацягнутую лёгкім ранішнім туманам. Язычкі сьвятла ад лучынаў у срэбных зажымах матляліся па сьценах, размаляваных кветкамі. Маёлікавыя ўстаўкі на падлозе пераліваліся, успыхвалі, калі ўспыхвала лучына.

У залі ішло баляваньне. Дубовыя сталы гнуліся пад цынавым і срэбным посудам.

Ляталі над галовамі слуг вялізныя падносы з мядзьвежынай і вепручынай, тарэлы са смажанымі лебядзінымі тушкамі, паліваныя гаршкі з рэпай, рэдзькай і мочаным гарохам, глякі з квасам і медавухай.

Сівы лірнік сядзеў ля печы ў куце. Печ, з яе полымі трубкамі-кафлямі, падобная да вялізнага вожыка, дыхала цяплом, і лірніку было ўтульна ля яе, таму яго пальцы борзда перабіралі струны, а надтрэснуты, ды яшчэ моцны голас запаўняў залю.

Сьпяваў ён пра маладую дзяўчыну, што свой вяночак кінула ў Дунай, і, стараючыся яго злавіць, патануў малады вой, які вяртаўся дадому да маці і бацькі. Доўгая гэтая балада заканчвалася словамі, якімі хлопец перад сьмерцю гаварыў з канём:

Бяжы ж ты, косю, бітай дарогай,
К таму сялу, к татульку майму.
Не кажы, косю, што я ўтапіўся,
А кажы, косю, што я ажаніўся.
Мае дружкі – круты беражкі,
Мая сваціца – рыба-плаціца…

Яго амаль ня слухалі. Толькі вялікі князь час ад часу адварочваўся ад ваяводы, які бесьперастанна штосьці яму казаў, і глядзеў на лірніка, ды пасол з Чэхіі ўважліва сачыў за гнуткімі пальцамі музыкі.

– А што з вашымі братамі-хрысьціянамі? – запытаўся папскі нунцый у кашталяна Гаштольда, асьцярожна беручы з тарэлы кавалак белага птушынага мяса.

– Жывыя яны яшчэ? Ці olla male fervet?*

Кашталян у моманты, калі пры ім гаварылі на лаціне, якую так і не адолеў за школьныя гады, пачуваў сябе разьюшаным. Але ён стрымаўся, адказаў зычліва, ды ўсё ж з ледзь прыкметнымі ноткамі зласьлівасьці:

– Абодва жывыя. Але старэйшы адрокся ад вашага бога, і літасьцівы князь дараваў яму адступніцтва. Ды вунь ён, нясе да цьверычоў бочачку з грэчаскім вінам. Бач, як стараецца! Больш за слуг працуе!

Нунцый уважліва ўгледзеўся ў твар падстольнічага, які, напружваючыся, нёс на плячы карычнева-шэрую бочку, у якой пялёхкалася духмяная густая вадкасьць. Ён акуратна паставіў яе на стол, лоўка выбіў корак і стаў разьліваць па брэцьяніцах цёмна-барвовы напой. Промень сонца на момант супыніўся ў срэбнай брэцьяніцы, зайчыкамі зайграў на скуластым голеным твары маладога хлопца, дзе вопытны італьянец яскрава ўбачыў сьляды бяссоных начэй і пакутлівага роздуму. Тужлівыя шэрыя вочы пазіралі на гасьцей, і было бачна, што думкамі той далёка адсюль і што ўвесь тлум, крыкі вітаньняў і гоман гасьцей цяжкія для яго.

– Гэта твар хрысьціяніна, – цьвёрда сказаў нунцый хутчэй сабе, чым субяседніку, але ваявода пачуў яго:

– Усё роўна спажывы для цябе, сьвяты ойча, ня будзе: яго хрысьціў Нестар, а вера яго, як вядома, грэчаская. I думаю, што не захоча Няжыла вяртацца ў цямніцу. Ён паразумнеў…

– Is feliciter sapit, qui perikulo alieno sapit*. I яшчэ: хаця ты і прыхільнік вашых багоў, аднак хачу, каб ты ведаў, ваявода: яшчэ тры з паловай стагоддзі таму нашая вера была адзінай. I Хрыстос таксама адзін.

– Пра гэта ты мне не кажы, ойча. Не хачу і слухаць пра вашыя справы. Мне люба выкрасаць купальскі агонь і танчыць у скоках.. Ось, добра, што я ўзгадаў пра скокі – нешта тут мала весялосьці!

I ваявода ўскочыў, загрымеўшы на ўсю залю:

– Ці дазваляеш, вялікі князь, проса пасеяць?

– О! Проса, проса сеяць! – разьнеслася вакол, і, калі Альгерд згодна кіўнуў галавой, мужчыны паўставалі з лаваў і, выбіраючы сабе хаўрусьніц, хутка наладзілі дзьве шарэнгі, што паўсталі адна супраць другой.

– А мы проса сеялі, сеялі, – па кіўку ваяводы пачала пані кашталянава, высокая, моцна зьбітая кабета ў сіняй аксамітавай сукні і чырвоным кабаце з залатой шнуроўкай, у белай намітцы з тонкага ўсходняга мусьліну, і жанчыны падхапілі:

– Ой, дзід Лада, сеялі, сеялі…

Мужчыны рашуча пасунуліся да жанчын, і бас ваяводы зноў загучаў, як абдымаючы ўсіх прысутных:

– А мы проса вытапчам, вытапчам!

Заціхлі ўсе размовы. Да скокаў далучаліся іншыя госьці, і хутка большая частка прысутных з захапленьнем сьпявала і танчыла, славячы багіню Ладу і Леля. Вялікі князь у рытм сьпеваў пастукваў доўгімі пальцамі па белым ільняным абрусе. Князёўны пляскалі ў далоні.

Няжылу раптам здалося, што бачыць і назірае за ўсім гэтым ён нібы з нейкай вышыні, дзе і гукі і фарбы мяняюцца, дзе з-пад звыклага праглядае нешта зусім іншае.

Яго любы брат сядзеў зараз у вязьніцы, жалезьзе ўпілося ў тонкія маладыя рукі, да струпоў нацёршы запясьці. Жоўтая сукравіца сачылася з каленяў, на якіх ён стаяў у час малітваў.

Няжылу здалося, што ён расьце, уздымаецца над усім тут і робіцца вялізным, як сама заля. Ніколі не адчутае ім, гарачае, п’янкое пачуцьцё ахапіла ўсю ягоную істоту. Ён дрыжэў, вочы яго гарэлі, а ўласны голас здаўся чужым і незнаёмым, калі на ўсю залю загаварыў ён якраз у тую хвіліну, калі змоўклі дудкі і спыніліся расчырванелыя танцоры, выціраючы рукавамі і хусьцінкамі спатнелыя твары:

– Вы, хто сьмяецца і танчыць, калі лепшы з вас усіх канае ў цямніцы...

Разгубленае маўчаньне. Раптоўная цішыня.

Няжыла ўбачыў: твар Альгерда спалатнеў, вочы сталі вялікімі і бяздоннымі. Але яшчэ болей зьмяніўся твар Бурылы: ён зжаўцеў, як быццам уся жоўць стала вокамгненна выступаць з кожнай ягонай поры.

– Вы, хто ліе чалавечую кроў на драўляныя калені ідалаў...

Ён задыхнуўся словамі. Але трэба было закончыць думку, і нехта зноў крыкнуў ягоным голасам так, што ва ўсёй вялізнай залі не засталося ніводнага куточка, дзе б ён ні прагучаў:

– Ваш час мінае!!

Вялікі жрэц коўтаў паветра, быццам яго стала не хапаць. Зьмяніліся твары і ў іншых – зьбялеў кашталян Нарбут, мабыць, адразу скеміўшы, што віну за раптоўнае здарэньне паставяць у віну яму. Зьніякавелі князёўны. Скамянелі жрацы.

Першым апамятаўся Бурыла:

– Двойчы адступніку няма месца ў княжым палацы! Мы выпрасілі табе дараваньне, але сабака ўсё роўна наступіць на ўласны хвост!

Тады Альгерд выпрастаўся, велічны і грозны:

– У цямніцу яго, злачынцу!

І гэта быў канец. Але Няжыла не змаўкаў. Ён крычаў, пакуль яму не заплішчылі рот і ня вынесьлі, сьпяшаючыся, подбегам, з залі і ня ўдарылі па галаве так, што ён захлынуўся недагаворанымі словамі, і сьвядомасьць яго не пакацілася некуды ў халодную, неспазнаную бездань...

Ды там раптоўна чорная немата зьмянілася на іншае. Яго ахутала залатое, мяккае сьвятло, закалыхала, суцішыла боль і ўдары. Ён раставаў у гэтым неспазнаным сьвятле і пачуцьці ўсеабдымнасьці і шчасьця. Там, побач, адчуў ён любага брата, пачуў ягоны голас і яшчэ іншыя галасы. Усе яны супакойвалі і лашчылі яго, як мяккія, несказальна пяшчотныя дотыкі.

– Я, відаць, у Ірыі, – пасьпеў падумаць Няжыла, перш чым раствырыцца ў гэтым залатым зьзяньні і пажадаць больш ніколі не вяртацца назад, у суровы, змрочны і няшчыры сьвет, ад якога ён адступіўся па сваёй волі.

Каб заўсёды заставацца з братам.

## *ДУБ*

Ніхто ня ведаў, колькі яму гадоў. Можа, пасадзілі яго яшчэ веліканы-вялеты, якія сышлі з зямлі, не пакінуўшы пасьля сябе нашчадкаў, таму што атруцілі зямлю іхнія звады і самі яны былі ўжо бясплоднымі. Мабыць, таму яны саджалі і саджалі расьліны і дрэвы, каб хаця тыя захавалі пра іх памяць. Садзілі ля валатовак, дзе вечным сном засыналі волаты, сутаргава сьціскаючы ў руках мячы, што іржавымі палосамі заставаліся ў зямлі. Садзілі ля рэчак, дзе абмывалі целы сваіх блізкіх і запальвалі памінальныя вогнішчы. А можа, гэта проста вецер раскідваў рудыя жалуды, разносілі іх дзікі ці сойкі.

Ён рос і рос, зьбіраючы вакол сябе маладзейшых, і сам, мабыць, ня ведаў, хто тут ягоныя сыны, хто ўнукі, а хто проста з нашчадкаў – такіх жа наравістых, магутных і стойкіх, як і ён сам.

Людзі так даўно схіляліся перад ім і столькі іхніх просьбаў сыпалася з іхніх вуснаў, што ён даўно згубіў ім лік і толькі випраменьваў і выпраменьваў на ўсіх і на ўсё вакол сваю магутнасьць і мудрасьць. І гэта яны рабілі з людзьмі цуды, аб якіх ведала цяперашняя, маладая ў параўнаньні з яго жыццём краіна: слабых уздымалі, нядольным давалі ўдачу, а бясплодным жанчынам дарылі сілы, каб тыя маглі зачаць дзіця.

Бывала, на ягоных галінах вешалі злодзеяў і злачынцаў. Але іхняя чарната была такая слабая ў параўнаньні з яго крэпасьцю і выпраменьваньнем, што ён не зьвяртаў на тое ўвагі. Часам каралі і невіноўных. Тады прыходзілі родзічы і горка плакалі пад яго кронай, і ён хутка супакойваў іх – гэтак жа, як і ўсіх астатніх. Яны аддзячвалі яму: вешалі

на галіны чырвоныя стужкі, пасы, кавалкі адбеленага лёну, клалі сыр і мёд. Гэта пасьля зьядалі людзі, што асабліва аддана служылі яму, іх навакольныя называлі жрацамі. Сярод жрацоў былі тыя, што любілі яго і самі выпраменьвалі тое, што ў людзей называецца любоўю. А былі і цёмныя, як гніль, што точыць самыя моцныя ствалы, і тады ён махаў галінамі, нібы адганяючы іх ад сябе. Але часьцей драмаў, праразаючы вяршалінай аблокі і ўзгадваючы незабыўныя часіны маладосьці і іншых, зусім іншых чалавечых істотаў. У некаторых з іх было па чатыры рукі*, насы нагадвалі гузікі, а грудзі мелі жабры, і іхнія песьні былі іншымі, чым гучалі цяпер навакол, але гэтыя ён ня памятаў, а тыя, даўнішнія, часам спрабаваў сьпяваць і сам. І толькі адзін са жрацоў Вільні чуў гэтыя песьні і нават мог паўтарыць напеў, толькі пра тое не казаў нікому, бо гэта была яго, Лойкава, таямніца.

Некалі менавіта Дуб даваў людзям ежу, бо, пакуль не навучыліся яны сеяць авёс ды жыта, малолі жалуды і рабілі з іх кашу.

У гэты красавіцкі дзень на галінах Дуба толькі зеляніліся малыя, яшчэ зусім слабыя лісточкі, бо карані пачыналі гнаць па жылах сок, які ажыўляў галіны і ўсё яго здранцвелае ў зімовай сьцюжы магутнае, неабдымнае цела. Кара за стагоддзі скамянела, па ёй лёгка было ўздымацца да самай вяршаліны, але на гэта ніхто не асьмельваўся. Дуб драмаў і амаль не адчуваў чалавечка, які караскаўся наверх і, выбіраючы патрэбную галіну, доўга вагаўся, седзячы на тоўстай галіне, з-за якой яго нават не было бачна. Дзе будзе сядзець вялікі князь і прыдворныя? Ці будзе адтуль бачнае ўсё, што адбудзецца, ці не захіляць злачынцаў іншыя галіны? І ён, з цяжкасьцю кідаючы вяроўку праз сук, спаўзаў уніз і зноўку доўга разглядаў разьмяшчэньне ствала і галін, каб, ратуй Пярун, не памыліцца і ня быць за тое пакараным самому.

Дзьве вяроўкі трэба было закінуць і замацаваць на галінах дубу так, каб уся знаць Вільні і ўсе, хто прыйдзе на пакараньне, бачылі, як будуць тузацца ў апошніх сутаргах тыя, хто насьмеліўся ісьці супраць жрацоў і, канешне, супраць вялікага князя. Бачылі і трапяталі самі.

Нарэшце на абодва прыдатныя сукі былі накінутыя пяньковыя, моцныя вяроўкі, якія ў некалькі вузлоў былі замацаваныя на Дубе. Яны не павінны абарвацца – бо тады абарвецца і жыцьцё малога чалавечка, што мацаваў вяроўкі. І ён стараўся. Ён ня думаў пра тых, каго заўтра будуць вешаць на гэтым дубе, – думаў пра дзяцей, якіх за ўзнагародныя грошы можна будзе смачна і добра накарміць. Жонцы, бадай што, удасца справіць новыя юхтавыя боцікі. І болей нічога яму на гэтым сьвеце ня трэба. Абы жыла здаровай і задаволенай сям'я. І, ратуй Пярун, каб яшчэ супрацьстаяць самому вялікаму князю ці, што яшчэ страшней, жрацам! І ён пайшоў, задаволены сваёй работай, дадому, а Дуб упершыню страсянула нейкая вышэйшая сіла, і ён загайдаў галінамі, усё яшчэ санлівы і спакойны, не падазраючы, што наступае Заўтра, якое нясе гібель і яму…

## *АПОШНІЯ АХВЯРЫ*

Перабітыя ногі не стаялі, яго падхапілі пад рукі і амаль вынесьлі з цямніцы. Кумец заплюшчыў вочы – так засьлязіліся яны на ясным кра-

савіцкім сонцы. Няжыла ішоў сам, трымаючыся за бок, прабіты жалезным прутам, якім ад душы частаваў яго падручны ката.

Іх кінулі на сялянскую фурманку, на якой вазілі гной. Парэпаны конік ледзь цягнуў калёсы, яны грукаталі па камяністай дарозе, кожны штуршок на якой аддаваўся нясьцерпным болем у скатаваных целах братоў.

Кумец маліўся. Ён пачаў гэтую доўгую, нескончоную малітву тады, калі пабачыў фурманку і зразумеў, што зямны шлях яго і Няжылы вось-вось абарвецца. І паступова боль праходзіў, яго ахоплівала мяккае залацістае зьзяньне, якое сьцішала ўсе раны і рабіла цела лёгкім. Ён ужо зьведаў гэта, і цяпер хацеў толькі аднаго: каб залатое зьзяньне ахутала таксама старэйшага брата і супакоіла ягоны боль. Яны мусяць памерці дастойна. Гэтага чакаюць ад іх сотні людзей, якія прыходзілі пад сьцены ягонай цямніцы і чулі адсюль словы, што давалі ім надзею. Яны не дачакаліся гэтай надзеі ад жрацоў, і цяпер вераць, што новае вучэньне дасьць іх душам спакой і сэрцам адхланьне.

Сонца ярка, як быццам таксама вырваўшыся з нейкая нябеснай цямніцы, залівала Вільню сьвятлом, і сярод шэра-зялёнага мроіва кустоўя гэтак жа ярка, па-сьвяточнаму, жаўцелі каташкі вярбы. Думкалі першыя пчолы, мяккі пыл казытаў ноздры, і раптам, як прарваўшыся аднекуль, вецер уварваўся ў горла і нясьцерпна захацелася жыць… І з гэтым пачуцьцём вярнуўся боль і зьнікла залатое зьзяньне. Тады зразумеў: для яго жыцьцё і яго спакусы – гэта боль і сьмерць. Зерне павінна ўпасьці ў глебу, каб даць плён. Ён мусіў памерці, каб ураталіся людзі, што тоўпяцца на ўсім шляху да Перуновага гаю і прагна ўглядаюцца ў твары братоў. Нехта з іх глядзеў з нянавісьцю, хтосьці – са зьдзіўленьнем. Было некалькі чалавек, якія, ня тоячыся, плакалі. Ён пабачыў сьлёзы таксама на твары Няжылы.

– Маліся, брат! Так, як не маліўся яшчэ ніколі, з усёй сілай, на якую здольны! – загадаў Няжылу, і той схамянуўся, вусны яго заварушыліся… Дарога ўздымалася ўгору, першыя дубы нібы расступаліся перад фурманкай, і ўжо сотні людзей тоўпіліся каля іх.

Сьвяшчэнны дуб, яшчэ толькі-толькі разбуджаны вясною, са сваімі яшчэ не разьвінутымі лістамі, быў відзён здалёку. Над усімі і ўсім тут раскідаў ён свае галіны-рукі. Кумец глядзеў на яго і бачыў у яркім сьвятле дзьве пятлі, што зьвісалі з ніжняе галіны. Можа, таму, што не адводзіў вачэй ад дуба, не адразу згледзеў новы жоўта-смалісты памост, на якім было разасланае чырвонае сукно. Наперадзе стаяла вялікае крэсла з пазалочанымі парэнчамі і княскім знакам наверсе, – мабыць, для вялікага гаспадара Альгерда, ззаду роўненька месьціліся каля двух дзясяткаў крэслаў менш пышных, але з прыгожымі разьбянымі сьпінкамі – відаць, для вешчых старцаў і вялікіх жрацоў. А ззаду хвалявалася, дыхала, кашляла, уздыхала адгароджаная ад памосту чалавечая маса, якая, пабачыўшы фурманку, загула, загалёкала, завыла на розныя галасы. Гэтае галёканьне, у якім спляліся праклёны і пагрозы, працягвалася да той хвіліны, калі вязьням дапамаглі вылезьці з калёсаў і яны ціха, ледзь перастаўляючы ногі, пасунуліся да Дуба, куды іх, паколваючы дзідамі, прымушаліісьці вартаўнікі.

Ціхі ўздых пранёсься па натоўпе, калі людзі пабачылі неверагоднае: Кумец ішоў на вывернутых каленьмі назад нагах! Яго твар, узьняты ўверх, быў асьветлены дзіцячай усьмешкай, і ўсім на імгненьне здалося, што

хлопец вось-вось уздымецца ўвысь. На Няжыле, які ішоў побач, вецер разгарнуў лахманы, і было бачна, што два пераломаныя яго рабры вытыркаюцца са страшна апухлай, чырвонай і разьедзенай струпамі скуры. І тады ўпершыню раздаліся іншыя галасы – галасы спачуваньня і жалю. Ім запярэчылі іншыя – грубыя і ненавісныя. Яшчэ хвіліна – і разгарэлася б бойка, але варта, якая кінулася была да людзей, спынілася і застыла, пачуўшы гучны і ясны покліч рогу. Гэта прыбываў вялікі гаспадар княства Альгерд.

У малінавым плашчы, шапцы, абітай лісіным мехам, з вялікім залатым змеявіком-медальёнам на грудзях ён, накульгваючы, падышоў да памосту, сеў у крэсла. Твар яго быў суровым і пахмурным, рукі сьцятыя ў кулакі. За ім, крэхчучы і вохкаючы, занялі месцы на лаве вешчыя старцы і прыдворныя, а таксама жрацы. Горка заплакалі ў натоўпе дзьве жанчыны – гэта былі сёстры асуджаных Бяроза і Радагоста.

Бурыла стаў наперадзе, яго высокі каўпак са стралой – знакам Перуна – быў горда ўзьняты над маленькай галавой, зялёныя вочы спакойна глядзелі на натоўп. Ён зьлегку адкашляўся, каб голас яго быў важкім і гучным. Якраз Бурылу было даверана ад імя вешчых старцаў і вялікага жрэчаства Вільні вынесьці вырак злачынцам. І ў гэтым таксама была незвычайнасьць і важнасьць таго, што тут адбывалася, бо заўжды выракі чытаў возны, у лепшым выпадку – войт места. І ніхто ня памятаў, каб пры пакараньні сьмерцю прысутнічаў сам гаспадар Княства.

Кумец глядзеў на вялікага князя. Яму чамусьці ўзгадалася ахвярапрынашэньне Векшы і ейная кроў на нагах у Перуна. Тады Альгерд стаяў спакойна, бо ўдзел у ахвярапрынашэньнях успрымаў як частку свайго вялікняскага становішча. Цяпер, як ні валодаў сабой вялікі князь, было бачна, што ён добра ўсьведамляе незвычайнасьць моманту і ненавідзіць усё, што адбываецца тут. Нават тое, што вялікі князь адводзіць вочы ўбок і не глядзіць на братоў, замест таго каб з нянавісьцю ўглядацца ў іх, сьведчыла пра нежаданьне Гаспадара караць сьмерцю сваіх былых прыдворных. Кумец жа пазіраў на валадара Княства са спагадай. Жыцьцё не такое ўжо і доўгае, а тое, што адбываецца паміж імі зараз, а менавіта забойства яго і брата – застанецца. А яшчэ дазнаўся ён, хаця і быў у цямніцы, што пад хатнім арыштам і пад сьледствам зараз знаходзіцца Круглец, якому таксама пагражае пакараньне.

Ад гэтага часу Альгерда заўсёды будуць узгадваць разам з ім, Кумцом, і яго братам Няжылам, а можа, і Кругляцом – што б ні зрабіў вялікага і выдатнага гэты валадар Княства. І абвостраным, ужо амаль вешчым позіркам, бо глядзеў а д т у л ь, ён убачыў Альгерда праз многія гады – уладнага, славутага сваімі справамі вялікага князя, які ваюе за Княства і ўздымае яго, ды ня сьпіць па начах і пачувае сябе няшчасным…

– Пачынайце! – як адчуўшы гэтыя думкі і хочучы перарваць іх, грозна кінуў Альгерд.

– Ваша Мосьць, я казаў Вам, яшчэ няма вялікай жрыцы Нары! – таропка папярэдзіў Бурыла.

Гэта таксама было нечуваным парушэньнем векавых звычаяў: у сьвяшчэнныя гаі не дазвалалася нават набліжацца жанчынам. Але Нара дамаглася гэтай прывілеі ад вешчых старцаў, і яны пасьля доўгіх ваганьняў адступілі. Калі нельга пускаць яе, казала вялікая жрыца, тады нельга дапускаць да Дуба і вялікага князя, які меў жонку-хрысьціянку і

сам з дзяцінства быў ахрышчаны. А пасьля, неяк неўпрыкмет, выйшла, што дазволам можа пакарыстацца і ейная сястра Дзівейна…

Альгерд на хвіліну завагаўся, ды яму не давялося перад усімі альбо паслухацца вялікага жраца, альбо запярэчыць яму: дзьве жанчыны на белых конях амаль разам вылецелі з-за дубоў і паскакалі да памосту. Натоўп вохнуў і, узбуджаны, зноў ледзь не прарваўся скрозь ланцуг варты. Ваявода ціха сказаў некалькі слоў мечніку, і колькасьць вояў ля месца, дзе сядзеў гаспадар і ягоная сьвіта, стала павялічвацца. Тым часам вершніцы саскочылі з коняў, і адна з іх нізка схілілася перад Альгердам, а другая коратка пакланілася кіўком галавы. Усё ў іх было вытанчаным і падкрэсьлівала іхнюю вабнасьць, такую розную і ў той жа час усемагутную: сукня зялёнага шоўку ў Дзівейны і белая, як аблокі, з усходняга мусьліну ў Нары. Белая, з таго самага мусьліну намітка у Дзівейны і зялёны, з рыжай лісінай апушкай каўпак у яе сястры, з якога зьвісала, абдымаючы плечы, залацістая тонкая тканіна. Яны нібы дапаўнялі адна адну – у аднолькавых пантофліках з ласінае скуры і ў сукнях, чые колеры нібы плаўна пераходзілі з адной на другую.

Гэтыя дзьве жанчыны, самыя вядомыя ў Вільні, атаясамлівалі яе прыгажосьць, багацьце і славу. І натоўп любаваўся імі, асабліва ж углядаючыся ў маладую і, як лілея, пяшчотна-ўзьнёслую Дзівейну, ацэньваючы яе і амаль несучы на крылах захапленьня да яго – вялікага князя, гаспадара, воя.

І Кумец, які стаяў ля дуба і на якога разам з братам усе на кароткае імгненьне нібыта забыліся, ацаніў задуму вялікай жрыцы, якая па-майстэрску выплеснула на вялікага князя тое захапленьне, якое непазбежна павінны былі выклікаць у вільнян і яна, і ейная сястра. Пачуцьцё тое ўзрастала ў процівагу Сьмерці, страшнай Мары-Марэны, якая лунала над усім тут і абвастрала пачуцьці, а значыць, таксама павінна была паслужыць планам Нары. І калі яна нарэшце разам з сястрой села – не наверсе, а ўнізе, пад Альгердам, на лаву, што стаяла на зямлі, сьмяротнік убачыў наяве: гэта таксама прадумана загадзя, каб нават сьмерць яго паслужыла ейным планам.

Іхнія вочы сустрэліся. І ў гэтым усьмешлівым, але вострым, як лязо паглядзе Кумец таксама прачытаў сьмерць і перамогу.

Але перамогі ў яе не было. І ня будзе. Бо за ёю няпраўда, нянавісьць і насільле над суразмернасьцю і ладам, які даў людзям Усявышні і чые законы яны скажаюць. І як жа хочацца спадзявацца, што можа якраз ён сваім жыцьцём, дакладней, сьмерцю, перапаліць іхнія чорныя грахі, каб ня мучылі яны людзей, ня клаліся чорным воблакам на іхнія думкі і справы і не атручвалі іх непрыкметна дзень за днём! І раптам ён здрыгануўся, захлынуўшыся ці то веснавым ветрам, ці то болем і радасьцю адначасна.

Ён угледзеў Уну. У шэрым каўтрышовым плашчы, у мехавым мужчынскім каўпаку, з-пад якога русымі пасмамі падалі яе падрэзаныя, як у хлопцаў-падлеткаў, валасы, яна неадрыўна глядзела на яго, і столькі любасьці, адданасьці і сьвятла было ў яе вачах, што, здавалася, яно ахінае ўвесь гэты натоўп, дзе разам сабраліся і цікаўнасьць, і страх, і надзея, і, адначасна нянавісьць да таго, што нясуць яны з сабою – новай веры, новага погляду на сьвет.

Яна вярнулася, рызыкуючы сваім жыцьцём, яна прыйшла сюды, дзе яе могуць убачыць, схапіць і таксама павесіць на гэтым жа дубе па пад-

войным абвінавачаньні: як парушальніцу забароны для жанчын і як злачынцу, якую шукаюць князевы слугі за тое, што ня выканала ягоны загад і не пайшла ў храм Перуна!

Любасьць да яе – тая вышэйшая любасьць мужчыны да жанчыны, у якой няма нічога зямнога, а толькі спалучэньне родных душаў і сэрцаў – ахапіла яго, ды ён пасьпешліва адвёў вочы – не навесьці б на яе падазрэньня, не зьвярнуць увагу катаў! Ён пашукаў вачыма брата Уны Кругляца (а раптам вырваўся хаця б на гэты час з-пад арышту?), але ня ўбачыў яго і пашкадаваў, што ня ўдасца разьвітацца з гэтым дарагім для яго чалавекам. А можа, яго ўжо схапілі і затачылі ў замкавую цямніцу?

Тым часам, невядома адкуль выйшаўшы, як вынырнуўшы з Вяльлі, да яго падышоў Нестар. Яму забаронена было сюды прыходзіць, яго перад самым пачаткам пакараньня ўжо двойчы не дапускала нават да першых дубоў гаю папярэджаная загадзя варта, ды духоўніку княгіні і пастыру віленскіх хрысьціянаў удалося пераадолець усе перашкоды. Момант для зьяўленьня быў выбраны ўдалы: уся ўвага перакінулася з сёстраў на асуджаных. Жрацы разам ускочылі. Бурыла памкнуўся паклікаць варту, але вялікі князь уладна падняў руку, і ўсё сьціхла, як перад вялікай навальніцай. Людзі глядзелі цяпер толькі на Нестара.

У гэты час, час найгоршага яго прыніжэньня перад усім Княствам і болю за любых яму людзей, сьвятар нібы састарэў на некалькі гадоў. Ішоў, як цягнучы ногі, нібыта яны былі перабітыя ў яго, а не ў Кумца. Рыза ягоная загнулася, з-пад яе бачныя былі белыя порты, а ў руцэ дробна дрыжэў завялікі для яго слабых і старых ужо рук крыж. Аднак з кожным крокам у яго нібыта прыбывала сіл. Ён бачыў асуджаных, бачыў іхні спакой і мужнасьць, і гэтая мужнасьць перадавалася і яму.

– Прэч хрысьціяніна! – пачуўся голас вешчага старца Капца.

– Прэч! – загудзеў натоўп, падаўшыся наперад, да Нестара.

Яшчэ імгненьне – і ён быў бы парваны на шматкі, скрываўлены ў невыразнае месіва. Ды тут, нібы ажылі дрэвы, з усіх бакоў выступілі з-за дубоў воі Альгерда з выстаўленымі наперад дзідамі, і натоўп адхіснуўся. Жрацы ўзьнялі крык, але воі роўна і зладжана адрэзалі іх ад людства, стаўшы за іхнімі сьпінамі, а іншыя хутка абкружылі натоўп.

Ізноў стала ціха. Жрацы вымушаныя былі сесьці.

Браты пацалавалі крыж, прынялі апошняе блаславеньне свайго нямоглага пастыра. І толькі тады Бурыла змог прачытаць прысуд. Ён зьдзівіў усіх, а Няжылу ашаламіў: яго не павесяць разам з братам, калі ён зноў адрачэцца ад хрысьціянства, ён можа застацца жыць! У гэтую хвіліну хлопец адчуў тое, аб чым ведаў, але неяк не задумваўся – мукі Юды, здрайцы, якому ў апошнюю хвіліну адкрылася ўся бездань адзіноты і граху… Ён упаў на калені перад братам, абняў яго, закрычаў:

– Я.. Я не адракаюся! Я памру таксама! Я ня здраджу табе, ты верыш? Ты верыш?!

І, гледзячы на яго зьверху, Кумец адказаў ціха:

– Мы хутка сустрэнемся з табой. Я люблю цябе, брат. Ты заўсёды быў для мяне самым блізкім чалавекам на Зямлі. Я верыў табе нават тады...

І крыкнуў гучна, так, што голас яго рэхам пракаціўся па сьвяшчэнным гаі:

– Сьмерці няма! Мы будзем разам у Вечнасьці! У Хрысьце!!!

Служкі пры сьвяшчэнным Перуновым гаі кінуліся да іх, расьцягнулі ў розныя бакі і паспрабавалі накінуць на Кумца мяшок, каб закрыць яму рот і вочы. Але ўжо з нечалавечай сілай ён адкінуў іх і сам, на сваіх скалечаных нагах, пайшоў да пятлі. Сонца скрозь прагаліну ў галінах ахінула яго праменьнямі, і ўсім здалося, што хлопец сам стаў сонцам і зазьзяў. Натоўп упаў на калені, хтосьці загаласіў.

Бурыла са страхам пабачыў: калі цела Кумца павісла на галіне, магутны, у многія чалавечыя абхваты дуб здрыгануўся, нібыта сутарга болю і шкадаваньня прайшла і па ім.

– Цуд! Цуд! – прашалясьцела навокал.

– Няшчасьце!

І тады разам усталі вешчыя старцы і ў вялікім жалю таксама ўпалі на калені. Самы стары з іх ціха заплакаў і схіліў галаву перад дубам. Бурыла, аднак, стаяў непарушна і, гледзячы на яго, пагардліва выпрасталася і пазірала на вешчых старцаў Нара.

– Сьвяшчэнны дуб гневаецца! – пачуліся яе словы.

– Вы дазволілі тут быць хрысьціяніну! – падхапіў Бурыла. Прыгнечаныя горам старцы ня слухалі, ды зваротлівы жрэц прадбачыў з таго вялікую выгоду: ён нарэшце зломіць непадатлівых і незгаворных праціўнікаў! Ён выкарыстае цуд як мае быць!

– Што гэта за знак? – недаўменна запытаўся вялікі князь.

– Лепей пра гэта ня ведаць – сказаў Лойка, а на вачах у яго таксама паказаліся сьлёзы.

Служкі трымалі Няжылу, а ён крычаў пра тое, што яны з братам будуць апошнімі ахвярамі багоў, час якіх даўно прайшоў.

Да вечара па ўсёй Вільні разьнесьліся прароцтвы. Адно з іх пра тое, што апаганены забойствам пакутнікаў-хрысьціян сьвяшчэнны дуб хутка памрэ. Другое – што хрысьціянскі сьвятар зайшоў у запаветны гай, і таму трэба чакаць няшчасьця для ўсіх вільнян. А хто вінны ў тым?

– Жрацы! – даказвалі адны.

– Вялікі князь Альгерд! Ён дазволіў Нестару благаславіць братоў, – чаўплі свае прыхільнікі жрацоў.

Плявузгалі рознае. І ўсе сыходзіліся на тым, што надыходзяць грозныя і неспасьцігальныя для простага люду часы...

## *ЭПІЛОГ*

У каморцы на другім паверсе царквы Параскевы Пятніцы Нестар пісаў, сагнуўшыся над пергаментам:

“У 1345 лета ад Раства Хрыстова 14 красавіка павешаны быў на паганскім дубе пакутнік Антоній, а праз дзесяць дзён, 24 таго ж месяца, пакараны быў і ягоны брат, названы мною ў хрышчэньні Іаанам. А сёньня, 13 сьнежня таго ж году, гэтак жа закончыў сваё зямное жыцьцё і Яўстафій, у паганстве Круглец, які таксама спавядаў хрысьціянства і быў за тое павешаны.

Люд Вільні спачуваў новым пакутнікам, і за гэты год паствы ў храме прыбавілася ўтрая, а вялікі князь Альгерд патаемна ад жрацоў падарыў нам наступнае: залатую кадзільніцу, новую золатам тканую рызу баршчовага колеру, тры срэбныя чашы і чарнёны пацір.

На тым тыдні сватаўся вялікі князь Альгерд да цьвярской князёўны Юльяны Аляксандраўны, і брат яе, холмскі князь Усевалад Аляксандравіч, даў згоду на той шлюб".

Ён завагаўся, раздумваючы над іншымі падзеямі, якія здаліся ўрэшце нявартымі запісу ў кнізе, якая пераажыве стагоддзі і данясе да далёкіх нашчадкаў усё, што адбылося тут, у стольным градзе Вільні, у час ягонага жыцьця.

Таму не напісаў, як нядаўна на сьвітанку ўгледзеў каля храму, на месцы, дзе некалі стаяў каменны ідал Рагуціс з вогненна-чырвонымі вачыма (гэтыя рубіны пасьля паклалі ў княжацкую скарбніцу) скурчанае ў пакутах цела і, павярнуўшы яго тварам дагары, пазнаў былога вярхоўнага жраца Мікшу. Было падобна на тое, што Мікша быў атручаны альбо атруціўся сам, прыйшоўшы на месца, дзе некалі меў і славу, і пашану, якіх цяпер пазбавіўся назаўсёды, бо страціў надзею на разбурэньне хрысьціянскага храму. Спалохаўшыся, што прыпішуць гэтую сьмерць хрысьціянам, Нестар паклікаў служку і разам з ім перацягнуў нябожчыка далей ад храму, туды, дзе на месцы высечаных дубоў падрасьлі маладыя бярозкі.

Не напісаў таксама і таго, што пасьля пакараньня брата немаведама куды зьнікла маладая сястра Яўстафія (Астапа), якая была зьбегла ў Нямеччыну і затым разам з братам, як казалі, вярнулася ў Вільню. Хадзілі чуткі, што жрацы шукалі яе ледзь ня болей, чым самога сына пасла Леся. Але схоплены імі Яўстафій ня выдаў, дзе знаходзіцца ягоная сястра, і таму катаваньні прыняў незвычайныя: яму адрэзалі нос і скалечылі так, што да віселіцы дайсьці сам ён ня мог. І ўсё ж пасьля, цудам божым, падняўся на ногі і тым даў незвычайную моц духу яму, Нестару. Ідучы да пакутніка на прычасьце і сабараваньне, чакаў ён сьмерці, аднак натоўп плакаў горкімі сьлязьмі ад жаласьці да маладога і прыгожага отрака, што сам дабраахвотна прымаў сьмерць, і толькі некаторыя крычалі з нянавісьцю да хрысьціян. І не было ўжо на тым пакараньні ні Альгерда, ні вярхоўных жрацоў…

І яшчэ аб адной падзеі не напісаў сьвятар, якога Вечнасьць назаўсёды прыкавала да трох маладых баяраў, што сталі вядомыя як Віленскія пакутнікі. Падзея гэтая адбылася тады, калі і ён лёг побач з княгіняй Марыяй у прыдзеле пабудаванай ім царквы: князь Альгерд нарэшце змог расправіцца з язычніцкімі жрацамі, што сваёй воляй учынілі забойства замежных купцоў-хрысьціян заходняга абраду. Тады была схопленыя і сьцятыя горлам Бурыла і Нара, а Дзівейна ўцякла з Вільні і навекі зьнікла ў наваградскіх лясах, – хадзілі чуткі, што яна жыла ў сьвяцілішчы братоўблізьнятаў Ашвінаў.

Гэтая падзея страсянула ўсё Княства і нарэшце пераламіла валадарства жрацоў: па загадзе князя быў ссечаны сьвяшчэнны Дуб, і ніхто, апроч купкі служкаў, не прыйшоў яго бараніць, хаця плачу і стогнаў было ў Вільні нямала. А яшчэ праз стагоддзе на месцы Дуба стаяла царква Сьвятой Тройцы – у памяць аб трох першых пакутніках за новую веру.

Яшчэ праз шэсьць стагоддзяў да гэтае царквы, у цэнтры сталіцы краю, прыходзілі вучыцца ў сваю гімназію нашчадкі тых старажытных крывічоў, што некалі плакалі тут, гледзячы на пакуты трох новаахрышчаных отракаў, а пасьля самі, пад наступам часу, прынялі крыж. І сама вуліца

гэтая, названая Вострабрамскай, стала падобнаю да крыжа: у галаве яго – Герб Пагоня на старажытнай браме, у сэрцы – ікона Божай маці, прывезеная Альгердам з Корсуні, па адзін бок – Сьвята-Духаў манастыр, дзе ляжаць нятленныя мошчы отракаў, па другі – Базыльянскія муры, дзе і пасюль стаіць на месцы сьсечанага дуба Траецкая царква. А вуліца ідзе ўніз, выцягваецца ажно да даліны Сьвятарога, дзе пад брукам ляжыць попел як балцкіх, так і славянскіх прашчураў-князёў, што тут тысячагоддзі назад жылі і валадарылі…

## ПРЫПІСЫ

Горні, альбо Верхні, замак – той, што стаіць на т. зв. Гедзімінавай гары і пасёньня зьяўляецца сімвалам Вільні.

Сталец – у значэньні вялікакняскі трон

Вогнік – чырвоныя плямы, якія, як лічылася, ускокваюць на твары чалавека, які нечым абразіў агонь.

І сёньня на сьцяне гэтага храму ёсьць надпіс: «Православная церковь сия есть первая каменная Христианская Святыня в Вильне. Она сооружена на месте языческого капища идола Рагутиса в 1345 г. супругою великого князя Литовско-Русского Ольгерда Марией Ярославною, княжною Витебскою и посьвящён св. великомученице Параскеве, наречённой Пятницей».

Улахерна – самая вядомая царква щ Канстанцінопалі, ад якой перайшло у славянскія землі сьвята Пакрову Багародзіцы.

Захоплены ў 1204 годзе ўдзельнікамі вызваленьня Труны Господняй, заходнімі рыцарамі, Царгорад быў у 1262 годзе адваяваны назад Міхаілам Палеолагам.

Понцкае, альбо Рускае, як называюць яго летапісы – гэта Чорнае мора.

Мудра (санскр.) – па-асабліваму сплеценыя пальцы, у выніку якіх энергія ідзе ў пэўныя органы і лечыць іх. Часам складзеныя ў мудру пальцы можна бачыць на старадаўніх абразах

Цынобра – кінавар.

Некаторыя дасьледчыкі лічаць, што назва горада Сураж (у Віцебскай і Гродзенскай вобласьці ёсьць такія ж назвы, а таксама і Суражская нізіна паміж Гарадоцкім і Віцебскім ўзвышшамі) паходзіць ад імя арыйскага бога сонца – Сур'я.

Севастамі называлі візантыйскіх імператараў.

Шэлег – самая дробная манета ў ВКЛ. 60 шэлегаў складаюць грош.

Сьцяць горлам – у значэньні пакараць, як пра тое сказана ў Статуце ВКЛ.

Севаст (імператар) Канстанцін у V1 ст. заснаваў Канстанцінопаль на месцы былога пасёлка Візантый.

Трасца – род ліхаманкі.

Літоўскага бога Медзіна ўзгадваюць беларускія летапісы.

Купала, як лічаць некаторыя дасьледчыкі, паходзіць ад Гопала – індыйскага Бога-пастуха, які гуляе ў гульні с апсарамі, нябеснымі пастушкамі.

Пагоня – ваенны паход уздагон за нападнікамі, які аб'яўляўся ва ўсім Княстве.

Падкуртачыць – ашукаць, пазьдзеквацца.

Літоўска-Наваградская праваслаўная метраполія была заснаваная ў 1317 г. у Наваградку.

Сварга (санскрыт) – месца нябеснага супакаеньня. Адсюль, на думку некаторых дасьледчыкаў, паходзіць Сварог, гэтак жа як імя Шварна – ад Сваруна.

Яшчэ да XX ст. у асобных мясьцінах Беларусі існавала павер'е: калі напаленая печ трашчыць з левага боку – памрэ гаспадыня. З правай – памрэ гаспадар.

Праз вялікі агонь часам праходзілі, калі хацелі даказаць сваю невінаватасьць.

Бурскі – тканіна персідскага шоўку

Паляндра – адно з назоваў багіні сьмерці. У гаворках выкарыстоўвалася як зьняважлівае азначэньне асобы.

Ахрап'е – рэшткі зяленіва, што ідзе на корм жывёле.

Легчы ў дубовую калоду – памерці.

Ашвіны – нябесныя браты-блізьняты, даслоўна з санскрыту азначае "дзеці кабылы". Валодалі лекавымі таямніцамі, пералятапі па паветры на калясніцы. У Беларусі ім пад імем Асьвінаў пакланяліся яшчэ ў пачатку Х1Х ст.

Агурных – у сэнсе гультайных, бесклапотных.

Налога – напад.

Каберац – дыванок.

Накладам – грашыма.

У 60-х гадах XX ст. шведскі вучоны Ганс Джэні з дапамогай генератара гукавых хістаньняў даказаў, што ў аснове матэрыі ляжаць гукавыя хвалі.

Паводле С. Цярохіна ("Перунова цяпельца", Мн., "Юнацтва", 1993 г.), яшчэ ў Х1Х ст. у Германіі, Аўстрыі і некаторых паўднёва-славянскіх землях сьвятары высякалі Новы агонь на могілках або каля цэркваў, а пасьля яго разносілі па хатах .

Тор – скандынаўскі адпаведнік Перуна. У фальклоры вядомы т.зв. Молат Тора.

Губа, альбо цара, цунтар – добра вывараны грыб, што нарастае на дрэвах і падобны да пушыстай ваты.

Бацьвіна – бурачная націна, ужывалася часам як зьняважлівае.

Крацір – многакутны кубак.

Варцобы – шахматы.

Плінфа – плоская цагліна.

Корд – кароткі меч.

Трасца – адна з міфічных сясьцёр, што наганялі на чалавека хваробу.

Гарцукі – беларускія гномы.

Вялікі агонь праўды – паводле старажытных звычаяў, той, каго падазравалі, і той, хто абвінавачваў, праходзілі праз агонь, а жрацы вырашалі, хто апёкся болей.

Каўтрыш – тоўстае касматае сукно.

Арэхавы ці калінавы жэзлы былі прыналежнасьцю вышэйшай касты жрацоў.

Тонка размолаты рыс, які ўжывалі як пудру, быў здаўна вядомы на Усходзе.

Камка – найтанчэйшая, накшталт мусьліна, тканіна.

Рэйтары (ням.) – коньнікі, часта – ахова гораду ці замку.

Лацінскі выраз olla male fervet дакладна гучыць як "гаршчок дрэнна варыць", што значыць: "справы дрэнь".

Лацінскі выраз Is feliciter sapit, qui perikulo alieno sapit азначае: "Шчасьліва паразумнеў той, хто паразумнеў ад бяды іншага".

Калачакра – у індуісцкай традыцыі бесьперапынны цыкл перараджэньняў.

Улахерна – царква ў Канстантынопалі, дзе ў 910 годзе ў час асады горада арабамі зьявілася Божая маці і прасьцёрла над ім свой покрыў, выратаваўшы Візантыю.

Конскі тыдзень сьвяткавалі ў канцы лета. Спачатку ён быў прысьвечаны Ашвінам, затым – сьв. Флору і Лаўру.

Кон – старажытная назва Лёсу.